ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ – СКАРБНІЦА ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ

**1938–2008**

**Мінск**
**НАРБ**
**2008**

УДК 930.25(476)”1938/2008”
БББК 79.3(4 Беи)
Н 35

*Рэкамендавана да друку*
*Вучоным Саветам Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі*

**Аўтары:**
А.К. Галубовіч (кіраўнік аўтарскага калектыва), Г.Я. Акуловіч, В.У. Бабкова, У.М. Дзянісаў, В.Х. Канаваленка, Г.М. Кутукова, Л.М. Лісава, Дз.Ч. Матвейчык., Т.С. Міхяёнак, М.Ф. Шумейка, З.Л. Яцкевіч.

**Навуковы рэдактар:** доктар гістарычных навук
Ю.М. Бохан

**Рэцэнзент:** кандыдат гістарычных навук А.Я. Рыбакоў

У выданні выкарыстаны фотаздымкі Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Н 35 **Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі – скарбніца дакументальнай спадчыны 1938–2008** / А.К. Галубовіч [і інш.].- Мінск : НАРБ, 2008. – 270 с.: іл.

ISBN 978-985-6372-55-4.

Выданне прысвечана 70-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, які з’яўляецца найбольшым у краіне сховішчам рукапісных дакументаў, створаных да 1917 г. – перыяду Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. У кнізе раскрываецца гісторыя стварэння архіва, яго папярэднікаў, паказваецца сённяшні стан, дасягненні і асноўныя накірункі дзейнасці. Апісанне гісторыі дапаўняецца ілюстрацыямі, біяграмамі архівістаў і спісам навуковых і навукова-папулярных прац, падрыхтаваных супрацоўнікамі архіва.

Выданне разлічана на навуковых супрацоўнікаў, даследчыкаў архіўнай справы ў Беларусі і шырокае кола аматараў айчыннай гісторыі.

**УДК** 930.25(476)”1938/2008”
**ББК** 79.3(4 Беи)

**ISBN 978-985-6372-55-4**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2008



# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ – СКАРБНІЦА КРАІНЫ

Адзін з найбуйнейшых збораў дакументальнай спадчыны краіны захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, дакументы якога выкарыстоўваюцца ў працэсе нацыянальнага адраджэння як важны элемент гістарычнага пазнання, аднаўлення гістарычнай памяці і духоўнасці народа.

Гісторыя Нацыянальнага архіва шматпакутная. Дакументы прайшлі складаны і цяжкі шлях, пабывалі ў архівах судовых устаноў Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, пасля ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі – у палатах грамадзянскіх судоў, архівах магістратаў, павятовых судоў, прыватных асоб, затым у Віленскім і Віцебскім архівах старажытных актаў.

Архіў захоўвае дакументы па гісторыі Беларусі перыяду ўваходжання ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ў колькасці 3118 фондаў, 29 калекцый мікрафотакопій, 1 018 930 адзінак захавання.

Комплекс дакументаў перыяду Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай прадстаўляюць пергаментныя прывелеі XIV-XVII стст., напісаныя на старабеларускай, старапольскай і лацінскай мовах. Як правіла, гэта прывілеі літоўскіх князёў, польскіх каралёў, дакументы дыпламатычнага і дзяржаўнага значэння. Сярод іх – пацвярджальны прывілей князёў Фёдара і Канстанціна Карыятавічаў пану Грынько на горад Сакалец за верную службу ад 20 чэрвеня 1391 г.; прывілей караля Стэфана Баторыя Габрыелю Бенешу на маёнтак Аванты за ўдзел у бітве пад Полацкам і Вялікімі Лукамі ад 3 лютага 1581 г.; прывілей князя Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі Нясвіжу на Магдэбурскае права ад 18 ліпеня 1586 г.; купчая князя Мікалая Чартарыйскага слонімскаму маршалку Аляксандру Палубінскаму на маёнтак Глуск за 50 тысяч польскіх злотых ад 4 чэрвеня 1626 г. Пад тэкстам сярод шматлікіх подпісаў – подпіс Пятра Дастаеўскага, пінскага гродскага суддзі (аднаго з продкаў Ф.М. Дастаеўскага); універсал гетмана Багдана Хмяльніцкага аб прадастаўленні купцам г. Слуцка бяспечнага і вольнага гандлю на тэрыторыі Украіны ад 7 мая 1656 г. і інш.

Гонарам архіва з’яўляюцца актавыя кнігі земскіх (самая ранняя – Драгічынскага земскага суда за 1416 г.), гродскіх, каптуровых, падкаморскіх, кампрамісарскіх, канфедэрацкіх, эксдывізарска-

таксатарскіх судоў, магістратаў, ваенна-цывільных парадкавых камісій, каралеўскіх эканомій, Галоўнага і Скарбовага трыбуналаў Вялікага княства Літоўскага, Кароннага трыбунала за XVI-XVIII стст.

Па словах гісторыка і архівіста Мікіты Іванавіча Гарбачэўскага, «менавіта ў іх (актах) алюстравалася жыццё пакаленняў цэлага краю, якія даўно замоўклі».

У гэтых кнігах знаходзяцца акты аб заснаванні Генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага, выбарах павятовых маршалкаў і саветнікаў судоў, запісы прысягі ўдзельнікаў канфедэрацыі, заклік канцлера Льва Сапегі да аб'яднання вакол канфедэрацыі, універсал соймавых маршалкаў ад 31 снежня 1790 г. аб унутраным і знешнім становішчы Польшчы, аб яе зносінах з іншымі дзяржавамі; прывілеі (копіі) літоўскіх князёў і польскіх каралёў аб наданні гарадам і мястэчкам Магдэбургскага права (1565-1798), прывілеі (копіі) каралёў і князёў магнатам, шляхце, духоўным асобам, манастырам, цэрквам, касцёлам на маёнткі, сёлы, землі, сялян; тэстаменты магнатаў, шляхты, мяшчан, у тым ліку тэстамент жонкі канцлера Льва Сапегі Дароты Фірлёвай; інвентарныя апісанні гарадоў, маёнткаў, сёл, фальваркаў з пералікам павіннасцяў і падаткаў сялян; апісанне каралеўскага замка, пабудоў у Гродна з пазначэннем вуліц і ўладальнікаў дамоў; матэрыялы аб паўстанні сялян і мяшчан Крычаўскага староства і адпраўцы зачыншчыкаў у Слуцкую крэпасць (1741-1744 гг.); акты аб уводзе ва ўладанне маёмасцю, размежаванні, куплі-продажы зямель, узаемных наездах шляхты, захопе маёнткаў, сёл, маёмасці, быдла; забойствах, збіцці, продажы і перадачы сялян у заставу, уцёках, цяжбах шляхты, самавольным заворванні сялянамі зямель памешчыкаў, парубцы лесу, адмове выконваць павіннасці і плаціць падаткі; універсалы аб устанаўленні парадку гандлю ў гарадах, мястэчках, сёлах; праверцы мер і вагі; заявах купцоў аб цяжкасцях перавозкі тавараў па Дзвіне ў Рыгу і аб неабходнасці пабудовы плаціны (1789-1792 гг.); звесткі аб пасевах збожжа ў фальварках Гродзенскай каралеўскай эканоміі (1733-1737 гг.); рукапісныя галандскія карты Нью-Ёрка XVII-XVIII стст., навігацыйная карта ўзбярэжжа Нідэрландаў. Вялікую цікавасць уяўляюць звесткі аб дзейнасці Віцебскага езуіцкага калегіума – гуманітарнай навучальнай установы, дзе за аснову навучання былі ўзяты прынцыпы заходнееўрапейскай адукацыі (1651-1820 гг.).

Маюцца звесткі аб архітэктурных помніках, такіх, як мінская і аршанская ратушы, царква Святых апосталаў Пятра і Паўла, аб тапаніміцы беларускіх сярэднявечных гарадоў і г.д.



Актавыя матэрыялы ўтрымліваюць багатую біяграфічную інфармацыю пра вядомых у Беларусі людзях – выдаўца і асветніка эпохі Рэфармацыі Васіля Цяпінскага, пра апошнюю прадстаўніцу роду слуцкіх князёў Алелькевічаў князёўну Сафію Слуцкую, пра дыпламата і пісьменніка Гальяша Пельгрымоўскага і інш.

Гісторыя Беларусі перыяду яе ўваходжання ў склад Расійскай імперыі (з канца XVIII па пач. XX ст.) пададзена ў фондах устаноў Беларускай (1797-1802 гг.), Віцебскай (1802-1917 гг.), Мінскай (1793-1917 гг.), Магілёўскай (1772-1796, 1802-1917 гг.) і Полацкай (1776-1796 гг.) губерняў.

У дакументах фондаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання, гарадскога, земскага і саслоўнага самакіравання, урадава-дваранскага нагляду над сялянамі маюцца звесткі аб устанаўленні, змяненні межаў губерняў, паветаў (тапаграфічнае апісанне Мінскай губерні, карта і спіс валасцей і паветаў Магілёўскай губерні, планы гарадоў, звесткі і справаздачы аб стане паветаў і валасцей). Захоўваюцца ў іх і дакументы аб перайменаванні і стане гарадоў, мястэчак, сёл, звесткі аб гербах гарадоў, перапісах, колькасці і веравызнанні насельніцтва, прызначэнні на пасады дзяржаўных чыноўнікаў, парадку работы дзяржаўных устаноў, іх штатах; аб выдачы пашпартоў, пасведчанняў і білетаў на вольны праезд па Расіі; прашэнні аб дазволе пераезду ў Пецярбург, Маскву, перасяленчым руху ў Арэнбургскую, Самарскую губерні, Сібір, на Каўказ.

Сярод матэрыялаў гэтага перыяду маюцца і дакументы, звязаныя з імем нашага суайчынніка Андрэя Тадэвуша Банавентуры Касцюшкі (1746-1817 гг.) – барацьбіта за свабоду Паўночна-Амерыканскіх штатаў, кіраўніка паўстання 1794 г. у Польшчы, Беларусі і Літве. Гэта выпісы з універсала Тадэвуша Касцюшкі аб вызваленні сялян і памяншэнні іх павіннасцяў. Цікавыя дакументы аб паўстанні дзекабрыстаў 1825 г. – аўтограф заснавальніка Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў П.І. Пестэля, ліст жонкі дзекабрыста А.П. Юшнеўскага М.К. Юшнеўскай з Сібіры і інш.

Вялікая колькасць архіўных матэрыялаў прысвечана нацыянальна-вызваленчаму, рабочаму і аграрнаму руху ў Беларусі. Гэта справы, якія распавядаюць аб фарміраванні, ходзе і баявых дзеяннях паўстанцкіх атрадаў падчас паўстанняў 1830-1831 гг., 1863-1864 гг.; аб арыштах, вобысках, пакараннях і ссылцы іх удзельнікаў у Сібір, пратаколы допытаў, спісы ўдзельнікаў паўстанняў і г.д. Сярод іх маецца варыянт верша Адама Міцкевіча «Смерць палкоўніка», прысвечанага ўдзельніцы

паўстання 1830-1831 гг. Эміліі Плятэр, цыркуляр Мінскага часовага ваеннага губернатара Мінскаму грамадзянскаму губернатару аб вышуку за ўдзел у паўстанні 1830-1831 гг. памешчыка Паўла Астроўскага, які паслужыў правобразам У. Дуброўскага ў аднайменнай аповесці А.С. Пушкіна; рапарт магілёўскай следчай камісіі А.П. Бяклемішаву ад 16 снежня 1863 г. аб кіраўніках паўстанцкіх атрадаў і іх дзеяннях у Магілёўскай губерні, дзе названы паплечнік Канстанціна Каліноўскага Людвік Звяждоўскі (псеўданім – Тапор).

Захаваліся дакументы па гісторыі Паўночнай вайны 1700-1721 гг., вайны 1812 г., руска-турэцкай 1877-1878 гг., руска-японскай 1904-1905 гг., першай сусветнай вайны 1914-1918 гг., а таксама пра падзеі 1905 і 1917 гг., у прыватнасці, аб трагедыі 18 кастрычніка 1905 г. у Мінску, вядомай пад назвай Курлоўскі расстрэл; матэрыялы аб антыўрадавай прапагандзе, агітацыі сярод рабочых, сялян, навучэнцаў, салдатаў і іх удзеле ў мітынгах і дэманстрацыях.

Фонды ваенных устаноў, у тым ліку губернскіх і павятовых, па воінскай павіннасці, упраўленняў губернскага і павятовых воінскіх начальнікаў, Полацкага кадэцкага корпуса ўтрымоўваюць рапарты і справаздачы аб стане мясцовых воінскіх часцей, перафарміраванні войскаў, справы аб правядзенні мабілізацый, прызыве навабранцаў, правядзенні заняткаў у Полацкім кадэцкім корпусе, забеспячэнні войскаў абмундзіраваннем, прадуктамі харчавання, ваенным рыштункам; прашэнні дабраахвотнікаў аб залічэнні іх на ваенную службу.

У дакументах гаспадарча-эканамічных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў асвятляецца гісторыя прамысловасці, маюцца звесткі аб адкрыцці фабрык, заводаў (віцебскай ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна», барысаўскай запалкавай фабрыкі «Бярэзіна», мінскіх машынабудаўнічых, чыгунамедналіцейных заводаў «Таварыства Якабсан, Ліўшыц і К°», шпалернай фабрыкі, піваварнага завода «Багемія», слуцкай фабрыкі персідскіх тканін і паясоў), майстэрняў, млыноў, аб стане фабрычна-заводскай прамысловасці, у тым ліку ткацкай і палатнянай фабрык, вінаградных і цукровых заводаў; правілы ўнутранага распарадку для рабочых, матэрыялы аб уводзе ў дзеянне закона аб страхаванні рабочых, аб выкарыстанні працы малагадовых, звесткі аб забастовачным руху і выніках забастовак; дыяграма Міністэрства гандлю і прамысловасці аб ліку рабочых, якія баставалі ў 1912-1916 гг., аб удзеле прадстаўнікоў Беларусі ў сусветных і ўсерасійскіх выставах.

У фондах губернскіх дарожных і будаўнічых камісій, устаноў транспарту і сувязі, харчовых і гандлёвых устаноў захоўваюцца дакументы аб будаўніцтве і рэканструкцыі гарадоў, пабудове мастоў, будынкаў, правядзенні водаправода, газавага асвятлення Маскоўска-Брэсцкай, Лібава-Роменскай, Палескіх і іншых чыгунак, шашэйных дарог, паштова-тэлеграфных устаноў, адкрыцці навігацыі на рэках, суднаходстве.



У фондах устаноў сельскай гаспадаркі ўтрымліваюцца звесткі аб землеўпарадкаванні, размеркаванні зямлі на хутарскія і адрубныя ўчасткі, замене цераспалосных зямель, пераходзе да хутарскога землекарыстання, стане паляводства, лугаводства, жывёлагадоўлі, пчалаводства, лясной гаспадаркі.

У складзе фондаў маюцца прапановы і справаздачы аб правядзенні гідратэхнічных пошукаў, даследаванняў тарфяных пакладаў, асушэнні балотаў, умацаванні берагоў рэк, буравых пошукаў пітной вады, а таксама аб працы экспедыцыі па правядзенні работ на Палессі пад кіраўніцтвам генерал-лейтэнанта І.І. Жылінскага.

Архіў захоўвае вялікую колькасць інвентароў памешчыцкіх і дзяржаўных маёнткаў, якія з'яўляюцца адным з асноўных крыніц па гісторыі беларускай вёскі.

Дакументы фондаў папячыцеля Беларускай навучальнай акругі, дырэкцый народных вучылішчаў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, навучальных устаноў, навуковых, культурна-асветных устаноў адлюстроўваюць гісторыю народнай адукацыі і культуры. У іх пададзены звесткі аб адкрыцці і дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў, настаўніцкіх семінарый, гімназій, народных, павятовых, гарадскіх, рамесных, прыватных, народных вучылішчаў, царкоўнапрыходскіх школ; аб ліку навучэнцаў (па саслоўях), праследванні настаўнікаў і навучэнцаў за ўдзел у рэвалюцыйнай дзейнасці. Захоўваюцца дакументы пра пісьменнікаў і паэтаў Якуба Коласа, Янку Купалу, М. Багдановіча, І. Тургенева, А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча і М. Лынькова; звесткі аб навуковых працах па этнаграфіі настаўнікаў народных вучылішчаў, у тым ліку А. Багдановіча, бацькі паэта М. Багдановіча; прашэнне В.Р. Бялінскага папячыцелю Беларускай навучальнай акругі аб прадастаўленні яму месца настаўніка; рукапіс працы В.Р. Бялінскага «О методе преподавания русского языка в школах»; матэрыялы аб кампазітарах М. Агінскім, С. Манюшку, М. Глінку, мастаках В. Ваньковічу, М. Шагалу, Х. Суціне, І. Рэпіне, аб пачатку дзейнасці першага прэзідэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі У.М. Ігнатоўскага і інш.

Матэрыялы архіва распавядаюць аб будаўніцтве, адкрыцці і дзейнасці Мінскага гарадскога тэатра (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя

Я. Купалы), бібліятэк, бальніц, аптэк; адкрыцці Віцебскага, Мінскага, Магілёўскага настаўніцкіх інстытутаў, Горацкіх сельскагаспадарчых навучальных устаноў, Бабруйскай, Гомельскай, Полацкай, Рагачоўскай настаўніцкіх семінарый, мужчынскіх і жаночых гімназій, рэальных вучылішч; стварэнні беларускага Вольнага эканамічнага таварыства і суполкі Таварыства мінскіх урачоў, таварыстаў выяўленчых мастацтваў, аховы жывёлы, губернскіх папячыцельстваў дзіцячых прытулкаў; адкрыцці метэаралагічных станцый, курсаў па садаводству і агародніцтву; аб адкрыцці Віцебскага архіва старажытных актавых кніг (1862 г.), стане архіваў Віцебскага губернскага праўлення.

Фонды ўстаноў аховы здароўя адлюстроўваюць медыка-санітарны стан губерняў, паветаў, утрымліваюць звесткі аб барацьбе з эпідэміямі і эпізаотыямі, ліку хворых, нараджальнасці, фельчарска-акушэрскіх школах, аптэках, ветэрынарных лячэбніцах, аб удзеле медыцынскіх устаноў ва Усеславянскай выставе, Усерасійскай гігіенічнай выставе (1913 г.); аб зборы ахвяраванняў для заснавання стыпендыі імя Боткіна.

У справах фондаў устаноў рэлігійнага культа захоўваюцца Атлас Паўночна-Заходняй Русі па веравызнаннях насельніцтва (1864 г.), звесткі аб наглядзе за «чысцінёй веры», стане царкоўных служб, якасці духоўных пропаведзяў, настроях парафіянаў і духавенства, дакументы аб антырэлігійных настроях сялян, барацьбе з ерассю і расколам. У гэтых фондах маюцца справы аб будаўніцтве і рамонце цэркваў, касцёлаў, кляштараў, сінагог, у тым ліку Мінскага кафедральнага сабора, надзяленні духавенства зямлёй, інвентарныя апісанні іх маёмасці, акты люстрацыі маёнткаў, якія належалі цэрквам, касцёлам і кляштарам, справы па скаргах царкоўных сялян на памяншэнне ворнай і сенакоснай зямель, абцяжарванне павіннасцямі, цялесныя пакаранні. Гэтыя ўстановы ажыццяўлялі таксама духоўны суд над царкоўнаслужыцелямі і парафіянамі, што адбілася ў справах гэтых фондаў. Тут жа маюцца метрычныя кнігі ўсіх канфесій – асноўныя крыніцы для даследавання сямейных і сваяцкіх сувязей. Да іх належаць фонды дваранскіх дэпутацкіх сходаў, казённых палат, мяшчанскіх управ, статыстычных камітэтаў, фамільных фондаў і фондаў асабістага паходжання.

На захаванні знаходзяцца дакументы, якія тычацца помнікаў архітэктуры, такіх, як Сафійскі сабор у Полацку, касцёл Святога Роха на Залатой Горцы ў Мінску, замак у Міры, палац Агінскіх у Залессі; гістарычных цэнтраў гарадоў Брэст, Віцебск, Мінск, Магілёў, Заслаўе, Нясвіж, Полацк, Навагрудак і інш.

У архіве захоўваюцца фонды асабістага паходжання, сярод якіх фамільныя фонды дваранскіх родаў Булгакаў, Горватаў, Друцкіх-Любецкіх, Любамірскіх, Плятэр-Зібергаў, Радзівілаў, Хмараў.



У фондзе князёў Радзівілаў захаваліся пергаментныя прывілеі за XVI-XVII стст. Іншыя дакументы гэтага фонда змяшчаюць звесткі маёмасна-гаспадарчага характару аб стане і вядзенні прыватнаўласніцкай гаспадаркі, плошчах панскай ворнай зямлі, сельскагаспадарчых культурах, развіцці жывёлагадоўлі; аб маёмасным і прававым становішчы сялян, формах іх эксплуатацыі, інвентарныя апісанні маёнткаў і сёл; справаздачы, даклады, ведамасці аб дзейнасці жалезаапрацоўчых заводаў, паташных, смалакурных, суконных фабрык, бровараў, цукровых заводаў, размешчаных у ардынацыях князёў Радзівілаў; дакументы аб становішчы і аплаце працы рабочых. У фондзе ёсць матэрыялы па гісторыі Барысава, Віцебска, Мінска, Магілёва, Нясвіжа, Слуцка і іншых беларускіх гарадоў; аб стане гандлю, медыцынскага абслугоўвання, аб гісторыі культуры, побыту і нораваў, сфрагістыцы (пячаткі розных устаноў, дзяржаўных, грамадскіх дзеячаў і іншых асоб). Маюцца ў фондзе дакументы, якія адносяцца да дзейнасці караля Яна Сабескага і яго сям'і (1633-1757 гг.), а таксама роднасных Радзівілам сямей – Вітгенштэйнаў, Флемінгаў, Завішаў. Адначасова з дакументальнымі матэрыяламі ў фондзе маюцца і матэрыялы з Нясвіжскай бібліятэкі князёў Радзівілаў: друкарскія і рукапісныя выданні, ноты музычных твораў, камплекты часопісаў і газет на англійскай, французскай, нямецкай, польскай, рускай мовах за XVIII-XIX стст.

Ёсць у архіве і дакументы па вотчыннаму кіраванню Гомельскім маёнткам графа Румянцава-Задунайскага (з 1776 г.), князя Паскевіча (з 1834 г.).

Архіў захоўвае калекцыі старажытных інвентароў каралеўскіх, прыватнаўласніцкіх і духоўных маёнткаў за 1562-1810 гг., створанай архіварыусам Цэнтральнага архіва г. Вільні М.І. Гарбачэўскім на падставе двух комплексаў – інвентароў Дзярэчынскага архіва і інвентароў люстрацыі і тарыфаў розных паветаў; тапаграфічных карт, планаў гарадоў, вёсак, сёл, маёнткаў Мінскай губерні (1797-1906 гг.); евангелічна-лютэранскіх цэркваў Беларусі (1648-1920 гг.); яўрэйскіх таварыстваў і ўстаноў Магілёўскай і Віцебскай губерняў за 1841-1917 гг.; Мінскай і Гродзенскай губерняў за 1872-1918 гг.; копіі дакументаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага XV-XVIII стст., аб сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі XVI-пач. XX ст., якія паступілі з дзяржаўных архіваў Расіі, Літвы, Латвіі, Галоўнага архіва старажытных актаў у г. Варшаве (Польшча); фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і інш.

*А.К. Галубовіч*

# Папярэднікі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі: Віленскі і Віцебскі цэнтральныя архівы старажытных актавых кніг і лёс іх дакументальных збораў

Загад Сената «Аб заснаванні ў Кіеве, Віцебску і Вільні цэнтральных архіваў для актавых кніг Заходніх губерняў» з мэтай захавання важных у археалагічных адносінах дакументаў, якія складаюць "адзіныя і сваім родзе матэрыялы для айчыннай гісторыі і старажытных дваранскіх родаў», быў падпісаны 2 красавіка 1852 г. Мікалаем I[1]. Перадачы ў цэнтральныя архівы належалі актавыя кнігі па 1799 г. уключна. Гэта дата была звязана з тым фактам, што юрыдычная сіла захоўвалася за актамі, унесенымі ў кнігі па гэты год уключна; пазней у далучаных землях дзейнічалі агульнарасійскія ўстановы і законы.

З самага пачатку абодва архівы былі пастаўлены ў няроўныя ўмовы, звязаныя не толькі са складам дакументаў, якія сюды ўваходзілі (у Віленскім павінны былі захоўвацца дакументы не толькі мясцовых, як у Віцебскім, але і цэнтральных судовых устаноў былога Вялікага княства Літоўскага), але і з іх арганізацыяй. У Вільні, дзе, як вядома, знаходзіўся цэнтр навучальнай акругі, архіў быў падпарадкаваны Міністэрству народнай асветы і адразу ж размешчаны ў будынку зачыненага ў 1832 г. мясцовага універсітэта. У Віцебску, дзе адсутнічалі якія-небудзь навучальныя ці навуковыя ўстановы, архіў быў пастаўлены пад кантроль Міністэрства ўнутраных спраў, і для яго спачатку нават не знайшлося належнага памяшкання. У сувязі з гэтым архіў змог пачаць працу толькі з 1862 г., калі пад яго сховішча быў прыстасаваны былы каталіцкі («фарны») касцёл, дзе размяшчаліся архівы губернскага праўлення і канцылярыі генерал-губернатара.

Умовы для захавання актавых кніг у абодвух архівах былі далёкімі ад дасканаласці, хаця віцебскія архіварыусы, адказваючы на анкеты, разасланыя Часовай камісіяй для ўладкавання архіваў (1873 г.) і Дз.Я. Самаквасавым (1898 г.), спрабавалі паказаць сітуацыю у больш станоўчым выглядзе.

Першы архіварыус А.М. Сазонаў (1862-1886 гг.), у прыватнасці, пісаў: "Архіў размяшчаецца ў казённым каменным будынку, ад жылых

[1] Сборник материалов, относящихся до архивной части в России. Пг., 1916. Т. 1. С. 120-121.



памяшканняў знаходзіцца на адлегласці 5 сажаняў, ад пажара і паводкі будынак у бяспецы. Сырасць маецца, і яна залежыць ад спосабу пабудовы будынку, які меў першапачаткова зусім іншае прызначэнне… Памяшканне са зводамі, падлогі ў двух аддзяленнях драўляныя, пячэй тры, дастаткова светла; у вокнах жалезныя краты, а ў некаторых – унутраныя жалезныя аканіцы»[2].

Апошні архіварыус Дз.І. Даўгяла (1897-1903 гг.), у цэлым пацвярджаючы інфармацыю Сазонава, некалькі канкрэтызаваў парадак размяшчэння архіва: «Архіў займае каменны казённы будынак, былы рымска-каталіцкі прыходскі касцёл, і складаецца з 4-х пакояў: 3 уласна пад архівам у 2-м паверсе і 1 у ніжнім – для канцылярыі… Памяшканне светлае і сухое, ад пажара бяспечнае. Формы рукапісаў – in folio, кнігі, пераплеценыя часткай у скуру, а ў большасці – у малескін»[3].

Канцэнтрацыя актавых кніг у Віленскім архіве пачалася адразу ж пасля падпісання царскага загаду. Аб паслугах у яе арганізацыі галоўнага начальніка края, што быў адначасова і папячыцелем Віленскай навучальнай акругі І.Г. Бібікава, у красамоўнай форме пісаў архіварыус М.І. Гарбачэўскі: «Па яго ўзмаху актавыя кнігі, як пералётныя птушкі, ляцелі ў цэнтральны архіў з усіх чатырох губерняў, так што ў канцы 1853 г. іх мелася ўжо ў наяўнасці 3036… У 1858 г. амаль усе прысутныя месцы перадалі старажытныя кнігі, што знаходзіліся пад іх наглядам, колькасцю 15 340 валюмінаў, засталіся толькі неперададзенымі цалкам два старажытныя архівы ў Гродзенскай губерні: драгічынскі і бранскі, часткай з прычыны шматлікасці кніг, часткай таму, что пошта з гэтых заштатных гарадоў адыходзіла толькі двойчы на тыдзень. Перадача гэтая працягвалася ўключна да 1863 года»[4]. У 1887 г. архіў узбагаціўся яшчэ пяццю тысячамі кніг судоў Люблінскай губ. Да канца стагоддзя, такім чынам, у ім захоўвалася 23 326 кніг, што ўключалі прыкладна 15 млн. дакументаў.

Былі сабраны актавыя кнігі і архіварыусам Віцебскага цэнтральнага архіва А.М. Сазонавым, які прыступіў да выканання сваіх абавязкаў з верасня 1862 г. Паводле складзенага ім у лістападзе 1864 г. вопіса, у архіве

[2] Самошенко В.Н. Исторические архивы дореволюционной России: Учебное пособие. М.: МГИАИ, 1986. С. 191.

[3] Самоквасов Д.Я. Архивное дело в России. Кн. 2. М., 1902. С. 86.

[4] Горбачевский Н.И. О Центральном архиве древних актовых книг губерний: Виленской, Гродненской, Минской и Ковенской // Вестник Западной России. 1869. Кн. 5, 6. (Тут і далей цытаты прыводзяцца паводле асобнаму адбітка артыкула з дароўным надпісам аўтара, што захоўваецца ў Аддзеле рэдкай і рукапіснай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі). С. 18.

налічвалася 1520 кніг (956 па Віцебскай і 564 – па Магілёўскай губ.). Паводле вопіса 1865 г., архіў налічваў ужо 1745 кніг за 1560-1803 гг., што паступілі з павятовых судоў (688 кн.), палаты грамадзянскага суда (152 кн.), магістратаў Віцебскай губ. (108 кн.); адпаведна па Магілёўскай губерні – з павятовых судоў (551 кн.), магістратаў (246 кн.)[5]. Усяго ж у «Пераліковы вопіс актавых кніг Віцебскага архіва», апублікаваны ў 1-м томе «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» (Віцебск, 1871), увайшлі 1823 кнігі, якія ўключалі каля 300 тыс. дакументаў.

Разабраўшы, сістэматызаваўшы і адрэстаўраваўшы кнігі, што паступілі на захаванне (многія з якіх, у прыватнасці аршанскія, у сувязі з перавозам у 1812 г. у Вялікія Лукі, прадстаўлялі дастаткова сумнае відовішча), супрацоўнікі архіва пачалі працаваць з дакументамі, папярэдне склаўшы навукова-даведачны апарат у выглядзе каталога (падрыхтаваны М.І. Гарбачэўскім і выдадзены ў 1872 г. у Вільні) і вышэй узгаданага пераліковага вопісу, які меў выключна інвентарны характар. Яны не змяшчалі звестак ні аб складзе, ні аб змесце ўключаных у кнігі актаў.

Праца ў архівах ішла па трох накірунках: выдача выпісаў з актавых кніг, даведак і паведамленняў па патрабаваннях прысутных месцаў і прашэннях прыватных асоб; складанне вопісаў дакументаў і паказальнікаў да іх; і, нарэшце, публікацыя дакументаў. Першы накірунак меў не толькі выключна прыкладны, але і навуковы характар, бо патрабаваў ад архівістаў высокага прафесіяналізму і адначасова фарміраваў у іх элементы крыніцазнаўчай культуры ў працы з дакументамі.

Актыўна вялася праца і па апісанню дакументаў, распрацоўцы навукова-даведачнага апарата ў форме імянных і геаграфічных паказальнікаў. Так, у Віцебскім архіве ў 1896-1899 гг. былі складзены імянныя паказальнікі па матэрыялах актавых кніг Гарадоцкага, Дынабургскага і Невельскага судоў, аднак агульнага імяннога паказальніка так і не было складзена[6].

Значнае месца ў дзейнасці абодвух архіваў займала праца па публікацыі дакументаў, а таксама па падрыхтоўцы навукова-даведачных выданняў.

У адрозненне ад Вільні, дзе асноўная публікацыйная дзейнасць вялася мясцовай археаграфічнай камісіяй, у Віцебску ўся археаграфічная праца ўскладалася на плечы архіварыуса, які асабіста вызначаў аб’ект публікацыі, затым з дапамогай наёмных пісараў рыхтаваў дакументы да

[5] НГАБ. Ф. 2790. Воп. 1. Спр. 4. Л. 7–7 адв.

[6] Самошенко В.Н. Исторические архивы дореволюционной России. М., 1986. С. 197–198.



выдання, займаўся карэктурай і г.д. Спробы А.М. Сазонава дамагчыся стварэння і ў Віцебску археаграфічнай камісіі па аналогіі з Вільняй і Кіевам не сустрэлі падтрымкі з боку афіцыйных органаў. Не атрымала ўхвалення і ініцыятыва віцебскага архіварыуса назваць праектуемую дакументальную серыю «Беларускім археаграфічным зборнікам», паколькі ў Вільні ўпраўленнем навучальнай акругі ўжо выдаваўся «Археаграфічны зборнік дакументаў, што адносяцца да гісторыі Паўночна-Заходняй Русі».

І тым не менш, нягледзячы на ўсе складанасці арганізацыйнага і фінансавага характару, у 1871 г. пабачыў свет 1-ы том зборніка «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы». Заключны 32-і том выйдзе ў 1906 г., калі архіў спыніць сваё існаванне.

М.Л. Вяроўкін, які змяніў Сазонава на пасадзе архіварыуса (1818-1896 г.), працягваў публікацыю серыйнага выдання. У прафесійных адносінах ён, хаця і не меў (як Сазонаў) універсітэцкай адукацыі, быў добра падрыхтаваным для свайго часу спецыялістам: ведаў латынь, польскую, нямецкую, французскую, латышскую мовы, валодаў выдатнай памяццю, вылучаўся начытанасцю. Сучаснікі адзначалі, што Вяроўкін быў «жывой даведачнай кнігай па самых разнастайных пытаннях, якія тычыліся мясцовага краю, чым шырока карыстаўся ў асобых заўвагах да «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў», дзе згрупаваў шмат цікаўнага гістарычнага і археалагічнага матэрыялу»[7]. Яго паслугамі карыстаўся віцебскі гісторык і археограф А.П. Сапуноў, працуючы над сваёй знакамітай «Віцебскай даўнінай».

Заключны перыяд дзейнасці Віцебскага архіва прыпаў на час яго рэфармавання. Першыя спробы рэарганізацыі архіва прадпрымаліся яшчэ ў пачатку 1890-х гг. у сувязі з працай спецыяльнай камісіі, устаноўленай пры Міністэрстве народнай асветы для абмеркавання пытання аб мерапрыемствах па больш эфектыўнай дзейнасці цэнтральных архіваў у «заходніх губернях». 19 лістапада 1893 г. на адрас віцебскага губернатара быў накіраваны ліст Дэпартамента агульных спраў МУС, у якім адзначалася выключнае становішча Віцебскага архіва, што мае агульнае прызначэнне і арганізацыю з Віленскім і Кіеўскім, але знаходзіцца ў распараджэнні не Міністэрства народнай асветы, а Міністэрства ўнутраных спраў. «Апрача таго, – пісалася ў лісце, – архіў гэты змяшчаецца ў такім горадзе, дзе немагчыма спадзявацца дастатковай колькасці асоб, якія цікавяцца гістарычнымі пошукамі, і выклікае пры існаванні Цэнтральнага ж архіва ў

[7] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Т. 27. Витебск, 1898. С. 111.

Вільні марнае раздрабленне матэрыялаў, якія тычацца гісторыі Паўночна-Заходняга краю»[8].

Далей аўтар ліста інфармаваў губернатара аб рашэнні камісіі аб'яднаць віцебскі і віленскі архівы з перадачай першага ў распараджэнне Міністэрства народнай асветы. Супраць такога рашэння катэгарычна выказваўся М.Л. Вяроўкін, спасылаючыся пры гэтым на пазітыўныя водгукі вядомых маскоўскіх, пецярбургскіх і кіеўскіх гісторыкаў К.М. Бястужава-Руміна, В.А. Ляліна, М.Ф. Уладзімірскага-Буданава і інш. у адрас віцебскага дакументальнага выдання, адзначаючы наяўнасць у Віцебску навуковых сіл (у прыватнасці, А.П. Сапунова, які выдаваў «Віцебскую даўніну»), параўнальна невялікія расходы на ўтрыманне архіва і інш. Прынамсі, калі на ўтрыманне віленскага архіва і археаграфічнай камісіі штогод трацілася 11,5 тыс. руб. (3,5 тыс. на архіў і 8 тыс. на камісію), дык расходы на ўтрыманне Віцебскага архіва складалі 2825 руб., з іх 600 атрымліваў архіварыус, 225 траціліся на канцылярскія і гаспадарчыя патрэбы і 2 тыс. руб. – на выданне актаў[9]. Архіварыус меркаваў, што з аб'яднаннем двух архіваў «віцебскія акты апынуцца на заднім плане, чарга да іх дойдзе хіба што ў аддаленай будучыні»[10]. «Апрача таго, – пісаў ён у лісце ў Дэпартамент, – з перамяшчэнем архіва ў аддаленую Вільню ўзнікнае немалая цяжкасць і з адміністрацыйнага пункту гледжання, таму як з'явіцца цяжкасць у своечасовым навядзенні рознага роду даведак, якія часта маюць надзённы інтарэс…»[11].

З улікам гэтых абставін М.Л. Вяроўкін прапаноўваў пакінуць Віцебскі архіў самастойным, узмацніўшы яго штат узнаўленнем пасады памочніка архіварыуса, павялічыць фінансаванне архіва, а «для прыцягнення мясцовых навуковых сіл да ўдзелу ў распрацоўцы і выданні актаў прызначыць такім супрацоўнікам узнагароджанне адпаведна з узнагароджаннем працаўнікоў гэтага поля дзейнасці ў Віленскай і Кіеўскай археаграфічных камісіях».

Відавочна, разважанні архіварыуса былі прыняты пад увагу пры вырашэнні пытання аб лёсе Віцебскага архіва. Зацверджанае 22 студзеня 1896 г. рашэнне Дзяржаўнага Савета мела паліялітыўны характар: архіў захоўваў самастойнасць, але перадаваўся пад нагляд МУС з ранейшым фінансаваннем[12].

[8] НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 41 377. Л. 1-2.

[9] НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 41 377. Л. 10 об.

[10] НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 41 377. Л. 10 об.

[11] Тамсама. Л. 8.

[12] Сборник материалов, относящихся до архивной части. Т. 2. С. 211; НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 41 377. Л. 14-15.



Рэарганізацыя Віцебскага архіва супала са смерцю М.Л. Вяроўкіна (пам. 20 лютага 1896 г.). 24 лютага 1896 г. па загаду віцебскага губернатара для перадачы архіва ў распараджэнне Міністэрства народнай асветы была створана спецыяльная камісія пад старшынствам памочніка інспектара Віцебскай духоўнай семінарыі, выпускніка пецярбургскіх духоўнай акадэміі і археалагічнага інстытута, кандыдата багаслоўя Дз.І. Даўгялы (1868-1942 гг.). У яе ўвайшлі таксама сакратар губернскага статыстычнага камітэта С.Г. Гарскі і рэдактар «Губернскіх ведамасцяў» І.І. Пілін. Часова выконваючым абавязкі архіварыуса быў прызначаны выкладчык Віцебскай мужчынскай гімназіі, стацкі саветнік А.П. Сапуноў, які добра ведаў архіў і, як адзначалася вышэй, карыстаўся паслугамі папярэдняга кіраўніка пры падрыхтоўцы «Віцебскай даўніны».

Нягледзячы на непрацягласць знаходжання Сапунова на пасадзе архіварыуса, з яго імем звязаны правядзенне рэстаўрацыі актавых кніг, прадухіленне выяўленых камісіяй недахопаў у арганізацыі іх захаванасці і выкарыстання[13].

З імем жа Дз.І. Даўгялы, які заняў 1 чэрвеня 1897 г. пасаду архіварыуса замест Сапунова, які выехаў у Маскву, звязаны заключны і найбольш эфектыўны перыяд у дзейнасці Віцебскага архіва наогул, публікацыйны у прыватнасці. З прыходам Даўгялы істотным чынам змяніўся характар серыйнага дакументальнага выдання. У ім пачалі публікавацца больш разнастайныя матэрыялы, якія суправаджаліся заўвагамі, што з значнай сваёй частцы мелі крыніцазнаўчы і палеаграфічны характар, і, што асабліва важна, тэксты перадаваліся ў поўнай адпаведнасці з арыгіналамі.

Змянілася і арганізацыя працы па падрыхтоўцы дакументальнага выдання. Цяпер яна рабілася па аналогіі з Віленскай археаграфічнай камісіяй, дзе пералік прапанаваных да апублікавання дакументаў праглядаўся і зацвярджаўся папячыцелем навучальнай акругі. Акрамя гэтага, падрыхтоўка «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» уваходзіла цяпер у кола прамых абавязкаў архіварыуса, пазбаўляючы яго такім чынам істотнага дадатку ў выглядзе ганарару да сціплага заробку.

Аналіз заключных тамоў віцебскага выдання сведчыць аб тым, што яны выгадна адрозніваліся ад папярэдніх як па аб'екту публікацыі, так і па ўзроўню іх археаграфічнай падрыхтоўкі, наяўнасцю шырокага (але не расцягнутага) навукова-даведачнага апарата.

[13] Падліпскі А.М. Летапісец Віцебшчыны. Мн.: Полымя, 1993. С. 37-39; Хмяльніцкая Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова). Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. С. 104–107.

Адбіраючы дакументы, Даўгяла кіраваўся не толькі крытэрыям іх каштоўнасці як гістарычных крыніц, але і браў у разлік архівазнаўчы фактар (ступень захаванасці і паўнату корпуса друкуемых дакументаў і г.д.). Так, гаворачы ў прадмове да 27-га тома «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» аб прычынах, што абумовілі ўключэнне ў яго склад у ліку іншых і дакументаў кніг Ушацкай магдэбургіі, ён пісаў: «Пры выбары гэтых дакументаў да друку мы кіраваліся не толькі гістарычнымі інтарэсамі. Азначаная кніга моцна спарахнела, і многія дакументы ледзьве могуць быць разабранымі, а некаторыя ўжо і незваротна страчаны. Каб захаваць (што магчыма) з кранутага парахненнем, мы і вырашылі надрукаваць прапануемыя дакументы з азначанай кнігі»[14].

Дз.І. Даўгяла, гэтак жа як і М.В. Доўнар-Запольскі, П.А. Гільдэбрандт і іншыя вядомыя археографы канца XIX ст., быў праціўнікам выбарачнай сістэмы публікацыі дакументаў, якая, як вядома, заўсёды ці амаль заўсёды зведвала на сабе праявы пазанавуковага – палітычнага, ідэалагічнага, канфесійнага і іншага ўплыву. Альтэрнатывай ён лічыў публікацыю дакументаў або аднаго віду або цалкам кнігі. Пра гэта, у прыватнасці, Даўгяла пісаў папячыцелю вучэбнай акругі, рыхтуючы чарговы, 29-ы том «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў»: «Азначаны выпуск… я намераны прысвяціць выключна толькі інвентарам, выяўленым у актавых кнігах былога Полацкага павятовага суда… і такім чынам увесці некаторую сістэму ў выданне «матэрыялаў» Віцебскага цэнтральнага архіва»[15].

У заключных 30-м і 32-м тамах «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» Дз.І. Даўгяла скарыстаў прыём суцэльнай публікацыі дакументаў асобнай кнігі (справы), характэрны, як вядома, для пафондавых выданняў. Аб’ектам публікацыі стала 1-я кніга Магілёўскага магістрата, якая вялася з 5 кастрычніка 1577 г. па 11 ліпеня 1578 г. (у т. 30 было змешчана 186 дакументаў за 1577 г., у т. 32 (выдадзены з прадоўжанай нумарацыяй старонак і дакументаў 30-га тома) – 172 дак. за 1577 г. і 516 дак. за 1578 г.). Увесь навукова-даведачны апарат да публікацыі «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» Даўгяла сканцэнтраваў у 32-м томе. Ён уключаў прадмову і археграфічны – «уступ», якія насілі крыніцазнаўчы характар, а таксама агульны пералік актаў кнігі, асабовы і геаграфічны паказальнікі.

Публікацыя кніг Магілёўскага магістрата атрымала працяг у выданні Віленскай археаграфічнай камісіі, апошнім старшынёй якой апынецца Дз.І. Даўгяла у 1913 г. Менавіта заключны, 39-ы том «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі» ўтрымліваў у сабе ўсе 2035 актаў

[14] Историко-юридические материалы. Т. 27. С. XXVIII.
[15] НГАБ. Ф. 2790. Воп. 1. Спр. 109. Л. 1.



двух чарговых кніг Магілёўскага магістрата за 1578-1580 гг. Работа па публікацыі калі не дакументаў, то хаця б апісанняў дакументаў актавых кніг Магілёўскага магістрата, пачатая ў канцы XIX ст. Віцебскім цэнтральным архівам старажытных актаў, працягваецца сучаснымі беларускімі архівістамі і археографамі, якія працуюць у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі[16].

Пасля ліквідацыі ў 1903 г. Віцебскага архіва як самастойнай установы і інтэграцыі яго дакументальнага збору ў Віленскі цэнтральны архіў старажытных актаў пачынаецца заключны перыяд у дзейнасці гэтых першых гістарычных сховішчаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Першая сусветная вайна, потым акупацыя Вільні кайзераўскімі войскамі, уключэнне Віленскага краю ў склад Польскай дзяржавы паклончылі з самастойным існаваннем архіва старажытных актаў, нявывезеная частка дакументаў якога ўвайшла у склад створанага польскай адміністрацыяй Дзяржаўнага архіва Польшчы ў Вільні.

У далейшым, амаль да пачатку Другой сусветнай вайны, дакументы былых віленскага і віцебскага цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг, як і архіў вялікакняскай канцылярыі, так званая «Літоўская метрыка», выступалі ў якасці своеасаблівай перашкоды пры вырашэнні пытанняў архіўнай рэстытуцыі паміж Расіяй, Беларуссю, Польшчай, Латвіяй і Літвой. Пра іх казалася ў заключаных Савецкай Расіяй у 1920-я гг. дамовах з Літвой, Латвіяй, Польшчай; праблемы справядлівага міждзяржаўнага размеркавання дакументальных збораў былых архіваў старажытных актаў абмяркоўваліся на Першай усебеларускай канферэнцыі архіўных работнікаў (май 1924 г.), Першым з’ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі (студзень 1926 г.). Спробы вырашэння гэтых праблем без уліку прынцыпу паходжання дакументаў прадпрымаліся ў 1940 г.

Трэба адзначыць, што дагэтуль, па дадзеных кіраўніцтва Расійскага дзяржархіва старажытных актаў, у яго складзе знаходзіцца значная колькасць матэрыялаў, якія адносяцца да тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, прынамсі, «калекцыя земскіх і гродскіх кніг». Што тычыцца гісторыі Віленскага і Віцебскага цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг, рашэнне пра стварэнне якіх прынята больш паўтара стагоддзя таму, то яна павінна разглядацца ў кантэксце еўрапейскага архівазнаўства. І было б справядліва, на нашу думку, цяперашняму Нацыянальнаму гістарычнаму архіву весці свой радавод ад гэтых двух гістарычных архіваў, якія ўзніклі ў 1850-я гг.

*М.Ф. Шумейка*

[16] Магілёўскі магістрат 1580-1581, 1588 гг. Мн., 1999. Вып. 1 / Склад. З.Л. Яцкевіч, А.А. Лашкевіч.

# ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ АРХІВА

## Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР (1938-1990 гг.)

Датай заснавання архіва лічыцца 5 ліпеня 1938 г., але яго гісторыя пачалася ў 1919 г. як гісторыя архівасховішча Магілёўскага архіўнага бюро.

У 1924 г. архівасховішча было рэарганізавана ў Акруговы архіў. У 1927 г. быў створаны Магілёўскі гістарычны архіў[1], пераўтвораны ў 1930 г. у аддзяленне Цэнтральнага архіўнага ўпраўлення БССР, пры якім заснаваны гістарычны архіў[2]. Згодна з заключэннем Цэнтрархіва БССР ад 6 сакавіка 1929 г., «паводле паўнаты састава і колькасці архіўных фондаў, якія ў ім захоўваюцца, Магілёўскі гістарычны архіў з'яўляецца адным з самых лепшых і багатых дзяржаўных архіваў БССР»[3].

5 ліпеня 1938 г. адпаведна пастанове Прэзідыума ЦВК БССР Магілёўскі гістарычны архіў рэарганізаваны ў Цэнтральны гістарычны архіў[4], з 1943 г. – у Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР[5]. З таго часу і вядзе архіў сваю гісторыю.

Калі весці адлік ад самага ранняга дакумента, які датуецца 1391 г., то архіву 617 гадоў, а калі са створанага Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў (1551 г.) – 457 гадоў; калі з 1862 г. з дня ўтварэння Віцебскага архіва старажытных актавых кніг – 146 гадоў.

Неабходна адзначыць, што дакументы гістарычнага архіва захоўваліся таксама ў Віцебскім і Мінскім гістарычных архівах, затым у абласных архівах, архіве Акадэміі навук БССР. Вялікая заслуга ў іх захаванасці ва ўмовах ваеннага часу, голаду і разрухі належыць гісторыкам-архівістам Дзмітрыю Іванавічу Жылуновічу (Цішку Гартнаму), Уладзіміру Іванавічу Пічэту, Дзмітрыю Іванавічу Даўгялу, Міхаілу Вікенцьевічу Мялешку

[1] Архивное дело в БССР (1918-1968). Мн., 1972. - С. 43.
[2] Тамсама. С. 58.
[3] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 281. Арк. 22.
[4] Архивное дело в БССР. С. 85.
[5] Тамсама. С. 91.



і іншым. З верасня 1938 г. архіў у ліку іншых архіўных устаноў быў перадаsuccessfully ў распараджэнне НКУС БССР[6], што прывяло да негатыўных наступстваў – неабгрунтаванага абмежавання доступу да дакументаў, і як вынік гэтага – да адрыву ад навукова-даследчых устаноў.

Архіў размяшчаўся ў трох памяшканнях – былыя Бернардынскі касцёл, архірэйскі дом, брацкі манастыр у Магілёве. Гэта былі прыстасаваныя памяшканні з пячным ацяпленнем, часткова абсталяваныя электрычным асвятленнем, водаправодам. У 1938 г. у Магілёўскім гістарычным архіве працавала 12 чалавек, у тым ліку 5 знаходзіліся ў штаце архіва (дырэктар архіва Э.М. Барэнбаум, навуковы супрацоўнік Р.Л. Слабодзіна, старшы архіўна-тэхнічны работнік А.І. Філішэнка, архіўна-тэхнічныя работнікі І.Г. Сякацкі, А.Н. Аўсяевіч), і 7 пазаштатных архіўна-тэхнічных работнікаў. У мэтах паскарэння архіўна-тэхнічнай апрацоўкі дакументаў, аптымізацыі іх выкарыстання, а таксама для замацавання за архіўнай службай кваліфікаваных кадраў Цэнтральнае архіўнае ўпраўленне БССР павялічыла штаты архіва на 2 чалавекі і прыняло меры для ўвядзення ў штатны расклад пазаштатных супрацоўнікаў[7]. Згодна каштарысу расходаў на 1938 г. меркавалася набыць 1000 каробак для захавання архіўных матэрыялаў, 10 000 вокладак для рамонту архіўных спраў, пераплесці 200 вопісаў.

У даваенны перыяд былі сфарміраваны асноўныя напрамкі выкарыстання дакументаў у навуковых і практычных мэтах не толькі па дакументах Магілёўскага гістарычнага архіва, але і дакументах дарэвалюцыйнага перыяду, якія захоўваліся ў іншых архівах рэспублікі. Упершыню ў дзяржаўным маштабе сталі прадпрымацца крокі па абнародаванню дакументаў па гісторыі Беларусі XVI-XIX стст. З выкарыстаннем дакументаў архіва Археаграфічнай камісіяй пры Інстытуце беларускай культуры быў падрыхтаваны і выдадзены зборнік «Беларускі архіў XV-XIX стст.» (тт.1-3; Мн., 1927-1930) і Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР зборнік «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. 1772-1963» (тт.1-2; Мн., 1936, 1940). Архіў працаваў і над выкананнем запытаў устаноў і заяў грамадзян.

Да 1941 г. у ЦДГА было сканцэнтравана 1560 фондаў у аб'ёме больш за 328 тыс. спраў.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны большая частка дакументаў і навукова-даведачны апарат да іх загінулі, частка дакументаў вывезена ў Рыгу і Германію, маёмасць архіва была знішчана і разрабавана.

[6] Тамсама. С. 87.
[7] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1115. Арк. 60, 74, 83.

У лістападзе 1943 г. яшчэ да вызвалення Магілёва пастановай Савета Народных Камісараў БССР была зацверджана структура ЦДГА БССР колькасцю 32 штатныя адзінкі[8].

Пасля вызвалення Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 28 чэрвеня 1944 г. у архіве мелася толькі 44 справы. Пачалася праца па рээвакуацыі і ўліку профільных дакументаў і ўпарадкаванню вернутых фондаў. Вярнуць удалося 38 054 справы з 700 фондаў, з якіх ніводзін не меў поўнага складу. Справы былі сырымі, падзёртымі, патрабавалі рамонту; не было будынка архіва, не хапала кваліфікаваных кадраў. І толькі карпатлівая праца энтузіястаў архіўнай справы дазволіла правесці ўлік, рамонт, нумарацыю аркушаў спраў, складанне загалоўкаў, афармленне вокладак, апісанне спраў, іх сістэматызацыю, фарміраванне звязак, тапаграфіраванне, размяшчэнне па стэлажах у памяшканні клуба швейнай фабрыкі.

У 1947 г. з Дзяржаўных архіваў Віцебскай і Гомельскай абласцей архіву былі перададзены фонды дарэвалюцыйнага перыяду. За 1945-1962 гг. у гістарычны архіў Магілёва паступілі профільныя справы з гістарычных архіваў Ленінграда, Масквы, Вільнюса і іншых архіваў у колькасці 382 566 адзінак[9].

У 1944 г. была зацверджана структура архіва, якая заставалася без змен да 1960 г.: кіраўніцтва, аддзелы агульных фондаў, сакрэтных фондаў, навукова-даведачнай літаратуры, чытальная зала. У 1947 г. у архіве працавала 28 чалавек, з 1951 г. – 17 чалавек. Сёння мы з павагай і ўдзячнасцю ўспамінаем нашых калег Рыгора Аркадзьевіча Ахраловіча, Валянціну Андрэеўну Гусарэвіч, Паўла Міхайлавіча Казлова, Таццяну Якаўлеўну Кундалеву, Алену Пятроўну Мелашунас, Таццяну Яфімаўну Напрэенка, Ганну Ульянаўну Нізоўцаву, Вольгу Пракоф’еўну Цюрыну, Ганну Іосіфаўну Эрперт, Сяргея Антонавіча Юрчанка, Людмілу Мікалаеўну Яноўскую і іншых, тых, каму ў 40-х–пачатку 50-х гадоў, у самы цяжкі перыяд гісторыі архіва, даводзілася аднаўляць яго працу нанова.

На пачатку 1948 г. архіў пасля доўгіх нягод атрымаў будынак былога касцёла па вул. Камсамольскай, 4. Пачалася праца па яго абсталяванню пад архіў. Праводзілася змайстраванне стэлажоў, а да завяршэння гэтай працы дакументы захоўваліся ў штабелях. Да 1950 г. была завершана і навукова-тэхнічная апрацоўка дакументаў па скарочанаму цыклу, а з 1951 г. пачалося іх карданаванне. Адначасова праводзілася экспертыза

[8] Архивное дело в БССР. С. 91.

[9] НАРБ. Ф. 249. Воп. 3. Спр. 104. Арк. 81.



каштоўнасці дакументаў, удасканальваўся ўлік і арганізацыя іх выкарыстання.

З 1956 г. архіў распачаў дэзінфекцыю і рэстаўрацыю, пераплёт лядашчых дакументаў, стварэнне страхавога фонду на дакументы, якія выклікалі апасенні ў іх захаванасці.

У 50-х–пачатку 60-х гг. архівісты пачалі ўкараненне комплекснага падыходу да працы з дакументамі: разам з удасканальваннем вопісаў і навукова-тэхнічнай апрацоўкай праводзілася тэматычнае выяўленне, экспертыза каштоўнасці дакументаў. Пачынаецца фарміраванне каталога. Акрамя мэтавай каталагізацыі складанне прадметна-тэматычных картак адначасова праводзілася і пры падрыхтоўцы спраў да мікрафотакапіравання, у працэсе выканання тэматычных запытаў, удасканальвання вопісаў, напісання артыкулаў.

Да 1963 г. прадметна-тэматычны каталог архіва ўключаў 39 000 картак. Узрасла колькасць даследчыкаў, якія працавалі ў чытальнай зале архіва.

Да 1960 г. у архіве адсутнічала самастойнае структурнае падраздзяленне, якое займалася б выкарыстаннем і публікацыяй дакументаў. Выяўленнем дакументаў, выкананнем запытаў, падрыхтоўкай публікацый займаліся супрацоўнікі аддзелаў агульных і сакрэтных фондаў, а таксама кіраўніцтва архіва. Толькі ў 1960 г. згодна з пастановай Савета Міністраў БССР ад 13 студзеня № 12 была пашырана структура архіва: арганізаваны навукова-публікатарская група і лабараторыя па рэстаўрацыі і мікрафотакапіраванню дакументаў.

Вялікае значэнне для архіва і ўсіх архіўных устаноў мела пераўтварэнне Архіўнага Упраўлення МУС БССР у Архіўнае упраўленне пры Савеце Міністраў БССР паводле пастановы ЦК КПБ і СМ БССР ад 1 сакавіка 1960 г.[10], што прывяло да шырокага выкарыстання дакументаў у навуковых мэтах і забеспячэння грамадства дакументальнай інфармацыяй.

Арганізацыя выкарыстання дакументаў з’яўлялася асноўнай задачай архіўных устаноў. Супрацоўнікі архіва прынялі ўдзел у V сесіі сімпозіума па аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы, выступіўшы з дакладам аб рэалізацыі рэформы 1861 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях. Тэзісы даклада былі апублікаваны. Падрыхтаваны і апублікаваны шэраг гісторыка-эканамічных нарысаў па гарадах, раёнах і сёлах Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Бранскай абласцей.

У архіве былі арганізаваны штодзённа з 16 да 18 гадзін дні адчыненых

[10] Архивное дело в БССР. С. 107.

дзвярэй, экспанаваліся выставы, праводзіліся лекцыі і гутаркі. Іх наведвала ў год болей за 1 тыс. чалавек; аб днях адчыненых дзвярэй паведамлялася ў прэсе.

Пашырэнне працы па інфармаванню зацікаўленых устаноў аб складзе і змесце дакументаў архіва і шырокая папулярызацыя архіўных матэрыялаў у перыядычным друку садзейнічалі прытоку ў архіў даследчыкаў. Тэматыка даследаванняў была дастаткова шырокай: стан эканомікі і культуры Магілёўскай губерні, развіццё сельскай гаспадаркі, скасаванне прыгоннага права, развіццё аховы здароўя, гісторыя беларускага выяўленчага мастацтва, архітэктуры, рабочага класа Беларусі; этнаграфія Беларусі; рэвалюцыйная рабочая паэзія і інш.[11].

У 50-60-я гг. супрацоўнікі архіва сумесна з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР прымалі ўдзел у падрыхтоўцы дакументальных зборнікаў: «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі 1900-1917 гг.» (т.т.3,4. Мн., 1953, 1954). Да 50-годдзя першай рускай рэвалюцыі апублікаваны зборнік «Революционное движение в Белоруссии. 1905-1907 гг.» (Мн., 1955), зборнік «Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права. 1861-1862 гг.» (Мн., 1959), апублікаваны шляхаводнік па ЦДГА БССР у г. Магілёве (Магілёў, 1959), падрыхтаваны 8 аглядаў фондаў («Віцебскае губернскае праўленне», «Канцылярыя генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага», «Віцебскі губернскі статыстычны камітэт», «Горацкія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы» і інш.) і шэраг тэматычных аглядаў.

У 50-я–пачатку 60-х гг. у тры разы ўзрасла колькасць даследчыкаў, якія працавалі ў чытальнай зале архіва.

Разуменне задач, якія стаялі перад архіўнай справай, уменне цаніць архіўныя дакументы, ініцыятыва, энергія і надзвычайныя здольнасці дырэктара Міхаіла Фёдаравіча Шпакава, яго намесніка Уладзіміра Пятровіча Пахвалава, супрацоўнікаў Эдуарда Міхайлавіча Савіцкага і іншых дазволілі ім так арганізаваць выкарыстанне дакументаў архіва, што Архіўнае ўпраўленне Беларусі рэкамендавала ўсім архівам рэспублікі вывучаць вопыт ЦДГА БССР у г. Магілёве і ўкараняць яго ў практыку.

1963 год – новая веха ў гісторыі архіва. Згодна з пастановай Савета Міністраў БССР ад 11 лістапада 1963 г. «Аб мерах па паляпшэнні архіўнай справы ў БССР » ЦДГА БССР быў пераведзены з Магілёва ў Мінск, і яму былі перададзены дакументы дарэвалюцыйных фондаў з

[11] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 87. Арк. 44.



Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, а таксама комплекс старажытных актаў з ЦДГА БССР у Гродна[12]. Па мерках таго часу архіў атрымаў цудоўны будынак па вул. Казлова, 26. Упершыню дакументы былі размешчаны не ў выпадкова прыстасаваным памяшканні, а ў спецыяльна абсталяваных архівасховішчах. Умовы забеспячэння захаванасці дакументаў былі набліжаны да аптымальных.

Адбылося аб’яднанне часткі калектываў супрацоўнікаў ЦДГА БССР у Магілёве і Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці са сваімі традыцыямі, навукова-метадычнай базай, дасягнутымі поспехамі, што станоўча паўплывала на новастворany калектыў. Загадам Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР № 100 ад 18 лістапада 1963 г. была зацверджана структура ЦДГА БССР у г. Мінску: кіраўніцтва, аддзелы фондаў Мінскай губерні, фондаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў, старажытных актаў, сакрэтных фондаў, выкарыстання і публікацыі, аддзел агульных фондаў у г. Магілёве, адміністратыўна-абслугоўваючы персанал у колькасці 43 чалавек[13]. З красавіка 1965 г. структура архіва акрамя кіраўніцтва ўключала аддзелы: фондаў, уліку і навукова-даведачнага апарата, выкарыстання і публікацыі, лабараторыя па рэстаўрацыі і мікрафотакапіраванню дакументальных матэрыялаў (да 1967 г.), адміністрацыйна-абслугоўваючы персанал у колькасці 42 чалавек[14].

З 1979 г. аддзелы атрымалі назвы: забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў, інфармацыйна-пошукавых сістэм, інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, група эксплуатацыі і абслугоўвання будынку ў колькасці 39 чалавек[15].

Асноўнай задачай ЦДГА БССР у Мінску было захаваць дакументы і арганізаваць іх выкарыстанне. Улічваючы, што дакументы, як і людзі, «старэюць», «паміраюць», патрабуюць прафілактычнага агляду і «лячэння», у архіве праводзіўся і праводзіцца комплекс работ па забеспячэнні захаванасці дакументаў: стварэнне тэмпературна-вільготнаснага рэжыму, дэзінфекцыя, рэстаўрацыя, пераплёт, стварэнне страхавога фонда на каштоўныя дакументы. Ствараўся і ўдасканальваўся навукова-даведачны апарат, які аблягчаў пошук патрабуемай дакументальнай інфармацыі, працягвалася фарміраванне каталога архіва (з тэматычных картак Магілёўскага гістарычнага архіва, Мінскага абласнога па дарэвалюцыйных фондах архіва і тэматычных

[12] Архивное дело в БССР. С. 115, 117.
[13] НАРБ. Ф. 249. Воп. 5. Спр. 917. Арк. 148-152.
[14] НАРБ, Ф. 251. Воп. 3. Спр. 119. Арк. 7-9.
[15] НАРБ. Ф. 251. Воп. 2. Спр. 25. Арк. 21-24.

картатэк, удасканаленых фондаў архіва). Інтэнсіўна выкарыстоўваліся і дакументы архіва.

У 1974 г. быў выдадзены даведнік па ЦДГА БССР у г. Мінску, які быў падрыхтаваны супрацоўнікамі архіва Я.Л. Бравер, Н.К. Булыгай, Т.А. Вараб'ёвай, А.П. Лазарук, Т.Е. Лявонцьевай, Н.Н. Масаловіч, М.Т. Мінько, В.П. Міронавай, Д.І. Радзіёнавай, Г.І. Шостак, А.Р. Азаравай, Н.І. Булдаковай, Б.З. Прыгожынай.

Праца складальнікаў ускладнялася тым, што адначасова з падрыхтоўкай характарыстыкі і анатацый да фондаў праводзілася ўдакладненне фандзіравання, улікова-даведачных дадзеных, гісторыі фондаўтваральнікаў па комплексах дарэвалюцыйных дакументаў, аб'яднаных у ЦДГА.

Адказным рэдактарам выдання быў доктар гістарычных навук Інстытута гісторыі АН БССР З.Ю. Капыскі.

Адначасова з падрыхтоўкай даведніка рыхтаваліся і іншыя даведнікі. Так, пры ўдакладненні фандзіравання магістратаў, гродскіх, земскіх судоў і іншых устаноў узнікла неабходнасць складання пераводнай табліцы шыфраў спраў архіва да «Каталога старажытных актавых кніг губерняў: Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Ковенскай», складзенага архіварыусам Мікітай Іванавічам Гарбачэўскім[16]. Супрацоўнікамі архіва зроблена вялікая праца па аднаўленні нумароў па вышэйназванаму каталогу і складзена пераводная табліца, якая атрымала высокую адзнаку айчынных і замежных даследчыкаў.

Гістарычныя даведкі да фондаўтваральнікаў, складзеныя ў працэсе падрыхтоўкі даведніка, з'явіліся фундаментам даведніка па гісторыі дзяржаўных, рэлігійных і грамадскіх устаноў Мінскай губерні за 1795-1917 гг., апублікаванага ў 2006 г. Рыхтуюцца да друку аналагічныя даведнікі па Віцебскай і Магілёўскай губернях.

У гэты ж час фарміраваўся і каталог архіва. Каталагізацыя праводзілася як самастойны від працы.

Падрыхтаваны агляды фондаў: «Мінская губернская земская ўправа», «Старшы фабрычны інспектар Мінскай губ.», «Радзівілы, князі», шэраг тэматычных аглядаў. Праца архівістаў па стварэнні навукова-даведачнага апарата да дакументаў архіва высока ацэньвалася даследчыкамі.

16 Каталог древним актовым книгам губерний: Виленской, Гродненской, Минской, Ковенской, а также некаторых судов губерний Могилевской и Смоленской, хранящимся ныне в Центральном архиве в Вильно. Вильно, 1872.



У арганізацыі выкарыстання дакументаў працягнуты лепшыя традыцыі Магілёўскага гістарычнага архіва. Працягваўся ўдзел супрацоўнікаў архіва ў сімпозіумах па аграрных пытаннях.

Па ініцыятыве дырэктара архіва І.В.Рошчына і загадчыка аддзела Т.А. Варабьёвай штогод праводзіліся па дакументах архіва па 2-3 перадачы тэлеальманаха «Архіварыус», у сувязі з чым тэлестудыя атрымоўвала станоўчыя водгукі. Шэраг тэлеперадач па дакументах архіва трансліравалася на Маскву.

Толькі за два гады (1967-1968), калі адзначалася 50-годдзе дэкрэта СНК «Аб рэарганізацыі і цэнтралізацыі архіўнай справы», было падрыхтавана і апублікавана 129 артыкулаў і інфармацый у перыядычным друку, 69 тэлеперадач, 203 радыёперадачы. Дні адчыненых дзвярэй здымаліся групай тэлестудыі і трансліраваліся ў тэлевізійных навінах.

Павялічылася і колькасць даследчыкаў у чытальнай зале архіва. Так, з 1971 па 1980 г. у чытальнай зале працавала 727 даследчыкаў. Па дакументах архіва былі напісаны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі, манаграфіі, падрыхтаваны навучальныя дапаможнікі, артыкулы, гістарычныя даведкі, даклады, дыпломныя і курсавыя работы, праведзены збор матэрыялаў для мемуараў, падрыхтоўкі музейных экспазіцый.

Аб эфектыўнасці выкарыстання дакументаў праз чытальную залу можна меркаваць па колькасці публікацый, створаных на падставе дакументаў архіва ці з іх выкарыстаннем За 1971-1980 гг. было апублікавана больш за сто манаграфій, артыкулаў, нарысаў, зборнікаў дакументаў і г.д.

Супрацоўнікі архіва прымалі ўдзел ў падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў «Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг.» (М., 1964), «Восстание в Литве и Белоруссии. 1863-1864» (М., 1965), «Белоруссия в эпоху феодализма» (Мн., 1959-1961), «Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв. Владение Сморгонь» (Мн., 1977), якія атрымалі высокую адзнаку грамадскасці. Так, пра зборнік «Инвентари» старшыня археаграфічнай камісіі Акадэміі навук СССР Сігурд Отавіч Шміт пісаў: «Гэта важная навуковая публікацыя, якая будзе неабходнай і вучоным – спецыялістам (гісторыкам, эканамістам), і практычным супрацоўнікам архіваў, і студэнтам. Гэта і пераканаўчае сведчанне высокай археаграфічнай і архівазнаўчай культуры, самай цеснай узаемасувязі археаграфіі і крыніцазнаўства. Можна не сумнявацца

ў тым, што падобныя выданні істотна садзейнічаюць і развіццю крыніцазнаўства, і ўсебаковаму вывучэнню сацыяльна-эканамічнай гісторыі».

Менавіта 60-я гг. засталіся ў памяці як гады цесных кантактаў архівістаў з навукова-даследчымі ўстановамі. Архівісты прымалі ўдзел у навуковых канферэнцыях і сімпозіумах, абаронах доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, падрыхтаваных па дакументах архіва. У сваю чаргу навукоўцы актыўна адклікаліся на вырашэнне праблем архівазнаўства і археаграфіі. На жаль, у наступныя гады гэтыя ўзаемаўзбагачальныя кантакты аслаблі, а па шэрагу накірункаў і ўвогуле зніклі.

У 70-80-я гг. асаблівае значэнне набывае публікацыйная работа ў сувязі з узростам інтарэсу да гісторыі Беларусі да 1917 г. Дакументальныя публікацыі архіва – не толькі крыніцазнаўчая база для грамадскіх навук, але і своеасаблівая гарантыя захавання асабліва каштоўных тэкстаў дакументаў, падвергнутых пакуль што незваротнаму працэсу затухання.

Архіў – удзельнік падрыхтоўкі зборнікаў дакументаў «Белоруссия в эпоху феодализма» (Мн., 1979); «Белорусия в эпоху капитализма» (Мн., 1983), «Революционное движение в Белоруссии. Июнь 1907-февраль 1917 г.» (Мн., 1987).

Як галоўная арганізацыя архіў сумесна з Інстытутам гісторыі АН БССР выступіў у падрыхтоўцы зборнікаў «Инвентари магнатский владений Белоруссии XVII-XVIII вв. Владение Тимковичи» (Мн., 1982) і «Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Конец XIV в.–1648 г.» (Мн., 1988).

Арганізаваны ў архіве метадычная работа, укараненне нарматыўных, навукова-метадычных распрацовак і перадавога вопыту архіўных устаноў краіны. У якасці субыканаўцаў супрацоўнікі архіва ўдзельнічаюць у распрацоўцы сумесна з УНДІДАС шэрагу навукова-даследчых тэм. Аднавілася работа па распрацоўцы актавых кніг, якая была перапынена ў 1965 г. у сувязі з ліквідацыяй аддзела старажытных актаў.

У мэтах пашырэння інфармацыйнай базы грамадскіх навук у сакавіку 1988 г. камісія па засакрэчванню і рассакрэчванню дакументаў архіва зацвердзіла акт аб рассакрэчванні дакументаў жандарскіх і паліцэйскіх упраўленняў у колькасці 3666 спраў з 43 фондаў. З'явіўся інтарэс людзей і да свайго мінулага, звязаны з узнаўленнем парушаных гістарычнымі катаклізмамі XX ст. сямейных і роднасных сувязей. Пачынаючы з 1988 г., у архіў паступаюць запыты грамадзян па гісторыі сям'і і рода.



Сярод першых выкананых архівам у 1988 г. – запыты па гісторыі дваранскіх родаў Урублеўскіх, Грынявецкіх, Храптовічаў, Дзяржынскіх, Свірскіх, Тызенгаузаў, у 1989 г. – па гісторыі родаў Сазонавых, Нарбутаў, Паскевічаў, нашчадкаў выхадцаў з Францыі Дзютфуа, Кутуарэ і інш. У 1990 г. архівам было ініцыіравана пытанне аб выдзяленні такіх запытаў у асобную групу, як генеалагічных. Дзякуючы супрацоўнікам архіва, якія распрацавалі методыку пошуку такой інфармацыі, ужо 20 гадоў удзячныя нашчадкі даведваюцца аб сваёй родавай гісторыі.

Са студзеня 1990 г. архіў перайшоў на новыя ўмовы гаспадарання. Гэта дало магчымасць пашырэння сферы яго дзейнасці, арганізацыі аказання платных паслуг, выканання дагаворных работ. Архівам былі заключаны доўгатэрміновыя дагаворы з Мінскім епархіяльным упраўленнем на распрацоўку фонда «Мінская праваслаўная духоўная кансісторыя», Дзяржаўным мастацкім музеем Беларусі па выяўленні дакументаў па гісторыі Нясвіжа, Міра і інш.

Праца калектыва архіва атрымала годную адзнаку. У 1984 г. калектыву было ўручана пасведчанне Галоўнага камітэта Выставы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР аб зацвярджэнні архіва ўдзельнікам ВДНГ СССР. Архіў узнагароджаны Ганаровай граматай Галоўархіва СССР за актыўны ўдзел у грамадскім аглядзе захаванасці дакументаў (1985 г.), пераходным Чырвоным Сцягам Галоўархіва СССР і ЦК прафсаюза працаўнікоў дзяржаўных устаноў з занясеннем у Кнігу гонару Галоўархіва БССР за другое месца ў рэспубліканскім сацылістычным спаборніцтве архіўных устаноў БССР (1987 г.) і інш.

Поспех калектыву – гэта вынік зладжанай, творчай працы яго супрацоўнікаў.

У 70-80-я гг. у архіве працавала слаўная плеяда высокакваліфікаваных, энергічных, нястомных гісторыкаў-архівістаў – А.Р. Азарава, Я.Л. Бравер, Н.К. Булыга, Т.А. Вараб'ёва, Т.Е. Лявонцьева, М.Т. Мінько, В.П. Міронаў, Б.З. Прыгожына, Д.І. Радзіёнава, Н.Л. Рабцэвіч, Н.І. Сяргуніна, Ю.С. Сядзельнікава, Н.М. Леўчык, Г.Я. Акуловіч, А.К. Галубовіч, А.А. Станкевіч, С.Я. Трацэўская, І.М. Шпілеўская, А.Ф. Аляксандрава, В.Д. Селяменеў, А.К. Цітоў, І.Г. Карнеева, Л.Д. Гусакова, В.У. Бабкова, Э.Л. Казлоўская, І.Л. Новікава, Г.М. Кутукова, Н.В. Кальцова, Е.І. Юцэвіч, Л.А. Кавалёва, С.І. Паўловіч і многія іншыя спецыялісты; галоўныя бухгалтары А.М. Чарнавусава, Л.В. Шчэмер. З аддачай працавалі супрацоўнікі адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела А.Р. Вашчокін,

Н.М. Кандруцкая, В.А. Мазурэнка, І.І. Петрашэвіч і інш. Дырэктарамі архіва ў розныя часы былі І.В. Рошчын (1964-1967), Ю.А. Капіца (1968-1970, 1992), Н.І. Сціхараў (1970-1972), П.К. Лешчанка (1972-1978), С.Ф. Зябко (1979-1982), П.М. Судзілоўскі (1982-1992). Развіццю архіва і архіўнай справы садзейнічалі старшыні Галоўнага архіўнага ўпраўлення БССР А.І. Азараў, У.В. Лашкевіч, намеснік старшыні В.М. Жыгалаў, куратар архіва Т.У. Камарова, С.Д. Грыневіч, В.І. Пташнікава, А.І. Карпачова. Мы ўдзячны Вам, шаноўныя калегі, за вашу працу, якая была Вамі ўкладзена ў развіццё архіўнай справы.

*А.К. Галубовіч, Л.М. Лісава*

## Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь - Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі 1991-2008 гг.

Пераўтварэнне Беларускай ССР у незалежную суверэнную дзяржаву Рэспубліка Беларусь на пачатку 90-х гг. XX ст. выклікала кардынальныя змены і ў архіўнай галіне краіны. Закранула гэта і архіў. Так, у ходзе падрыхтоўкі і прыняцця рашэння аб лёсе былога Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ узнікла ідэя стварэння ў Мінску Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь на аснове комплексаў дакументаў ЦДГА ў г. Мінску і вышэй названага архіва. Калектыў гістарычнага архіва не застаўся абыякавым да свайго далейшага лёсу. На сходзе 10 студзеня 1992 г. ён прыняў наступнае рашэнне: «Пакінуць Цэнтральны дзяржаўны архіў рэспублікі як адзіную і непадзельную ўстанову… У выпадку прыняцця рашэння Урадам аб стварэнні Цэнтральнага архіва Рэспублікі Беларусь прасіць не дзяліць, а захаваць дакументы гістарычнага архіва як адзінае цэлае»[1].

Далейшая гісторыя архіва паказала, што гэта рашэнне было лёсавызначальным. На падставе Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 красавіка 1992 г. «Аб пытаннях архіваў» быў створаны Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (дырэктар Я.І. Бараноўскі) з дакументаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў г. Мінску і Цэнтральнага партыйнага архіва (ЦПА) КПБ[2]. 10 жніўня 1992 г. ЦДГА ў г. Мінску быў пераўтвораны ў Цэнтр гістарычных дакументаў (дырэктар А.Ю. Капіца) у складзе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь

[1] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 366а. Арк. 80.
[2] НАРБ. Ф. 505. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1.



(НАРБ)[3]. У адпаведнасці з Загадам Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (Белкамархіў) № 21 ад 26.11.1992 Цэнтр гістарычных дакументаў быў скасаваны[4]. Комплекс дакументаў XIV-пачатку XX ст. у складзе НАРБ з'яўляўся практычна самастойнай структурай і быў размешчаны па адрасу вул. Казлова, 26. Яго ўзначаліла намеснік генеральнага дырэктара А.К. Галубовіч.

У структуры Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь дзейнічалі аддзелы: забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў (XIV-пач. XX ст.), інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў (XIV-пач. XX ст.), інфармацыйна-пошукавых сістэм (XIV-пач. XX ст.), старажытных актаў[5], супрацоўнікі якіх забяспечвалі працу з дакументамі ўказанага перыяду.

У гэтыя гады адбываецца павелічэнне штатаў архіва, забеспячэнне новым абсталяваннем (ксеракс, факс, першыя камп'ютары), пашыраецца дзейнасць архіва па аказанні паслуг. Распрацоўваецца канцэпцыя навуковай тэмы «Генеалогія і геральдыка беларускай шляхты», інтэнсіўна прапрацоўваецца пытанне аб камп'ютарызацыі рабочых працэсаў, у тым ліку пры стварэнні навукова-даведачнага апарата.

У той жа час аб'яднанне дакументаў феадальнай і капіталістычнай фармацый (ЦДГА) з дакументамі адной палітычнай структуры эпохі сацыялізму (ЦПА) было механічным, і праверка дзейнасці НАРБ у 1994 г. паказала беспадстаўнасць аб'яднання двух комплексаў дакументаў, якія не мелі ніякіх прыкмет агульнасці[6]. Загадам Белкамархіва ад № 15 12 чэрвеня 1995 г. на базе комплексу дакументаў канца XIV-пачатку XX ст. створаны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску, які загадам Белкамархіва № 23 ад 23 кастрычніка 1995 г. «Аб удакладненні назваў гістарычных архіваў» перайменаваны ў **Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі**[7]. Дырэктарам архіва стала і да цяперашняга часу з'яўляецца А.К. Галубовіч. Структура архіва ў 1995 г. уключала кіраўніцтва, аддзелы: забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў; інфармацыйна-пошукавых сістэм; старажытных актаў; інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў;

[3] Тамсама. Арк. 4.
[4] Тамсама. Арк. 5.
[5] Тамсама. Спр. 31. Арк. 5-7.
[6] Тамсама. Ф. 249. Воп. 5. Спр. 2388. Арк. 10; Жумарь С.В. Организационно-правовые и административные аспекты деятельности государственной архивной службы Республики Беларусь в 90-х годах // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн.: НГАБ, 2007. С. 33.
[7] НАРБ. Ф. 251. Воп. 5. Спр. 1. Арк. 1, 5.

адміністрацыйна-гаспадарчы[8]. Развіццё тэхнічнай базы прывяло да зменаў у структуры архіва: у 1998 г. створаны аддзел аўтаматызаваных архіўных тэхналогій[9], задача якога – стварэнне аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэм да дакументаў архіва.

У сувязі з высокай ступенню загружанасці архівасховішчаў, адставаннем у развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ў пачатку 90-х гг. кіраўніцтвам архіва ініцыіруецца прапанова аб выдзяленні новага памяшкання для размяшчэння дакументаў па гісторыі Беларусі XIV-пачатку XX ст. На падставе Загаду Белкамархіва № 11 ад 22.03.1996 г. у мэтах аптымізацыі і паляпшэння ўмоў размяшчэння дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь Нацыянальнаму гістарычнаму архіву Беларусі быў выдзелены будынак па вул. Крапоткіна, 55[10] (былога Беларускага дзяржаўнага архіва, у цяперашні час Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь), тэхнічна забяспечаны для падтрымання аптымальнага рэжыму захавання дакументаў, абсталяваны аўтаматычнай устаноўкай газавага пажаратушэння, ахоўнай і пажарнай сігналізацыямі, устаноўленымі ў архівасховішчах і службовых памяшканнях.

У будынак па вул. Крапоткіна, 55 калектыў архіва пераехаў на працягу 1996-2000 гг. па меры яго вызвалення Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь. Гэта былі гады ўпартай працы, у якой удзельнічалі ўсе супрацоўнікі архіва. У архівістаў дзейнічала сістэма ўзаемадапамогі. Праявілася зацікаўленасць у дасягненні канчатковай мэты ў супрацоўнікаў аддзелаў пад кіраўніцтвам загадчыкаў: С.Ф. Адамовіч (аддзел інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў), Г.Я. Акуловіч (аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм), А.Ф. Аляксандравай (аддзел старажытных актаў), А.А. Станкевіч (аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў), Т.С. Міхяёнак (аддзел аўтаматызаваных архіўных тэхналогій), А.Р. Вашчокіна (адміністрацыйна-гаспадарчы аддзел).

Нягледзячы на пераезд, працягвалася праца над навуковымі тэмамі, выконваліся запыты, пачалася праца над стварэннем аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэм. У гэтыя гады быў закладзены патэнцыял сучаснай дзейнасці архіва.

Больш за мільён спраў, 19 калекцый мікрафільмаў, каля 40 тыс. экзэмпляраў кніг, газет, часопісаў, якія меліся ў навукова-даведачнай

[8] Тамсама. Спр. 9. Арк. 1-3.
[9] Тамсама. Спр. 54. Арк. 9.
[10] Тамсама. Спр. 1. Арк. 9.



бібліятэцы, былі з перапынкамі перавезены ў новы будынак на працягу пяці гадоў. Апошняя кропка ў пераездзе была пастаўлена ў кастрычніку 2000 г. пасля заканчэння перавозкі бібліятэкі, у тым ліку дарэвалюцыйных выданняў, якія дапаўняюць і раскрываюць дакументы архіва, неабходных у навукова-даследчай і інфармацыйна-даведачнай працы[11].

28 снежня 2000 г. архіў атрымаў назву Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі». Асноўная мэта дзейнасці архіва – захаванне дакументаў па гісторыі Беларусі XIV-пачатку XX ст., арганізацыя іх выкарыстання ў інтарэсах навукі і грамадства ў цэлым.

Асноўнымі задачамі архіва з'яўляюцца:

забеспячэнне захавання дакументаў устаноў перыяду Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі за XIV-пачатак XX ст., у тым ліку мікрафотакопій;

развіццё і ўдасканаленне сістэмы ўліку навукова-даведачнага апарата, стварэнне інфармацыйна-пошукавых сістэм і баз дадзеных па дакументах архіва;

інфармацыйнае забеспячэнне, арганізацыя ўсебаковага выкарыстання і публікацыі дакументаў архіва;

вядзенне навукова-даследчай працы па актуальных пытаннях гісторыі Беларусі, архівазнаўства, археаграфіі, спецыяльных гістарычных дысцыплін: гісторыі дзяржаўных устаноў, генеалогіі, сфрагістыцы, геральдыцы.

Улічваючы асноўную задачу архіва – захаваць дакументальную спадчыну і прадаставіць грамадству рэтраспектыўную інфармацыю – архіў працуе **над захаваннем носьбітаў і тэксту інфармацыі.** За перыяд з 1995 г. архівам з дапамогай Цэнтральнай лабараторыі мікрафільмавання і рэстаўрацыі дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь створана больш за два мільёны 300 тысяч кадраў страхавога фонда і фонда карыстання, адрэстаўрыравана больш за 1 млн. 610 тыс. аркушаў, здзейснены пераплёт і падшыўка каля 24 тыс. спраў.

У адпаведнасці з галіновай «Праграмай па захаванню архіўнай дакументальнай спадчыны – састаўной часткі інфармацыйных рэсурсаў грамадства» ажыццяўляецца тэхнічнае аснашчэнне архіва з мэтай прыцягнення новых тэхналогій і тэхнічных сродкаў. З выкарыстаннем сканера і лічбавай камеры архівам ствараюцца лічбавыя копіі фонда

[11] Лисова Л.М. Переезд НИАБ в новое здание: год за годом: 2000 г. // Архіварыус: Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў. Вып. 3. Мн.: НГАБ, 2005. С. 181-183.

карыстання найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваемых і асабліва каштоўных дакументаў фонда «Радзівілы, князі» і дакументаў іншых фондаў. Сапраўдным набыткам архіва з'яўляецца сканер мікраформ, які дазваляе ажыццяўляць перавод інфармацыі з мікрафотакопій дакументаў у электронны выгляд.

У чытальнай зале архіва ўсталявана сістэма відэаназірання для кантроля захаванасці дакументаў пры працы з імі даследчыкаў. Набыты сучасныя чытальныя апараты для прагляду мікрафільмаў і мікрафіш, а таксама чытальна-капіравальны апарат, які дазваляе пераводзіць тэкст з мікрафотакопій на папяровую аснову.

**У адпаведнасці са структурай архіва арганізавана праца спецыялістаў, якія творча падыходзяць да вырашэння пытанняў развіцця архіўнай справы.**

У аддзеле забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія арганізуюць працу па захаванасці дакументальнай спадчыны, займаюцца стварэннем страхавога фонду і фонду карыстання, рэстаўрацыяй, мікрафільмаваннем дакументаў, ажыццяўляюць кантроль выдачы і вяртання ў архівасховішча спраў перыяду XIV-пачатку XX ст. і праверку наяўнасці і стану спраў. Яны займаюцца выяўленнем і ўлікам асабліва каштоўных спраў і дакументальных помнікаў, дакументаў з дэфектамі носьбіта і тэксту, прадпрымаюць неабходныя меры па правядзенні экспертызы стану дакументаў у архівасховішчах на прадмет іх паражэння мікрафлорай, удзельнічаюць у аўтаматызацыі рабочых працэсаў па ўліку, стану і руху дакументаў у архіве.

Супрацоўнікі аддзела займаюць актыўную пазіцыю ў правядзенні навуковых даследаванняў, з'яўляюцца выканаўцамі навукова-даследчай тэмы «Картаграфічныя матэрыялы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі». Прымалі ўдзел у падрыхтоўцы «Правілаў работы дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь», распрацоўцы праграмнага модуля забеспячэння аўтаматызаванай інфармацыйна-пошукавай сістэмы «Улік фізічнага стану дакументаў».

**Аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм (ІПС)** арганізуе ўдасканаленне і выкарыстанне сістэмы навукова-даведачнага апарата да дакументаў архіва, удзельнічае ў навуковай распрацоўцы дакументаў, падрыхтоўцы архіўных даведнікаў пра склад і змест дакументаў архіва – вопісаў, каталогаў, паказальнікаў да фондаў устаноў Расійскай імперыі. Супрацоўнікі аддзела ажыццяўляюць дзяржаўны ўлік дакументаў, вызначэнне іх гістарычнай каштоўнасці, прыём і апісанне профільных



дакументаў, якія паступілі з органаў ЗАГСа. У 1996-2007 гг. архівам былі атрыманы і апісаны метрычныя кнігі цэркваў, касцёлаў, сінагог з абласных архіваў і органаў ЗАГСа Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей за 1848-1938 гг.

Запатрабаванасць у інфармацыі генеалагічнага характару паклала пачатак працы аддзела ІПС па перапрацоўцы вопісаў фондаў рэлігійных устаноў. Яна пачалася ў 1990 г. з удасканалення фонда «Мінская праваслаўная духоўная кансісторыя», які складаўся больш чым з 40 тыс. спраў, уключаных у 53 вопіса, у 1996-1998 гг. працягнута работа з фондамі ўстаноў праваслаўнай канфесіі Мінскай губерні, з 1999 г. – з аналагічнымі фондамі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Былі ўдасканалены вопісы фондаў цэркваў, касцёлаў, духоўных праўленняў, благачынных акруг Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, у тым ліку справы генеалагічнага характару – метрычныя кнігі, шлюбныя вобыскі, спавядальныя ведамасці.

З прычыны таго, што звесткі генеалагічнага характару – гэта комплекс найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваемых дакументаў, архіў распачаў стварэнне лакальнай аўтаматызаванай інфармацыйна-пошукавай сістэмы «Міжфондавы геаграфічны паказальнік да вопісаў фондаў рэлігійных устаноў праваслаўнай канфесіі».

Інтэнсіўны зварот да рэвізскіх сказак ф. 333 «Мінская казённая палата» – самай масавай крыніцы, якая змяшчае генеалагічныя звесткі, паказаў, як важна своечасова падрыхтаваць навукова-даведачны апарат, каб скараціць неабгрунтаваную выдачу спраў. Прыкладам такога своечасовага падыходу ў архіве з'явілася распрацоўка праграмнага забеспячэння АІПС па дакументах генеалагічнага характару «Радавод».

Работа з аўтаматызаванымі інфармацыйна-пошукавымі сістэмамі праводзіцца супрацоўнікамі **аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій,** якія займаюцца ўкараненнем у практыку работы інфармацыйных тэхналогій, пытаннямі тэхнічнага аснашчэння, забеспячэннем функцыянавання архіўнага Web-сайта, арганізацыяй стварэння фонда карыстання дакументаў у лічбавым фармаце.

Неабходна адзначыць, што ў архіве праводзіцца праца з дакументальным комплексам перыяду XIV-XVIII стст. Гэтым займаецца **аддзел старажытных актаў,** створаны ў 1990 г., дзе працуюць вопытныя спецыялісты ў галіне археаграфіі, палеаграфіі і гісторыі Беларусі, якія валодаюць методыкай і нарматывамі працы па стварэнні і ўдасканаленні навукова-даведачнага апарата да дакументаў XIV-XVIII стст., да вопісаў ф. 694 «Радзівілы, князі», якія змяшчаюць звесткі на нямецкай,

французскай, польскай, італьянскай, лацінскай мовах, а таксама па апісанні і ўліку пячатак. За семнаццаць гадоў аддзелам старажытных актаў архіва праведзена праца па складанні навукова-даведачнага апарата (унутраных вопісаў, геаграфічнага і асабовага паказальнікаў, тэрміналагічнага слоўніка) да актавых кніг практычна ўсяго XVI ст. і часткова XVII ст.

На падставе пячатак і гербаў, уключаных у сфрагістычны каталог, падрыхтаваны даследаванні генеалагічнага характару – радаводы Я. Чачота, М. Багдановіча, Ядвігіна Ш. (А. Лявіцкага), А. Кіркора, А. Тышкевіча і інш., а таксама малыя гербоўнікі навагрудскай і халопеніцкай шляхты, «Гербоўнік беларускай шляхты» (т. 1-2). Геральдычныя матэрыялы выкарыстоўваліся і ў выступленнях супрацоўнікаў архіва на канферэнцыях, лекцыях, пры падрыхтоўцы выстаў, у радыё- і тэлеперадачах.

Назапашаны вялікі вопыт працы з рукапіснымі крыніцамі XIV-XVIII стст., веданне іх складу і зместу дапамагаюць у іх выкарыстанні.

Добрае валоданне супрацоўнікамі **аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі** гісторыка-дакументальнай базай дазваляе ім на высокім узроўні арганізаваць навуковае выкарыстанне дакументаў, выкананне тэматычных, генеалагічных і біяграфічных запытаў устаноў і грамадзянаў Рэспублікі Беларусь і замежных дзяржаў, а таксама працу чытальнай залы і бібліятэкі архіва.

Дакументы XIV–пачатку XX стст., якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, маюць шырокі спектр выкарыстання. Стала запатрабаваны дакументы архіва ўстановамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі па гісторыі населеных пунктаў, дзяржаўных устаноў, устаноў адукацыі, аховы здароўя, гісторыі помнікаў архітэктуры і культуры гарадоў Беларусі.

Узрасла цікавасць і да гісторыі сям'і, рода. Выкананне запытаў генеалагічнага характару – працаёмкі працэс. Характар запытваемых звестак: устанаўленне і пацвярджэнне сваяцкіх адносінаў; паходжанне прозвішча; пытанні этнічнага паходжання; звесткі пра канкрэтных прадстаўнікоў роду, іх жыццё і дзейнасць; пра сваякоў, што эміgraвалі за мяжу. Геаграфія паступлення запытаў разнастайная, акрамя Рэспублікі Беларусь, гэта – Расія, Украіна, Казахстан, ЗША, Польшча, Ізраіль, Францыя, Англія, Канада, Італія, Аўстралія, Германія, Швецыя, Літва, Латвія. Вядзецца праца і па аказанні дапамогі ў даследаванні радаводаў наведвальнікам чытальнай залы. Калі ў 2000 г. па ўказанай тэме працавалі 96 чалавек, то ў 2007 г. – 148.



Колькасць даследчыкаў і наведвальнікаў **чытальнай залы** складае з 2000 г. ад 400 да 580 чалавек штогод, што ў параўнанні з 80-мі гг. XX ст. больш у 6-8 разоў. Выдача спраў карыстальнікам узрасла ў апошнія гады да 14 тысяч штогод, мікрафотакопій – да 9 тыс. Тэматыка даследаванняў разнастайная: «Гісторыя грашова-крэдытных узаемаадносінаў у Беларусі ў XIX–пачатку XX ст.», «Гісторыя грамадзянска-палітычнага жыцця гарадоў Беларусі ў XV-XVIII стст.», «Народная адукацыя ў Беларусі ў XIX–пачатку XX ст.», «Помнікі гісторыі, архітэктуры і культуры Беларусі ў XIV–пачатку XX ст.», «Беларусь у кансалідацыйных працэсах станаўлення ВКЛ і Рэчы Паспалітай», «Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі», «Царкоўна прыходскія школы Мінскай епархіі ў сярэдзіне XIX–пачатку XX ст.», «Судовыя ўстановы ніжэйшай інстанцыі на Беларусі. XVI-XVII стст.» і інш.

За мінулыя дзесяцігоддзі ў чытальнай зале Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі працавалі даследчыкі з Польшчы, Латвіі, Літвы, Украіны, Расіі, Францыі, Германіі, Ізраіля, Японіі. Тэматыка даследаванняў: «Гісторыя заходніх абласцей Расійскай імперыі ў кантэксце міжнацыянальных узаемаадносінаў. XIX-XX стст.» (Расія), «Кляштары езуітаў і піяраў. XVIII-XIX стст.» (Літва), «Стараверы Дынабурга, Дзвінска, Даўгаўпілса» (Латвія), «Драгічынская зямля XV-XVIII стст.» (Польшча), «Яўрэйскія абшчыны Магілёўскай, Мінскай губерняў і іх сувязь з яўрэйскімі абшчынамі Чарнігаўскай губерні» (Украіна) і інш.

Удзельнічае архіў у ***навуковых і навукова-практычных канферэнцыях***. Сумесна з Упраўленнем культуры Мінаблвыканкама і Мінскім абласным краязнаўчым музеем была падрыхтавана навукова-практычная канферэнцыя «Мястэчкі Беларусі». Супрацоўнікі архіва выступалі з дакладамі на Міжнародных Карэліцкіх, Скарынаўскіх, Купалаўскіх чытаннях, іншых канферэнцыях па праблемах гісторыка-культурнай спадчыны, даследавання радаводаў вядомых суайчыннікаў, аб знаходках невядомых раней дакументаў, гістарычных крыніц і інш. Геаграфія канферэнцый: Мінск, Беласток, Масква, Цвер, Кіеў, Паставы, Віцебск, Навагрудак, Магілёў, Гомель, Рэчыца, Гродна, Горкі, арганізатарамі якіх былі Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы, Беларускі дзяржаўны універсітэт, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Галоўная дырэкцыя дзяржаўных архіваў Польшчы і інш.

Прымалі супрацоўнікі ўдзел у міжнародных канферэнцыях «Архіў Радзівілаў у публічных зборах» (1994 г., Небарова, Польшча), 21-й канферэнцыі «Генеалогія яўрэяў» (2001 г., Лондан, Вялікабрытанія), 1-й Еўрапейскай канферэнцыі па інфармацыі пра культурную спадчыну (2002 г., Кракаў, Польшча), канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Е. Гедройца (2006 г., Люблін, Польшча) і інш.

Дакументы архіва актыўна выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы перадач Беларускага тэлебачання. Гэта серыя «Падарожжы дылетанта», 15 выпускаў якой прысвечаны гісторыі Нясвіжа, Турава, Ашмянаў, Мазыра, Чачэрска, Магілёва, Міра, Заслаўя і іншых населеных пунктаў, тэлеперадачы па гісторыі сям'і, аб новых дакументах пра жыццё песняра Беларусі Я. Купалы, мастака Марка Шагала, да 100-годдзя першай Мінскай электрастанцыі, пра Мінскую ратушу, Чырвоны касцёл, прадстаўніках роду князёў Радзівілаў, шляхты, аб правядзенні генеалагічных запытаў у архівах. Сумесна з Белтэлерадыёкампаніяй быў падрыхтаваны цыкл тэлеперадач «Дрэва жыцця», прадстаўленай на суісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2000). Выкарыстанне дакументнай інфармацыі ажыццяўляецца ў радыё- і тэлеперадачах, такіх як «Сядзіба ў ваколіцах Мінска», «Сустрэча са старым Менскам», «Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў».

Архіў праводзіць вялікую ***выставачную работу***, у тым ліку сумесна з Нацыянальным музеем гісторыі і культуры Беларусі, Мінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкай імя Я. Купалы, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва. На працягу некалькіх гадоў сумесна з Дэпартаментам па архівах і справаводству былі падрыхтаваны выставы, прысвечаныя Дням беларускай пісьменнасці і друку (Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск і раёны).

Арганізавана вытворчая практыка студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ, якая знаёміць іх з крыніцамі па гісторыі Беларусі, архівазнаўству, крыніцазнаўству, генеалогіі, геральдыцы, сфрагістыцы, палеаграфіі, дапамагае авалодаць метадамі гістарычнага даследавання, старажытнымі мовамі – старабеларускай, старапольскай.

У 2004 г. у архіве быў утвораны **аддзел публікацыі дакументаў,** што значна перамясціла акцэнты ў выкарыстанні дакументаў. За чатыры гады існавання гэтага аддзела адбылася заўважная актывізацыя ў навуковай і публікатарскай дзейнасці архіва, праведзены аналіз перспектыўных навуковых тэм і выданняў, аказана арганізацыйна-метадычная дапамога ўсім удзельнікам падрыхтоўкі зборнікаў, даведнікаў аддзелаў: інфармацыйна-пошукавых сістэм, старажытных актаў, навуковага



выкарыстання дакументаў і інфармацыі.

З 1991 г. архівам падрыхтавана і выдадзена больш за 10 зборнікаў і даведнікаў па гісторыі Беларусі, якія садзейнічаюць духоўнаму адраджэнню, вяртанню забытых культурных каштоўнасцяў. Артыкулы супрацоўнікаў уключаны ў гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць» (гарадоў Мінска, Магілёва, Гродна і інш.), «Энцыклапедыю гісторыі Беларусі», «Энцыклапедыю Вялікага княства Літоўскага». Выступаюць супрацоўнікі і ў сродках масавай інфармацыі, з'яўляюцца аўтарамі артыкулаў, апублікаваных у навуковых зборніках «Архіварыус», «Беларускі археаграфічны штогоднік», часопісах «Архівы і справаводства», «Беларускі гістарычны часопіс» і інш.

Архіў вядзе падрыхтоўку зборнікаў (даведнікаў) і сумесна з іншымі ўстановамі Дзяржаўнай архіўнай службы, прымаючы ўдзел у стварэнні міжархіўных даведнікаў, у тым ліку «Навукова-даведачны апарат дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусі», «Дакументы па гісторыі і культуры яўрэяў у архівах Беларусі» (даведнік), «Віцебшчына архіўная: гісторыя, фонды, персаналіі (сяр. XIX-XX ст.)» і іншых. Сумесна з Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь была праведзена праца па падрыхтоўцы зборнікаў «В. Дунін-Марцінкевіч (1808-1884): да 200-годдзя з дня нараджэння», «Жыццё і творчасць Язэпа Лёсіка». Публікацыйная дзейнасць архіва дазваляе ўводзіць у навуковы ўжытак новыя гістарычныя крыніцы, знаёміць усіх, каму цікавая мінуўшчына, з дакументальнымі матэрыяламі па гісторыі Беларусі за шэсць стагоддзяў, пачынаючы з XIV ст. па пачатак XX ст., а таксама ўносіць пэўны ўклад у развіццё беларускай гістарыяграфіі.

Узноўлена супрацоўніцтва архіва з Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Гэта кансультацыі па розных накірунках, звязаных з гістарычнай навукай, сумесная праца над артыкуламі для зборнікаў, абмеркаванне канцэптуальных пытанняў падрыхтоўкі да друку дакументаў, даведнікаў, рэцэнзаванне артыкулаў і кніг супрацоўнікаў архіва. Сярод навукоўцаў, шчыльна звязаных з НГАБ – дактары гістарычных навук Г.Я. Галенчанка, П.А. Лойка, З.В. Шыбека, Ю.М. Бохан, кандыдаты гістарычных навук М.Я. Спірыдонаў, В.Ф. Голубеў, А.І. Дзярновіч, М.Ф. Шумейка, У.П. Крук, В.У. Скалабан, кандыдаты філалагічных навук В.М. Свяжынскі, І.В. Саверчанка і інш.

Беларусь за сваю шматвекавую гісторыю зведала іншаземныя нашэсці,

унутраныя міжусобныя войны, і шматлікія дакументы апынуліся ў архівах Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы, Латвіі, Францыі, Фінляндыі, Германіі і іншых краін. Праблема вяртання гістарычных дакументаў беларускага паходжання хвалюе і сёння грамадскасць Беларусі. Па магчымасці, у адпаведнасці з дамовамі аб супрацоўніцтве, архіў атрымлівае копіі матэрыялаў па гісторыі Беларусі, якія захоўваюцца ў архівах гэтых краін. Гэта Метрыка Вялікага княства Літоўскага з Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў, дакументы з фонда «Князі Радзівілы» з Галоўнага архіва старажытных актаў Польшчы, а таксама матэрыялы з дзяржаўных гістарычных архіваў С.-Пецярбурга, Літвы, Латвіі.

Пытанні выяўлення і рэстытуцыі дакументаў па гісторыі Беларусі стала знаходзяцца ў полі ўвагі кіраўніцтва архіва. Ужо шмат гадоў вядзецца картатэка матэрыялаў, якія захоўваюцца па-за межамі Беларусі, праводзіцца выяўленне падобных дакументаў у Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў, Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве, іншых замежных сховішчах. У адпаведнасці з Пагадненнем аб супрацоўніцтве паміж Генеральнай дырэкцыяй дзяржаўных архіваў Польшчы і Дзяржаўным камітэтам па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь ад 29 верасня 1992 г. супрацоўнікі архіва працавалі ў Галоўным архіве старажытных актаў з мэтай выяўлення дакументаў па гісторыі Беларусі. Аналагічна супрацоўнікі архіваў Польшчы працавалі ў НГАБ.

Апрача гэтага супрацоўнікі архіва праходзілі стажыроўку ў Ягелонскім універсітэце (па запрашэнні Фонда каралевы Ядзвігі, г. Кракаў), Інстытуце гісторыі мастацтва і культуры Польскай Акадэміі навук (г. Варшава) і іншых навуковых установах Польшчы.

За апошнія дзесяць гадоў архіў наведалі паслы Францыі і Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь, 1-ы сакратар Консульства Ізраіля ў Рэспубліцы Беларусь, група Міжнароднага Таварыства гісторыкаў і даследчыкаў генеалогіі з ЗША, Ізраіля, Канады і іншыя замежныя дэлегацыі. Студэнтамі факультэта журналістыкі Магдэбургскага універсітэта з выкарыстаннем дакументаў архіва ажыццеўлена выдэаздымка сюжэта «Магдэбургскае права ў Беларусі».

Архіў з'яўляецца членам Еўра-Азіяцкага рэгіянальнага аддзялення Міжнароднай рады архіваў (ЕЎРАЗІКА), у сувязі з чым дырэктар прымала ўдзел у пасяджэннях Кансультатыўнай рады кіраўнікоў дзяржаўных архіўных служб дзяржаў-удзельнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў і рабоце 4-й (г. Мінск, 2003), 6-й (г. Львоў, 2005) і 7-й (г. Ерэван, 2006) Агульных канферэнцыях ЕЎРАЗІКІ.

Дырэктар архіва прыняла ўдзел у 2-м Пасяджэнні беларуска-германскай Змешанай камісіі па культурным супрацоўніцтве ў Берліне (2002 г.); у межах супрацоўніцтва паміж архівамі Рэспублікі Беларусь і Федэральнай рэспублікі Германія наведала Бундэсархіў (г. Кобленц, 2005 г.) з мэтай вывучэння складу дакументаў роду князёў Радзівілаў. У выніку архіву перададзена копія вопіса дакументаў фонда «Княжацкі Радзівілаўскі архіў у Нясвіжы, уключаючы дакументы былога кіраўніцтва маёнткамі Вітгенштэйнаў», якія захоўваюцца ў Бундэсархіве.



Архіў удзельнічае таксама ў ***міжнародных праектах***. У цяперашні час вядзецца работа па праекце «Віртуальная рэканструкцыя архіва князёў Радзівілаў», мэтай якога з'яўляецца прадстаўленне багацейшых, але разрозненых матэрыялаў архіва роду князёў Радзівілаў міжнароднай навуковай грамадскасці, а таксама забеспячэнне эфектыўнага доступу да згаданых матэрыялаў шляхам іх публікацыі ў сетцы Інтэрнэт.

Для калегіяльнага абмеркавання і прыняцця рашэнняў па пытаннях дзейнасці архіва створана **дырэкцыя**. Асноўная задача дырэкцыі – ажыццяўленне мер па забеспячэнні эфектыўнай і якаснай дзейнасці архіва, паспяховага выканання плана і распрацаваных мерапрыемстваў. Дырэкцыяй архіва разглядаюцца пытанні арганізацыі і стану архіва, прымаюцца рашэнні аб перспектывах працы архіва ў цэлым і па асобных накірунках: развіцця навукова-даведачнага апарата і дзяржаўнага ўліку дакументаў, аўтаматызацыі архіва, публікацыйнай дзейнасці; ажыццяўляецца кантроль выканання перспектыўных і бягучых планаў архіва, якасці працы, выканальніцкай дысцыпліны і інш. Павестка дня ўключае праблемы работы навукова-дарадчых органаў, кадравыя пытанні, абагульненне назапашанага вопыту, паляпшэнне ўмоў працы супрацоўнікаў, развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы і фінансавага забеспячэння архіва, іншыя пытанні, прадугледжаныя Статутам архіва.

Гісторыя і сучаснасць арганічна ўключаюць спадчыну мінуўшчыны. Супрацоўнікі архіва – гэта перш за ўсё людзі, якія валодаюць ведамі, многія – вопытам працы, бязмежна любяць сваю прафесію. Перадаюць свой вопыт ветэраны архіўнай справы: Г.Я. Акуловіч, А.Ф. Аляксандрава, С.Я. Трацэўская, Г.В. Барсукова, Т.В. Елісеева, Т.М. Коцік, Л.Д. Гусакова. Пятнаццаць гадоў і больш таму назад прыйшлі ў архіў Н.А. Барсукова, І.Л. Вернер, А.А. Лашкевіч, І.М. Бобер, С.А. Рыбчонак, Н.М. Аліпчанка. На змену старэйшаму пакаленню, такім як загадчыкі аддзелаў Г.А. Станкевіч, А.Ф. Аляксандрава, прыйшлі новыя супрацоўнікі – В.У. Бабкова (аддзел старажытных актаў), Г.М. Кутукова (аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў), В.А. Ходзіна (аддзел навуковага

выкарыстання дакументаў і інфармацыі). Створаны ў архіве аддзел аўтаматызаваных архіўных тэхналогій узначаліла Т.С. Міхяёнак, аддзел публікацыі дакументаў – З.Л. Яцкевіч.

Змяняецца склад аддзелаў, аднак супрацоўнікі архіва па-ранейшаму валодаюць ведамі па гісторыі, спецыяльных гістарычных дысцыплінах (генеалогіі, геральдыцы, палеаграфіі і інш.), валодаюць метадамі навуковага даследавання. Больш за 10 гадоў працуюць у архіве А.Л. Грывянёў, В.М. Дзянісаў, Л.М. Лісава, Г.М. Брэгер, С.М. Хлябіч. Хочацца спадзявацца, што надоўга атрымалі «прапіску» ў архіве В.І. Зяньковіч, В.А. Астапава, В.Л. Сядзельнікава, А.В. Груша, В.В. Кавалеўская, У.Л. Казлоў, А.Я. Гаршкова, Н.Ф. Хар'янава, І.У. Пакрасенка, А.А. Лютарэвіч, Н.А. Бабіч, М.Т. Скіданава і іншыя.

У мэтах забеспячэння неабходнага ўзроўню выкарыстання наяўнай інфармацыі ў архіве ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі працуючых спецыялістаў. Прайшлі падрыхтоўку ў аспірантуры Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Дз.В. Лісейчыкаў, Дз.Ч. Матвейчык, у аспірантуры пры БелНДІДАС вучацца З.В. Антановіч, З.Л. Яцкевіч. Спалучаюць працу ў архіве з вучобай у Беларускім дзяржаўным універсітэце Н.М. Статкевіч, В.В. Урублеўскі, А.С. Макарэвіч, Е.А. Аніскевіч.

Прапрацаваўшы ў разнастайных галінах народнай гаспадаркі і іншых архівах, прыйшлі ў архіў В.Х. Канаваленка, Л.М. Ліпская, Н.І. Місевіч, Н.В. Ваўчок, М.І. Блашкова, А.М. Гесь, Т.А. Навіцкая, Я.К. Анішчанка, Я.П. Насытка, В.В. Пахомава, Л.С. Іванова, Т.М. Абрамовіч. Забеспячэнне працы будынка, абсталявання падтрымлівае інжынерная служба пад кіраўніцтвам галоўнага інжынера І.К. Парабковіча з удзелам П.В. Кістэрнага, С.У. Сапачова і ветэрана архіва М.М. Трубнікава. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, падтрыманне чысціні ў архівасховішчах і ахова будынка ляжаць на плячах загадчыка адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела Л.К. Матус, прыбіральшчыкаў службовых памяшканняў В.Я. Панамаровай, В.І. Туліца, З.С. Зелянко, Т.І. Скібіцкай, вахцёраў Т.Э. Гнаценка, В.Ф. Трус. Забяспечваюць распрацоўку прагнозных паказчыкаў развіцця архіва, улік фінансавых аперацый, правільнае расходаванне бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў, рыхтуюць бухгалтарскую справаздачнасць галоўны бухгалтар Р.Ф. Бабіч, вядучы бухгалтар Т.А. Матук, вядучы эканаміст А.Н. Лаўрэнава. Добрым словам мы ўзгадваем сёння тых архівістаў, хто пайшоў на заслужаны адпачынак – Т.Я. Лявонцьеву, Г.А. Станкевіч, І.Л. Новікаву, Я.І. Юцэвіч, Н.М. Леўчык, Л.А. Кавалёву, хто перайшоў



на працу ў Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь – У.П. Крука, Т.І. Седлярэвіч, Г.С. Жаўняркевіча. У архіве выраслі кадры для Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (А.І. Груша), Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (А.М. Латушкін), Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта (У.І. Кананові). Папоўнілі архівы ведамстваў, перайшлі ў іншыя арганізацыі, пакінуўшы добры след у архіве, І.І. Сухаверх, М.М. Ульянава, І.М. Шпілеўская, І.Г. Карнеева, Т.Ю. Капіца, М.Г. Кныш, Н.Г. Бартасевіч, І.Г. Панасюк, Р.В. Ініна, Г.А. Прыка, С.С. Ваўковіч, С.М. Корбут і іншыя супрацоўнікі.

Мінуў час, калі пра архіў казалі як пра штосьці далёкае ад жыцця. Сёння, гаворачы пра архіў, можна сказаць, што ён – гэта мы, захавальнікі гісторыі. Менавіта стварэнне 70 гадоў таму Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі дазваляе захаваць нацыянальны фонд «гістарычнай памяці» Беларусі, данесці яго нашым сучаснікам і перадаць наступным пакаленням.

*А.К. Галубовіч, Л.М. Лісава*

# НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ

## НАВУКОВАЯ І ЭКСПЕРТНА-МЕТАДЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АРХІВА

### Вучоны савет

Архіў – не толькі сховішча дакументаў, але і своеасаблівы навукова-даследчы цэнтр, дзе разам з забеспячэннем захаванасці дакументаў адным з галоўных накірункаў дзейнасці з'яўляецца правядзенне навуковых даследаванняў. Пры гэтым натуральным выглядае стварэнне ў архіве асобнага органа, які б ажыццяўляў кіраўніцтва і каардынацыю навуковай дзейнасці архіва. Менавіта такім органам з'яўляецца на сённяшні дзень Вучоны савет.

Вучоны савет (Навуковы савет) быў заснаваны 26 красавіка 1946 г. у адпаведнасці з загадам № 24 начальніка ЦДГА МУС БССР Канстанціна Пятровіча Пятрова[1]. Членамі Вучонага савета былі абраны наступныя супрацоўнікі: К.П. Пятроў (старшыня), намеснік начальніка ЦДГА МУС БССР П.М. Казлоў (намеснік старшыні), начальнік аддзела агульных фондаў, старшы навуковы супрацоўнік Д.І. Розін, начальнік чытальнай залы навуковы супрацоўнік Г.Ц. Гузанаў (сакратар), начальнік аддзела сакрэтных фондаў, старшы навуковы супрацоўнік А.М. Горбач, начальнік аддзела навукова-даведачнай літаратуры, старшы навуковы супрацоўнік Г.У. Нізаўцова, а таксама вырашана запрасіць дырэктара Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута Кірылава. Пасяджэнні Вучонага савета павінны праводзіцца адзін-два разы на месяц. Намесніку старшыні П.М. Казлову і сакратару Г.Ц. Гузанаву неабходна было скласці план працы Вучонага савета і падаць яго на разгляд да 10 мая 1946 г.

У 1947 г. праводзілася выяўленне і археаграфічная апрацоўка дакументаў у адпаведнасці з некалькімі тэмамі. У выніку апрацаваны 81 дакумент для ўключэння ў зборнік «Рэвалюцыя 1905-1907 гг. у Беларусі», 67 дакументаў для зборніка «Да ўсталявання савецкай улады на Беларусі», 339 дакументаў па тэме «Стан народнай адукацыі ў Магілёўскай губерні ў XIX і пачатку XX ст.», 14 дакументаў па тэме «Сялянскі рух у першай палове XIX ст. і рэформа 1861 года ў Магілёўскай

[1] НГАБ. Ф. 251 (бягучы архіў, далей - ба). Воп. 1. Спр. 2. Арк. 8 адв.-9.



губерні» і 137 дакументаў па іншых тэмах[2].

Паводле пратаколаў пасяджэнняў Вучонага савета за 1950 г. у яго склад уваходзілі начальнік ЦДГА, яго намеснік па навуковай частцы, навуковыя і старшыя навуковыя супрацоўнікі архіва, начальнік Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці і яго намеснік, дырэктар Магілёўскага педінстытута, яго намеснік і некалькі супрацоўнікаў гэтага інстытута, прадстаўнікі магілёўскіх абласнога і гарадскога камітэтаў КП(б)Б і ЛКСМБ, начальнік і супрацоўнік Архіўнага аддзела Упраўлення МУС, дырэктар краязнаўчага музея, некаторыя іншыя прадстаўнікі навуковай грамадскасці; усяго – 24 чалавекі. У 1951 г. пры абмеркаванні зборніка «Сялянскі рух на Беларусі пасля адмены прыгоннага права» быў запрошаны супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР[3]. Савет займаўся абмеркаваннем падрыхтаваных супрацоўнікамі архіва навуковых прац і зборнікаў дакументаў. Напрыклад, 22 сакавіка 1950 г. абмяркоўваўся артыкул Яцунскага (назва невядомая), а 1 жніўня – ход працы над падрыхтоўкай зборніка «Дакументы і матэрыялы аб школе Магілёўскай губерні з сярэдзіны XIX і пачатку XX ст.»[4].

У 50-х–70-х гг. накірункі працы Вучонага савета не змяняліся, але яго дзейнасць часам істотна запавольвалася. Напрыклад, за 1960-1962 гг. было праведзена толькі два яго пасяджэнні, на якіх абмяркоўваліся падрыхтаваны супрацоўнікамі архіва гісторыка-эканамічны нарыс г. Оршы і дзве главы манаграфіі «Магілёўская вобласць», якую рыхтавалі выкладчыкі Магілёўскага педагагічнага інстытута[5].

На працягу ўсяго савецкага часу супрацоўнікі архіва прымалі ўдзел у распрацоўцы дакументаў з мэтамі іх публікацыі ці падрыхтоўцы на падставе іх навуковых ці навукова-папулярных прац. У гэты перыяд выразна пераважалі тэмы, звязаныя з сацыяльна-эканамічным развіццём Беларусі, разгортваннем сялянскага і рэвалюцыйнага руху на яе землях у другой палове XIX–пачатку XX ст., таксама ўвага надавалася гісторыі асобных гарадоў і іншых населеных пунктаў. З канца 70-х гг. пачынае актыўна распрацоўвацца тэма «Гербы беларускіх гарадоў»[6]. На падставе распрацовак былі падрыхтаваны некалькі зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, рэгулярна публікаваліся артыкулы ў навуковых і навукова-публіцыстычных выданнях (гл. спіс публікацый супрацоўнікаў архіва).

У 1980 г. з мэтай паляпшэння ўзаемадзеяння паміж архівам і іншымі навуковымі ўстановамі і асобнымі грамадзянамі ў архіве адбылася сумесная

[2] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 10. Арк. 21.
[3] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 34. Арк. 48.
[4] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 25. Арк. 1-1 адв., 5-7.
[5] НАРБ, Ф. 251. Воп. 3. Спр. 103. Арк. 16.
[6] НАРБ, Ф. 251. Воп. 3. Спр. 103. Арк. 14-19; Спр. 286. Арк. 3-7.

канферэнцыя супрацоўнікаў архіва і беларускіх навукоўцаў. У ёй прынялі ўдзел будучыя вядомыя айчынныя навукоўцы, а тады маладыя даследчыкі – кандыдат гістарычных навук З.В. Шыбека, кандыдат мастацтвазнаўства Н.Ф. Высоцкая, В.У. Скалабан і інш. Падчас канферэнцыі навукоўцы выказалі падзяку супрацоўнікам архіва за дапамогу у працы, а таксама шмат пажаданняў, многія з якіх у далейшым рэалізаваны архівістамі[7]. Была адзначана вялікая публікацыйная праца архіва, якая вядзецца сумесна з навукоўцамі інстытута гісторыі АН БССР. Напрыклад, доктар гістарычных навук З.Ю. Капыскі быў галоўным рэдактарам даведніка па архіву[8], дактатары гістарычных навук Я.М. Карпачоў і П.Р. Козловский і кандыдат гістарычных навук Э.М. Савіцкі ўдзельнічалі ў працы над шэрагам зборнікаў дакументаў. Падкрэслівалася таксама заслуга архіва ў падрыхтоўцы і выданні чацвёртага тома зборніка дакументаў «Беларусь у эпоху феадалізму», які завяршыў серыйнае выданне дакументаў па дадзенай тэматыцы, і першага тома серыйнага выдання «Інвентары магнацкіх уладанняў Беларусі XVII-XVIII стст.», які прысвячаўся Смаргоні[9]. Надрукаваныя матэрыялы былі ацэнены на канферэнцыі як каштоўная крыніцавая база для гістарычных даследаванняў, якія карыстаюцца вялікім попытам у навукоўцаў і аматараў айчыннай гісторыі. Сярод іншага заўважалася, што застаюцца яшчэ не ўведзенымі ў навуковы ўжытак каштоўныя комплексы архіўных матэрыялаў, і супрацоўнікаў архіва яшчэ чакае вялікая праца па іх апублікаванні. Як станоўчы момант адзначаўся працяг удзелу архіва ў падрыхтоўцы да выдання яшчэ некалькіх зборнікаў дакументаў – «Сацыяльна-палітычная барацьба народных мас Беларусі. Канец XIV ст. – 1648 г.» (т. 1), «Беларусь у эпоху капіталізму» (т. 1), «Рэвалюцыйны рух на Беларусі, ліпень 1907 – люты 1917 г.)» (т. 1), «Інвентары магнацкіх валоданняў Беларусі XVII-XVIII стст. Валоданне Цімкавічы» (гл. артыкул, прысвечаны аддзелу публікацыі дакументаў і спіс публікацый супрацоўнікаў архіва).

На пачатку 80-х гг. у адпаведнасці з «Палажэннем аб ЦДГА БССР у г. Мінску» прадугледжвалася функцыянаванне пры архіве Навуковага савета. У сувязі з гэтым намеснікам дырэктара архіва Э.Л. Казлоўскай было падрыхтавана «Палажэнне аб Навуковым савеце ЦДГА БССР у г. Мінску». 31 студзеня 1983 г. яно было абмеркавана і прынята на пасяджэнні экспертна-метадычнай камісіі. Навуковы савет дзейнічаў на правах дарадчага органа для калегіяльнага разгляду і каардынацыі асноўных пытанняў навуковай і

[7] НАРБ. Ф. 241. Воп. 3. Спр. 296. Арк. 1-5.

[8] Центральный государственный исторический архив БССР в Минске. Путеводитель. Мн.: Изд. «Полымя», 1974. 336 с.

[9] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. IV. Мн., 1978; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв. Владение Сморгонь. Мн., 1977.



навукова-арганізацыйнай дзейнасці архіва, садзейнічання павышэнню яе эфектыўнасці і якасці, умацавання і развіцця сувязей з навуковай грамадскасцю. Старшынёй Савета з'яўляўся дырэктар архіва, яго намеснікам – намеснік дырэктара, сакратаром – адзін з членаў Савета. Таксама ў яго склад ўваходзілі кіраўнікі структурных падраздзяленняў, высокакваліфікаваныя навуковыя супрацоўнікі і вядучыя спецыялісты архіва, прадстаўнікі Галоўархіва БССР, іншых дзяржаўных архіваў, навукова-даследчых інстытутаў, ВНУ і навуковых устаноў. У склад Навуковага савета ўвайшлі П.М. Судзілоўскі (старшыня), Э.Л. Казлоўская (намеснік старшыні), Т.М. Лініч (сакратар), Я.Л. Бравер, Т.А. Вераб'ёва, Г.Я. Галенчанка, Н.М. Леўчык, Т.Е. Лявонцьева, Э.М. Савіцкі, В.Д. Селяменеў, З.В. Шыбека[10].

Асноўнымі задачамі Навуковага савета з'яўляліся:

1) вызначэнне асноўных накірункаў навуковай дзейнасці архіва;

2) разгляд і ацэнка навуковай працы і праблемных пытанняў дзейнасці архіва ў галінах:

– архівазнаўства, археаграфіі і іншых сумежных навуковых дысцыплін; навукова-інфармацыйнай дзейнасці;

– камплектавання і экспертызы навуковай каштоўнасці дакументаў;

– захаванасці і забеспячэння захаванасці дакументаў;

– навуковай арганізацыі працы, вывучэння, абагульнення і распаўсюджання перадавога вопыту работы архіўных устаноў краіны, прафесійнай падрыхтоўкі кадраў, а таксама іншых прынцыповых пытанняў, звязаных з дзейнасцю архіва.

Свае пасяджэнні Навуковы савет павінен быў праводзіць не радзей за адзін раз на год, а яго ход фіксаваць пратаколам[11]. Тэкст тагачаснага «Палажэння» з невялікімі зменамі паўтораны ў «Палажэнні аб Навуковым савеце Нацыянальнага гістарыянага архіва Беларусі» ад 2000 г. і ў «Палажэнні аб Вучоным савеце архіва» ад 2006 г.

Важнай падзеяй у навуковай працы архіва стала зацвярджэнне 1996 г. планаў-праспектаў, праграм і методык даследванняў шэрагу навуковых тэм – «Генеалогія і геральдыка беларускай шляхты» (адказны за выкананне – С.А. Рыбчонак), «Беларусь у актавых кнігах XVI-XVIII стст.» (адказны за выкананне – З.Л. Яцкевіч)[12].

У 2000 г. у склад Навуковага савета ўваходзіла 17 чалавек. На яго пасяджэннях у гэтым годзе разглядаўся цэлы шэраг пытанняў, звязаных з навуковай і навукова-папулярызатарскай дзейнасцю. У студзені былі

[10] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 332. Арк. 1-5.

[11] Тамсама. Арк. 2-3.

[12] Отчет об исполнении плана развития архивного дела за 1998 год и приложения к нему; Паспорт архива на 01.01.1999 // НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 49. Арк. 4.

праведзены два пасяджэнні, на якіх абмяркоўвалася вылучэнне аўтарскага калектыва цыкла тэлеперадач «Дрэва жыцця», створанага на падставе дакументаў архіва, на суісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. У выніку гарачых дыскусій было вырашана рэкамендаваць калектыў на суісканне гэтай прэміі. У верасні гэтага ж года было праведзена трэцяе пасяджэнне, на якім абмяркоўваліся падрыхтаваны З.Л. Яцкевічам «Малы гербоўнік шляхты Рагачоўскай правінцыі» (рэкамендаваны да друку) і зацвярджаліся канцэпцыі і планы шэрагу навуковых тэм – «Гісторыя дзяржаўных устаноў ВКЛ на падставе дакументаў НГАБ XVI-XVIII стст.» (адказны за выкананне – З.Л. Яцкевіч), «Сфрагістыка і геральдыка Беларусі» (выканаўца – А.У. Леўчык), «Крыніцы па гісторыі горадабудаўніцтва і архітэктуры Беларусі» (выканаўца – У.М. Дзянісаў), «Прысутнасць іншаземных падданых на тэрыторыі Беларусі» (І.Л. Вернер), «Шляхта Ашмянскага павета ВКЛ у сярэдзіне 2-й паловы XVI ст.» (Г.М. Брэгер). У наступныя гады зацверджаны і іншыя навуковыя тэмы – «Гісторыя дзяржаўных устаноў Расійскай імперыі» (адказны за выкананне – Т.Я. Лявонцьева), «Плыні неартадаксальнага праваслаўя на Беларусі» (выканаўца – В.А. Ходзіна) і інш.

Накірункі працы Вучонага савета, закладзеныя ў «Палажэнні» аб ім, рэалізоўваліся на практыцы цалкам. На яго пасяджэннях у 2001-2007 гг. абмяркоўваліся падрыхтаваныя архівам да друку зборнікі артыкулаў альбо дакументаў, планы-праспекты навуковых тэм, справаздачы аб праведзенай навуковай працы па ўжо зацверджаных тэмах.

Усе артыкулы, якія напісаны супрацоўнікамі архіва і плануюцца да друку ў выданнях, рэкамендаваных ВАК Беларусі, перад падачай у рэдакцыю атрымоўваюць рэкамендацыю Вучонага савета. Напрыклад, за апошнія гады такія рэкамендацыі атрымалі З.В. Антановіч, Дз.В. Лісейчыкаў, Дз.Ч. Матвейчык, С.А. Рыбчонак, З.Л. Яцкевіч[13] і інш. Тое ж тычыцца зборнікаў артыкулаў і дакументаў, на якіх ставіцца адпаведны грыф – «Рэкамендавана да друку Вучоным саветам Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі». Вынікам працы архіва сталі шэраг зборнікаў, якія

[13] Лісейчыкаў Дз.В. Фрагмент асабістага архіва прафесара Полацкай духоўнай семінарыі Адама Тамковіда // БАШ. Вып. 8. Мн.: БелНДІДАС, 2007. С. 140-150; Матвейчык Дз.Ч. Рукапісныя дакументы Таварыства Літоўскага і Рускіх Зямель і Таварыства Братэрскага Аб'яднання ў бібліятэчных сховішчах Польшы // БАШ. Вып. 8. Мн.: БелНДІДАС, 2007. С. 89-102; Рыбчонак С.А. Комплекс рэвізскіх сказак у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі // БАШ. Вып. 8. Мн.: БелНДІДАС, 2007. С. 47-54; Рыбчонок С.А. Комплексы основных генеалогических источников в Национальном историческом архиве Беларуси // АіС. 2007. № 5. С. 88-95; Яцкевіч З.Л., Антановіч З.В. Судовыя пратаколы рыма-каталіцкіх кансісторый Беларусі як крыніцы па справаводству канца XVIII–пачатку XX стагоддзя // АіС. 2007. № 6. С. 111-115.



таксама былі рэкамендаваны да друку Вучоным саветам[14].

У 2007 г. на пасяджэнні Савета былі абмеркаваны некалькі падрыхтаваных супрацоўнікамі архіва навуковых прац і зборнікаў – «Гербоўнік беларускай шляхты» (т. 2 – літара «Б»), 5-ы выпуск штогодніка «Архіварыус», у якім апублікаваны 10 артыкулаў супрацоўнікаў архіва і тры артыкулы на прадмет іх рэкамендацыі да друку ў іншых часопісах. Па ўсіх пытаннях вынесены станоўчыя рашэнні. Таксама была заслухана і прынята справаздача пра ход падрыхтоўкі да выдання зборнікаў дакументаў «Тэстаменты XVI ст. па дакументах актавых кніг» і «Витебская губерния: Государственные, религиозные и общественные учреждения».

Паводле загаду Дырэктара архіва ад 21 сакавіка 2008 г. у склад Савета ўваходзяць: А.К. Галубовіч (старшыня), Л.М. Лісава (намеснік), загадчыкі аддзелаў і супрацоўнікі архіва В.У. Бабкова (сакратар), Г.Я. Акуловіч, В.А. Ходзіна, З.Л. Яцкевіч, У.М. Дзянісаў, Я.К. Анішчанка, прадстаўнік Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі РБ, кандыдат гістарычных навук У.П. Крук, дырэктар БелНДІДАС, кандыдат гістарычных навук А.Я. Рыбакоў, намеснік дырэктара па навуковай працы БелНДІДАС, кандыдат гістарычных навук С.У. Жумар, дырэктар БелНДЦЭД, кандыдат гістарычных навук В.Л. Насевіч, прафесар БДЭУ, доктар гістарычных навук Ю.М. Бохан, загадчык аддзела публікацыі дакументаў НАРБ, кандыдат гістарычных навук В.У. Скалабан, дырэктар БелНДЦЭД, прафесар БДЭУ, доктар гістарычных навук З.В. Шыбека, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў і пачатку новага часу Інстытута гісторыі НАНБ, доктар гістарычных навук Г.Я. Галенчанка, дацэнт БДУ, кандыдат гістарычных навук М.Ф. Шумейка (усяго – 17 чалавек).

Такім чынам, за больш чым паўвекавы шлях сваёй гісторыі Вучоны савет шмат зрабіў для станаўлення навуковай працы ў архіве і дасягнення адпаведнага яе ўзроўню. Падрыхтаваныя супрацоўнікамі архіва публікацыі праходзяць абмеркаванне і зацвярджаюцца на яго пасяджэннях, набываюць больш высокую навуковую якасць і вядомасць.

*Дз.Ч. Матвейчык, З.Л. Яцкевіч*

[14] Архіварыус. Вып. 1-6. Мн., 2001-2007; Минская губерния: Государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917 гг.) / Сост. Т.Е. Леонтьева. Мн.: БелНИИДАД, 2006. 392 с.: ил.; Гербоўнік беларускай шляхты / Уклад. С. Рыбчонак [і інш.]. Т. 1-2. Мн.: НАРБ, 2002-2007, і інш.

## Экспертная і метадычная камісіі

На працягу доўгага часу ў архіве не існавала адзінай эспертна-метадычнай камісіі, а навукова-метадычная праца і экспертыза дакументаў праводзіліся як асобныя віды дзейнасці.

У першы пасляваенны час архіў апынуўся ў складанай сітуацыі, адной з характэрных рыс якой была адсутнасць кваліфікаваных кадраў у галіне архіўнай справы. На 1944 год большасць супрацоўнікаў працавала ў архіве ўпершыню. Толькі адзін супрацоўнік меў 10-гадовы стаж працы. Таму ў гэты час метадычная праца ў архіве заключалася ў мерапрыемствах па павышэнні кваліфікацыі працаўнікоў. У прыватнасці, былі праведзены заняткі па тэхнічнаму мінімуму, уведзены адзіныя дзённікі ўліку працоўнага часу, наладжаны прыём і ўлік заінвентарызаваных дакументальных матэрыялаў і праверка якасці праведзенай працы з імі[1]. У 1945 г. трое супрацоўнікаў наведалі 3-месячныя курсы для навукова-кіруючых работнікаў[2].

Разам з вяртаннем дакументаў у ЦДГА была створана экспертная камісія, якая павінна была ацэньваць архіўныя справы на прадмет іх каштоўнасці і вызначаць тыя дакументы, якія не павінны былі захоўвацца ў далейшым - правесці т.зв. экспертызу каштоўнасці. Напрыклад, у 1947 г. для спісання прызначаліся 1428 такіх спраў. Паралельна з працэсам знішчэння праводілася ў архіве праца па апісанні фондаў і спраў, якія “вытрымалі” экспертызу. У гэтым жа 1947 г. у якасці метадычнай працы былі складзены 39 гістарычных даведак, 9 аглядаў фондаў і 12 характарыстык фондаў[3].

За 1948 г. экспертнай камісіяй для спісання спраў дарэвалюцыйнага перыяду на макулатуру былі выдзелены 1185 спраў з ЦДГА, а таксама аказана дапамога ў экспертызе Дзяржаўнаму архіву Мінскай вобласці, у выніку чаго да спісання былі прызначаны яшчэ 1426 спраў. Усе спісы такіх спраў былі зацверджаны ў Архіўным упраўленні МУС БССР. Пры гэтым, як адзначана ў справаздачы архіва за 1948 г., “экспертная камісія ЦДГА ўкамплектавана дастаткова падрыхтаванымі навуковымі супрацоўнікамі, работа па экспертызе каштоўнасці дакументальных матэрыялаў на ўсіх этапах праводзілася кваліфікаванымі супрацоўнікамі,

[1] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 1. Арк. 1 адв.-2.
[2] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 4. Арк. 14 адв.
[3] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 10. Арк. 20.



добра знаёмымі са складам фондаў архіва”[4].

Як адзначана ў справаздачы архіва за 1950 г., у ім існаваў асобны метадычны кабінет, дзе, “у мэтах стварэння ўмоў для падняцця навуковага ўзроўня ўсёй праводзімай работы ў архіве”, была сканцэнтравана неабходная літаратура па пытаннях архівазнаўства. Тут жа былі прадстаўлены шэраг форм і наглядных удалых прыкладаў па стварэнні схем афармлення спраў і складання іх загалоўкаў, вопісаў, картак для ўказальнікаў і г.д., а таксама ўдала складзеныя інвентарныя вопісы, рабочыя інструкцыі і г.д. Праводзіліся метадычным кабінетам і кансультацыі[5].

У гэтым жа годзе экспертнай камісіяй архіва былі прызначаны да спісання 5286 спраў і 300 кг россыпу, аднак Архіўным упраўленнем МУС БССР былі зацверджаны не ўсе з іх, а 3924 спраў і 300 кг россыпу. Усё гэта складала 1 тону 259 кг, якія ў якасці макулатуры былі перададзены органам “Союзутиля”[6]. У наступным, 1951 годзе, падобная аперацыя была праведзена экспертнай камісіяй з 1360-цю справамі і 91 кг россыпу (1 тона 369 кг)[7].

Асноўным накірункам навукова-метадычнай працы архіва ў 1950-х–1960-х гг. было складанне рабочых інструкцый і распрацоўка схем сістэматызацыі спраў у межах “вялікіх” фондаў, вострая патрэба ў якіх адчувалася ў працэсе апрацоўкі фондаў. Немалая ўвага надавалася напісанню метадычных дапаможнікаў, якія перад ужываннем праходзілі абмеркаванне на навукова-метадычных нарадах, а таксама схем класіфікацыі дакументальнай інфармацыі для складання прадметна-тэматычнага і асабовага каталогаў[8].

У 60-х гг. на метадычных нарадах усё часцей абмяркоўваюцца планы-праспекты разнастайных выданняў (напрыклад, гісторыка-эканамічнага нарыса г. Оршы), тэксты экскурсій для выстаў, падрыхтаваных паводле матэрыялаў архіва[9]. Назапашаны багаж метадычных дапаможнікаў і рабочых інструкцый за 1944-1962 гг. прывёў да неабходнасці яго сістэматызацыі, вынікам чаго стала стварэнне ў 1962 г. тэматычнай картатэкі метадычных дапаможнікаў, куды былі ўключаны 364 карткі[10].

[4] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 14. Арк. 17.
[5] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 27. Арк. 7-8.
[6] Тамсама. Арк. 9.
[7] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 34. Арк. 46.
[8] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 56. Арк. 41-42; Ф. 251. Воп. 3. Спр. 87. Арк. 45-46.
[9] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 92. Арк. 60.
[10] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 104. Арк. 65.

У 60-х гг. працягвала праводзіцца экспертыза каштоўнасці дакументаў, хаця ў гэты час яна набыла нашмат меншыя памеры, чым гэта было ў папярэдні перыяд. Напрыклад, у 1962 г. было спісана на макулатуру 40 спраў[11].

У сакавіку 1964 г. у архіве была створана асобная метадычная камісія. У яе склад увайшлі ўсе начальнікі аддзелаў і намеснік начальніка архіва[12]. Асноўнымі формамі метадычнай працы ў архіве былі:

– складанне рабочых інструкцый, гістарычных даведак;

– правядзенне метадычных нарад;

– правядзенне заняткаў па павышэнню працоўнай кваліфікацыі[13].

Расшыралася тэматыка пытанняў, якія абмяркоўваліся на метадычных нарадах. Напрыклад, у 1966 г. на 6-ці пасяджэннях метадычнай камісіі была абмеркавана памятка па складанні тэматычных картак для каталога архіва, план выкарыстання дакументаў архіва ў сувязі са святкаваннем 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., метадычныя ўказанні па стварэнні навукова-даведачнага апарата да старажытных актаў, пералікі тыповых загалоўкаў да фонда 242, праект «Слоўніка архіўных тэрмінаў», метадычныя ўказанні па падрыхтоўцы дакументаў на мікрафільмаванне[14]. У далейшым тэматыка расшыралася яшчэ больш, абмяркоўваліся даклады супрацоўнікаў архіва на канферэнцыях, схемы шляхаводнікаў і класіфікацыі дакументальных матэрыялаў, праспекты выстаў, планы-праспекты мерапрыемстваў, праекты нарматыўных дакументаў і інш. Картатэка метадычных дапаможнікаў рэгулярна папаўнялася артыкуламі і паведамленнямі архівазнаўчага характару[15]. Супрацоўнікі архіва прымалі ўдзел у працы метадычнай камісіі Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР[16].

У 1970 г. двое супрацоўнікаў архіва (Э.І. Булдакова і А.Г. Азарава ) удзельнічалі ў нарадзе-семінары ў г. Гродна па пытаннях стварэння і ўдасканалення навукова-даведачнага апарата, дзе выступілі з дакладамі па методыцы і практыцы арганізацыі НДА ў ЦДГА БССР у Мінску[17].

У пяцігодку 1976-1980 гг. была па-іншаму сфармулявана асноўная задача метадычнай працы архіва. Цяпер яна заключалася ў «своечасовым забеспячэнні метадычнымі дапаможнікамі ўсіх удзельнікаў практычнай

[11] Тамсама.
[12] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 110. Арк. 72.
[13] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 128. Арк. 71.
[14] Тамсама. Арк. 72.
[15] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 141. Арк. 45; Спр. 165. Арк. 75.
[16] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 174. Арк. 5; Спр. 232. Арк. 2.
[17] Тамсама. С. 3-5.



дзейнасці архіва». За гэты час былі падрыхтаваны 16 метадычных дапаможнікаў і 2 агляды фондаў. У гэтых жа гадах былі праведзены 20 пасяджэнняў метадычнай камісіі, на якіх разгледжаны 26 пытанняў – абмеркаваны падрыхтаваныя метадычныя дапаможнікі і агляды, вынікі навуковых распрацовак, палажэнні аб СІФе і аддзелах архіва, пасадныя інстукцыі супрацоўнікаў, планаванне ўдасканаленняў вопісаў, перагляд спіса фондаў у сувязі з удасканаленнем катэгарыйнасці фондаў і інш. Працягвалася практыка экспертызы каштоўнасці дакументаў і выдзялення “непатрэбных” да знішчэння. У 1976-1980 гг. было знішчана 2143 справы[18].

У 1981-1985 гг. метадычная і экспертная камісіі былі аб’яднаны ў адзіную экспертна-метадычную камісію (ЭМК). Як сведчаць некаторыя пратаколы пасяджэнняў за 1983 г., яна займалася абмеркаваннем палажэння аб Навуковай радзе ЦДГА БССР у Мінску і яго складзе, разглядам рабочай інструкцыі па ўдасканаленні вопісаў ф. 694, накірунка і хода працы па складанні ўказальнікаў (прадметнага, асабовага, геаграфічнага), актаў на знішчэнне спраў і тэматычных картак пасля правядзення экспертызы іх каштоўнасці і інш. У гэтым годзе ў склад ЭМК уваходзілі Я.Л. Бравер, С.Д. Грыневіч, Н.В. Кальцова, Т.Е. Лявонцьева, Н.М. Леўчык, Б.З. Прыгожына, Г.А. Станкевіч, А.К. Цітоў, М.М. Ульянава.[19] У 1985 г. у архіве сярод іншых распрацоўвалася асобная навуковая тэма “Методыка адбору гістарычных крыніц для публікацыі ў разнастайных тыпах і відах выданняў дакументаў”. Вынікам распрацоўкі стала аналітычная даведка аб практыцы адбору гістарычных крыніц ЦДГА БССР для відавых публікацый[20].

У 1986-1990 гг. спынілася практыка падрыхтоўкі архіва спраў да знішчэння пад час экспертызы каштоўнасці. На гэты час была запланавана распрацоўка метадычнага дапаможніка па археаграфіі, але архіў не змог распачаць працу над ім у сувязі з загружанасцю іншай працай. Аднак за гэты перыяд было падрыхтавана 5 іншых метадычных дапаможнікаў па розных відах працы[21].

Такім чынам, на працягу 50-80-х гг. метадычная праца ў архіве няспынна ўдасканальвалася. Ад першых агульных рэкамендацый і прапаноў яна была пераведзена на складанне вузка спецыялізаваных дапаможнікаў, якія павінны былі забяспечыць усе накірункі працы неабходным метадычным апаратам. Вынікам гэтага стала напісанне

[18] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 299. Арк. 2-3, 7.
[19] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 332.
[20] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 362. арк. 11.
[21] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 422. Арк. 7, 8.

дзесяткаў «метадычак», схем, аглядаў і г.д., некаторымі з якіх супрацоўнікі працягваюць карыстацца да сённяшняга дня. Аднак у гэты ж час былі незваротна страчаны тысячы спраў, якія былі знішчаны ў выніку дзейнасці экспертнай камісіі і правядзення ёю экспертызы каштоўнасці.

*Дз.Ч. Матвейчык*

## Экспертна-метадычная камісія

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь» Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі з'яўляецца рэспубліканскім навукова-метадычным і навукова-даследчым цэнтрам па працы з дакументамі Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь. На экспертна-метадычную камісію (ЭМК) архіва ўскладаецца разгляд і прыняцце рашэнняў па навукова-метадычных і практычных пытаннях архіўнай справы і справаводства, у тым ліку экспертызы каштоўнасці дакументаў і камплектавання архіва, кантроль за ўвядзеннем нарматыўных і метадычных дакументаў.

Пачынаючы з 1990-х гг., змяняецца тэматыка навуковых распрацовак і форм выкарыстання дакументаў, зваротаў грамадзян і арганізацый за дакументамі, у сувязі з чым тэрмінова ўзнікае неабходнасць новага метадычнага забеспячэння па ўсіх накірунках дзейнасці архіва. Станоўчы адбітак тут накладвае наяўнасць кваліфікаваных спецыялістаў з вялікім стажам працы ў архіве, якія з'яўляюцца асновай ЭМК. Гэта загадчыкі аддзелаў і вядучыя навуковыя супрацоўнікі – Г.Я. Акуловіч, Н.М. Леўчык, (аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм), А.Ф. Аляксандрава, Н.А. Барсукова (аддзел старажытных актаў), С.А. Рыбчонак, І.Л. Новікава (аддзел інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў), Г.А. Станкевіч, Г.М. Кутукова, І.М. Шпілеўская (аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў).

На сённяшні момант у склад ЭМК уваходзяць вопытныя і высокакваліфікаваныя спецыялісты ў галіне архіўнай справы Г.М. Кутукова, І.У. Пакрасенка, В.А. Ходзіна, У.М. Дзянісаў, С.А. Рыбчонак, В.У. Бабкова, А.Ф. Аляксандрава, Н.А. Барсукова, Г.Я. Акуловіч, Т.М. Коцік, З.Л. Яцкевіч, Т.С. Міхяёнак.

У сувязі з актыўным пошукам дакументаў па гісторыі сям'і і рода,



неабходнасцю пацвярджэння роднасных сувязяў, доказу маёмасных правоў прыярытэтным накірункам з'яўляецца развіццё нарматыўнай прававой базы даследаванняў па генеалогіі. Каб дапамагчы ўсім, хто звяртаецца ў архіў, з Беларусі і замежных краін, у 2001 г. зацверджана «Положение о порядке доступа к документам, содержащим сведения генеалогического и биографического характера и выдаче архивных справок, копий и выписок из документов, содержащих информацию, составляющую личную или семейную тайну». У Палажэнні вырашана праблема доступа да дакументаў і навукова-даведачнага апарату, у т.л. да звестак з аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэм (АІПС "Радавод", "Пашпарты", "Беларуская шляхта"). Неабходна падкрэсліць і тое, што, паводле дакумента, на ўсіх карыстальнікаў фондамі архіва ўскладаецца адказнасць за канфідэнцыяльнае выкарыстанне інфармацыі аб прыватным жыцці грамадзян.

У 2003 г. ЭМК разгледжаны і рэкамендаваны да друку метадычны дапаможнік "Крыніцы па генеалогіі Беларусі і правядзенне генеалагічных даследаванняў у архіве" (складальнік С.А. Рыбчонак)[1], які характарызуе агульныя накірункі і этапы правядзення даследаванняў па генеалогіі Беларусі ў НГАБ. У ім пералічаны асноўныя фонды, дзе прадстаўлена генеалагічная інфармацыя, для садзеяння тым даследчыкам, якія не маюць дастатковага ўзроўню падрыхтоўкі да працы з архіўнымі крыніцамі.

Лагічным працягам гэтай тэмы стала падрыхтоўка і ўзгадненне ЭМК у 2006 г. «Инструкции по исполнению запросов биографического характера (о подтверждении даты рождения, бракосочетания, смерти)», якая вызначае парадак афармлення запытаў біяграфічнага характару, дае ўяўленне аб методыцы і этапах пошуку дакументаў, выкарыстанні даведачнай літаратуры, афармленні адказаў на запыты.

Хуткае развіццё аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэм і даведачных баз дадзеных выклікала актыўны ўдзел у гэтым працэсе ўсіх зацікаўленых супрацоўнікаў архіва пад метадычным кіраўніцтвам І.І. Сухаверх, якая пачала распрацоўку памятак для карыстальнікаў ЭВМ.

Адказам на патрабаванне часу было стварэнне ў 2001–2006 гг. Т.С. Міхяёнак абагульняючых нарматыўных дакументаў па аўтаматызацыі працэсу работы ў архіве. У мэтах прававой абароны інфармацыі, якая змяшчаецца ў базах дадзеных аўтаматызаваных ІПС, з 01.11.2001 г. ЭМК разгледжана і ўведзена ў практыку работы

[1] Рыбчонак С.А. Крыніцы па генеалогіі Беларусі (XVI–пач. XX ст.): Метадычныя парады. Мн.: НГАБ, 2003. С. 76

«Инструкция по организации работы с документами на электронных носителях, содержащими служебную информацию ограниченного распространения». Затым у сувязі з павелічэннем колькасці камп'ютараў у архіве распрацавана і зацверджана экспертна-метадычнай камісіяй і дырэктарам архіва ў 2003 г. памятка карыстальнікам ПЭВМ, у 2006 г. – «Методические рекомендации по созданию автоматизированного научно-справочного аппарата в Национальном историческом архиве Беларуси», «Инструкция по безопасности АИПС архива».

Сёння ў архіве адбываецца фарміраванне новай рэальнасці пры вырашэнні актуальных задач метадамі камп'ютарных тэхналогій. Члены ЭМК падыходзяць да гэтага патрабавання з пазітыўных пазіцый. Напрыклад, на аснове распрацаванай у аддзеле старажытных актаў і зацверджанай на пасяджэнні ЭМК сфрагістычнай карткі ў архіве створана база дадзеных "Сфрагістычны каталог". У адзначаную базу дадзеных ужо ўнесены 700 запісаў за 1994–2007 гг., дзякуючы чаму з'явілася магчымасць раздрукаваць картку, адваротны бок якой прызначаны для лічбавай выявы пячаткі. Вынікам зробленай працы з'явілася каталагізацыя – магчымасць навуковай апрацоўкі, стварэнне інфармацыйна-пошукавай базы на сфрагістычныя помнікі і забеспячэнне захаванасці пячатак. Візуальная дэманстрацыя адсканаванай выявы пячаткі дазволіла абмежаваць выкарыстанне дакументаў з пячаткамі.

Забеспячэнню захаванасці дакументаў служыць і распрацаванае ў 2004 г. ЭМК "Положение о документальных памятниках Национального исторического архива Беларуси – составной части Национального архивного фонда Республики Беларусь". Яно вызначае крытэрыі і парадак аднясення архіўных матэрыялаў да дакументальных помнікаў, парадак іх уліку і захавання. У яго падрыхтоўцы прымалі ўдзел дырэктар архіва А.К. Галубовіч, намеснік дырэктара Л.М. Лісава., вядучы навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў У.М. Дзянісаў. Вызначэнне дакументальнага помніка не толькі як асобнага дакумента, але і як структурнай часткі ўсяго фонда, дазволіла значна пашырыць кола дакументаў, працы з якімі надаецца асаблівае значэнне.

У 2005 г. было праведзена выяўленне дакументаў архіва, якія адпавядаюць патрабаванням заканадаўства аб Нацыянальным архіўным фондзе Рэспублікі Беларусь і Палажэнню аб дакументальных помніках. На пасяджэнні ЭМК у снежні 2005 г. адзначалася, што «…работа была выполнена на высоком профессиональном уровне и в полной мере соответствует необходимым требованиям нормативно-методических документов. Одновременно были организованы необходимые условия для хранения выявленных документов, рекомендованных к присвоению им статуса документальных памятников».



У другой палове 1990-х гг., нягледзячы на перамяшчэнне дакументаў архіва, былі распрацаваны асноўныя накірункі развіцця навукова-даведачнага апарата да фондаў, у якіх змешчаны звесткі біяграфічнага характару. У сувязі з гэтым у 1997–2002 гг. з членамі ЭМК было ўзгоднена ўдасканаленне звыш 500 фондаў цэркваў і іншых рэлігійных устаноў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Сярод іх вопісы фондаў "Магілёўскі Брацкі Багаяўленскі манастыр" за 1821–1916 гг., "Віцебскі мужчынскі Троіцкі Багаяўленскі манастыр" за 1772–1918 гг., "Тадулінскі манастыр" (канец XVШ ст., дакументы на польскай мове), "Полацкі Спаса-Ефрасіньеўскі манастыр" за 1852–1914 гг., "Аршанскі Благавешчанскі манастыр" за 1853 г. і інш.

Членамі ЭМК была абмеркавана канцэпцыя ўдасканалення вопісу фонда"Тапаграфічныя карты і планы гарадоў, вёсак, сёл, маёнткаў Мінскай губерні (калекцыя)". Улічваючы разнастайнасць дакументаў у разглядаемым фондзе (карты, планы, чарцяжы архітэктурных збудаванняў і т.д.), было прынята рашэнне аб адмове ад першапачатковай ідэі складання ўнутраных вопісаў. Праводзілася экспертыза загалоўкаў картаграфічных дакументаў фонда. Карты размешчаны па асобных справах, выкарыстана суцэльная нумарацыя выяўленых у працэсе работы асобных картаграфічных дакументаў.

На сённяшні час члены ЭМК удзельнічаюць у экспертызе вопісаў ўдасканаленых фондаў "Віцебскае губернскае праўленне", "Віцебская губернская казённая палата" і іншых. У сувязі з камплектаваннем метрычнымі кнігамі ЭМК разгледжаны вопісы некалькіх тысяч метрычных кніг за 1851–1938 гг., якія былі перададзены ў архіў у апошнія гады з Брэсцкага, Гомельскага, Віцебскага і Мінскага архіваў органаў ЗАГС, Бабруйскага, Асіповіцкага, Магілёўскага, Шклоўскага і інш. раённых аддзелаў органаў ЗАГС.

Вопыт супрацоўнікаў архіва спатрэбіўся пры распрацоўцы нарматыўных і метадычных дакументаў да Закона Рэспублікі Беларусь «О Национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь», у прыватнасці «Методических рекомендаций по усовершенствованию описей дел постоянного хранения в государственных архивах Республики Беларусь».

На пасяджэннях ЭМК пастаянна абмяркоўваюцца пытанні аднясення дакументаў архіва да ліку асабліва каштоўных.

Узгоднены пералік асабліва каштоўных дакументаў фонду “Мінскі губернскі дваранскі дэпутацкі сход”. У азначаным фондзе захоўваюцца загады Сената, Мінскага губернскага праўлення, пастановы, журналы і пратаколы пасяджэнняў дваранскіх дэпутацкіх сходаў, радаводныя кнігі і шляхецкія спісы, звесткі аб шляхецкім паходжанні, аб пацвярджэнні шляхецтва, загады Герольдыі. Маюцца звесткі памешчыкаў аб даходах з маёнткаў, пастаўках правіянту і фуражу і шматлікія іншыя звесткі за 1794–1920 гг. Улічваючы, што генеалагічныя звесткі сёння вельмі актуальныя, дакументы фонду аднесены да асабліва каштоўных.

Да ліку асабліва каштоўных таксама цалкам аднесены архіўныя фонды “Канцылярыя Мінскага губернскага прадвадзіцеля дваранства”, “Дырэкцыя народных вучылішчаў Магілёўскай губерні”, “Горацкія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы”, фамільныя фонды і інш.

На пасяджэннях ЭМК разглядаліся метадычныя і практычныя пытанні экспертызы каштоўнасці дакументаў, іх апісанні. У 2002 г. узгоднены: «Памятка по усовершенствованию описей фонда «Витебское губернское правление», «Метадычныя парады па распрацоўцы і апісанню актавых кніг XVI-XVII стст. як крыніцаў архіўных даведнікаў», на падставе якіх складаюцца і разглядаюцца ўнутраныя вопісы да актавых кніг фондаў магістратаў, земскіх, гродскіх судоў і інш.

У 1998 г. ЭМК НГАБ разгледжаны і рэкамендаваны да друку тэкст брашуры “Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі”, экспазіцыйны план юбілейнай выставы архіва.

Рукапіс зборніка дакументаў аб землеўладанні пісараў і дзякаў Канцылярыі ВКЛ па матэрыялах Літоўскай Метрыкі і фонду “Радзівілы, князі” за II палову XV – I палову XVI стст.” узгоднены ЭМК у 2003 г. Праца над ім абумоўлена значнасцю згаданых дакументаў для гісторыі і гістарычнай геаграфіі.

У 2004 г. – узгоднена ўтрыманне 1-й версіі архіўнага сайту.

У 2007 г. заслуханы паведамленні загадчыцы аддзела старажытных актаў В.У. Бабковай аб рэцэнзаванні навукова-даследчых работ БелНДІДАС «Терминологический словарь по археографии», «Лацінска-беларускі слоўнік актавай дакументацыі ВКЛ XIII–XVI стст.» і загадчыцы аддзела ААТ Т.С. Міхяёнак аб рэцэнзаванні навукова-даследчай працы БелНДІЦЭД «Электронный атлас-справочник Витебской губернии (начало XX века)».

Праца экспертаў заключаецца ў тым, каб даць пуцёўку ў жыццё шматлікім напрацоўкам. Навукова-метадычная праца па экспертызе дакументаў з’яўляецца адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці НГАБ.

*Л.М. Лісава*



# НАШЫ АДДЗЕЛЫ

## Аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў

Гісторыя аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў НГАБ пачынаецца з 5 ліпеня 1938 г., калі Магілёўскі гістарычны архіў быў рэарганізаваны ў Цэнтральны гістарычны архіў БССР. Правядзенне першапачатковых мерапрыемстваў па забеспячэнню захаванасці дакументаў выклікала шэраг складанасцяў. Архіў знаходзіўся ў непрыстасаваным каменным, неацяпляемым будынку былой царквы. Прызначанае для архівасховішча памяшканне не забяспечвала захаванасці дакументаў па шэрагу прычын:

- памяшканне мела натуральнае, двухбаковае асвятленне;
- памеры архівасховішча не адпавядалі патрабаванням захоўвання архіўных матэрыялаў.

Акрамя таго, прынцып размяшчэння сцелажоў быў нерацыянальным, у выніку чаго большасць з іх падступала блізка да сценаў сховішча, а праходы былі вельмі вузкімі.

Да пачатку 1941 г. у ЦДГА БССР было сканцэнтравана 1560 фондаў, звыш 382 тыс. спраў. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны большасць дакументаў і навукова-даведачнага апарату да іх была знішчана, а частка дакументаў – вывезена ў Рыгу і Германію.

Пасля вызвалення Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у архіве засталося 44 справы. Пасляваенны перыяд быў для супрацоўнікаў архіва складаным. Большая частка дакументаў была складзена на падлозе штабелямі, паасобнымі звязкамі і адзінкамі захоўвання. Пэўныя цяжкасці ў працы па забеспячэнню захаванасці дакументаў выклікалі такія фактары, як незадавальняючае абсталяванне архівасховішчаў, пячное ацяпленне, адсутнасць сістэмы электрычнага асвятлення, незадавальняючы стан даху і вадасцёкавай сістэмы, што прыводзіла да рэзкага вагання тэмпературы і павышэння вільготнасці. З-за дрэнных умоў захоўвання, а таксама частых перавозак дакументы знаходзіліся ў кепскім фізічным стане.

У сувязі з усім вышэйадзначаным асаблівая ўвага па забеспячэнню захаванасці надавалася аптымальным умовам, у якіх захоўваліся

дакументы: рамонту даху будынка, уцяпленню вокнаў, размеркаванню дакументаў на сцелажах.

Галоўнымі задачамі, якія сталі перад архівістамі ў 1945 г., былі:

- рэвакуацыя архіўных дакументаў з Рыгі;

- працяг пошуку дакументальных матэрыялаў, разрабаваных падчас вайны;

- праверка наяўнасці дакументаў з мэтай уліку страт, нанесеных нямецка-фашысцкімі захопнікамі[1].

У 1945 г. архіве працавала 28 чалавек і мелася ўсяго два аддзелы: аддзел агульных фондаў (7 чалавек) і аддзел сакрэтных (4 чалавекі)[2].

У гэты ж год у Магілёў з Рыгі вярнулі 38 054 адз. зах. – 74 фонды гістарычных дакументаў. Да вайны ў архіве налічвалася 382 866 адз. зах., што складала толькі дзесятую частку страчаных документов.

Ні адзін з фондаў не меў поўнага складу. Абсалютная большасць утрымлівала ад адной да 100 адз. зах. Найбольш значнымі з ліку тых, што захаваліся пасля вайны, былі: “Дырэкцыя народных вучылішчаў Магілёўскай губерні” – 1605 спраў, “Канцылярыя Магілёўскага губернатара” – 2084 справы, “Віленскі дваранскі дэпутацкі сход” – 1403 справы. Каля 60% гэтых дакументаў патрабавалі рэстаўрацыі і пераплёту[3].

У выніку прыёму і перадачы спраў у 1949 г. у архіве налічвалася 1008 фондаў, 277 000 адз. зах., 1138,5 кг. россыпу спраў.

На пачатку 1950-х гг. архівам атрымана 312 фондаў (19 202 справы), сфарміравана 2486 адз. зах. На 1 студзеня 1951 г. у архіве налічвалася 1386 ф. (324 055 адз. зах.). Па плану належала апрацаваць 44 221 адз. зах., было апрацавана 59 113 адз. зах. У макулатуру вылучана 3924 адз. зах., 300 кг. россыпу[4].

У канцы 1940-х гг. у ЦДГА БССР паступілі дакументы Віцебскай губерні, якія раней захоўваліся ў г. Віцебску ў кляштары Св. Марка.

У 1948 – 1952 гг. у архіве праводзілася першая комплексная праверка наяўнасці і стану спраў, задачамі якой з’яўлялася выяўленне стратаў, нанесеных нямецка-фашысцкімі захопнікамі архіўным матэрыялам. Аднак падчас праверкі па шэрагу фондаў не былі ўстаноўлены сапраўдныя аб’ёмы спраў, якія меліся ў наяўнасці, не ліквідаваны недахопы ў фандзіраванні матэрыялаў, а таксама ў афармленні вопісаў і ўліковай дакументацыі. Гэта было абумоўлена шэрагам прычын: адсутнасцю нармальных умоў працы, нізкай кваліфікацыяй кадраў, наяўнасцю нераспрацаваных і неапісаных матэрыялаў, дрэнным фізічным і тэхнічным станам вопісаў.

[1] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 4.
[2] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 5.
[3] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 4.
[4] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 27.



Для папярэджання развіцця плесені справы запакоўваліся ў кардон і размяшчаліся ўздоўж сценаў з абаграваннем (у архіве заўсёды парушаўся тэмпературна-вільготнасны рэжым, вільготнасць узнімалася да 84%). Прымаліся меры для прасушкі і абяспыльвання дакументальных матэрыялаў. У вяснова-летні перыяд дакументы падвяргаліся праветрыванню[5].

З 1955 г. пачалося суцэльнае карданаванне дакументаў пасля іх прасушкі. Праводзілася паляпшэнне фізічнага стану спраў: замена цэтлікаў, нарошчванне карэньчыкаў, рамонт і падшыўка спраў. У чытальную залу для выкарыстання было выдадзена 7450 адз. зах. На працягу года адказным захавальнікам фондаў праводзіўся сістэмны нагляд за станам і рэжымам захаванасці дакументальных матэрыялаў. Рэгулярна вяліся запісы ў журнале рэгістрацыі тэмпературы і вільготнасці паветра ў архівасховішчы[6].

У 1956 г. архіў прыступіў да дэзінфекцыі і рэстаўрацыі старых дакументаў. Для забеспячэння іх захаванасці ў Мінску была арганізавана лабараторыя па рэстаўрацыі і мікрафотакапіраванню.

З 1958 г. пачало праводзіцца мікрафотакапіраванне комплексу дакументальных матэрыялаў, якія захоўваюцца ў ЦДГА БССР. Асноўным напрамкам суцэльнага мікрафотакапіравання ў архіве з’яўлялася стварэнне страхавога фонду на найбольш каштоўныя і ўнікальныя матэрыялы, а таксама на дакументы ў дрэнным фізічным стане і з затухаючым тэкстам. Быў распрацаваны перспектыўны план, паводле якога ў 1963 г. ужо было змікрафільмавана 181 800 кадраў. Таксама паступілі першыя мікрафільмы з іншых архіваў – 3194 адз. зах., 173 889 кадраў.

З 1963 г. у аддзеле забеспячэння ўводзіцца тэрмін “санітарныя дні”. Яны з’яўляюцца неабходнай мерай для забеспячэння захаванасці дакументаў, а менавіта: для стварэння аптымальных умоў захавання, якія забяспечваюцца ўжываннем розных сродкаў для аптымізацыі тэмпературна-вільготнага, светавога, санітарна-гігіенічнага рэжымаў і кантроля за імі.

На падставе пастановы СМ БССР № 537 ад 11 лістапада 1963 г. ЦДГА у г. Магілёве пераведзены ў г. Мінск, дзе архіў атрымаў прапіску па

[5] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 32.
[6] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 56.

вуліцы Казлова, 26. Ён быў павялічаны за кошт передачы старажытных актаў з ЦДГА у г. Гродне і дарэвалюцыйных фондаў Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці.

Згодна штатнага раскладу 1964 г., зацверджанага на падставе загада № 100 Архіўнага упраўлення пры СМ БССР ад 18 лістапада 1963 г., у аддзеле фондаў Мінскай губерні працавалі 8 чалавек: загадчык аддзела, старшы навуковы супрацоўнік, 2 навуковыя супрацоўнікі, рэстаўратар, 2 старшыя архіварыусы; 5 чалавек – у аддзеле фондаў Віцебскай і Магілёўскай губерній: загадчык аддзела, навуковы супрацоўнік, 2 рэстаўратары, старшы архіварыус; і 2 чалавекі - у аддзеле сакрэтных фондаў: загадчык аддзела і старшы архіварыус[7].

На 1 студзеня 1964 г. працягласць сцялажных паліц складала 15 274 пагонных метра са ступенню загружанасці 90%. Плошча архіва складала 2786 кв. м , дзе захоўвалася 2849 ф., 995 672 адз. зах., з якіх 3657 адз. зах. з'яўляліся сакрэтнымі; страхавы фонд складаў 10 676 спраў (992 756 кадраў)[8]. Быў таксама створаны пафондавы тапаграфічны паказальнік.

З 1964 г. пачынаецца другая комплексная праверка наяўнасці і стану спраў, сканцэнтраваных у архіве. Яна працягвалася да 1970 г., што было выклікана перамяшчэннем матэрыялаў архіва ў Мінск і передачай на захаванне новага комплексу дакументаў. Падчас дадзенай праверкі ставіліся наступныя задачы: выявіць фактычную колькасць спраў як у межах фонду, так і кожнага вопісу асобна; выявіць агульную колькасць і шыфры спраў, якія адсутнічаюць; правесці пошук адсутных спраў або апраўдальнай дакументацыі, якой тлумачыцца нястача; выявіць і па магчымасці знішчыць памылкі ў фандзіраванні матэрыялаў, аб'яднаць матэрыялы аднаго фондаўтваральніка, улічаныя двойчы як самастойныя фонды; унесці ў вопіс і ўлічыць усе неапісаныя матэрыялы; праверыць звесткі аб аб'ёме спраў ва ўсіх уліковых дакументах (вопісах, лісце і картцы фонда) і прывесці гэтыя дадзеныя ў адпаведнасць з фактычнай наяўнасцю спраў; перашыфраваць усе фонды ў адпаведнасці з прынятымі ў архіве шыфрамі.

Для рэалізацыі дадзенага мерапрыемства было арганізавана некалькі груп, у кожную з якіх уваходзіла два-тры чалавекі: навуковы супрацоўнік або старшы захавальнік і адзін або два архіварыусы. У дапамогу супрацоўнікам, якія займаліся праверкай наяўнасці, у 1963 г. была распрацавана метадычная парада, якой вызначалася кола неабходных задач праверкі наяўнасці і стану дакументаў, пошуку адсутных спраў,

[7] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 111.
[8] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 104.



парадку афармлення дакументацыі па праверцы і ўнясенню змен ва ўліковую дакументацыю.

У выніку праведзенай працы ў 1964 г. было праверана 517 822 адз. зах., падчас праверкі выяўлены недахоп склаў 1229 адз. зах.[9]

У 1965 г. зацверджана новая структура архіва, у сувязі з чым утвораны аддзел фондаў. Адпаведна новага штатнага раскладу, зацверджанага на падставе загаду Архіўнага ўпраўлення пры СМ БССР № 7 ад 15 красавіка 1965 г. у аддзеле працавала 8 чалавек: загадчык аддзела, галоўны захавальнік фондаў, 2 старшыя захавальнікі фондаў, 4 архіварыусы. Першым загадчыкам аддзела фондаў была Т.Е. Лявонцьева, якая займала азначаную пасаду да 1986 г.[10]

Дзякуючы яе дзейнасці, быў распрацаваны і падрыхтаваны шэраг інструкцый па стварэнні і ўдасканаленні навукова-даведачнага апарату, праверцы наяўнасці і стану спраў, адбору і ўліку асабліва каштоўных спраў, выяўленню, уліку і падрыхтоўцы да рэстаўрацыі пашкоджаных спраў. У 1967 г. Т.Е. Лявонцьевай была распрацавана “Метадычнае ўказанне аб парадку адбору, падрыхтоўкі і передачы дакументальных матэрыялаў на мікрафотакапіраванне”, у якой разглядаліся галоўныя прынцыпы, якія сталі асноўнымі пры вызначэнні чарговасці мікрафільмавання дакументаў[11]. Для вызначэння чарговасці здымкі дакументаў быў абраны крытэрый навуковай вартасці матэрыялаў. Акрамя таго, улічваўся фізічны стан дакументаў, час стварэння матэрыялаў і іх захаванасць, ступень выкарыстання, стан навукова-даведачнага апарату і навукова-тэхнічнай апрацоўкі дакументальных матэрыялаў. Пры складанні парады ўлічваўся досвед практычнай працы па мікрафільміраванню, а таксама “Інструкцыя па мікрафільміраванню дакументальных матэрыялаў ЦДГНГ СССР”.

Т.Е. Лявонцьева з'яўлялася аўтарам публікацый у архівазнаўчай перыёдыцы, удзельнічала ў падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў “Рэвалюцыйны ўздым у Літве і Беларусі ў 1861–1862 гг.”, “Паўстанне ў Літве і Беларусі ў 1863-1864 гг.”, даведнікаў па Дзяржаўнаму архіву Мінскай вобласці і ЦДГА БССР у г. Мінску, а таксама прымала ўдзел у навукова-тэарэтычных канферэнцыях, з'яўлялася дэлегатам Міжнароднага з'езду архівістаў у г. Маскве (1972).

У 1966 г. у аддзеле ўведзена пасада галоўнага захавальніка фондаў, якую заняла Б.З. Прыгожына, і старшага захавальніка фондаў, на якой

[9] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 110.
[10] НАРБ. Ф. 251. Воп. 5. Спр. 1023.
[11] Леонтьева Т.Е. Методическое указание о порядке отбора, подготовки и передачи документальных материалов на микрофотокопирование. Мн., 1967.

працавала З.А. Кукіна (Каржанеўская). Добрасумленная і адказная праца гэтых стала залогам паспяховага правядзення комплексу мерапрыемстваў па забеспячэнню захаванасці дакументаў у архіве на дадзены перыяд і ў будучыні. Так, Б.З. Прыгожына, якая працавала архівістам з 1945 г., прымала непасрэдны ўдзел у пошуку і вяртанні дакументаў, іх навукова-тэхнічнай апрацоўцы, стварэнні згубленага падчас вайны навукова-даведачнага апарата, арганізацыі рэстаўрацыі пашкоджаных спраў, выяўленні каштоўных дакументаў. Яна таксама падрыхтавала шэраг метадычных рэкамендацый (працоўных інструкцый, памятак, метадычных парад па навукова-тэхнічнай апрацоўцы дакументаў, удасканаленню навукова-даведачнага апарата і інш.), удзельнічала ў падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў “Беларусь у эпоху феадалізма”, “Сялянскі рух у Беларусі пасля адмены прыгоннага права (1861-1862 гг.)”, шляхаводнік па Дзяржаўнаму архіву Мінскай вобласці і ЦДГА БССР у г. Мінску.

У 1970-я гг. супрацоўнікамі была праведзена першая спроба сур’ёзнага ўсебаковага аналізу стану дакументаў. У выніку было ўстаноўлена, што дакументы фондаў Мінскай губерні, якія амаль на працягу стагоддзя захоўваліся ў неацяпляемых памяшканнях з павышанай вільготнасцю, былі пашкоджаны плесенню, аснова многіх спраў была разбурана. У выніку рэзкай змены тэмпературнага рэжыму пры ўсталяванні ацяпляльнай сістэмы фонды ўстаноў Магілёўскай і Віцебскай губерній, якія захоўваліся ў неацяпляемым памяшканні, таксама згубілі механічную трываласць. Працягласць тэрміну і неспрыяльныя ўмовы захавання комплексу старажытных актаў прывялі да пашкоджання асновы тэксту, абумоўленага натуральным працэсам разбурэння. У сувязі з гэтым была арганізавана праца па дэзінфекцыі дакументаў, пашкоджаных плесенню.

Аддзелам распрацаваны і арганізаваны комплекс мерапрыемстваў, які павінен быў забяспечыць аптымальныя ўмовы для забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў. Так, у 1975 г. было закарданавана 42 448 спраў, ажыццяўлялася сістэматызацыя (20 753 лістоў), падшыта 1007, мікрафільміравана 937 (103 556 кадраў, 15 ролікаў), а таксама адрэстаўрыравана 65 049 лістоў і пераплецена 542 справы. Былі праведзены і іншыя віды працы па забеспячэнню захаванасці дакументаў і фондаў: нумарацыя і праверка нумарацыі (1 425 871 аркушоў), выдача спраў (17 818) і мікрафільмаў (511), прыём спраў (56 692)[12].

Для азнаямлення з працай ЦДГА СССР у г. Ленінградзе па забеспячэнню захаванасці (выяўлення, уліку і дэзынфекцыённай апрацоўцы дакументаў, пашкоджаных плесенню) дырэктар архіва М.К. Лешчанка і загадчык аддзела фондаў Т.Е. Лявонцьева ездзілі ў камандзіроўку. Кіраўніцтва ЦДГА СССР у г. Ленінградзе неаднаразова падкрэслівала, што пытанне забеспячэння захаванасці, і ў прыватнасці – барацьба з плеснявелым заражэннем спраў з’яўляюцца асноўнымі пытаннямі ў дзейнасці архіва. Падчас паездкі Т.Е. Лявонцьева выступіла з паведамленнем аб працы ЦДГА БССР у г. Мінску па забеспячэнню захаванасці дакументаў[13].

[12] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 299.



У аддзеле ў 1970-я гг. працавалі: Т.Е. Лявонцьева – загадчык аддзела, Б.З. Прыгожына – загадчык архівасховішча; Г.А. Станкевіч, А.П. Міхалёва – старшыя захавальнікі фондаў; З.А. Манчык, Ж.М. Лойка, Ф.І. Тамашэвіч, У.Н. Первышын, І.Н. Місько – архіварыусы.

З 1978 г. пачало праводзіцца выяўленне унікальных і асабліва каштоўных дакументаў як асобны від працы. Да гэтага часу выяўленне асабліва каштоўных спраў ажыццяўлялася ў працэсе правядзення выяўлення дакументаў для зборнікаў, выкарыстання іх у навуковых мэтах і выканання тэматычных запытаў[14].

На падставе загада № 13 Галоўнага архіўнага упраўлення пры СМ БССР ад 17 жніўня 1979 г. у архіве была ўведзена новая структура аддзела. Паводле новага штатнага раскладу ў аддзеле забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў працавала 9 чалавек: загадчык аддзела, 2 загадчыкі архівасховішчаў, 2 старшыя захавальнікі фондаў, 4 захавальнікі фондаў[15].

У 1980-я гг. асаблівая ўвага надавалася рэстаўрацыі і пераплёту спраў, мікрафільміраванню і стварэнню фонда карыстання. Значная колькасць спраў здавалася на дэзінфекцыю, нарошчванне карэньчыкаў, афармленне вокладак і падшыўку спраў. Выдача спраў у чытальную залу складала каля 20 000 адз. зах. штогод. У гэты час у аддзел прыйшлі новыя супрацоўнікі: Т.Н. Лініч, І.Г. Мазуранка, З.Я. Трацэўская і Г.В. Барсукова. З 1986 г., пасля сыходу на адпачынак заслужанай архівісткі і спецыяліста па пытаннях забеспячэння захаванасці Т.Е. Лявонцьевай, аддзел узначаліла Г.А. Станкевіч.

Г.А. Станкевіч распрацавала памяткі па праверцы наяўнасці спраў, парадку перадачы, прыёму фондаў на захаванне пасля перапрацоўкі і ўдасканалення вопісаў. Таксама яна склала “Пералік груп спраў, падлягаючых страхавому капіраванню па вопісе 1 ф. 1430 “Канцылярыя віцебскага грамадзянскага

[13] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 232.

[14] Леонтьева Т.Е. Методические указания о выявлении, учете, описании и хранении особо ценных документов. Мн., 1981.

[15] НАРБ.Ф. 251. Воп. 3. Спр. 285.

губернатара”, “Пералік картаграфічных дакументаў, якія знаходзяцца ў фондах Мінскай губерні”, “Пералік картаграфічных дакументаў, якія знаходзяцца ў фондах Віцебскай і Магілёўскай губерній”.

Цяжкі перыяд быў у архівістаў аддзела, калі, пачынаючы з 1996 г. па 1999 г., архіў пераязджаў у новы будынак па адрасу Крапоткіна, 55 (дзе знаходзіцца і па сённяшні дзень). Усе да адзінага дакументы прайшлі праз іх рукі.

Архіў знаходзіцца ў сучасным, адмыслова абсталяваным будынку, у якім створаны аптымальныя ўмовы для захаванасці архіўных дакументаў. У будынку архіва маецца 5 архівасховішчаў, дзе размешчана 3119 ф., 1 018 930 адз.зах., якія ўтрымліваюць звесткі па гісторыі Беларусі, значныя матэрыялы па генеалогіі, геральдыцы, сфрагістыцы за перыяд канца XIV–пачатку XX стст. Архівасховішчы загружаны пры двухрадным захоўванні дакументаў на 108%, працягласць сцялажных паліц складае 11 597 пагонных метраў. Архіў прымае на захаванне дакументы рэлігійных устаноў, нягледзячы на тое, што з’яўляецца ўстановай, якая не камплектуецца.

У сваёй дзейнасці супрацоўнікі аддзела кіруюцца шэрагам нарматыўных і метадычных дакументаў па арганізацыі ўліку і забеспячэння захаванасці[16].

Пытанні забеспячэння захаванасці дакументаў у архіве ў працэсе

[16] Закон РБ от 6 октября 1994 г. «О национальном архивном фонде и архивах Республики Беларусь» (в редакции Закона Республики Беларусь от 6 января 1999 г.); Положение о Национальном архивном фонде Республики Беларусь, утвержденное Указом президента Республики Беларусь от 20 сентября 1996 г. № 373 (с изменениями и дополнениями, внесенными Указами президента Республики Беларусь 23 апреля 1999 г. № 213, от октября 2002 г. № 513, от 23 декабря 2004 г. № 604); Правила работы государственных архивов Республики Беларусь, утвержденные постановлением Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь от 25 ноября 2005 г. № 7 (с дополнениями, внесенными постановлением Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь от 1 марта 2006 г. № 2); Документы на бумажных носителях. Правила государственного хранения. ОСТ 55.6–85 / Исполнители: В.Ф. Привалов, О.И. Любомирова. М.: Главархив СССР, 1985; Памятка о проверке наличия дел, выданных из архивохранилищ в предшествующий год / Сост.: Т.Е. Леонтьева, А.А. Станкевич. Мн.: ЦГИА БССР в г. Минске, 1987; Методические рекомендации по проведению полистной проверки наличия и состояния документов. М.: Росархив, 2005; Методические рекомендации по восстановлению угасающих текстов и изображений архивных документов. М.: Росархив, ВНИИДАД, 2005; Методические рекомендации по работе с особо ценными документами в государственных архивах Российской федерации / сост. Н.И. Химина, А.В. Елпатьевский. М.: Росархив, ВНИИДАД, 2006; Защита архивных документов от биоповреждений: Методические рекомендации. М.: Главархив СССР: ВНИИДАД, 1988; Инструкция по нумерации листов единиц хранения при подготовке их на реставрацию, переплет и микрофильмирование, при выдаче дел из хранилищ для использования. М.: ВНИИДАД, 1986; Привалов В.Ф. Влияние перемещения документов на их сохранность. М.: ВНИИДАД, 1998;.Методические указания о выявлении, учете, описании и хранении особо ценных документов / Сост. Т.Е. Леонтьева. Мн.: ЦГИА БССР в г. Минске, 1981.



выкарыстання дастаткова дакладна адбіліся ў арганізацыйна-распарадчых дакументах архіва. У дадзеным накірунку дзейнасці выдаюцца загады дырэктара і прымаюцца рашэнні на пасяджэннях дырэкцыі, якія з’яўляюцца кіраўніцтвам да выканання для ўсіх працаўнікоў архіва.

Аддзел праводзіць працу па выкананні планавых паказчыкаў развіцця архіўнай справы ў галіне забеспячэння захаванасці дакументаў. У 1998 г. пачалася трэцяя комплексная праверка наяўнасці і стану спраў, завяршэнне якой плануецца ў 2009 г. Праводзіцца таксама падрыхтоўка спраў да рэстаўрацыі, пераплёту і мікрафільміраванню, якія праводзяцца Цэнтральнай лабараторыяй мікрафотакапіравання і рэстаўрацыі дакументаў НАФ РБ. Штогод архіў здае на рэстаўрацыю і пераплёт 100 000 лістоў. У аддзеле заўсёды ідзе візуальны кантроль дакументаў, якія прайшлі дэзінфекцыю і рэстаўрацыю.

Павелічэнне цікавасці да гісторыі нашай краіны, у тым ліку на дакументы генеалагічнага характару, прывялі да інтэнсіўнай выдачы дакументаў карыстальнікам. Штодзённа ў працэсе працы (выдача спраў, праверка наяўнасці і стану спраў) аддзел займаецца выяўленнем дакументаў з дэфектамі насіцеля і тэксту. Штогод расце колькасць дакументаў, якія выдаюцца супрацоўнікамі аддзела ў чытальную залу, лабараторыю і супрацоўнікам архіва. Калі ў 1997 г. было выдадзена 18 645 адз. зах., 7732 мікрафільма, то ў 2007 г. – 31 873 адз. зах., 8172 мікрафільмы (нягледзячы на тое, што ў 2007 г. праводзіўся рамонт чытальнай залы, падчас якога справы чытачам не выдаваліся).

Для забеспячэння аптымальнага захавання дакументаў усе справы павінны быць закарданаваны. На 1 студзеня 2007 г. закарданавана 97 % адз. зах. Колькасць незакарданаваных спраў у архіве – 29 000. Гэта ў асноўным нестандартныя справы старажытных актавых кніг, колькасць лістоў якіх перавышае 1000. Супрацоўнікі аддзела асвойваюць праграмны пакет “Забеспячэнне захаванасці. Версія 1.0.”.

Праводзіцца праца па выяўленні асабліва каштоўных спраў (АКД), у тым ліку і дакументальных помнікаў і унікальных дакументаў. Пры выяўленні АКД выкарыстоўваюцца “Метадычныя ўказанні аб парадку вызначэння вартасці дакументаў НАФ”, распрацаваныя ў 2001 г. Дзяржкамархівам Рэспублікі Беларусь[17]. “Метадычныя ўказанні” дапамагаюць у рашэнні пытанняў, звязаных з аднясеннем дакументаў архіва да пэўнай катэгорыі вартасці і вызначэннем іх вартасці, а таксама ў выкарыстанні гэтых дадзеных пры захаванні, страце, знішчэнні і

[17] Методические указания о порядке определения стоимости документов НАФ. Мн., 2001.

пашкоджанні дакументаў. Сёння ў архіве выяўлена АКД 497 ф., 98 192 справы, мікрафільміравана 52 453 адз. зах., фонд карыстання складае 45 774 справы.

У архіве праводзіцца мікалагічнае абследаванне дакументаў для выяўлення біялагічных пашкоджанняў. Прычынамі з’яўлення біялагічных пашкоджанняў з’яўляюцца пераезд, адсутнасць апрацоўкі архівасховішчаў перад заездам, няякасным кардонам, выкарыстаным для карданавання. Адміністрацыяй архіва былі распрацаваныя мерапрыемствы для папярэджання негатыўных вынікаў біялагічнага пашкоджання дакументаў. У 2007 г. архіў набыў сістэму для ачысткі паветра Health Way Model 20 600-3 для барацьбы з біялагічнымі забруджваннямі (вірусамі, бактэрыямі, плесенню, грыбамі). У гэтым напрамку вядзецца праца і Інстытутам эксперыментальнай батанікі імя У.Ф. Купрэвіча НА НБ, з якім архіў заключыў дамову на правядзенне азначанага даследвання.

Для стварэння аптымальных умоў захавання дакументальных матэрыялаў за кожным сховішчам замацаваны асобы, якія адказваюць за наяўнасць і стан дакументаў даручанага ім архівасховішча, а таксама за іх супрацьпажарны і санітарна-гігіенічны стан.

Аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў працягвае традыцыі сваіх папярэднікаў. З 2002 г. аддзел узначальвае Г.М. Кутукова, якая прыйшла на работу ў аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў захавальнікам фондаў НГАБ у 1982 г. У траўні 2004 г. Г.М. Кутукова прыняла ўдзел у міжнародным семінары па забеспячэнню захаванасці архіўных дакументаў па праграме “Дельта”, які праходзіў у Варшаве. Падчас камандзіроўкі Г.М. Кутукова пазнаёмілася з працай лабараторыі па рэстаўрацыі архіўных дакументаў, асабліва цікавым і пазнавальным з’яўляецца знаёмства з работай замежных калег у галіне рэстаўрацыі пергаментных грамат і пячатак і іх захавання.

У аддзеле захаванасці дакументаў і фондаў у дадзены момант працуе 12 чалавек: З.Я. Трацэўская, Г.В. Барсукова, В.І. Акула, Т.У. Елісеева, З.Н. Хлябіч, Н.Н. Аліпчанка, І.У. Пакрасенка, А.Е. Гаршкова, М.Е. Сылка, Т.У. Абрамовіч, Е.А. Аніскевіч. Свой велізарны ўклад у працу аддзела ўнеслі і супрацоўнікі, якія перайшлі на работу ў іншыя аддзелы і за межы архіва: З.М. Корбут, В.Х. Канаваленка, Р.У. Ініна, І.Г. Мазурэнка, І.М. Шпілеўская. Аддзел забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў быў для іх своеасаблівай стартавай пляцоўкай.

*Г.М. Кутукова, Г.Я. Гаршкова*



## Аддзел інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў

За працягу ўсёй гісторыі архіва адным з важнейшых накірункаў яго дзейнасці з’яўлялася арганізацыя выкарыстання дакументаў. На вялікі жаль за перыяд з 1938 па 1941 г. захавалася вельмі мала звестак аб рабоце па выкарыстанню архіўных дакументаў. Вядома, што, пачынаючы з 1938 г., праводзілася выяўленне дакументаў звязаных з шэрагам тэм, у тым ліку па гісторыі грамадзянскай вайны, выгнанню нямецкіх акупантаў з Беларусі ў 1918 г., 20-годдзем утварэння БССР, гісторыяй народаў Беларусі, па сялянскаму руху ў 2-й палове XIX ст., па рабочаму руху ў пачатку XX ст. Так, у жніўні 1938 г. ЦДГА БССР накіраваў інфармацыю ў Цэнтральнае архіўнае ўпраўленне БССР аб правядзенні работы па выяўленню дакументальных матэрыялаў у фондзе Горкаўскай валаснй земскай управы перыяду германскай акупацыі Беларусі 1918 г.[1]. Было арганізавана актыўнае супрацоўніцтва з краязнаўчымі музеямі. У 1938 г. па заказу Магілёўскага дзяржаўнага гістарычнага музея былі зроблены машынапісныя копіі і арганізаваны фотаздымкі дакументаў з фонду “Магілёўскі павятовы суд за 1819-1869 гг.”. Адначасова ў 1938-1939 гг. праводзілася выяўленне дакументаў па гісторыі горада Магілёва для пашырэння экспазіцыі музея і падрыхтоўкі да выдання нарысу па гісторыі Магілёва[2].

Перад Вялікай Айчыннай вайной супрацоўнікамі архіва быў падрыхтаваны цэлы шэраг матэрыялаў для навуковых і папулярных выданняў. У 1938-1939 гг. супрацоўнік архіва З.Г. Клімовіч працавала над артыкулам “Сялянскі рух у Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя” для часопіса “Красный архив”[3].

Было арганізавана абслугоўванне даследчыкаў у чытальнай зале. На вялікі жаль, спецыяльнага памяшкання ў будынку архіва не было, таму для работы даследчыкаў быў прыстасаваны Ленінскі куток. Копіі і выпіскі з архіўных дакументаў звяраліся з аўтэнтыкам дырэктарам архіва. Адзін асобнік копіі заставаўся на захаванні ў архіве[4]. На працягу каляндарнага года працавала да 10 даследчыкаў па планавых навуковых тэмах. Аб іх асабістым складзе і тэмах даследванняў звестак не захавалася. Вядома

[1] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1213. Л. 52.
[2] Тамсама. Л. 23.
[3] Тамсама. Л. 83.
[4] Там сама. Спр. 1176. Л. 56-57.

толькі, што ў 1941 г. па тэме дысертацыі “Сялянскі рух у Беларусі ў перыяд першай рускай рэвалюцыі 1905-1907 гадоў” працаваў старшы выкладчык БДУ, будучы член-карэспандэнт АН БССР К.І. Шабуня[5].

Перарваную ў час Вялікай Айчыннай вайны дзейнасць архіў аднавіў у 1944 г. Першапачаткова асноўная работа была накіраваная на ўпарадкаванне дакументальных матэрыялаў, якія захаваліся, росшукі і збор дакументаў, іх разборку і інвентарызацыю. Адначасова пачалася работа па выкананню тэматычных запытаў ад устаноў і арганізацый. Так, ужо ў 1944 г. па даручэнню Архіўнага ўпраўлення НКУС БССР архівам праводзіўся пошук планаў чыгунак заходніх абласцей Беларусі і Германіі[6]. У 1945 г. работа па выкарыстанню дакументальных матэрыялаў яшчэ не была распачата ў поўным аб’ёме, таму што асноўная частка бюджэтнага часу адводзілася на апрацоўку дакументаў, якія ўдалося расшукаць.

Згодна са штатным раскладам архіва, зацверджаным у 1944 г., быў створаны аддзел навукова-даведачнай літаратуры з 2-х супрацоўнікаў: начальніка аддзела (старшы навуковы супрацоўнік) і старшага архіварыуса. Адначасова ўводзілася пасада начальніка чытальнай залы (навуковы супрацоўнік). Менавіта на гэтых людзей пасля і легла асноўная частка работы па арганізацыі выкарыстання дакументаў. Неабходна таксама адзначыць, што ўсе навуковыя супрацоўнікі займаліся ў той або іншай ступені гэтай працай, уключаючы кіраўніцтва архіва. Выяўленне дакументальных матэрыялаў у народна-гаспадарчых, навуковых і даведачных мэтах праводзілася пры выкананні ўсіх відаў работ.

У 1946-1947 гг. пачалася планамерная работа па распрацоўцы дакументальных комплексаў, якія захоўваюцца ў архіве. Пачалося выяўленне дакументаў па наступных тэмах: “Карысныя выкапні Магілёўскай губерні”, “Стан сельскай і лясной гаспадаркі Магілёўскай губерні ў 1900-1917 гг.”, “Колькасць прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Магілёўскай губерні і іх размяшчэнне напярэдадні Першай імперыялістычнай вайны”. Усяго за 1947 г. па гэтых тэмах было выяўлена больш за 600 дакументаў.

У архіў паступалі тэматычныя запыты ад розных устаноў і арганізацый. За 1947 г. было выканана 20 запытаў, у выніку якіх падрыхтавана 9 станоўчых і 11 адмоўных даведак, у тым ліку аддзелу па справах архітэктуры Магілёўскага аблвыканкама аб помніках даўніны горада Магілёва і Магілёўскай губерні. Пачалося супрацоўніцтва з

[5] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1437. Л. 2-3.
[6] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 1. Л. 1 адв.-2.



рэдакцыямі цэнтральных і мясцовых газет, у тым ліку “Советской Белоруссией” і “За Радзіму”. У архіве было абсталявана спецыяльнае памяшканне для чытальнай залы на 15 працоўных месцаў. Работа чытальнай залы і афармленне асабістых спраў даследчыкаў былі арганізаваны згодна з правіламі, усталяванымі “Інструкцыяй аб парадку выкарыстання дакументальных матэрыялаў Дзяржаўнага архіўнага фонда Саюза ССР у чытальных залах дзяржаўных архіваў СССР”, зацверджанай загадам НКУС СССР (№451 ад 12 лістапада 1945 г.). У чытальнай зале на працягу 1947 г. па планавых тэмах праводзілі даследванні 9 навуковых супрацоўнікаў і 45 студэнтаў гістарычнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута. Усяго за 1947 г. адзначана 146 наведванняў чытальнай залы. Для работы даследчыкам было выдадзена 775 адзінак захавання[7].

З кожным годам выкарыстанне дакументальных матэрыялаў ЦДГА БССР пашыралася. Было арганізавана супрацоўніцтва з Інстытутам гісторыі АН БССР, а таксама з гістарычнымі факультэтамі і кафедрамі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Пашыралася кола даследчыкаў, якія працавалі ў чытальнай зале архіва, паступова пачалі ўкараняцца новыя формы папулярызацыі архіўных матэрыялаў. Так, у 1948 г. да 30-х угодкаў утварэння БССР былі падрыхтаваны 2 тэматычныя выставы дакументаў, а таксама арганізавана першая радыёперадача[8].

Да канца 1940-х гг. значна пашырылася колькасць запытаў. У 1949 г. у архіў паступіла 15 тэматычных і 56 запытаў біяграфічнага характару[9].

Пачынаючы з 1950-х гг. пры штогадовым планаванні работы архіва ўсё больш увагі ўдзялялася выкарыстанню архіўных матэрыялаў у народна-гаспадарчых мэтах. Гэта работа выконвалася згодна з заяўкамі міністэрстваў і ведамстваў БССР. Так, у 1950 г. па заяўках Міністэрства сельскай гаспадаркі і Міністэрства меліярацыі БССР вялася работа па выяўленні дакументальных матэрыялаў аб наяўнасці карысных выкапняў на тэрыторыі Беларусі, аб наяўнасці торфу, гісторыі меліярацыйных работ, аб кармавых і аднагадовых травах у Магілёўскай губерні і інш. Па гэтых тэмах рыхтаваліся тэматычныя даведкі-арыенціроўкі і агляды дакументаў. Колькасць даследчыкаў, якія працавалі ў чытальным зале на працягу года, заставалася нязменнай. На пасяджэнні Навуковага савета ЦДГА БССР ад 22 сакавіка 1950 г. начальніку чытальнай залы было даручана ўзмацніць работу па

[7] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 10. Л. 23.
[8] Тамсама. Спр. 14. Л. 17.
[9] НАРБ. Спр. 17. Л. 42.

прыцягненню даследчыкаў у чытальную залу[10]. Акрамя навуковых супрацоўнікаў матэрыяламі архіва карысталіся выкладчыкі школ, студэнты, музеязнаўцы і краязнаўцы. З дакументамі архіва працавалі не толькі жыхары Беларусі, але і навукоўцы з іншых саюзных рэспублік. У асноўным вялася распрацоўка кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, дыпломных работ, рэфератаў, рыхтаваліся матэрыялы для пашырэння музейных экспазіцый і інш. У 1950 г. аспірант з Масквы Івашчанка працаваў над кандыдацкай дысертацыяй па тэме "Пачатковая школа ў Беларусі з канца XIX стагоддзя да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі"[11], а аспірантка Акадэміі сельскагаспадарчых навук Зелькіна па тэме "Навуковая спадчына М.В. Рытава ў гісторыі рускай біялогіі". У 1951 г. у чытальнай зале працавала 19 даследчыкаў (118 наведванняў).

Расла выдача біяграфічных даведак па запытах грамадзян аб працоўным стажы, заканчэнні навучальных устаноў, а таксама метрычных выпісей і інш. У 1951 г. паступіла 150 такіх запытаў.

Да 1955 г. значна пашырылася тэматыка выяўлення дакументаў. Па запыту Міністэрства юстыцыі БССР была складзена даведка-арыенціроўка аб асабістым складзе суддзяў былых Магілёўскай і Віцебскай губерній. Праводзілася выяўленне дакументальных матэрыялаў па гісторыі тэхнікі, прыродазнаўства ў СССР, медыцыны, культуры, архітэктуры, па фальклору і этнаграфіі ў XIX стагоддзі (запыт Інстытута філасофіі і права АН БССР), па гістарычным развіцці гарадоў, абласцей і раёнаў у БССР (запыт Дзяржаўнай планавай камісіі пры Савеце Міністраў БССР)[12].

Па запыту Архіўнага аддзела УМУС па Смаленскай вобласці быў складзены пералік дакументальных матэрыялаў "Рабочы і сялянскі рух у Смаленскай губерні 1905-1907 гадоў". Павялічылася колькасць публікацый у мясцовым друку, у першую чаргу ў абласной газеце "За Радзіму". У 1955 г. у чытальнай зале архіва працавалі даследчыкі з Масквы, Ленінграда, Рыгі. Штогадовая колькасць заяў грамадзян аб атрыманні даведак біяграфічнага характару ўзрасло да 175. Па заяўках даследчыкаў у чытальную залу было выдадзена 994 адзінак захавання[13].

У сувязі з узрослай цікавасцю да гісторыі роднага краю пачала паступаць значная колькасць запытаў ад дзяржаўных устаноў і

[10] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 25. Л. 6.
[11] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 27. Л. 86.
[12] Там жа. Спр. 56. Л. 37.
[13] Там жа. Спр. 56. Л. 40.



грамадскасці па гісторыі гарадоў, сёлаў, вёсак, школ і інш. Павялічылася колькасць падрыхтаваных супрацоўнікамі архіва артыкулаў і інфармацыі для перыядычнага друку: у 1960 г. іх лік склаў 60. Калі ў 1959 г. было адзначана 150 наведванняў чытальнай залы 31 даследчыкам, то ў 1960 г. у архіве працавала 45 чалавек (наведванняў - 330). Было выдадзена 3616 адзінак захавання і 176 кніг, з якіх для даследчыкаў знята копій на 752 машынапісных лістах, 1960 кадраў мікрафотакопій дакументаў і 1162 лісты рукапісных выпісак. Паступіла 458 заяў-запытаў грамадзян біяграфічнага характару, па якіх выдадзена 69 архіўных даведак, 118 запытаў накіравана ў іншыя архівы і на 271 дадзены адмоўныя адказы[14].

Значныя змены ў рабоце ЦДГА БССР па выкарыстанні дакументальных матэрыялаў у навуковых і народна-гаспадарчых мэтах адбыліся ў 1960-я гг. Сталі актыўна ўводзіцца новыя формы работы, такія, як экскурсіі ў архіў, лекцыі, гутаркі. Па большасці матэрыялаў, выяўленых пад час працы над пэўнымі тэмамі, былі падрыхтаваны інфармацыйныя дакументы, а іх вынікі выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы артыкулаў для перыядычнага друку, а таксама лекцый і выстаў дакументаў. У гэты перыяд павялічылася колькасць інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі школ, прамысловых прадпрыемстваў, дзейнасці грамадскіх арганізацый. У 1962 г. была падрыхтавана перасоўная выстава дакументаў да 150-годдзя Айчыннай вайны 1812 года. З 1962 г. сістэматычна пачалі праводзіцца экскурсіі ў архіў (44 экскурсіі, у якіх удзельнічала 1400 чалавек), было прачытана 17 лекцый і арганізавана 44 гутаркі, на якіх прысутнічала больш 3,5 тыс. чалавек. У чытальнай зале былі арганізаваны практычныя заняткі для студэнтаў Магілёўскага педінстытута[15].

У 1963 г. было прынята рашэнне аб пераводзе ЦДГА БССР з Магілёва ў Мінск. Паводле загада начальніка Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР (№100 ад 18 лістапада 1963 г.) быў зацверджаны новы штатны расклад Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў г. Мінску, згодна з якім быў ліквідаваны аддзел навукова-даведачнай літаратуры, навукова-публікацыйная група, а таксама пасада начальніка чытальнай залы. Створаны новы аддзел выкарыстання і публікацыі, які ўзначальваў начальнік аддзела - старшы навуковы супрацоўнік. Акрамя гэтага, былі ўведзены пасады старшага навуковага супрацоўніка-археографа і навуковага супрацоўніка, які

[14] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 87. Л. 44.
[15] Там жа. Спр. 98. Л. 30-33.

адказваў за работу чытальнай залы[16]. У 1963-1965 гг. дакументы архіва былі перавезены з Магілёва ў Мінск у новы будынак архіва па вуліцы Казлова, 26. Адначасова вялася праца па абсталяванні памяшкання чытальнай залы. Пасля завершэння пераезду ў 1965 г. паводле Загада начальніка Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР №7 ад 15 красавіка 1965 г. быў зменены штатны расклад ЦДГА БССР, згодна з якім штат аддзела выкарыстання і публікацыі складаўся з начальніка, двух старшых навуковых супрацоўнікаў, малодшага навуковага супрацоўніка і архіварыуса[17]. Акрамя традыцыйных напрамкаў у галіне выкарыстання дакументальных матэрыялаў у навуковых і народна-гаспадарчых мэтах пашыраецца навукова-даследчая работа. З мэтай папулярызацыі дакументальных матэрыялаў архіва праводзяцца выставы, гутаркі ў школах, выступленне супрацоўнікаў з інфармацыяй аб складзе і змесце матэрыялаў архіва ў ВНУ, тэхнікумах, арганізацыях і на прадпрыемствах. Супрацоўнікі архіва ўдзельнічалі ў рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных навуковых канферэнцыях. У 1966 г. імі падрыхтаваны даклады на тэмы "Удзел настаўнікаў і навучэнцаў Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі 1905-1907 гадоў", "Агляд дакументальных матэрыялаў ЦДГА БССР у г. Мінску па гісторыі народнай асветы Беларусі (XIX-пачатак XX стагоддзя)", "Сялянскі рух у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны" і інш., апублікавана 35 артыкулаў, інфармацый і паведамленняў у часопісах "Нёман", "Маладосць", а таксама ў цэнтральных рэспубліканскіх газетах. Сталі традыцыйнымі радыёперадачы з удзелам супрацоўнікаў архіва. Арганізаваны тэлевізійны альманах для школьнікаў "Архіварыус". У 1965 г. праведзена 9 радыё- і 17 тэлеперадач, у 1966 г. адпаведна 23 і 22 перадачы. Наладжана супрацоўніцтва з кінастудыяй "Беларусьфільм", якая выкарыстоўвала матэрыялы архіва пры вытворчасці мастацкіх і гісторыка-дакументальных фільмаў. Пачынаючы з 1966 г. архіў стаў рыхтаваць спісы знамянальных і памятных дат па гісторыі Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду для ўключэння ў агульнасаюзны і рэспубліканскі календары. З кожным годам павялічвалася колькасць выкананых тэматычных і біяграфічных запытаў, якія паступалі ад навукова-даследчых устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў. У 1966 г. было выканана 160 тэматычных і 270 біяграфічных запытаў. Памяшканне чытальнай залы атрымала новае абсталяванне, у тым ліку апараты для работы з мікрафільмамі. Чытальная зала ўкамплектавана

[16] НАРБ. Ф. 249. Воп. 5. Спр. 917. Л. 148-152.

[17] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 119. Л. 6, 7, 18, 19.



даведачнай літаратурай, у тым ліку архіўнымі шляхаводнікамі, вопісамі найбольш запатрабаваных архіўных фондаў і інш. У 1966 г. у чытальнай зале працавалі 80 даследчыкаў, у тым ліку 2 першыя замежныя даследчыкі з Польшчы[18].

З 1967 г. у архіве сталі праводзіцца "дні адчыненых дзвярэй ". На прадпрыемствах і ў арганізацыях супрацоўнікі аддзела праводзілі сустрэчы, лекцыі і гутаркі.

У 1970-я гады архіў пачаў рыхтаваць ініцыятыўныя інфармацыі для зацікаўленых устаноў і арганізацый. За перыяд з 1976 па 1980 гг. было падрыхтавана 16 такіх інфармацый. На вялікі жаль, у 1970-я гады скарацілася колькасць тэлевізійных і радыёперадач. З 1976 па 1980 гг. было праведзена 50 радыё- і 2 тэлеперадачы, арганізавана 44 экскурсіі ў архіў, прачытана 9 лекцый, падрыхтавана 13 выстаў фотадакументаў, апублікавана 66 артыкулаў, 2 падборкі дакументаў[19]. Супрацоўнікамі архіва арганізаваны 2 навукова-практычныя канферэнцыі з удзелам настаўнікаў школ Мінскай вобласці, а ў 1980 г. праведзена канферэнцыя супрацоўнікаў ЦДГА БССР з даследчыкамі ў чытальнай зале архіва. З 1976 па 1980 гг. у зале працаваў 371 даследчык, было выканана 436 тэматычных і 302 сацыяльна-прававыя запыты.

Загадам Галоўархіва БССР №13 ад 17 жніўня 1979 г. была зацверджана новая структура Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР, згодна з якой аддзел атрымаў афіцыйную назву – аддзел інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў.

У 1980-я гады супрацоўнікі архіва далучыліся да агульнарэспубліканскай праграмы па выяўленню архіўных матэрыялаў для серыі кніг "Памяць" па ўсіх раёнах Беларусі. Заслугоўвае ўвагі досвед работы па выкарыстанні тэкставых і графічных дакументаў архіва пры распрацоўцы праектаў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры Беларусі. Сярод іх Сафійскі сабор у Полацку, Прэабражэнская царква ў Заслаўі, замкі ў Міры і Нясвіжы, рэгенерацыя гістарычнага цэнтра Мінска і інш. За ўкараненне перадавога вопыту работы па выяўленню і выкарыстанні дакументаў, якія спрыялі аднаўленню гісторыка-культурнай спадчыны, у 1984 г. пастановай Галоўнага камітэту ВДНГ СССР архіў быў зацверджаны афіцыйным удзельнікам ВДНГ СССР. ЦДГА БССР аказваў дапамогу ў стварэнні краязнаўчых, школьных музеяў і музеяў прадпрыемстваў. Дзякуючы выяўленым дакументам, экспазіцыі музеяў пашыраліся і папаўняліся новымі экспанатамі. Архіў

[18] Там жа. Спр. 128. Л. 70-80.

[19] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 299. Л. 6-7.

пачаў заключаць дагаворы аб творчым і навуковым супрацоўніцтве з установамі і арганізацыямі, з'явіўся шэраг паслуг на платнай аснове. Так, разам з аб'яднаннем "Белрэстаўрацыя" быў падрыхтаваны вялікі пералік дакументаў для праектаў рэгенерацыі гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі.

Да канца 1980-х гг. значна павялічылася колькасць тэматычных запытаў, а таксама з'явіліся генеалагічныя запыты ад устаноў і грамадзян. Іх было столькі, што архіў упершыню вымушаны быў запрашаць грамадзян для работы самастойна ў чытальнай зале. Слабы ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі такіх наведвальнікаў да работы з архіўнымі дакументамі значна павялічыў нагрузку на загадчыка чытальнай залы і іншых супрацоўнікаў. Адсутнасць у той час дасканалай капіравальнай тэхнікі ўскладняла арганізацыю ўсіх работ па выкарыстанні архіўных дакументаў, акрамя таго, у будынку архіва не было адмысловага памяшкання для размяшчэння выстаў.

Работа чытальнай залы архіва была арганізавана згодна з нарматыўнымі патрабаваннямі "Асноўных правілаў работы дзяржаўных архіваў СССР" (1984 г.) і "Правілаў работы даследчыкаў у чытальных залах дзяржаўных архіваў СССР" (1985 г.).

У 1986-1990 гады ў чытальнай зале працаваў 861 даследчык. За гэты перыяд выкананы 661 тэматычны запыт і 469 запытаў сацыяльна-прававога характару, падрыхтаваны 24 ініцыятыўныя інфармацыі, 13 выстаў дакументаў, 41 радыё- і тэлеперадача, 36 артыкулаў і падборак дакументаў[20]. Змяненне аб'ёмаў выкарыстання дакументаў запатрабавала паляпшэння якаснага і павелічэння колькаснага складу супрацоўнікаў усяго архіва і ў першую чаргу аддзела выкарыстання.

У 1990-я гады ў жыцці аддзела і ўсяго архіва адбыліся вялікія змены. Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 красавіка 1992 г. №224 на базе двух архіваў — Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнага дзяржаўнага партыйнага архіва КПБ быў створаны новы, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Адначасова быў значна павялічаны штат аддзела, колькасць супрацоўнікаў якога ўзрасла да 14 чалавек. Ён атрымаў афіцыйную назву — аддзел інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў (XIV-XIX стст.), а ў яго структуры быў створаны новы сектар – сектар гісторыі сям'і[21].

У 1995 г. на базе комплекса дакументаў XIV – пачатку XX ст. былога

[20] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 422. Л. 4.
[21] НАРБ. Ф. 505. Воп. 1. Спр. 31. Л. 2-3.



Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР быў створаны самастойны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Загад Камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь №15 ад 2 чэрвеня 1995 г.).

У апошні час значна змяніліся задачы і формы работы аддзела. У 2004 г. у сувязі са стварэннем у архіве самастойнага аддзела публікацыі дакументаў аддзел выкарыстання атрымаў новую назву – аддзел навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі. Зараз у ім працуе 12 штатных супрацоўнікаў.

У сваёй дзейнасці аддзел навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі кіруецца Законам Рэспублікі Беларусь "Аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь", а таксама заканадаўчымі актамі, нарматыўнымі і метадычнымі матэрыяламі па выкарыстанні і публікацыі архіўных дакументаў і забеспячэнню правоў і законных інтарэсаў грамадзян па атрыманні рэтраспектыўнай інфармацыі. Згодна з палажэннем аб аддзеле, зацверджаным дырэктарам Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (№01 03/9 ад 9 студзеня 2007), задачамі аддзела з'яўляюцца:

вызначэнне асноўных напрамкаў і аналіз работы архіва па выкарыстанню дакументаў, а таксама падрыхтоўцы прапаноў па іх удасканаленню;

вывучэнне перадавога айчыннага і замежнага вопыту ў вобласці выкарыстання дакументаў і ўкараненне яго ў практыку работы;

нарматыўна-метадычнае забеспячэнне работы па выкарыстанні дакументаў архіва.

Паводле гэтых задач аддзел інфармуе ўстановы і арганізацыі, зацікаўленыя ў рэтраспектыўнай інфармацыі аб дакументах архіва праз сродкі масавай інфармацыі, выяўляе дакументы па запытах органаў дзяржаўнага кіравання, вывучае патэнцыяльныя патрэбы грамадства ў рэтраспектыўнай інфармацыі, ажыццяўляе рэкламаванне работ і паслуг, якія выконваюцца па дакументах архіва, выконвае тэматычныя, біяграфічныя і генеалагічныя запыты дзяржаўных устаноў і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, прадпрыемстваў і арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці, замежных арганізацый, а таксама грамадзян Рэспублікі Беларусь і замежных грамадзян, выдае ім ва ўсталяваным парадку даведкі, копіі і выпіскі з дакументаў.

У апошнія гады ўсё больш паступае запытаў ад мясцовых Саветаў, дзяржаўных устаноў, грамадскіх арганізацый у сувязі са святкаваннем юбілейных дат.

Значнае месца ў рабоце аддзела займае падрыхтоўка тэле- і

радыёперадач. У апошнія гады вялікая цікавасць да дакументальных матэрыялаў узнікае ў аўдыёвізуальных сродкаў масавай інфармацыі. Архіў аказвае вялікую дапамогу “Белтэлерадыёкампаніі” (Першы Нацыянальны канал, тэлеканал “Лад”, СТБ і АНТ, радыёстанцыі “Культура”, “Беларусь”) у падрыхтоўцы інфармацыйных паведамленняў і тэматычных перадач. Арганізавана супрацоўніцтва з “Белвідэацэнтрам” Міністэрства культуры, а таксама кінастудыяй “Беларусьфільм”.

Супрацоўнікі аддзела рыхтуюць дакументальныя публікацыі па профілю архіва згодна з задачамі асветніцкай работы, праблемамі развіцця навукі і культуры (артыкулы, нарысы, падборкі і іншыя матэрыялы для перыядычнага друку).

Важнае месца ў папулярызацыі дакументальнай спадчыны займаюць выставы дакументаў. У 1990-2000-х гг. тэматыка выстаў архіва пашырылася: сталі экспанавацца не толькі копіі, але і аўтэнтычныя дакументы. Традыцыйнымі сталі сумесныя выставы гістарычнага архіва і Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі, Мінскай абласной бібліятэкі імя А. Пушкіна. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі на працягу шэрагу гадоў супрацоўнічае з Мінскай гарадской цэнтральнай бібліятэкай імя Я. Купалы. Традыцыйнымі сталі штогадовыя сумесныя выставы, прысвечаныя Дню горада Мінска.

Супрацоўнікі аддзела праводзяць экскурсіі па архіву, лекцыі, сустрэчы з грамадскасцю, удзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні нарадаў, семінараў, у рабоце навуковых і навукова-практычных канферэнцый, забяспечваюць работу навукова-даведачнай бібліятэкі і даведачна-інфармацыйнага фонда архіва, арганізуюць дзейнасць чытальнай залы згодна з усталяваным парадкам, забяспечваюць кваліфікаванае абслугоўванне даследчыкаў у чытальнай зале.

Пачынаючы з 1965 г. аддзелам кіравалі Т.А. Вераб’ёва (1965-1975), Я.Л. Бравер (1975-1990), А.К. Галубовіч (1990-1993); У.П. Крук (1993-1995), С.Ф. Адамовіч (1995-2000), С.А. Рыбчонак (2000-2007). З 1 студзеня 2008 г. аддзелам кіруе В.А. Ходзіна (гл. біяграфічныя даведкі аб супрацоўніках архіва).

Значнае месца ў навуковым выкарыстанні дакументаў архіва займае работа чытальнай залы. Колькасць яе наведвальнікаў няспынна ўзрастае. У апошні час штогод яго паслугамі карыстаецца да 500 чалавек. Павелічэнне колькасці даследчыкаў запатрабавала змянення рэжыму працы. З 2007 г. усталяваны новы распарадак работы чытальнай



залы: у буднія дні - штодня з $9^{00}$ да $20^{00}$, у суботу з $9^{00}$ да $15^{00}$, нядзеля выхадны. Кожную пятніцу праводзяцца санітарныя дні. Чытальную залу абслугоўваюць 3 супрацоўнікі, у тым ліку загадчык чытальнай залы М.І. Блашкова (галоўны архівіст) і М.Т. Скіданава (вядучы архівіст). Работа чытальнай залы арганізавана паводле “Правілаў работы дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь”, зацверджаных пастановай Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь №7 ад 25 лістапада 2005 г. чытальная зала забяспечана неабходнай навукова-даведачнай літаратурай: энцыклапедыямі, слоўнікамі, даведнікамі па адміністратыўна-тэрытарыяльнаму падзелу і інш. У наяўнасці ёсць пафондавая картатэка, вопісы на больш запатрабаваныя фонды, тэматычныя і пафондавыя агляды, пераводныя табліцы да “Каталога” М. Гарбачэўскага, “Паказальніка” М. Спрогіса (з пазначэннем нумароў фондаў, вопісаў і актавых кніг, якія захоўваюцца ў архіве), агляды і пералікі дакументаў па гісторыі Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду, каталог кніг навукова-даведачнай бібліятэкі архіва. Даследчыкі таксама маюць магчымасць карыстацца сістэматычным, імянным і сфрагістычным каталогамі.

Афармленне даследчыкаў для работы ў чытальнай зале адбываецца згодна з адпаведнымі правіламі. У мэтах аказання метадычнай дапамогі ў падборы дакументаў і ў рабоце з імі кансультацыі праводзяць не толькі супрацоўнікі чытальнай залы, але і супрацоўнікі ўсяго аддзела інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў. Пры неабходнасці да кансультацый прыцягваюцца супрацоўнікі іншых аддзелаў.

Сярэдняя наведвальнасць чытальнай залы за перыяд з 2000 па 2004 г. у дзень складала 18-20 чалавек, у 2005-2006 гг. – 26-28 чалавек.

Сярэдняя штодзённая наведвальнасць у 2007 г. склала 36-38 чалавек, а ў асобныя дні – да 50.

Штогод узрастае колькасць архіўных спраў і мікрафотакопій дакументаў, якія выдаюцца ў чытальную залу.

| | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць выдадзеных спраў | 11714 | 11693 | 13643 | 12358 | 12662 | 15931 | 17249 |
| Колькасць выдадзеных МКФ | 7989 | 8575 | 7838 | 11939 | 8065 | 11611 | 11552 |

Сярод наведвальнікаў чытальный залы пераважаюць даследчыкі, якія працуюць над планавымі навуковымі тэмамі. Гэта супрацоўнікі навукова-даследчых інстытутаў, выкладчыкі навучальных устаноў, студэнты, журналісты, працаўнікі музеяў, краязнаўцы і інш., якія працуюць над падрыхтоўкай доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, магістарскіх, дыпломных і курсавых работ, над распрацоўкай праектаў рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры, падрыхтоўкай публікацый навуковых работ, артыкулаў і манаграфій, над стварэннем экспазіцый музеяў і выстаў. У апошнія гады ўзрасла колькасць наведвальнікаў, якія займаюцца вывучэннем гісторыі сваёй сям'і.

Акрамя айчынных у чытальнай зале працуюць даследчыкі з Польшчы, Літвы, Латвіі, Украіны, Расіі, Францыі, Ізраіля, ЗША і іншых краін.

| | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго даследчыкаў | 367 | 505 | 500 | 451 | 463 | 566 | 580 |
| Айчынныя даследчыкі | 329 | 457 | 460 | 401 | 420 | 518 | 526 |
| У тым ліку: навуковыя тэмы | 76 | 82 | 84 | 65 | 84 | 39 | 50 |
| генеалогія | 96 | 104 | 126 | 97 | 113 | 187 | 171 |
| іншыя тэмы | 157 | 271 | 250 | 239 | 223 | 292 | 305 |
| Замежныя даследчыкі | 38 | 48 | 40 | 50 | 43 | 48 | 54 |
| У тым ліку: генеалогія | 9 | 11 | 11 | 5 | 9 | 18 | 15 |
| навуковыя тэмы | 29 | 37 | 29 | 45 | 34 | 30 | 39 |
| Краіны | Англія Балгарыя Германія Літва Польшча Расія Украіна Францыя Швейцарыя | Італія Латвія Літва Польшча Расія Украіна Японія | Латвія Літва Польшча Расія Украіна Японія | Германія Ізраіль Літва Польшча Расія Украіна Францыя | Ізраіль Латвія Літва Польшча Расія Украіна Францыя Швейцарыя | Ізраіль Латвія Літва Польшча Расія Канада ЗША Украіна Францыя Швецыя | Ізраіль Латвія Літва Польшча Расія ЗША Украіна Францыя |



Даследчыкам выдаюцца справы, якія адносяцца да тэмы даследавання згодна з храналагічнымі рамкамі работы. Дакументы, на якія створаны страхавы фонд, выдаюцца толькі ў мікрафотакопіях. Для работы з мікрафотакопіямі маюцца спецыяльныя апараты. Капіраванне дакументаў па замовах даследчыкаў выконваецца паводле існуючых правіл. Створаны ўмовы для забеспячэння захаванасці дакументаў, якія выдаюцца ў чытальную залу. Для іх абсталявана адмысловае памяшканне.

Улік работы чытальнай залы праводзіцца ў спецыяльнай кнізе. Існуе журнал рэгістрацыі даследчыкаў і іх асабістых спраў, а таксама журнал рэгістрацыі наведвання даследчыкамі чытальнай залы. Створаны картатэкі даследчыкаў з паказаннем назваў і нумароў выкарыстаных фондаў архіва, уліку апублікаваных работ па дакументах архіва, алфавітная картатэка даследчыкаў. У чытальнай зале маецца кніга водгукаў і скаргаў.

Вялікі ўклад у работу аддзела, пачынаючы з дня яго стварэння, унеслі супрацоўнікі архіва: Н.А. Бабіч, М.І. Блашкова, Я.Л. Бравер, Н.К. Булыга, І.Л. Вернер, А.К. Галубовіч, В.У. Губіна, Л.Д. Гусакова, У.М. Дзянісаў, Р.С. Жаўняркевіч, В.В. Кернажыцкая, М.Г. Кныш, Л.А. Кавалёва, Н.М. Казапалянская, У.Л. Казлоў, В.Х. Канаваленка, С.М. Корбут, І.Г. Карнеева (Мазурэнка), Т.А. Котава, У.П. Крук, М.Д. Матусевіч, К.П. Міхайлава, І.Л. Новікава, С.С. Паскрэбка (Валковіч), Г.А. Прыка, А.В. Расказава, С.А. Рыбчонак, Т.І. Седлярэвіч, В.В. Сімагасціцкая, М.Т. Скіданава, І.І. Сухаверх, І.М. Філонава, В.А. Ходзіна, І.М. Шпілеўская і інш.

*У.М. Дзянісаў*

## Аддзел публікацыі дакументаў

За ўсе часы неад'емнай часткай дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і яго супрацоўнікаў з'яўлялася публікацыя зборнікаў дакументаў, даведнікаў, асобных артыкулаў (гэта тычыцца і архіваў-папярэднікаў – Цэнтральных архіваў старажытных актаў у Вільні і Віцебску).

Адпаведна з Пастановай Савета Міністраў БССР № 9 ад 10 студзеня 1961 г. у ЦДГА БССР створана навукова-публікатарская група. У яе склад уваходзіў адзін старшы навуковы супрацоўнік – археограф, якім

з'яўляўся Эдуард Міхайлавіч Савіцкі[1]. Загадам Архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР № 100 ад 18 лістапада 1963 г. была зацверджана новая структура гістарычнага архіва, дзе ўпершыню быў зафіксаваны аддзел з новай назвай – выкарыстання і публікацыі[2].

У 1979 г. згодна з загадам Галоўнага архіўнага Упраўлення пры Савеце Міністраў БССР ад 7 жніўня аддзел атрымаў больш пашыраную назву – аддзел інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, з якой існаваў да стварэня ў 2004 г. асобнага аддзела публікацыі дакументаў. Адбылося гэта ў адпаведнасці з рашэннем Старшыні камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь У.І. Адамушкі і загадам дырэктара НГАБ А.К. Галубовіч № 24 ад 25 чэрвеня 2004 г. У выніку з 1 ліпеня 2004 г. аддзел інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў быў рэарганізаваны ў аддзел інфармацыі і навуковага выкарыстання і аддзел публікацыі дакументаў. Апошні быў створаны ў колькасці сямі чалавек: загадчыка (З.Л. Яцкевіча), 2-х галоўных архівістаў (Г.М. Брэгера, А.А. Цвіркі), 2-х вядучых навуковых супрацоўнікаў (У.М. Дзянісава, І.Я. Войніча), старшага навуковага супрацоўніка (З.В. Антановіч, працуе са снежня 2004 г.) і вядучага архівіста. За перыяд з 2004 г. у аддзеле працавала 18 чалавек. Падобная вялікая колькасць супрацоўнікаў тлумачыцца пэўнай цяжкасцю і складанасцю працы, якая патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі (неабходны грунтоўныя веды і адпаведныя навыкі ў галіне палеаграфіі, археаграфіі, архівазнаўства, рэдактуры, карэктуры, вёрсткі, дызайну і інш.).

Супрацоўнікі на працягу існавання архіва друкавалі дакументы і матэрыялы як у асобных зборніках дакументаў, так і ў часопісах «Исторический архив», «Вопросы архивоведения», «Отечественные архивы», «Советские архивы», «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», «Архівы і справаводства», «Беларускі гістарычны часопіс» і інш.

Публікацыйную дзейнасць архіва можна падзяліць на тры перыяды:

1) 1950-я гг.–1992 г.;

2) 1992–2004 гг.;

3) 2004 г.–да цяперашняга часу.

З 1959 па 1979 гг. архіў прыняў удзел у падрыхтоўцы сумесна з Акадэміяй навук, Інстытутам гісторыі Акадэміі навук, Архіўным упраўленнем МУС (затым – пры Савеце Міністраў БССР) зборніка «Белоруссия в эпоху феодализма. С древнейших времен до середины

[1] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 82. Арк. 105.

[2] НГАБ. Ф. 251(ба). Воп. 3. Спр. 3. Арк. 19.



XVII века»[3]. Храналагічна ён ахоплівае перыяд з 1-й паловы XII ст. да 1861 г. і складаецца з 4 тамоў (т. 1 – 1959; т. 2 – 1960; т. 3 – 1961; т. 4 – 1979). Зборнік насычаны статыстычнымі табліцамі, губернатарскімі справаздачамі, канцылярскімі ведамасцямі, тапаграфічнымі апісаннямі і інш. Большасць дакументаў апублікавана на рускай і старажытна-беларускай мовах, некаторыя акты – у перакладзе з польскай і лацінскай моў. У канцы тамоў пададзены спісы апублікаваных дакументаў, прадметна-тэматычныя і геаграфічныя паказальнікі. Зборнік з'яўляецца адным з найбольш значных дакументальных шматтомных выданняў, прысвечаных феадальнаму перыяду гісторыі Беларусі, якія ўбачылі свет у 1950–1970-я гг. У ім выкарыстаны многія новыя крыніцы, якія на сённяшні дзень захоўваюцца ў архівах Масквы (Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў, Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі), Санкт-Пецярбурга (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў), Вільнюса (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы), Мінска (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь) і інш. Да недахопаў выдання адносіцца адсутнасць арыгінальных тэкстаў некаторых актаў і дакументаў. На ўнутранай перыядызацыі асобных раздзелаў адмоўна адбіліся дагматычныя канцэптуальныя схемы афіцыйнай беларускай і рускай гістарыяграфіі[4].

Маскоўскім выдавецтвам «Наука» ў 1965 г. выпушчаны зборнік «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863–1864 гг. Матэрыялы і дакументы», які налічвае 588 старонак[5]. Зборнік выдадзены пад эгідай Інстытута славяназнаўства Акадэміі навук СССР, Галоўнага архіўнага ўпраўлення СССР, Інстытута гісторыі Акадэміі навук Літоўскай ССР, Архіўнага ўпраўлення Літоўскай ССР, Інстытута гісторыі Польскай акадэміі навук, Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных архіваў, Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларускай ССР, Архіўнага ўпраўлення Беларускай ССР.

У зборніку надрукавана 278 дакументаў па паўстанню 1863–1864 гг., большасць з іх – упершыню. У падрыхтоўцы крыніц дадзенага выдання прымалі ўдзел Л.В. Аржаева – дакументы па Гродзенскай губерні (Архіўнае ўпраўленне пры Савеце Міністраў Беларускай ССР), Т.Я. Лявонцьева – дакументы па Мінскай губерні (ЦГА БССР у г. Мінску), Н.І. Булдакова – дакументы па Віцебскай і Магілёўскай губернях (ЦГА БССР у г. Мінску). Складаннем раздзелаў па Беларусі кіравала С.М. Байкова (Інстытут гісторыі АН БССР), астатніх раздзелаў – Г.В. Кісялёў (Архіўнае

[3] Белоруссия в эпоху феодализма. С древнейших времен до середины XVII века. Мн., 1959. 516 с.

[4] Г. Галенчанка. Беларусь у эпоху феадалізму / Вялікае княства Літоўскае. Беларуская энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 2005.

[5] Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863-1864 гг. Матэрыялы і дакументы. М., 1965. - 588 с.

ўпраўленне пры Савеце Міністраў Літоўскай ССР).

Важнай вехай у працы архівістаў гістарычнага архіва сталі падрыхтоўка і выданне даведнікаў па фондах архіва. Першы з іх пабачыў свет ў 1959 г. ў аб'ёме 164 старонкі[6]. Ён складаўся з адзіннацаці асноўных раздзелаў з анатацыямі на фонды, выдзеленых на падставе агульнапрынятай схемы дзяржаўных, рэлігійных і грамадскіх устаноў ВКЛ і Расійскай імперыі, і навукова-даведачнага апарата у выглядзе спіса неанатаваных фондаў, асабовага, геаграфічнага і прадметнага паказальнікаў. Над падрыхтоўкай даведніка працавалі загадчык аддзела агульных фондаў В.А. Гусарэвіч, старшы архіварыус Р.І. Зіміна, А.М. Пішчык, намеснік начальніка архіва У.П. Пахвалаў (які з'яўляўся адказным за выпуск) і начальнік ЦДАГА М.Ф. Шпакаў (які таксама выконваў абавязкі карэктара).

У 1974 г. быў выдадзены другі пуцевадзіцель, які налічвае 336 старонак[7]. У выданні анатуюцца дакументы, што стварыліся ў працэсе дзейнасці губернскіх, павятовых і валасных органаў улады і кіравання, гаспадарча-эканамічных, фінансавых, жандарскіх, паліцэйскіх, судовых, культурна-асветных і іншых устаноў былых Полацкай (1776–1796), Беларускай (1797–1802), Магілёўскай (1772–1796, 1802–1918) губерняў, а таксама матэрыялы за перыяд уваходжання Беларусі ў склад Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

У серыі «Инвентари магнатских владений Белоруссии: Конец XVI–XVIII вв.» з'явіўся першы зборнік «Владение Сморгонь»[8], выдадзены пад тытулам: «Главное архивное управление при Совете Министров БССР, Институт истории АН БССР, Центральный государственный исторический архив». Зборнік уключае 9 інвентароў, што ўяўляюць сабой гаспадарачыя вопісы ўладання Смаргонь (Ашмянскі павет Віленскага ваяводства). Дакументы выяўлены ў архівах Літоўскай ССР і БССР. Археаграфічную апрацоўку перакладаў і адпаведную частку прадмовы зрабіла Я.Л. Бравер. Яна таксама падрыхтавала прадметны і геаграфічны паказальнікі, спіс скарачэнняў. У другі зборнік «Владение Тимковичи»[9] ўключаны інвентары, што ўяўляюць сабой гаспадарчыя вопісы

[6] Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР: Путеводитель / Под ред. Е.П. Лукьянова, В.Н. Жигалова, В.П. Похвалова. Могилев: Могилевская областная типография, 1959.

[7] Центральный государственный исторический архив БССР в Минске. Путеводитель. Мн.: Изд. «Полымя», 1974. 336 с.

[8] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв. Владение Сморгонь. Мн., 1977. -256 с.

[9] Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв. Владение Тимковичи. Мн., 1982.- 216 с.



графства Цімкавічы, размешчанага ў Слуцкім княстве Навагрудскага ваяводства (цяпер Капыльскі раён Мінскай вобл.). Архіўныя дакументы, прадстаўленыя ў зборніках, публікаваліся ўпершыню.

Першы том запланаванага ў трох тамах зборніка «Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии: Конец XIV в.–1648 г.: Сборник документов и материалов»[10] выдадзены пад грыфам «Главное архивное управление при Совете Министров БССР, Центральный государственный исторический архив, Институт истории Академия наук БССР». Ён планаваўся як першы том трохтомнага выдання, прысвечанага сацыяльна-палітычнай барацьбе народных мас Беларусі з канца XIV ст. да 1648 г.

Эканамічнае і палітычнае становішча сялян і гараджан, узмацненне нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту і формы барацьбы супраць яго ілюструюцца 167 дакументамі. У археаграфічнай апрацоўцы дакументаў прымалі ўдзел Я.Л. Бравер (ёй жа складзены тэрміналагічны слоўнік) і Э.Л. Казлоўская. На жаль, наступныя тамы так і не пабачылі свет. Зніклі нават іх рукапісы.

Серыя «Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII стст.» была заснавана яшчэ ў 1996 г. як выданне, у якім плануецца друкаваць гістарычныя дакументы, а таксама архіўныя, археаграфічныя і іншыя доследы згаданага перыяду. Як вядома, даследаванняў гэтага часу вельмі мала. Лічаныя адзінкі з іх трапляюць у рукі не толькі шырокага кола чытачоў, але і навукоўцаў. У той жа час толькі ў НГАБ захоўваецца больш за мільён рукапісных спраў, з якіх звыш 10 тыс. адносіцца да перыяду XVI–XVIII стст. Пэўная частка дакументаў гэтага часу захоўваецца ў НГАБ у г. Гродна, а таксама ў бібліятэках нашай краіны. Вялікая колькасць дакументаў знаходзіцца за межамі Беларусі. Аб гэтым яскрава засведчыла праца камісіі «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, якая адлюстравалася ў шасці зборніках з адпаведнай назвай. Але фінансавыя і іншыя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя праблемы дазволілі выйсці ў свет першай кнізе гэтай серыі толькі ў 1999 г. Менавіта гэты год можна лічыць пачаткам адраджэння выдавецкай дзейнасці гістарычнага архіва. Тады ўпершыню на Беларусі быў здзейснены першы выпуск навуковага выдання ў дадзенай серыі, прысвечаны актавым кнігам Магілёўскага магістрата (1580–1581, 1588)[11]. Выпуск знаёміць чытача з новымі архіўнымі і археаграфічнымі даследаваннямі дакументаў Магілёўскага

[10] Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии: Конец XIV в.–1648 г.: Сб. документов и материалов. В 3 т. Т. 1. Мн., 1988. 303 с.

[11] Беларусь у актавых кнігах XVI-XVIII стст. Вып. 1: Магілёўскі магістрат. 1580–1581, 1588 / Склад. З.Л. Яцкевіч, А.А. Лашкевіч. Мн.: БелНДІДАС, 1999. 462 с.

магістрата, праведзенымі ў апошнія гады ў аддзеле старажытных актаў НГАБ. Каштоўнасць гэтых крыніц немагчыма пераацаніць. Праўда, да цяперашняга часу яны застаюцца маладаступнымі для шырокага кола даследчыкаў, што звязана з шэрагам фактараў: па-першае, месца захавання (архіў), адзіны арыгінал і мікрафільм; па-другое, старабеларуская мова і палеаграфія (кірылічны скарапіс) гэтых унікальных помнікаў. Адзначаныя фактары ўзмацняюць каштоўнасць дадзенага выдання. Яго навукова-даведачны апарат уключае падрабязны змест (загалоўкі), а таксама асабовы і геаграфічны паказальнікі, тэрміналагічны слоўнік. У 2006 г. нарэшце пабачыў свет другі выпуск «Магілёўскага магістрата 1597–1598, 1599–1600, 1602–1603 гг.»[12]. Ужо сёння ў межах азначанай серыі падрыхтаваны да друку «Ашмянскі гродскі суд 1661–1663 гг.», «Мінскі гродскі суд 1640–1647 гг.». Таксама завяршаецца праца над зборнікам дакументаў «Тэстаменты XVI ст.».

У 2001 г. супрацоўнікам архіва А. Грушам выдадзена «Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44. Кніга запісаў 44 (1559–1566)»[13] аб'ёмам 229 старонак. Адначасова была заснавана яшчэ адна серыя «Беларуская гістарычная бібліятэка», якая, на жаль, не атрымала свайго працягу. Метрыка ВКЛ – унікальны збор рукапісных кніг XV–XVIII стст., што сфарміраваўся пераважна ў працэсе дзейнасці канцылярыі ВКЛ, першасная крыніца па гісторыі ВКЛ і народаў, якія ўваходзілі ў яго склад. Без выкарыстання матэрыялаў Метрыкі не абыходзілася і не абыходзіцца ніводная з грунтоўных прац па гісторыі ВКЛ. Публікуемая кніга Метрыкі 44 – адна з кніг збору – змяшчае больш за 100 копій дакументаў, што выйшлі з дзяржаўнай канцылярыі з 1559 па 1566 гг. Дакументы разнастайныя па відах: прывілеі князя на розныя дараванні ваенна-служыламу класу, буйным і сярэднім дзяржаўным ураднікам, пацвярджэнні на гэтыя дараванні, дакументы, з дапамогай якіх вялікі князь паведамляў мясцовым уладам свае распараджэнні і г.д. Матэрыялы кнігі адлюстроўваюць дзейнасць скарбу ВКЛ, развіццё землеўладання. Яны могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні праблем гістарычнай геаграфіі, дыпламатыкі, кадзікалогіі, гістарычнага дакументазнаўства і г.д.

Яшчэ адна серыя «Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства» была заснавана ў 1998 г. У яе межах НГАБ выдае зборнік навуковых артыкулаў

[12] Беларусь у актавых кнігах XVI-XVIII стст. Вып. 2: Магілёўскі магістрат. 1597–1598, 1599-1600, 1602-1603 / Аўт.-склад. А.А. Лашкевіч і З.Л. Яцкевіч. Ч. 1-2. Мн.: БелНДІДАС, 2006. 824 с. (ч. 1 – 393 с., ч. 2 – 435 с.).

[13] Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44. Кніга запісаў 44 (1559–1566). Мн., 2001.- 229 с.



і паведамленняў «Архіварыус»[14]. На сённяшні дзень выдадзены пяць выпускаў і падрыхтаваны шосты. Ён прысвечаны даследаванням па архівазнаўству, археаграфіі і крыніцазнаўству. Падобных выданняў раней не было не толькі ў Беларусі, але і ў архіўных установах СНД. Зборнік складаецца з 8 раздзелаў, звестак пра аўтараў і рэзюмэ. Уключаныя ў яго паведамленні і артыкулы з'яўляюцца арыгінальнымі, таму што грунтуюцца на першакрыніцах. Структура зборніка ўсебакова адлюстроўвае навуковыя інтарэсы калектыва аўтараў. Зборнік уключае ў сябе не толькі публікацыі архіўных дакументаў, але і матэрыялы па праблемах захаванасці і выкарыстання архіўнай спадчыны і інш. Актуальнасць зборніка відавочная. Сярод аўтараў – не толькі архіўныя работнікі, але ўвогуле даследчыкі беларускай гісторыі. Такі падыход дазволіць і ў перспектыве падтрымліваць высокі навуковы ўзровень зборніка. Вельмі добра, калі паралельна з дакументамі айчынных архіваў падаецца інфармацыя замежных архіваў і матэрыялаў з іх, якія тычацца гісторыі Беларусі. Так, у яго раздзеле «Архівазнаўства» размясцілі свае даследаванні з замежных і айчынных архіваў А.І. Дзярновіч («Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. Том III.»), Г.М. Брэгер («Сумны лёс Бешанковіцкага архіва Храптовічаў», «Архіў маёнтка Глыбокае Зяновічаў і Радзівілаў у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве»), А.Ф. Раманкевіч («Адзін са старажытнейшых рэестраў беларускіх архіваў. Пінскі гродскі суд. 1522–1631 гг.»).

Гісторыя – гэта заўсёды факты, а ў нашым выпадку аўтары прыводзяць не толькі менавіта іх, а таксама і дакументы, першакрыніцы. У любым артыкуле з раздзелаў «Гісторыя» ці «Публікацыя архіўных дакументаў» абавязкова знойдуцца новыя, яшчэ не друкаваныя звесткі, а звесткі пра Сафію Слуцкую і Паўлюка Багрыма (В.У. Бабковай), І. Дамейку (В.В. Гарбачовай), І. Гашкевіча (І.Л. Вернер) ці М. Шагала (У.М. Дзянісава) – гэта цудоўнае адкрыццё, пасля якога нельга ставіць кропку. Здаецца, што пра княгіню і беларускую святую С. Слуцкую сказана і напісана шмат, а вось В. Бабкова, пасля новай знаходкі ў біяграфіі княгіні дала навукоўцам роздум над загадкай аб працяглацсі яе зямнога жыцця. Колькі ж сапраўды яна пражыла – 25 ці 27 гадоў? Цікава, што абедзве лічбы засведчаны рукапісамі. Падобныя пытанні дзесяткі гадоў даследуюцца і дыскутуюцца навукоўцамі, і толькі новыя архіўныя

[14] Архіварыус. Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001. 190 с.; Вып. 2. Зб. навук. паведамл. і арт. Мн., 2004. 198 с.; Вып. 3. Зб. навук. паведамл. і арт. Мн., 2005;. Вып. 4. Зб. навук. паведамл. і арт. Мн., 2006. 220с.; Вып. 5. Зб. навук. паведамл. і арт. Мн., 2007. 220 с.

знаходкі могуць даць адказ. Сведчанне таму – артыкулы З.Л. Яцкевіча «Радавод Адама Ганорыя Кіркора ў святле новых архіўных дакументаў» і С.А. Рыбчонка «Радавод Хлявінскіх». Напрыклад, чаму ў адным і тым жа дакуменце адно і тое ж прозвішча ці геаграфічная назва маюць розныя варыянты напісання: Сегал – Сагал – Шагал (у артыкуле У. Дзянісава «Новыя дакументы да біяграфіі і радаводу Марка Шагала»)? Трэба ведаць, што такое напісанне характэрна для складальнікаў дакументаў таго перыяду. Бясспрэчна, што без глыбокага ведання крыніцазнаўства не абысціся пры працы з архіўнымі дакументамі. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца артыкулы Р.С. Жаўняркевіча, А.А. Лашкевіча, У.М. Свяжынскага, І.У. Ганецкай з адпаведнага раздзела.

Пра постаці нашых папярэднікаў-архівістаў распавядаюць матэрыялы І.Л. Новікавай і З.Л. Яцкевіча. Кожнае чарговае выданне «Архіварыуса» з'яўляецца "візітнай карткай" архіва, якая адлюстроўвае багацце і унікальнасць змешчаных матэрыялаў, над якімі яшчэ трэба будзе працаваць. Гэта магчымасць сказаць важкае слова аб гісторыі свайго народа, Айчыны, нацыянальнай свядомасці, аб тым, чаго мы варты ў свеце.

У НГАБ з пачатку 1996 г. праводзіцца планавая распрацоўка тэмы «Генеалогія і геральдыка шляхецкіх родаў Беларусі». Яе мэта – на падставе ўсебаковага вывучэння неабходных архіўных дакументаў, спецыяльнай літаратуры і іншых апублікаваных крыніц падрыхтаваць да выдання энцыклапедычны даведнік па генеалогіі і геральдыцы шляхецкіх родаў Беларусі, у тым ліку звесткі пра іх паходжанне, валоданне маёнткамі, выявы гербаў і пячатак, якімі яны карысталіся, пасады вядомых прадстаўнікоў роду і іншую інфармацыю. У выніку ў НГАБ распачата шматтомнае выданне пад агульнай назвай «Гербоўнік беларускай шляхты»[15]. Першы том у чорна-белым выкананні і мяккай вокладцы, які ўключае 192 радаводы на літару «А» (рускія і польскія літары «А» і «О») аб'ёмам 493 старонкі, выдадзены ў 2002 г., даўно стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. У 2007 г. пабачыў свет 2-гі том «Гербоўніка беларускай шляхты» (каляровы, ў цвёрдай вокладцы)[16], які з'яўляецца вынікам шматгадовай крапатлівай работы супрацоўнікаў НГАБ (у другім – 320 радаводаў на літару "Б").

Кнігі складаюцца з прадмовы, спіса скарачэнняў, артыкулаў асноўнай часткі, навукова-даведачнага апарата, спіса малюнкаў гербаў, алфавітнага спіса гербаў з пазначэннем родаў, якія імі карысталіся,

[15] Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 1. / Т. Капіца, А. Леўчык, С. Рыбчонак і інш. Мн.: Мн.: БелНДІДАС, 2002. 493 с.

[16] Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 2. / Склад. С. Рыбчонок [і інш.]. Мн.: НГАБ, 2007. - 672 с.



каляровых малюнкаў (90 гербаў і іх варыянты) і зместу. У прадмове сцісла апісваецца гісторыя генеалогіі як навукі ў незалежнай Беларусі, даецца пералік крыніц і выданняў па генеалогіі, апісваюцца прынцыпы напісання артыкулаў да гербоўніка, разглядаюцца некаторыя праблемы, з якімі могуць сутыкацца даследчыкі пры вывучэнні генеалогіі. У зборніку таксама змешчаны спіс скарачэнняў, якімі карысталіся аўтары пры яго падрыхтоўцы. Асноўнае месца ў выданні займаюць радаводы. Артыкулы па генеалогіі напісаны па аднолькавай схеме, якая складаецца з наступных частак: назва – прозвішча з гербам, уступная частка – родавыя паданні аб паходжанні, звесткі пра наданне гербу ці яго змене, карыстанне гербавымі ці родавымі прыдомкамі; асноўная частка – генеалогія роду ў выглядзе пакаленнага роспісу, які ўключае рэальнага родапачынальніка, яго нашчадкаў з пазначэннем сваяцкіх сувязей, фактаў валодання зямлёй, цывільных ці вайсковых урадаў, месцаў пражывання. Асноўная частка завяршаецца інфармацыяй пра дату вываду ў Дваранскім дэпутацкім сходзе з пазначэннем часткі радаслоўнай кнігі, загада Дэпартамента Герольдыі пры Сенаце аб зацвярджэнні (ці незацвярджэнні) роду ў дваранстве Расійскай імперыі, архіўнымі крыніцамі, літаратурай, а таксама заўвагамі.

Асабовы паказальнік змяшчае ўсе згаданыя прозвішчы (з варыянтамі, прыдомкамі, дзявочыя і шлюбныя прозвішчы з указаннем чарговасці шлюбаў, бацькоў і іншых звестак). Геаграфічны паказальнік уключае назвы населеных пунктаў і іншых аб'ектаў, іх адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць падчас існавання Рэчы Паспалітай ці Расійскай імперыі. Упершыню друкуюцца каляровыя выявы гербаў з архіўных дакументаў першай паловы XIX ст., а таксама алфавітны спіс гербаў з пазначэннем родаў, якія імі карысталіся.

Дадзеная праца – важкі ўнёсак беларускіх архівістаў у равіццё айчыннай і сусветнай генеалагічнай, а таксама гістарычнай навукі. У той жа час праца разлічана не толькі на спецыялістаў, але і на аматараў, якія цікавяцца старонкамі мінуўшчыны Беларусі.

У 2006 г. пабачыў свет даведнік «Минская губерния. Государственные, религиозные и общественные учреждения. 1793-1917 гг.»[17], складальнікам якога з'яўляецца старэйшы супрацоўнік архіва – Т.Я. Лявонцьева, якая працавала над ім некалькі дзесяткаў гадоў. Ён падрыхтаваны да друку аддзелам публікацыі дакументаў і з'яўляецца першым беларускім выданнем па гісторыі ўстаноў, якія існавалі ў

[17] Минская губерния. Государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917). Мн.: БелНИИДАД, 2006. 392 с.

Мінскай губерні з 1793 г. па 1917 г. Даведнік складаецца з прадмовы, 17 раздзелаў, у якіх апісаны ўстановы Мінскай губерні з пазначэннем часу стварэння і ліквідацыі, іх структура і падпарадкаванасць, пераўтварэнні і правапераемнасць, дадатку, у якім прыводзяцца звесткі пра мінскіх губернатараў, і ілюстрацыі. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (1772-1795) беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Па другім падзеле (1793) пад яе пратэктарат падпала створаная яшчэ ў 1566 г. тэрытарыяльна-адміністрацыйная адзінка – Мінскае ваяводства. Замест яго загадам імператрыцы Кацярыны ІІ ад 23 красавіка 1793 г. створана Мінская губерня з цэнтрам у г. Мінску. Загадам ад 3 мая 1795 г. губерня стала называцца намесніцтвам (у 1796 г. назва «губерня» вернута), а яе тэрыторыя, склад і «ўладкаванне» былі «ўдакладнены». Яна ўключала 13 акругаў – Мінскую, Вілейскую, Пастаўскую, Докшыцкую, Лёзненскую, Барысаўскую, Ігуменскую, Бабруйскую, Мазырскую, Давыд-Гарадоцкую, Пінскую, Нясвіжскую і Слуцкую. Адпаведна ў кожнай з іх адчыняліся губернскія і павятовыя ўстановы. Тут жа існавалі рэлігійныя і іншыя грамадскія ўстановы. Зараз рыхтуюцца да друку аналагічныя даведнікі па Віцебскай і Магілёўскай губернях.

Важным крокам у працы аддзела з'яўляецца выданне даведніка «Фонды Национального исторического архива Беларуси»[18]. Упершыню ў ім надрукаваны спіс фондаў архіва. У даведніку адсутнічаюць неанатаваныя фонды. Ён складаецца з шасці раздзелаў (фонды устаноў Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі XVI–1-й пал. XIX ст., фонды ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў Расійскай імперыі 2-й пал. XVIII–пач. XX ст., фамільныя фонды і фонды асабістага паходжання, фонды ўстаноў перыяду Часовага ўраду і БССР, калекцыі, навукова-даведачная бібліятэка), якія грунтуюцца на агульнапрынятай схеме сістэматызацыі дзяржаўных і грамадскіх устаноў ВКЛ, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. У ім таксама прадстаўлены фонды НГАБ з характарыстыкай устаноў-фондаўтваральнікаў.

Як ужо адзначалася вышэй, аддзел публікацыі дакументаў распачаў сваю працу з 1 ліпеня 2004 г. Адпаведна Палажэнню аб аддзеле публікацыі дакументаў ён з'яўляецца структурным падраздзяленнем дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі». Асноўнымі мэтамі дзейнасці аддзела з'яўляюцца:

вызначэнне асноўных напрамкаў і аналіз работы архіва па

[18] Фонды Национального исторического архива Беларуси: Справочник. Мн., БелНИИДАД, 2006. 304 с.



выкарыстанню і публікацыі дакументаў, падрыхтоўка прапаноў па іх удасканаленні;

публікацыя дакументаў у навуковых зборніках на карысць грамадства ў навуковых, навукова-папулярных, культурна-асветніцкіх, навучальных і сацыяльна-прававых мэтах;

распрацоўка навуковых тэм і нарматыўна-метадычнае забеспячэнне работы па публікацыі дакументаў.

На аддзел ускладзена шэраг адпаведных задач: падрыхтоўка прапаноў да праектаў праграм, перспектыўных і бягучых планаў работы архіва па профільных напрамках, распрацоўка і абмеркаванне тэарэтычных і метадычных пытанняў публікацыі архіўных дакументаў, асноўных напрамкаў і тэматыкі навукова-даследчай і метадычнай работы архіва, выяўленне і вывучэнне патэнцыяльных патрэб грамадства ў рэтраспектыўнай інфармацыі, падрыхтоўка тэматычных выданняў, удзел у распрацоўцы навукова-даследчых тэм і метадычных дапаможнікаў па профільных напрамках, вывучэнне і выкарыстанне айчыннага і замежнага вопыту работы ў галіне публікацыі архіўных дакументаў, ажыццяўленне мерапрыемстваў па ўкараненні ў практыку навуковых распрацовак, каардынацыя навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці архіва. Гэтыя і іншыя пытанні і матэрыялы аддзел выносіць да абмеркавання на пасяджэннях дырэкцыі, экспертна-метадычнай камісіі, Вучонага савета.

Адным з накірункаў дзейнасці аддзела з'яўляецца арганізацыя рэцэнзавання, якое традыцыйна праводзіцца навукоўцамі Інстытута гісторыі АН РБ (Г.Я. Галенчанка, В.Ф. Голубеў), гістарычнага факультэта БДУ (М.Ф. Шумейка) і МДПУ (Э.Г. Іофе), Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства Юстыцыі РБ (У.П. Крук), БелНДІДАС. Хочацца падзякаваць за працу пастаянным рэцэнзентам: доктару гістарычных навук, прафесару, галоўнаму навуковаму супрацоўніку аддзела археаграфіі БелНДІДАС Э.М. Савіцкаму і кандыдату гістарычных навук намесніку дырэктара БелНДІДАС С.У. Жумару.

Зборнікі дакументаў, даведнікі і артыкулы супрацоўнікаў архіва падрыхтаваныя да выдання самастойна ці сумесна з архіўнымі і іншымі ўстановамі аб складзе і змесце дакументаў архіва, дакументальныя публікацыі, нарысы, матэрыялы для перыядычнага друку, (каардынацыя работы сувыканаўцаў па падрыхтоўцы публікацый, пасля падрыхтоўкі да друку, а часам і ў працэсе падрыхтоўкі) праходзяць абмеркаванне і атрымоўваюць рэкамендацыі на Вучоным савеце НГАБ. Дадзеная традыцыя склалася з часу стварэння Савета 26 красавіка 1946 г.[199].

[199] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 2. Арк. 8 адв.-9.

Адпаведна ўскладзеным задачам супрацоўнікі аддзела актыўна ўключыліся ў навукова-даследчую і публікацыйную дзейнасць архіва. Так, пачалася праца над наступнымі навуковымі тэмамі: «Генеалогія і геральдыка беларускай шляхты» (З.Л. Яцкевіч, А.А. Цвірка, Дз.Ч. Матвейчык, А.С. Залівака), «Гісторыя дзяржаўных устаноў ВКЛ» (З.Л. Яцкевіч, Г.М. Брэгер, Дз.В. Лісейчыкаў, З.В. Антановіч), «Крыніцы па гісторыі горадабудаўніцтва і архітэктуры Беларусі (Планіроўка і забудова гарадоў Беларусі ў канцы XVIII-пач. XX ст.)» (У.М. Дзянісаў), «Гісторыя дзяржаўных устаноў Расійскай імперыі» (З.В. Антановіч, З.Л. Яцкевіч, Дз.В. Лісейчыкаў, Я.К. Анішчанка, Я.П. Насытка). У выніку шэраг работ атрымалі сваё лагічнае завяршэнне ў выглядзе друкаваных кніг – «Мінская губерня», «Гербоўнік беларускай шляхты». Унікальнымі ў сваім родзе сталі архіўныя выданні штогодніка «Архіварыус» і даведніка «Фонды НИАБ».

Новым відам дзейнасці са з'яўленнем аддзела ў архіве стала рэдактура, карэктура, вёрстка, электроннае афармленне вокладак. Недахоп кваліфікаваных кадраў робіць дадзены накірунак дзейнасці складаным і сёння. Над рэдактурай плённа працавалі І.Я. Войніч, А.М. Гесь, З.Л. Яцкевіч. Карэктуру і вёрстку выконвалі І.Я. Войніч, А.М. Гесь, Н.В. Ваўчок, А.У. Курчатава, В.В. Пахомава, А.С. Макарэвіч.

Супрацоўнікі аддзела займаюцца падрыхтоўкай і правядзеннем нарад, семінараў па профільных напрамках аддзелу, удзельнічаюць у працы навуковых і навукова-практычных канферэнцый, нарад, семінараў (З.В. Антановіч, З.Л. Яцкевіч). Акрамя гэтага, супрацоўнікі аддзела актыўна ўдзельнічаюць у напісанні артыкулаў, дакладаў і паведамленняў, многія з якіх агучваюцца на разнастайных навукова-практычных канферэнцыях, у тым ліку і міжнародных (З.В. Антановіч, З.Л. Яцкевіч, А.М. Гесь, В.В. Урублеўскі).

Аддзел не застаецца ў баку ад выканання традыцыйных прац архіва. Супрацоўнікамі рэгулярна выконваюцца генеалагічныя і тэматычныя запыты, складаюцца пералікі дакументаў (Я. Лёсік, В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Колас, Ваньковічы і інш.), на падставе якіх рыхтуюцца выставы (у тым ліку і віртуальныя).

У адпаведнасці з задачамі культурна-асветніцкай працы, патрэбамі развіцця беларускай навукі і культуры супрацоўнікі аддзела У.М. Дзянісаў, З.Л. Яцкевіч часта выступаюць на радыё і тэлебачанні, а таксама з'яўляюцца аўтарамі сцэнарыяў і кансультантамі шэрагу тэлевізійных перадач і фільмаў.



Падсумоўваючы вынікі публікатарскай працы гістарычнага архіва за 70 год, трэба сказаць, што першы этап характарызуецца пераважна ўдзелам у падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў сумесна з іншымі навуковымі ўстановамі і выдавецтвамі (за выключэннем даведнікаў па архіву 1959 і 1974 гг.), а таксама актыўным напісаннем і друкаваннем артыкулаў і матэрыялаў у перыядычным друку. Для другога этапа (з 1992 г.) характэрна змена тэматыкі, колькасці публікацый у перыядычным друку, а таксама з'яўленне самастойных выданняў, што звязана са зменамі ў грамадстве. На трэцім этапе быў створаны спецыяльны аддзел публікацыі дакументаў і выданне зборнікаў і даведнікаў набыло планавы і рэгулярны характар. Спадзяемся, што гэты паступовы рух публікацыйнай дзейнасці архіва працягнецца і будзе рэгулярным і якасным.

*З.Л. Яцкевіч*

## Аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм

Адным з асноўных накірункаў дзейнасці дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь з'яўляецца стварэнне і ўдасканаленне навукова-даведачнага апарата (НДА) да дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда[1]. У НГАБ для дасягнення гэтых мэтаў вылучана спецыяльная структурная адзінка – аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм (ІПС). Згодна з Палажэннем аб аддзеле, зацверджаным дырэктарам архіва 1 студзеня 2007 г., у дзейнасці аддзела акрэслены наступныя задачы:

- вызначэнне асноўных напрамкаў развіцця НДА да дакументаў архіва, арганізацыя і правядзенне работы па яго стварэнні і развіццю, укараненне і выкарыстанне аўтаматызаваных ІПС;

-дзяржаўны ўлік і фандзіраванне дакументаў;

-вывучэнне і ўкараненне ў практыку работы аддзела перадавога айчыннага і замежнага вопыту ў галіне стварэння і выкарыстання ІПС, у тым ліку аўтаматызаваных, дзяржаўнага ўліку дакументаў;

-нарматыўна-метадычнае забеспячэнне работы па стварэнні і ўдасканаленню НДА.

Працу над складаннем НДА распачыналі яшчэ ў архівах дзяржаўных устаноў ВКЛ. Так, у фондзе Пінскага гродскага суда быў знойдзены адзін з самых старажытных вопісаў спраў – рэестр дакументаў,

[1] Правила работы государственных архивов Республики Беларусь / Редкол.: В.И. Адамушко и др. Мн.: БелНИИДАД, 2006. С. 5.

складзены пісарам Якубам Яльцом 9 лютага 1632 г.[2] Плённа працавалі ў гэтым накірунку і работнікі ўстаноў-папярэднікаў НГАБ – архіва Нясвіжскай ардынацыі роду князёў Радзівілаў, а таксама Віленскага і Віцебскага цэнтральных архіваў старажытных актаў: М.Л. Вяроўкін, М.І. Гарбачэўскі, Д.І. Даўгяла, А.М. Сазонаў, А.П. Сапуноў, І.Я. Спрогіс. Захаваліся вопісы, складзеныя і ў іншых установах – архівах духоўных кансісторый, павятовых судоў і інш. Варта адзначыць, што справаводства ў Расійскай імперыі было добра наладжана, і вопісы, складзеныя архіварыусамі дарэвалюцыйных устаноў, нават для сённяшняга часу маюць высокі ўзровень.

У 20-я і 30-я гг. XX ст. у выніку адсутнасці спецыялістаў у справе па стварэнні і ўдасканаленню НДА доўгі час не надавалася належнай увагі, на першым месцы стаялі пытанні рэстытуцыі архіўнай спадчыны Беларусі (большая частка якой апынулася ў Расіі, Польшчы і Літве). Аднак, нягледзячы на гэта, вялася навукова-тэхнічная апрацоўка наяўных дакументаў для выяўлення іх магчымай прыналежнасці да суседніх дзяржаў і ў выніку – перадачы. Тагачасныя кіраўнікі архіўнай галіны БССР намагаліся запаволіць навукова-тэхнічную апрацоўку дакументаў з мэтай хоць часткова спыніць вываз дакументаў за межы Беларусі[3].

З моманту ўтварэння ЦДГА ў г. Магілёве (1938 г.) улікам у архіве займалася З.Г. Клімовіч, якая акрамя гэтага выконвала шмат іншых відаў працы[4].

На 18 студзеня 1938 г. у Магілёўскім гістарычным архіве налічваўся 1401 фонд, апісана і сістэматызавана 1398 фондаў[5]. У архіве працавала 5 штатных супрацоўнікаў: дырэктар – Э.М. Барэнбаум , навуковы супрацоўнік Р.Л. Слабодзіна , старшы архівіст —тэхнічны работнік А.І. Філішэнка , архіўна-тэхнічныя работнікі І.Г. Сякацкі і А.Н. Аўсяевіч , а таксама некалькі пазаштатных: 6 архіўна-тэхнічных супрацоўнікаў і машыністка[6].

Стан дакументаў і навукова-даведачнага апарата архіва паказвае акт абследавання архіва камісіяй ЦАУ СССР ад 18 лістапада 1938 г.: «Архіўныя матэрыялы … разабраны па фондах, па гадах і па структурнай

---

[2] Раманкевіч А.Ф. Адзін са старажытнейшых рэестраў беларускіх архіваў (Пінскі гродскі суд. 1522-1631 гг.) // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 4 / рэдкал.: Ю.М. Бохан [і інш.]. Мн.: НГАБ, 2006. С. 14-24.

[3] Шумейко М.Ф. Собрать рассеянное. О реституции белорусских архивов в прошлом и настоящем. Мн.: БелНИИДАД, 1997. С. 32.

[4] Шумейко М.Ф. Собрать рассеянное.

[5] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1176. Арк. 54.

[6] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1176. Арк. 52.



прыкмеце і справаводчых нумарах. Далейшая сістэматызацыя архіўных матэрыялаў не праводзіцца. Загалоўкі пакідаюцца старыя –справаводчыя. Новыя загалоўкі складаюцца здавальняюча», а таксама: «Частка вопісаў фондаў, структура якіх дакладна не пазначана ў старым справаводчым загалоўку, мае структурны падзел …Фонды, структура якіх недакладна вызначана на старой справаводчай вокладцы, апісаны без уліку структурных частак фондаўтваральніка»[7].

Вялікая Айчынная вайна 1941–1945 гг. яшчэ мацней ускладніла ўлік і навукова-тэхнічную апрацоўку спраў. Нават той невялікі навукова-даведачны апарат, які існаваў у даваенныя часы, быў амаль цалкам знішчаны – усе ўліковыя дакументы і большасць старых інвентарных вопісаў страчаны. Да сённяшняга дня пры складанні прадмоў да фондаў, што падлеглі ўдасканаленню, архівісты падчас вымушаны канстатаваць: «Даваенную гісторыю фонда прасачыць не ўдалося».

Праца па ўпарадкаванні дакументальных матэрыялаў пачалася адразу ж пасля вызвалення Магілёва. Паводле стану на 28 чэрвеня 1944 г., у Магілёве засталося ўсяго 44 адзінкі захавання[8]. Супрацоўнікі НКУС БССР, прызначаныя для арганізацыі ўліковых работ, 13 снежня 1944 г. засведчылі, што большая частка дакументаў была знішчана альбо вывезена ў г. Рыгу.

У дакладзе начальніка Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва МУС БССР аб рабоце архіва за 1947 г. адзначалася, што «ў … архіве на 1-га студзеня 1947 года лічылася 670 фондаў з колькасцю 43 479 адз. захавання, прыведзеных у поўны парадак, і 247 адз. захавання неапісаных на польскай і старажытнарускай мовах. На 1 студзеня 1948 г. у архіве захоўваецца 715 фондаў з колькасцю 46 353 адз. захавання апісаных і неапісаных 265 адз. захавання на польскай мове…»[9]. Запаўняліся справы і лісты фондаў: «…Улік на дакументальныя матэрыялы ў асноўным заведзены ў 1946 г. У справаздачным годзе (1947 – *аўт.)* завершана складанне лістоў фондаў і картак… Цалкам улічаны дакументальныя матэрыялы, што паступілі ў архіў у 1947 годзе ў аб’ёме 45 фондаў, 2874 адз. захавання.

Прадстаўлены ў Архіўнае упраўленне спіс страчаных фондаў, вопіс страчаных спраў фондаў, якія захаваліся, другія экзэмпляры фондавых картак на страчаныя фонды, спіс фондаў, якія не адносяцца да профілю архіва»[10]. Новы, удакладнены варыянт пераліку фондаў устаноў

[7] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1176. Арк. 55-56.

[8] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 3. Арк. 5.

[9] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 10. Арк. 19.

[10] НАРБ. Ф. 249. Воп. 1. Спр. 1213. Арк. 83.

Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дакументы якіх былі цалкам альбо часткова страчаны, быў складзены ў 1961 г.[11]. З-за адсутнасці дапаможнай літаратуры і любых іншых крыніц, акрамя саміх дакументаў архіва, навуковая распрацоўка фондаў у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі вялася вельмі марудна[12].

Нягледзячы на асобныя цяжкасці, у 40-я і 50-я гг. XX ст. супрацоўнікамі архіва была праведзена навукова-тэхнічная апрацоўка значнай колькасці дакументальных матэрыялаў. Сярод асноўных відаў працы можна вылучыць наступныя: разбор дакументальнага россыпу і фарміраванне адзінак захавання, сістэматызацыя матэрыялаў унутры фонда, інвентарызацыя, складанне загалоўкаў.

У выніку з тон бессістэмнага россыпу дакументаў былі сфарміраваны тысячы архіўных спраў, якія ўлічваліся і на якія складаліся вопісы. Хоць і больш маруднымі тэмпамі, але ўсё ж праводзіліся мерапрыемствы па стварэнні гістарычных даведак, аглядаў фондаў, паказальнікаў.

У перыяд знаходжання ЦДГА БССР у г. Магілёве распрацоўкай навукова-даведачнага апарата і ўлікам займаліся два аддзелы – агульных і сакрэтных фондаў. У гэты час у архіве працавалі такія супрацоўнікі, як Г.А. Ахраловіч , А.М. Горбач , В.А. Гусарэвіч, В.Р.Маісеенка, А.П. Мелашунас , М.Л. Мендэльсон , Г.У. Нізаўцова , А.М. Пішчык, Г.М. Унішэўская , М.Д. Хальпукова , Л.Р. Чэпікава , Г.І. Эрперт. Складзенымі імі вопісамі і дагэтуль карыстаюцца архівісты і даследчыкі.

Аддзел дарэвалюцыйных фондаў Дзяржархіва Мінскай вобласці налічваў сем супрацоўнікаў (Я.Л. Бравер , Т.Е. Лявонцьева , Б.З. Прыгожына і інш.), якія займаліся ўсімі відамі работ з матэрыяламі па Мінскай губерні, што рабіла практычна немагчымым працу па стварэнні і ўдасканаленню навукова-даведачнага апарата. Найбольш буйны комплекс фондаў, які налічваў амаль 600 000 спраў, знаходзіўся ў нездавальняючым стане. Большасць вопісаў былі здатачнымі, часцей за ўсё сумарнымі, загалоўкі спраў не раскрывалі склад і змест дакументаў. Пасля пераводу ЦДГА ў 1963 г. у Мінск і перадачы фондаў старажытных актаў з філіяла ў Гродна і дарэвалюцыйных фондаў устаноў былой Мінскай губерні з Дзяржархіва Мінскай вобласці створана новая структура архіва. Працу па забеспячэнню навукова-даведачнага апарата цяпер вялі чатыры аддзелы: фондаў Мінскай губерні, фондаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў, сакрэтных фондаў і старажытных актаў. Толькі 15 красавіка 1965 г., згодна з загадам № 7 Архіўнага ўпраўлення пры

[11] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 92. Арк. 59.
[12] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 4. Арк. 15.



Савеце Міністраў БССР, у структуры ЦДГА БССР у якасці асобнай адзінкі быў вылучаны аддзел уліку і навукова-даведачнага апарата. Паводле штатнага раскладу ад 6 сакавіка 1966 г., ён складаўся з 8 чалавек: загадчык, 2 старшыя навуковыя супрацоўнікі, 3 малодшыя навуковыя супрацоўнікі і 2 архіварыусы)[13]. 11 кастрычніка 1979 г. ён набыў сённяшнюю назву – аддзел інфармацыйна-пошукавых сістэм.

За перыяд свайго існавання аддзелам ІПС была праведзена вялікая праца па стварэнню навукова-даведачнага апарата да дакументаў архіва.

Паводле інфармацыйнай значнасці фонды НГАБ былі падзелены на тры катэгорыі. Класіфікацыя адбывалася паводле навукова-гістарычнай каштоўнасці, шматаспектнасці інфармацыі, ступені паўнаты дакументаў фонда, ролі і значэння ўстановы-фондаўтваральніка ў сферы грамадскай і дзяржаўнай дзейнасці. Да першай катэгорыі былі аднесены фонды вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і кіравання губерняў: генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага, губернскіх праўленняў, казённых палат, земскіх упраў, статыстычных камітэтаў, гродскіх і земскіх судоў і інш. Да другой катэгорыі аднесены фонды па пэўных галінах дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці: губернскія чарцёжныя, урачэбныя ўправы, дырэкцыі народных вучылішчаў, камітэты па разгляду і складанні інвентароў памешчыцкіх маёнткаў, дваранскія дэпутацкія сходы, магістраты і інш. Да трэцяй катэгоры былі аднесены найменш інфарматыўныя фонды. Трэба адзначыць, што дзяленне фондаў на катэгорыі дастаткова ўмоўнае.

У першую чаргу ўдасканаленню ці перапрацоўцы падлягалі фонды 1-й катэгорыі як найбольш інфарматыўныя, затым – 2-й і 3-й. У 1965–1985 гг. аддзел ІПС займаўся ўдасканаленнем фондаў першых дзвюх катэгорый, у тым ліку «Радзівілы, князі», «Мінскае губернскае праўленне», «Мінская казённая палата» і інш.

З 1985 г. пачалася распрацоўка фондаў 3-й катэгорыі. Удасканаленне гэтай катэгорыі патрабавала часам вялікіх намаганняў. Большасць вопісаў была складзеная ў 40-я–50-я гг. XX ст., тэматычная распрацоўка іх практычна не праводзілася. У нумарацыі спраў у вопісах, складзеных да 1917 г., сустракаліся вялікія пропускі, выкліканыя адсутнасцю многіх спраў у сувязі з правядзеннем так званай экспертызы каштоўнасці. Яе вынікам стала тое, што ў 40-я–70-я гг. XX ст. былі незваротна страчаны цікавыя дакументы XIX–пач. XX ст. Да спісання прызначаліся справы, якія паводле крытэрыяў таго часу не ўяўлялі навуковай каштоўнасці.

[13] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 129. Арк. 9.

Так, у фондзе Магілёўскай рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі, які да канца 50-х гг. знаходзіўся ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Ленінградзе, толькі ў 1950 г. былі адабраны да знішчэння звыш 20 тыс. адзінак захавання.

Усяго за 1985–2000 гг. былі ўдасканалены 522 фонды. Сярод іх – фонды судоў вышэйшай інстанцыі: палаты крымінальнага і грамадзянскага судоў, галоўны суд крымінальнага і грамадзянскага дэпартаментаў, аб'яднаная палата крымінальнага і грамадзянскага суда Мінскай губерні і інш. Дзякуючы поўнаму прыцягненню спраў пры распрацоўцы фондаў былі выяўлены многія унікальныя дакументы, у тым ліку і датаваная 1391 годам пергаментная грамата (самы старажытны дакумент на захаванні ў НГАБ).

Да моманту заснавання асобнага аддзела старажытных актаў у 1990 г. аддзел ІПС займаўся апрацоўкай і стварэннем навукова-даведачнага апарата да фондаў устаноў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай (гродскія і земскія суды і інш.)

Адзін з галоўных накірункаў працы аддзела ІПС – стварэнне і ўдасканаленне каталогаў. Тэматычную распрацоўку спраў архівы распачалі яшчэ ў 40–50-я гг. XX ст. Так, у справаздачы аб рабоце ЦДГА ў г. Магілёве за 1947 г. адзначалася, што ў працэсе правядзення экспертызы каштоўнасці, складання аглядаў і гістарычных даведак, напісання загалоўкаў пры праглядзе 6636 адз. захавання, якія адлюстроўваюць гісторыю Магілёўскай губерні, складзена 667 картак для прадметна-тэматычнага каталога па тэмах «Прамысловасць», «Сельская гаспадарка», «Каштоўныя выкапні», «Колькасць прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў», «Стан народнай адукацыі» і інш.[14]. У 1949 г. былі адзначаны асноўныя недахопы ў гэтай рабоце: «адсутнасць належнай сувязі з праектна-гаспадарчымі і плануючымі арганізацыямі, у выніку чаго здабыткі па выкарыстанні дакументальных матэрыялаў у справе ўзнаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі адсутнічаюць»[15].

Асноўную частку сістэматычнага каталога і каталога імёнаў НГАБ складаюць карткі на дакументы, якія былі перададзены ў архіў у 1964 г. разам з профільнымі дакументамі з розных архіваў краіны. Такім чынам, у ЦДГА ў г. Мінску апынуліся два каталогі аб'ёмам прыкладна 60 тыс. тэматычных картак, сістэматызацыя якіх была праведзена па розных прынцыпах (больш за 40 тыс. картак былога ЦДГА ў г. Магілёве, сістэматызаваных па рабочай, нездавальняючай схеме,

[14] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 10. Арк. 20.
[15] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 24. Арк. 9.



і прыкладна 15 тыс. картак былога Дзяржархіва Мінскай вобласці, якія сістэматызаваны па прадметна-галіновых групах). Карткі ніколі не рэдагаваліся, часам у іх адсутнічалі тыя ці іншыя неабходныя звесткі[16](канчатковае аб'яднанне і ўключэнне ў сістэматычны каталог усіх гэтых тэматычных картак адбылося толькі ў 1985 г.[17]).

На базе аддзела ўліку і навукова-даведачнага апарата ўзнікла група па каталагізацыі дакументаў, якая займалася вырашэннем пытанняў арганізацыі і методыкі гэтай работы. Сістэматычны каталог будаваўся ў адпаведнасці са «Схемай класіфікацыі дакументальных матэрыялаў ЦДГА БССР у г. Мінску», прынятай у архіве ў 1972 г. У першую чаргу тэматычна распрацоўваліся найбольш каштоўныя шматгаліновыя фонды (фонды 1-й і 2-й катэгорыі). Да таго ж, з канца 1970-х гг. у працэсе выяўлення і апісання сфрагістычных помнікаў (пячатак) пачаў камплектавацца сфрагістычны каталог.

У 1983 г. Усесаюзным навукова-даследчым інстытутам дакументазнаўства і архіўнай справы была распрацавана «Схема адзінай класіфікацыі дакументнай інфармацыі ў сістэматычных каталогах дзяржаўных архіваў СССР (XVIII–пач. XX ст.)». Схема каталога ЦДГА БССР у г. Мінску была блізкая ёй па структуры, яна не патрабавала карэннай перапрацоўкі. Супрацоўнікі архіва дапрацавалі і дапоўнілі яе з улікам спецыфікі гісторыі Беларусі. Сістэматычны каталог архіва пабудаваны паводле гэтай схемы.

На пачатку 1980-х гг. супрацоўнікамі аддзела была складзена «Інструкцыя па ўдасканаленні сістэматычнага і імяннога каталогаў у ЦДГА БССР у г. Мінску», паводле якой ішла гэтая праца. Удасканаленне каталога было завершана ў 2004 г.

Паводле стану на 1 студзеня 2008 г. сістэма каталогаў НГАБ налічвае больш за 289 тыс. тэматычных картак. Схема сістэматычнага каталога складаецца з галоўнай і асноўнай табліц.

Галоўная табліца змяшчае 5 аддзелаў, якія адпавядаюць наступным падзеям, з'явам і фактам дзяржаўнага і грамадскага жыцця:

1. Б/З – Дзяржаўная ўлада. Дзяржаўнае кіраванне. Самакіраванне. Ахова існуючага ладу.
2. И – Грамадска – палітычны рух. Рэвалюцыйная барацьба.
3. К/Т – Прыродныя ўмовы. Эканамічнае развіццё.
4. Ф/Ю – Культура. Навука. Побыт.

[16] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 108. Арк. 28.
[17] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 362. Арк. 5.

5. Я – Рэлігія[1].

Асноўная табліца схемы з'яўляецца ключом для арганізацыі і пабудовы сістэматычнага каталога. Яе структура такая: кожны з аддзелаў падзяляецца на пададдзелы, у асноўным паводле галіновай прыкметы; пададдзелы размяшчаюцца ў лагічнай паслядоўнасці і маюць унутранае дзяленне на раздзелы і падраздзелы. На сённяшні момант сістэматычны каталог НГАБ утрымлівае сотні падраздзелаў. Да найбольш запатрабаваных можна аднесці такія з іх, як «Народная адукацыя», «Рэлігія», «Прамысловасць», «Сельская гаспадарка» і інш. Структуру каталога можна прасачыць на прыкладзе пададдзела «Народная адукацыя»:

| Пададдзел | Раздзелы | Падраздзелы |
|---|---|---|
| Народная адукацыя | Вышэйшая адукацыя | Універсітэты |
| | | Настаўніцкія інстытуты |
| | Прафесійная адукацыя | Тэхнічная адукацыя |
| | | Тэхнічныя вучылішчы |

Тэматычныя карткі ў пададдзелах каталога размешчаны ў алфавітным парадку па губернях. Для пазначэння губерняў выкарыстоўваюцца агульныя вызначальнікі адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак і асобных рэгіёнаў («022» – Віцебская губ., «095» – Мінская губ., «096» – Магілёўская губ., «130» – Расія. Расійская імперыя, «150» – Смаленская губ. і інш.), далей карткі адсістэматызаваны па паветах, пасля – па населеных пунктах у храналагічнай паслядоўнасці.

Папаўненне каталога новымі звесткамі адбываецца і ў цяперашні час, калі пры ўдасканаленні фондаў складаюцца тэматычныя карткі.

На працягу 1965–1973 гг. супрацоўнікі аддзела А.Г. Азарава, Э.І. Булдакова, А.П. Лазарук і Д.І. Радзіёнава сумесна з супрацоўнікамі іншых аддзелаў удзельнічалі ў падрыхтоўцы даведніка «Центральный государственный исторический архив БССР в г. Минске», які пабачыў свет у 1974 г. У 2006 г. у выніку работы аддзела ў супрацоўніцтве з

[1] Для пазначэння аддзелаў выкарыстоўваюцца прапісныя літары расійскага алфавіта ("Б", "И", "Щ" і інш.), для пазначэння пададдзелаў яшчэ і арабскія лічбы (В2, П14, Т340 і інш.).



аддзеламі выкарыстання і старажытных актаў выдадзены даведнік «Фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі».

На сённяшні дзень супрацоўнікі аддзела ІПС займаюцца навуковай і навукова-метадычнай працай – рыхтуюць артыкулы ў навуковыя зборнікі, даклады на міжнародныя і рэспубліканскія канферэнцыі, метадычныя рэкамендацыі па ўдасканаленні вопісаў фондаў і інш.

У розныя гады аддзел узначальвалі: Р.Р. Міронава (1965–1968), Э.І. Булдакова (1968–1982), Н.М. Леўчык (1982–1993). З 1993 г. па сённяшні дзень загадчыкам аддзела ІПС з'яўляецца Г.Я. Акуловіч. У 1976–1979 гг. у аддзеле працавала сённяшні дырэктар архіва А.К. Галубовіч.

Акрамя гэтага ў аддзеле працавалі: А.Г. Азарава, Н.Н. Аліпчанка, А.Ф. Аляксандрава, В.У. Бабкова, Г.В. Барсукова, Т.С. Глухава, Н.В. Кальцова, І.Л. Краўцова, А.П. Лазарук, Л.Ю. Міронава, І.Л. Новікава, Н.Л. Рабцэвіч (Зюзіна), Д.І. Радзіёнава, Г.А. Рыкава, С.Я. Трацэўская, М.М. Ульянава, Л.А. Суднік, А.К. Цітоў.

На сённяшні дзень у аддзеле ІПС плённа працуюць: Н.В. Ваўчок (вядучы архівіст), А.В. Груша (старшы навуковы супрацоўнік), А.Л. Грывянёў (старшы навуковы супрацоўнік), Т.М. Коцік (галоўны архівіст), Л.М. Ліпская (вядучы навуковы супрацоўнік), Дз.В. Лісейчыкаў (галоўны архівіст), А.А. Лютарэвіч (вядучы навуковы супрацоўнік), Н.І. Місевіч (архівіст 1-й катэгорыі).

*Г.Я. Акуловіч, Дз.В. Лісейчыкаў*

## Аддзел старажытных актаў

Датай заснавання аддзела старажытных актаў лічыцца лістапад 1963 г., калі згодна з пастановай № 537 «Аб мерах па паляпшэнні архіўнай справы ў БССР» ад 11 лістапада 1963 г.[2]. ЦДГА БССР у г. Магілёве быў пераведзены ў г. Мінск і ўзбуйнены за кошт перадачы яму старажытных актаў з філіяла Гродзенскага гістарычнага архіва, а таксама архіўных фондаў дарэвалюцыйных устаноў былой Мінскай губ. з Дзяржархіва Мінскай вобласці. Згодна з Загадам Архіўнага упраўлення пры СМ БССР № 100 ад 18 лістапада 1963 г. была зацверджана новая структура ЦДГА БССР, у якую ўваходзіў і аддзел старажытных актаў[3].

Усяго з Гродна было перавезена 223 фонды старажытных актаў:

[2] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр.111.Арк.3-5.
[3] НАРБ. Ф.249. Воп. 5. Спр. 917. Арк. 151.

6986 адзінак захавання і 223 вопісы[4]. У вопісах да фондаў у большасці выпадкаў пазначалася толькі разнавіднасць актавых кніг, але не іх змест, што ўскладняла карыстанне старажытнымі кнігамі. З Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці быў перададзены 600-тысячны комплекс дакументаў.

Неабходнасць стварэння адмысловага аддзела па вывучэнні старажытных дакументаў, стварэнню і ўдасканаленні вопісаў да іх была відавочнай. У планах і справаздачах аб працы архіва, складзеных у пачатку 60-х гг., адзначалася ўзрастанне грамадскай цікавасці да мінулага роднага краю, а таксама павелічэнне колькасці запытаў ад грамадскіх і дзяржаўных устаноў аб часе заснавання і гісторыі розных населеных пунктаў. Праблемай з'яўлялася прачытанне дакументаў XV–XVIII стст., напісаных на лацінскай, старабеларускай, старапольскай мовах, тэксты якіх маглі быць затухаючымі, а фізічны стан часткі дакументаў нездавальняючым.

Паводле штатнага раскладу ЦДГА БССР у г. Мінску ў 1963 г. у аддзеле старажытных актаў значыліся два супрацоўнікі – загадчык аддзела і старшы архіварыус[5]. Але фактычна адзіным супрацоўнікам аддзела ў гэты перыяд была гісторык і архівіст Яўгенія Леанідаўна Бравер, якая перайшла на працу ў ЦДГА БССР у г. Мінску з Дзяржархіва Мінскай вобласці. За год працы аддзела былі складзены пераводная табліца да фондаў старажытных актаў, гістарычныя даведкі на групы фондаў судовых устаноў Беларусі перыяду Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, органаў саслоўнага, гарадскога, сялянскага самакіравання, распачата праца над зборнікам «Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв.»[6].

У 1964 г. у архіве адбыўся шэраг пасяджэнняў метадычнай камісіі, на якім вырашаліся пытанні аб удасканаленні НДА, фандзіраванні, уліку і камплектаванні дакументальных матэрыялаў судовых устаноў, ад чаго залежала паўната выкарыстання гэтых гістарычных крыніц. «Дакументальныя матэрыялы такіх судоў, як, напрыклад, земскіх павятовых, гродскіх, эксдывізарскіх, падкаморскіх, магістратаў, ратуш і г.д., з'яўляюцца найбольш каштоўнымі, а часам адзінымі крыніцамі па палітычным і эканамічным жыцці беларускіх зямель таго часу», – пісала ў «Даведцы аб фандзіраванні і ўліку дакументальных матэрыялаў судовых устаноў» начальнік аддзела сакрэтных фондаў, старшы навуковы супрацоўнік ЦДГА БССР у г. Мінску Р.Р. Міронава[7].

[4] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 10. Арк. 75-76.
[5] НАРБ. Ф. 249. Воп. 5. Спр. 917. Арк. 151.
[6] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 110. Арк. 72–73.
[7] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 108. Арк. 56.



У 1965 г. была зацверджана новая структура ЦДГА БССР у г. Мінску (загад АУ пры СМ БССР № 7 ад 15 красавіка 1965 г.), у якой аддзел старажытных актаў як структурная адзінка ўжо не існаваў. Аднак праца са старажытнымі дакументамі ў архіве працягвалася. У 1967 г. Я.Л. Бравер быў складзены «Метадычны дапаможнік аб шляхах і методыцы падакументальнага апісання актавых кніг», дзе ўжо тады адзначалася неабходнасць публікавання ўнутраных вопісаў да актавых кніг. Апісанне актавых дакументаў на тэматычных картках было распачата з кніг фонда «Брэсцкі земскі суд» (ф. 1741). Працягвалася праца па стварэнню памяткі аб падрыхтоўцы слоўніка рэдкаўжываных спецыфічных тэрмінаў XV–XIX стст. (1970 г.), аналізе і ўдасканаленню навукова-даведачнага апарата да дакументаў комплекса старажытных актаў, а таксама падрыхтоўка ф. 694 («Радзівілы, князі») да мікрафотакапіравання. Паводле разлікаў Я.Л. Бравер, з-за вялікага аб'ёму розных відаў працы па комплексу старажытных актаў сіламі аднаго супрацоўніка паактавае апісанне толькі аднаго фонда «Брэсцкі земскі суд» магло быць завершана толькі ў XXI ст.[8].

На сітуацыю з актавымі дакументамі звярнулі ўвагу навукоўцы Інстытута гісторыі АН БССР. На канферэнцыі супрацоўнікаў архіва і даследчыкаў, якая адбылася ў ЦДГА Беларусі ў Мінску ў красавіку 1973 г., былі выказаны пажаданні аб стварэнні ў архіве групы па апрацоўцы старажытных актаў. З.Ю. Капыскі, В.І. Мялешка, Е.С. Падокшына таксама падымалі пытанне аб неабходнасці пошуку беларускіх дакументаў, якія захоўваюцца ў іншых архівах, аб больш шырокай публікацыі дакументаў архіва перыяду феадалізму[9].

З 1975 г. праца з комплексам дакументаў старажытных актаў адбывалася ў межах аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, загадчыкам якога была Я.Л. Бравер. Працягвалася складанне картатэкі апублікаваных старажытных актаў па гісторыі Беларусі ў дарэвалюцыйных і савецкіх выданнях. Былі прагледжаны 13 тамоў зборніка «Историко-юридические материалы» і складзена 1305 картак. Працягвалася выяўленне дакументаў для падрыхтоўкі выдання «Храналагічны пералік грамат XVI–XVIII стст.», складзены план падрыхтоўкі зборніка «Социально-политическая борьба в Белоруссии в конце XV–1648 г.» (т. 1). Архіў назапасіў станоўчы вопыт падрыхтоўкі да выдання дакументаў адной разнавіднасці (інвентары), была распрацавана методыка адбору дакументаў для публікацый. У выніку пабачылі свет два зборнікі: «Инвентари магнатских владений

[8] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 177. Арк. 15.
[9] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 207. Арк. 1-5.

Белоруссии в XVII–XVIII вв. Владение Сморгонь» (Мн., 1977) і «Инвентари магнатских владений Белоруссии в XVII–XVIII вв. Владение Тимковичи» (Мн., 1982). Праца адбывалася ў цесным супрацоўніцтве з Інстытутам гісторыі АН БССР.

У чытальнай зале архіва ў той час працавалі маладыя навукоўцы – будучыя дактары гістарычных навук П.Р. Казлоўскі, З.Ю. Капыскі, Г.Я. Галенчанка, М.Ф. Спірыдонаў, П.А. Лойка і В.Ф. Голубеў ды інш. ЦДГА БССР у г. Мінску з'яўляўся адным з найбольш значных навукова-даследчых цэнтраў, у якім былі сабраны матэрыялы па гісторыі, эканоміцы, палітыцы і культуры за перыяд з канца XIV ст.

Супольна з навукоўцамі вырашаліся шмат якія праблемы ў архіве. Гэтак, у снежні 1973 г. паўстала пытанне аб перадачы непрофільных для архіва старадрукаў XVI–XVIII стст. (200 адз.), якія патрапілі ў архіў у 1971 г. з былога кляштара брыгітак у Гродна і з'яўляліся гістарычнай і культурнай каштоўнасцю, у аддзел рэдкай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі АН БССР. На пасяджэнні экспертнай камісіі ў архіве па гэтым пытанні выступалі доктар гістарычных навук З.Ю. Капыскі, кандыдаты філалагічных навук А.І. Мальдзіс і Г.В. Кісялёў. У выніку працяглай дыскусіі было прынята рашэнне аб перадачы старадрукаў у бібліятэку[10].

Даследаванне старажытных дакументаў, якія маюць палеаграфічныя, моўныя асаблівасці, відавочна патрабавала адмысловых падыходаў, наладжанай сістэмы працы, павелічэння штатнай колькасці супрацоўнікаў.

У адпаведнасці з загадам ГАУ пры СМ БССР ад 1 студзеня 1990 г. у гістарычным архіве ў Мінску адбылася дырэкцыя, адным з пытанняў якой было стварэнне (а практычна аднаўленне) аддзела старажытных актаў. Распрацоўка Палажэння аб новастворанным аддзеле і наборы супрацоўнікаў была даручана намесніку дырэктара С.І. Паўловіч (пратакол № 7 ад 13 лістапада 1989 г.)[11]. Аддзел пачаў функцыянаваць з 1 студзеня 1990 г.[12].

Першапачаткова ў ім працавалі два супрацоўнікі: А.Ф. Аляксандрава і В.У. Бабкова. На сённяшні дзень у структуры аддзела 7 чалавек: загадчык, два галоўныя архівісты, два вядучыя навуковыя супрацоўнікі, галоўны і вядучы палеографы. Загадчыкам аддзела з моманту яго заснавання ў 1990 г. і да 2003 г. была Альбіна Францаўна Аляксандрава, пад кіраўніцтвам якой распачалася распрацоўка актавых кніг судовых устаноў ВКЛ і РП XVI ст.,

[10] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 205. Арк. 9–26.
[11] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 409. Арк. 22–23.
[12] НАРБ,Ф. 251. Воп. 3. Спр. 703. Арк. 23.



склаўся накірунак дзейнасці аддзела на перспектыву, а таксама асноўны касцяк супрацоўнікаў, практычна нязменны да сённяшняга дня. Гэта, найперш, – А.Ф. Аляксандрава, В.У. Бабкова, Н.А. Барсукова, І.М. Бобер, А.А. Лашкевіч, Г.М. Брэгер. У розны час у аддзеле працавалі З.Л. Яцкевіч, Ф.П. Крыванос, А.І. Груша, А.М. Латушкін, Г.А. Прыка, А.Ф. Раманкевіч, У.І. Кананові́ч, якія ў сваёй далейшай навуковай дзейнасці карысталіся ведамі, набытымі падчас працы са старажытнымі дакументамі. За апошні час у аддзеле распачалі працу гісторык-медыевіст, даследчык пратэстантызму на Беларусі Л.С. Іванова і выпускніца гісторыка-архіўнага аддзялення гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Надзея Статкевіч.

У 1992 г. у межах аддзела быў створаны сектар сфрагістыкі, які праіснаваў кароткі час, але ж сфрагістычны накірунак дзейнасці, які ўключае ў сябе працу па выяўленні і апісанні пячатак, стварэнні сфрагістычнага каталога, працягваецца.

Асноўным накірункам працы аддзела старажытных актаў з'яўляецца стварэнне навукова-даведачнага апарата да актавых кніг судовых устаноў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай XVI–XVII стст., які ўключае ў сябе наступныя віды дзейнасці: прачытанне актавай кнігі, складанне і афармленне загалоўка да кожнага дакумента (унутраны вопіс), складанне асабовага і геаграфічнага паказальнікаў, тэрміналагічнага слоўніка. Дадзеная праца выконваецца на падставе «Метадычных парад па распрацоўцы і апісанні актавых кніг», падрыхтаваных у 2002 г. А.Ф. Аляксандравай. За перыяд існавання аддзела быў складзены НДА да 61 актавай кнігі судовых устаноў усяго XVI ст. і пачатку XVII ст.

Чытаннем актавых кніг займаюцца практычна ўсе супрацоўнікі аддзела: Н.А. Барсукова расчытвае кнігі Брэсцкага і Гродзенскага земскіх судоў, І.М. Бобер – Віцебскага земскага, Гродзенскіх, Брэсцкіх, Слонімскіх земскіх і гродскіх судоў, А.Ф. Аляксандрава – Брэсцкага, Слонімскага і Віцебскага земскіх судоў, Г.М. Брэгер – Ашмянскага гродскага, А.Ф. Раманкевіч і Л.І. Іванова – Пінскіх земскага і гродскага судоў, В.Ул. Бабкова – Мінскага і Слонімскага гродскіх судоў, А.А. Лашкевіч – Магілёўскага магістрата, Н.М. Статкевіч – Мінскага магістрата. Падрыхтаваныя ўнутраныя вопісы з паказальнікамі да распрацаваных фондаў перадаюцца ў чытальную залу архіва для выкарыстання.

Вядуцца ў аддзеле і іншыя віды працы. Вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела А. А.Лашкевічам былі ўдакладнены загалоўкі да мікрафільма «Літоўская метрыка» (Калекцыя мікрафотакопій (КМФ-18) і ўключаны ў вопіс 77 спраў Метрыкі, якія не ўвайшлі ў «Описание» С.Л. Пташыцкага. Вядучым палеографам Г.М. Брэгерам складзены вопіс на мікрафішы

дакументаў, якія паступілі з Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільні «Калекцыя мікрафільмаў інвентароў архіва скарбавай камісіі ВКЛ і архіва Гродзенскай казённай палаты» (КМФ-19), а таксама ўнутраны вопіс да актавай кнігі Віленскага ваяводскага суда за 1553–1557 гг., Кніга запісаў № 34 Літоўскай Метрыкі. Навуковым супрацоўнікам аддзела А.І. Грушам была падрыхтавана да выдання Кніга запісаў № 44 Метрыкі за 1559–1566 гг. У 2006 г. галоўным архівістам У.І. Канановічам складзены НДА да вопісаў №№ 8 і 12 фонда «Радзівілы, князі», якія складаюцца з комлексу дакументаў фамільных родаў Гагенцолернаў і каралеўскай сям'і Сабескіх, напісаных на шматлікіх еўрапейскіх мовах. Вядучы палеогрф Г.М. Брэгер распачаў удасканаленне вопісаў старажытных актаў (удакладненне іх фондавай прыналежнасці, крайніх дат, рэдагаванне загалоўкаў).

У 1999 г. была праведзена экспертыза каштоўнасці, сфарміраваны з россыпу і апісаны справы, якія паступілі ў архіў з Нясвіжскага фарнага касцёла, складзены пералікі дакументаў па гісторыі гарадоў Мазыра, Пінска, Браслава, беларуска-украінскіх, руска-беларускіх сувязей у XVI–XVII стст. У школах Астравецкага раёна супрацоўнікамі аддзела Г.М. Брэгерам і А.М. Латушкіным былі праведзены краязнаўчыя лекцыі па дакументах НГАБ і Літоўскага Дзяржаўнага гістарычнага архіва «Гісторыя Астраўца ад XV па XX ст.», «Гісторыя Варанян ад 1391 г. па XX ст.» У 2003 г. працягваліся краязнаўчыя лекцыі па дакументах НГАБ. Супрацоўнікамі З.Л. Яцкевічам і Г.М. Брэгерам былі прачытаны лекцыі "Гісторыя мястэчка Халопенічы і яго насельніцтва XV–XIX стст." і „ Гісторыя в. Хацюхова ў XVI–XX стст.".

У лютым 2003 г. загадчыкам аддзела старажытных актаў была прызначана Вольга Уладзіміраўна Бабкова.

Распачалася праца па апісанню пергаментных грамат XV–XVI стст., якія захоўваюцца ў архіве. Штогод супрацоўнікамі аддзела праводзіцца навуковае кіраўніцтва архіўнай практыкай студэнтаў-гісторыкаў БДУ, а таксама практыкай студэнтаў аддзялення класічных моў і антычнай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ: архіў захоўвае багатую спадчыну лацінамоўных дакументаў, каля 500 актавых кніг за XV–XVII стст.

Супрацоўнікі аддзела прымаюць удзел у шматлікіх навуковых і краязнаўчых канферэнцыях (Беларусь, Украіна, Польшча, Літва, Латвія), у выяўленні профільных дакументальных матэрыялаў у архівах Польшчы, Літвы і Расіі, друкуюцца і артыкулы ў гістарычных і архівазнаўчых выданнях, а таксама ў зборніках, якія выдаюцца ў архіве: «Архіварыус», «Гербоўнік беларускай шляхты». У межах дакументальнай серыі «Беларусь у актавых кнігах», заснаванай у архіве, распачалося выданне ўнутраных вопісаў да распрацаваных у аддзеле актавых кніг. На сённяшні дзень пабачылі свет «Магілёўскі магістрат 1580–1581» (Вып. 1), «Магілёўскі магістрат 1597–98, 1599–1600, 1602–1603» (Вып. 2), падрыхтаваны да друку ўнутраныя вопісы да кніг № 25 з фонда «Ашмянскі земскі суд» (1661–1663 гг.), да кнігі № 3 фонда «Мінскі гродскі суд»(1640–1645, 1649 гг.). Рыхтуецца да выдання першы том навуковага зборніка дакументаў «Тэстаменты другой паловы XVI ст. па матэрыялах актавых кніг НГАБ». Ідэя зборніка паўстала пад час працы з актавымі кнігамі і стала адным з вынікаў гэтай працы.



Тэстаменты (духоўніцы) з'яўляюцца унікальнай крыніцай для вывучэння юрыдычна-эканамічных адносін і ментальнасці людзей часоў Рэнесансу і Рэфармацыі, рэканструкцыі штодзёнага жыцця тагачаснай шляхты і мяшчанаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Першы том будзе складацца з тэстаментаў актавых кніг Брэсцкага, Віцебскага, Менскага, Слонімскага судоў і Магілёўскага магістрата. Другі том цалкам прысвечаны тэстаментам Гродзенскага земскага суда. Усяго агулам рыхтуецца выдаць каля 200 дакументаў. Над зборнікам працуюць А.Ф. Аляксандрава , В. Ул. Бабкова , І.М. Бобер.

У далейшым у якасці асноўнага накірунку дзейнасці аддзела старажытных актаў плануецца захаваць распрацоўку судовых актавых кніг XVII ст., а таксама публікацыю найбольш выбітных дакументау па гісторыі Беларусі.

*В.У. Бабкова*

## Аддзел аўтаматызаваных архіўных тэхналогій

Першага сакавіка 1998 г. ў НГАБ быў створаны новы аддзел – аддзел аўтаматызаваных архіўных тэхналогій (ААТ), асноўнай перспектыўнай мэтай якога стала падрыхтоўка і правядзенне комплекснай аўтаматызацыі архіва з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ). Выкарыстанне ў працы архіваў сучасных тэхналогій дазваляе на якасна новым узроўні выконваць асноўныя задачы, а менавіта: забеспячэнне захаванасці дакументаў, задавальненне патрэб грамадства ў архіўнай інфармацыі, паляпшэнне якасці інфармацыйнага абслугоўвання і зніжэнне працаёмкасці апрацоўкі інфармацыі.

На першым этапе работы аддзелу, які складаўся з шасці супрацоўнікаў, былі пастаўлены наступныя задачы:

– стварэнне і запаўненне баз дадзеных, якія змяшчаюць інфармацыю з дакументаў;

– аўтаматызацыя рашэнняў лакальных задач іншых аддзелаў;

– забеспячэнне стабільнай работы парка камп'ютэрнай тэхнікі ў архіве.

У 1999 г. на пачатку работы далекія перспектывы архіва ўяўляліся такім чынам: «Усе камп'ютэры аб'яднаны ў сетку, якая мае выхад да Інтэрнэта. Любы супрацоўнік мае доступ да баз дадзеных, у якіх змешчана інфармацыя з дакументаў архіва … Апроч таго, маюцца электронныя копіі дакументаў, унесенныя ў базы дадзеных, якія дазваляюць не толькі атрымаць патрэбную інфармацыю, але ўбачыць копію першакрыніцы на экране камп'ютэра і пры неабходнасці раздрукаваць яе» .[1]

Прайшло дзесяць гадоў работы аддзела ААТ у НГАБ. І сёння можна сцвярджаць, што амаль усе мары дзесяцігадовай даўнасці ажыццявіліся.

Сёння ва ўсіх структурных падраздзяленнях НГАБ ёсць камп'ютэры, маюцца 4 лакальные сеткі ў аддзелах. Адзінай агульнаархіўнай сеткі яшчэ няма, але гэта блізкая перспектыва і досыць рэальная задача. Зразумела, яшчэ не кожны архівіст мае персанальны камп'ютэр, але амаль кожны навуковы супрацоўнік карыстаецца камп'ютэрам у сваёй дзейнасці.

Архіў як сховішча вялікіх масіваў інфармацыі прадстаўляе шырокія магчымасці для ўкаранення розных інфармацыйных тэхналогій. На пачатковым этапе для аўтаматызацыі дзейнасці архіў пачаў актыўна ствараць і шырока выкарыстоўваць інфармацыйныя сістэмы (ІС). Фундаментальным кампанентам ІС з'яўляюцца базы дадзеных (БД). Яны сталі састаўной часткай навукова-даведачнага аппарата (НДА) да дакументаў, забеспечваюць збор спецыяльным кшталтам арганізаванай інфармацыі, яе пошук і прадстаўленне ў выглядзе, неабходным для ажыццяўлення архіўных інфармацыйных працэсаў.

Стварэнне аўтаматызаванага НДА (АНДА) забяспечвае дадатковую захаванасць дакументаў, а таксама магчымасць іх эфектыўнага выкарыстання. АНДА у параўнанні з традыцыйным прадстаўляе больш шырокія магчымасці аператыўнага і шматаспектнага пошуку. Зніжэнне працаёмкасці апрацоўкі інфармацыі дзякуючы аўтаматызаванаму пошуку дазваляе архіву не толькі аператыўна і якасна выконваць запыты грамадзян, але вызваляць каштоўныя працоўныя рэсурсы

[1] Михеенок Т.С. Отдел ААТ – реалии и перспективы. // Архіварыус: Зб. навук.-папул. павед. і арт. Вып.1, Мінск, 1999.



для правядзення навуковых даследаванняў, актывізаваць працу па выкарыстанню архіўных дакументаў у навуковых і культурна-асветніцкіх мэтах.

На 01.01.2008 г. у НГАБ створаны і працягваюць напаўняцца дадзенымі 18 розных аўтаматызаваных ІС, якія знаходзяцца ў розных структурных падраздзяленнях архіва. Гэтыя сістэмы аўтаматызуюць дзейнасць па асобных накірунках, функцыяніруюць у розных аперацыйных асяроддзях, выкарыстоўваюць рознае (нярэдка не сумяшчальнае паміж сабой) праграмнае забеспячэнне і фарматы дадзеных. Усе архіўныя АІС можна падзяліць на ўліковыя, тэматычныя і адміністрацыйна-кіраўнічыя.

АНДА архіва прадстаўляе сабой сукупнасць апісанняў дакументаў, ўнесеных у базы дадзеных (БД), аўтаматызаваных сродкаў пошуку інфармацыі і прадастаўлення вынікаў. АНДА будуецца на прынцыпах традыцыйнай сістэмы НДА і рэалізуе ўсе яго функцыі. Функцыі АНДА выконваюцца з дапамогай працэдур пошуку інфармацыі, прадастаўлення яго вынікаў для экранавага прагляду, дадзеных на паперы ці ў выглядзе файлаў.

Асноўнымі элементамі традыцыйнага НДА з'яўляюцца спіс фондаў, вопісы, каталог, шляхаводнік па фондах архіва. Дадатковымі — паказальнікі, абзоры дакументаў. Усе гэтыя тыпы даведнікаў прысутнічаюць і ў складзе АНДА.

БД-шляхаводнік адрозніваецца ад традыцыйнага шляхаводніка тым, што дазваляе дапаўняць і пастаянна актуалізаваць змешчаную ў ім інфармацыю. Мэта стварэння БД-шляхаводніка – уключэнне інфармацыі аб складзе і змесце дакументаў НГАБ у адзіную інфармацыйную прастору Рэспублікі Беларусь.

Асноўнае звяно ў сістэме НДА – архіўны **вопіс**. Ён змяшчае універсальны набор элементаў апісанняў, што дазваляе фарміраваць з іх поўнавартасныя БД і ажыццяўляць пошук інфармацыі як па любому з элементаў апісання, так і па групе элементаў адначасова. Прымяненне ААТ пры стварэнні БД-вопісу значна пашырае пошукавыя магчымасці гэтага тыпу даведніка і, відавочна, робіць непатрэбнай неабходнасць змяшчэння інфармацыі на ўзроўні справы ў сістэме каталогаў.

Значным элементам сістэмы НДА з'яўляецца **каталог –** адзіны даведнік, які можа забяспечыць унутрыархіўны скразны пошук інфармацыі па ўсіх фондах архіва. У электронным выглядзе найбольш мэтазгодна падрыхтоўка тэматычных і імянных каталогаў. Перспектыўнасць БД-каталогаў бясспрэчна, але толькі на базе

іх уніфікацыі і ўкаранення стандартызаваных фарматаў апісання інфармацыі.

Сярод разнастайных відаў АНДА запатрабаванымі сталі БД-**паказальнікі.** Гэта звязана з адноснай прастатой і малымі выдаткамі на іх падрыхтоўку, а таксама з хуткасцю шырокага і многааспектнага пошуку.

З 1994 г. НГАБ стварае і выкарыстоўвае розныя тыпы АНДА. Шырокае прымяненне дыферэнцыраванага падыходу адлюстравана складам маючыхся даведнікаў, розным наборам элементаў апісання ў іх, чарговасцю іх стварэння і г.д.

У цяперашні час у архіве прадстаўлены ўсе віды архіўных даведнікаў: БД-вопіс, БД-каталог і шматлікія БД-паказальнікі.

Ахарактарызуем найбольш значныя БД.

**БД-вопіс**

Ствараецца да фонду 694 «Радзівілы, князі». Яе асновай з’яўляецца традыцыйны вопіс. Змяшчае наступныя звесткі: нумар фонду, нумар вопісу, нумар справы, загаловак адзінкі захавання, крайнія даты, мова дакумента, заўвагі.

**БД-паказальнікі**

Уяўляе сабой найбольш шматлікі і разнастайны від даведніка.

АІПС **«Радавод»** уяўляе сабой імянны і геаграфічны паказальнік да рэвізскіх сказак фонду 333 «Мінская казённая палата». Змяшчае наступныя звесткі: нумар фонду, нумар вопісу, нумар справы, аркуша; губерня, уезд, дата дакумента, назва маёнтка, прозвішча ўладальніка, назва пасялення і стан яго жыхароў, нумар двара па бягучай і апошняй рэвізіям, прозвішча.

**БД «Імянны паказальнік асоб, якія выязджалі за мяжу па дадзеным пашпартоў»** уяўляе сабой імянны і геаграфічны паказальнік да дакументаў фонда 295 «Канцылярыя Мінскага губернатара». Змяшчае наступныя звесткі: нумар фонда, нумар вопісу, нумар справы і аркуша, год выдачы пашпарта, прозвішча, імя і імя па бацьку карыстальніка пашпарта, месца прыпіскі (жыхарства), узрост, стан, звесткі аб сваяках, якія выязджалі разам.

**БД «Беларуская шляхта»** ўяўляе сабой імянны паказальнік да пратаколаў (вывадовых і аб далучэннях) з фонда 319 «Мінскі дваранскі дэпутацкі сход» і 2512 «Віцебскі дваранскі дэпутацкі сход». Змяшчае наступныя звесткі: прозвішча (на рускай, беларускай і польскай мовах), назва герба, дата выводу, дата далучэння, дата і нумар указа Сената, нумар фонду, нумар вопісу, нумар справы і аркушоў.



**БД «Магілёўская сінагога»** ўяўляе сабой імянны паказальнік да метрычных кніг з фондаў 3362 «Магілёўская габрэйская сінагога» і 3410 «Габрэйскія таварыствы і ўстановы Магілёўскай і Віцебскай губерняў».

Складаецца з дзвюх частак і змяшчае наступныя звесткі:

- алфавітны спіс габрэяў мужчынскага полу, якія нарадзіліся ў 1864-1893 гг. (год, № запісу у метрычнай кнізе аб народжаных, прозвішча і імя бацькі дзіцяці);

- звесткі з метрычных кніг аб народжаных за 1894-1917 гг. (нумар фонду, нумар вопісу, нумар справы і аркуша; год, № запісу, прозвішча, імя бацькі, месца прыпіскі, пол і імя нованароджанага).

Аналагічныя звесткі змяшчае БД **«Жлобінская сінагога».**

У электронным выглядзе маюцца імянныя і геаграфічныя паказальнікі да фондаў 147 «Мінская аб’яднаная палата крымінальнага і грамадзянскага судоў», 299 «Мінскае губернскае праўленне», 308 «Мінскае губернскае па воінскай павіннасці прысутніцтва», 1430 «Канцылярыя Віцебскага грамадзянскага губернатара», 2640 «Віцебская казённая палата». Структура гэтых БД простая: нумар фонду, нумар вопісу, нумар справы, прозвішча, назва населенага пункта.

**БД-каталог**

**БД «Міжфондавы паказальнік да фондаў праваслаўнай канфесіі» і «Міжфондавы паказальнік да фондаў каталіцкай канфесіі»** ўяўляюць сабой даведнікі, якія ўлічваюць праваслаўныя і каталіцкія метрычныя кнігі па ўсіх фондах архіва. Змяшчае наступныя звесткі: нумар фонду, нумар вопісу, нумар справы і аркушаў; павет, назва царквы (касцёла), частка кнігі (нараджэнне, шлюб, пахаванне), крайнія даты, мова дакумента.

У цяперашні час НГАБ мае каля 500 000 запісаў у розных тэматычных базах дадзеных, доступ да якіх арганізаваны як для супрацоўнікаў, так і для карыстальнікаў чытальнай залы. У 2000 г. зарэгістравана каля 150 зваротаў да розных БД, 2005 г. – 350, 2007 г. – 500, што пацвярджае актуальнасць і запатрабаванасць гэтай працы.

З 2001 г. архіў мае доступ да сеткі Інтэрнэт. З гэтага часу НГАБ вядзе актыўную перапіску з выкарыстаннем электроннай пошты niab@solo.by Электронная пошта – просты і эфектыўны сродак для павышэння зручнасці і якасці інфармацыйнага абслугоўвання насельніцтва. Любы чалавек незалежна ад месца знаходжання і часу можа адправіць свой запыт у архіў, што асабліва актуальна для грамадзян краін СНГ і далёкага замежжа. Для заказчыка таксама важна магчымасць аператыўнага інфарміравання аб здзяйсненні

аплаты і атрымання адказаў на паўстаўшыя пытанні. Выкарыстанне электроннай пошты дазваляе падтрымліваць сувязь з архівам хутчэй і танней, чым традыцыйнымі сродкамі сувязі – поштай і тэлефонам.

З 2004 г. функцыяніруе ўласны сайт НГАБ. У цяперашні час ён знаходзіцца па адрасу: www.niab.belhost.by

Галоўнымі задачамі стварэння афіцыйнага архіўнага сайта з'яўляюцца:

інфарміраванне грамадзян і ўстаноў аб складзе і змесце дакументаў, што захоўваюцца ў архіве;

азнаямленне з паслугамі, якія прадстаўляе архіў;

паляпшэнне якасці інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў;

павышэнне эфектыўнасці працы архіва.

Матэрыялы, якія змешчаны на сайце НГАБ, абмежаваны не толькі інфармацыяй прадстаўнічага характару, мы асвятляем усе накірункі дзейнасці архіва. У рубрыцы «Аб архіве» змешчаны гістарычная даведка аб установе, інфармацыя аб структуры архіва, вытрымкі са статута, планы і справаздачы. У раздзеле «Паслугі» можна знайсці адказы на найбольш частыя пытанні, што ўзнікаюць пры замаўленні платных паслуг: узоры заяў, віды запытаў, іх кошты, тэрміны выканання, парадак аплаты і г.д. У гэтай жа рубрыцы маецца раздзел «Навіны», дзе ў аператыўным парадку наведвальнікі інфармуюцца аб новых матэрыялах, змешчаных на сайце, і важных архіўных падзеях, такіх, як змена рэжыма работы, кошты архіўных выданняў, змена ўмоў прадастаўлення паслуг і г.д.

У рубрыцы «Архіўныя даведнікі» змешчаны звесткі аб розных відах даведнікаў – вопісах, каталозе, паказальніках, БД, а таксама анатаваныя фонды; календары знамянальных дат і іншыя даведачныя матэрыялы. У рубрыцы «Публікацыі» можна азнаёміцца са зместам архіўных выданняў: «Архіварыус», «Магілёўскі магістрат», «Фонды НГАБ», «Мінская губерня», а таксама прачытаць найбольш цікавыя артыкулы супрацоўнікаў архіва. У рубрыцы «Архіўныя дакументы» змешчаны матэрыялы па наступных накірунках: «Гістарычныя падзеі», «Знакамітыя асобы», «Культура». На сайце маецца віртуальная выстава тыповых генеалагічных дакументаў: рэвізская сказка, метрычныя кнігі аб нараджэнні, шлюбе і смерці, прызыўны і пасямейны спісы, а таксама дваранскія радаслоўныя дрэвы.

Аддзел ААТ адказвае за функцыяніраванне сайта, праводзіць рэгістрацыю сайта ў пошукавых сістэмах і тэматычных каталогах, аналізуе эфектыўнасць его работы. Сярэдняя колькасць наведвальнікаў сайта на пачатку 2006 г. – 30 у дзень, а у 2007 г. з сайтам НГАБ знаёміліся ў сярэднім 50 чалавек у дзень. У цяперашні час сайт толькі рускамоўны, таму каля 80% усіх наведвальнікаў – з Беларусі і Расіі. У будучыні мы плануем зрабіць англамоўную версію сайта, каб прывабіць таксама карыстальнікаў з іншых краін.



Да нядаўняга часу большасць архіўных службаў свету, у тым ліку і Беларусі, стваралі страхавы фонд і фонд карыстання шляхам стварэння копій найбольш каштоўных дакументаў на мікрафільмах і мікрафішах. Аднак імклівае развіццё новых метадаў капіравання дакументаў, значная зручнасць захавання і выкарыстання лічбавых копій прымусілі архівы многіх краін перагледзець традыцыйную практыку на карысць лічбавання дакументаў.

Укараненне ў практыку работы архіваў тэхналогій стварэння і выкарыстання лічбавых выяў цалкам адпавядае інтарэсам карыстальнікаў. Перавод дакументаў у лічбавы фармат дае наступныя перавагі:

магчымасць шматразовага капіравання без згубы якасці;

магчымасць паляпшэння інфармацыйнай каштоўнасці арыгіналаў;

забеспячэнне доступу многіх карыстальнікаў да копіі, у тым ліку праз інтэрнэт.

У 2001 г. НГАБ прыступіў да лічбавання архіўных дакументаў, спачатку праца праводзілася на планшэтным сканеры Mustek A3, з 2005 г. – на сканеры EPSON 10000 XL. Перш за ўсё пачаўся перавод у лічбавы фармат незбрашураванага віду, які інтэнсіўна выкарыстоўваецца.

У красавіку 2005 г. архіў прыняў удзел у стварэнні інфармацыйнай сістэмы «Нясвіж – культурны цэнтр Еўропы і нацыянальны помнік» у межах праграмы ЮНЭСКА «Памяць Беларусі» і атрымаў у карыстанне лічбавую камеру SONY F828. Спектр дакументаў, якія можна перавесці ў лічбавы фармат шляхам фатаграфіі, значна шырэй – гэта збрашураваныя, нефарматныя дакументы ў любым фізічным стане. Архіў прыступіў да стварэння лічбавых копій на дакументальныя помнікі (ДП), якія захоўваюцца ў архіве. У цяперашні час усе ДП маюць лічбавыя копіі.

Разнастайнасць дакументаў, якія маюцца ў НГАБ на захаванні, не дазваляе вырашыць праблему лічбавання якім-небудзь адным спосабам. Асноўная маса захаваўшыхся ў архіве дакументаў – гэта сшытыя дакументы, нярэдка вялікай таўшчыні. Многія дакументы НГАБ знаходзяцца ў дрэнным фізічным стане: пашкоджаны плесенню, са затухаючымі тэкстамі і г.д. Таму для стварэння якасных копій архіву неабходны цэлы комплекс абсталявання: кніжны сканер, планетарны сканер, сканер мікраформ, лічбавая камера высокага разрашэння і інш.

У 2007 г. быў наладжаны новы від работ – лічбаванне мікрафільмаў,

што дазваляе павысіць захаванасць арыгіналаў. Супрацоўнікі аддзела ААТ і БелНДЦЭД алічбавалі мікрафотакопіі фонда «Браньскі гродскі суд» з выкарыстаннем сканера мікраформ Minolta MS7000.

Супрацоўнікі аддзела ААТ прымаюць актыўны ўдзел у навуковых канферэнцыях, семінарах і нарадах, выступаюць з дакладамі і паведамленнямі па тэматыцы работы аддзела. У аддзеле распрацаваны ўнутраныя інструкцыі – «Памятка карыстальнікам ПЭВМ», «Інструкцыя па арганізацыі работы з БД абмежаванага доступа», «Метадычныя рэкамендацыі па стварэнню АНДА ў НГАБ», «Інструкцыя па інфармацыйнай бяспецы архіва». Па ўсіх асноўных накірунках работы аддзела – выкарыстанне ІКТ у архівах[2], праблемы пошуку інфармацыі у архіўных БД[3], стварэнне фонда карыстання ў лічбавым фармаце[4], патрабаванні да падрыхтоўкі архівістаў[5], перспектывы развіцця архіўнай справы[6] – маюцца публікацыі.

З моманту заснавання аддзел узначальвае Т.С. Міхяёнак. Доўгі час добрасумленна працавалі ў аддзеле Н.Г. Бартасевіч і І.Г. Панасюк. Адным з асноўных відаў іх працы было запаўненне БД «Радавод», адной з першых, найбольш запатрабаванай і самай вялікай па аб’ёму ў цяперашні час БД.

Практычна з дня стварэння аддзела працуе галоўны архівіст В.У. Сядзельнікава, з 2006 г. – вядучы навуковы супрацоўнік Н.А. Бабіч. Яны займаюцца найбольш складанымі відамі работ, якія патрабуюць высокай кваліфікацыі – падрыхтоўка да выдання архіўных даведнікаў, ўнясенне інфармацыі ў БД «Радавод» і «Беларуская шляхта», стварэнне электронных даведнікаў, стварэнне лічбавых копій дакументаў з выкарыстаннем рознага абсталявання (фотакамеры, планшэтны сканер,

[2] Михеенок Т.С. Зачем архивам Интернет?// Нормативные документы и комментарии. январь, 2002, №1-2 (32-33). С.135-136.

[3] Михеенок Т.С. О достоверности информации, выдаваемой из БД, составленных на основании исторических документов генеалогического характера// Информационный бюллетень ассоциации «История и компьютер», Материалы VIII конференции, Москва, 2002. №30. С.130-132.

[4] Михеенок Т.С. Цифровые копии в архиве – новый способ воспроизведения документов или новая веха в обеспечении сохранности?// Материалы Международной конференции «Программа ЮНЕСКО «Память мира»: деятельность библиотек, архивов, музеев по сохранению документального наследия» (Минск, 30 ноября-1 декабря 2006), Мн., 2007.- С.105-111.

[5] Михеенок Т.С. Формула профессионализма архивиста// «Делопроизводство и архивы». 2005 №3. С.88-92..

[6] Михеенок Т.С. Архивы в информационном обществе и перспективные направления развития отрасли// «Делопроизводство и архивы», “Архівы і справаводства”, 2005, №1. С.79-84.



сканер мікраформ), выкананне генеалагічных і біяграфічных запытаў і г.д.).

З 2002 г. у аддзеле працуе архівіст 2-й катэгорыі Н.Ф. Хар’янава, з 2007 г. – вядучы архівіст Т.А. Навіцкая. Іх праца запатрабавана многімі супрацоўнікамі іншых аддзелаў архіва – гэта набор тэкстаў, тэхнічнае афармленне работ, ксеракапіраванне і сканіраванне дакументаў і інш.

*Міхяёнак Т.С.*

## Навукова-даведачная бібліятэка

Навукова-даведачная бібліятэка Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі на снежань 2007 г. мае ў сваіх зборах 28 605 кніг і брашур, 328 камплектаў журналаў, 98 назваў газет, з іх каля 20 тыс. кніг і брашур, больш 9 тыс. асобнікаў журналаў і газет дарэвалюцыйнага выдання[7]. У ёй захоўваецца гістарычная і архівадаведчая літаратура за перыяд да 1917 г. і паслярэвалюцыйны час, выданні профільнага зместу за апошнія дзесяцігоддзі.

Бібліятэчны фонд навукова-даведачнай бібліятэкі сфарміраваўся ў асноўным да 1964 г. Па Пастанове Савета Міністраў БССР ад 11 лістапада 1963 г. “Аб мерах па паляпшэнні архіўнай справы ў БССР”[8] Цэнтральны дзяржаўны архіў БССР быў пераведзены з г. Магілёва ў г. Мінск. У гэтым жа годзе з Дзяржархіва Мінскай вобласці былі перададзены ў ЦДГА БССР (г. Мінск) усе фонды дарэвалюцыйнага перыяду і бібліятэка з навукова-даведачным апаратам: інвентарнымі кнігамі, алфавітным і тэматычным каталогамі. Бібліятэчны фонд Дзяржархіва Мінскай вобласці пачаў фарміравацца ў 1919–1922 гг. пры правядзенні ў жыццё дэкрэта Савета Народных Камісараў РСФСР ад 1 чэрвеня 1918 г. “Аб рэарганізацыі і цэнтралізацыі архіўнай справы”[9], падпісанага У.І. Леніным, які паклаў пачатак арганізацыі адзінага Дзяржаўнага архіўнага фонда ў нашай краіне.

На падставе гэтага дэкрэта ў Мінскі архіў разам з рукапіснымі дакументальнымі матэрыяламі дакастрычніцкага перыяду пачыналі паступаць і друкаваныя выданні, якія меліся ў карыстанні: заканадаўчыя,

[7] Фонды Национального исторического архива Беларуси: справочник / Сост. Г.Е, Акулович [и др.]. Мн.:БелНИИДАД, 2006. С. 213.

[8] Архивное дело в БССР (1918-1968). Сб. законодательных и руководящих документов. Мн., 1972. С. 115.

[9] Архивное дело в БССР (1918-1968). Сб. законодательных и руководящих документов. Мн., 1972. С. 12-13.

нарматыўныя і даведачныя, статуты ўстаноў, справаздачы і агляды іх дзейнасці. Друкаваная літаратура была вылучана ў бібліятэчны фонд. Усяго з Дзяржархіва Мінскай вобласці ў 1963 г. было перададзена 16 012 кніг, 4682 журналы, 151 падшыўка газет, 18 інвентарных кніг.

У 1964 г. з Магілёва разам з архіўнымі фондамі была перададзена і нешматлікая бібліятэка – усяго 5270 кніг.

У ліпені 1941 г., у сувязі з акупацыяй тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ЦДГА БССР у г. Магілёве спыніў сваю дзейнасць. Дакументальныя матэрыялы архіва былі вывезены акупантамі ў г. Рыгу, куды паводле загаду № 33 ад 15 сакавіка 1945 г. была накіравана група супрацоўнікаў архіва разам з загадчыкам аддзела навукова-даведачнай літаратуры Ганнай Ульянаўнай Нізаўцавай. Асноўнай мэтай дзейнасці групы было вызначана правядзенне адбору і падрыхтоўкі да рэвакуацыі дакументальных матэрыялаў[10]. Дадзеных аб вернутым кніжным фондзе ў 1945 г. не маецца.

Паводле штатнага раскладу ў архіве ў 1945 г. дзейнічаў аддзел навукова-даведачнай літаратуры са штатнымі адзінкамі: загадчык аддзела – старшы навуковы супрацоўнік (Г.У. Нізаўцава) і старшы архіварыус (Т.Е. Кундалева).

У пасляваенны час бібліятэчны фонд ЦДГА БССР у г. Магілёве няспынна папаўняўся. Так, у 1947 г. у архіў былі перададзены дарэвалюцыйныя фонды з дзяржаўных архіваў Віцебскай і Гомельскай абласцей і друкаваная літаратура, аб чым сведчаць штампы на кнігах. Літаратура паступала таксама з дзяржаўных архіваў Масквы і Ленінграда.

У справаздачы аб рабоце ЦДГА БССР у г. Магілёве за 1950 г. адзначана, што за справаздачны перыяд у бібліятэку з Дзяржархіва Гомельскай вобласці было перададзена 2982 кнігі, 4730 асобнікаў газет[11].

Па стану на 1 студзеня 1951 г. у навукова-даведачнай бібліятэцы архіва налічвалася 7370 асобнікаў кніг, 36 камплектаў журналаў, 52 камплекты газет. За 1950 г. было заінвентарызавана 2982 кнігі, 4730 газет, складзены прадметна-тэматычны каталог па тэме “Гісторыя дзяржустаноў”, які ўключаў 200 картак.

У смеце выдаткаў за гэты год пазначана, што на набыццё кніг для бібліятэкі і выпіску газет выдаткавана: “Праўда” – 72 руб., “Веснік Акадэміі навук” – 96 руб., “Бальшавік Беларусі” – 36 руб., “Пытанні гісторыі” – 96 руб., “Бібліятэкар” – 24 руб., набыццё літаратуры – 176 руб.

[10] НАРБ. Ф. 251. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 15 адв.
[11] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 27. Арк. 98.



Навукова-даведачная бібліятэка архіва ў 1950 г. супрацоўнічала з бібліятэкамі імя У.І. Леніна ў г. Маскве і г. Мінску па абмене матэрыялам. За справаздачны перыяд па міжбібліятэчнаму абанементу было атрымана 15 асобнікаў кніг па зваротах супрацоўнікаў.

У 1950–1951 гг. бібліятэкай загадвала старшы архіварыус Лідзія Раманаўна Чэпікава.

У справаздачы аб рабоце архіва за 1955 г. адзначана, што ў аддзел навукова-даведачнай літаратуры паступіла 340 кніг і часопісаў, аформлена 38 падшывак газет[12]. Паводле даведніка па ЦДГА БССР 1959 г. у бібліятэцы захоўвалася 8633 кнігі, а таксама часопісы (37 назваў) і газеты (64 назвы)[13]. У 1960 г. бібліятэка папоўнілася 274 кнігамі, 26 камплектамі часопісаў, 6 камплектамі газет[14].

Загадам № 105 ад 26 снежня 1964 г. дырэктара ЦДГА БССР (г. Мінск) “Аб перадачы дакументальных матэрыялаў пад адказнасць загадчыкаў аддзелаў архіва”, бібліятэчны фонд быў перададзены ў падпарадкаванне аддзелу выкарыстання і публікацыі[15]. Адказнай за арганізацыю яго захавання была прызначана навуковы супрацоўнік аддзела Кацярына Пятроўна Міхайлава, якая загадам № 40 ад 27 красавіка 1964 г. “Аб узнагароджанні супрацоўнікаў архіва ў сувязі з заканчэннем перавозкі дакументальных матэрыялаў” у ліку іншых супрацоўнікаў была адзначана падзякай[16].

Па загаду дырэктара архіва № 28 ад 25 кастрычніка 1965 г. “Аб перадачы дакументальных матэрыялаў аддзелам фондаў і друкаваных матэрыялаў аддзелу ўліку навукова-даведачнага апарата” загадчык аддзела Т.А. Вараб’ёва і загадчык чытальнай залы К.П. Міхайлава перадалі навукова-даведачную літаратуру з інвентарнымі кнігамі і бібліятэчнымі каталогамі аддзелу ўліку і навукова-даведачнага апарата.

Загадам № 92 ад 25 лістапада 1965 г. “Аб размеркаванні абавязкаў у ЦДГА БССР” на малодшага супрацоўніка аддзела ўліку і навукова-даведачнага апарата Ніну Леанідаўну Зюзіну (з 1967 г. – Рабцэвіч) была ўскладзена адказнасць за навукова-даведачную бібліятэку і вядзенне ўсяго комплексу работ: камплектаванне, улік, выдача і прыём кніг, забеспячэнне захаванасці бібліятэчнага фонда. У 1967 г. Н.Л. Рабцэвіч камандзіравана

[12] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 56. Арк. 42.
[13] Центральный государственный исторический архив БССР: Путеводитель. Могилев: Архивное Управление МВД БССР, 1959. – С. 126.
[14] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 87. Арк. 47.
[15] НАРБ. Ф. 251. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 139–142.
[16] НАРБ. Ф. 251. Воп. 1. Спр. 34. Арк. 91.

ў ЦДГА г. Ленінграда для адбору літаратуры па профілю архіва.

У справаздачы архіва аб рабоце за 1970 г. па аддзелу ўліку і навукова-даведачнага апарата адзначалася, што ў бібліятэцы зроблена інвентарызацыя 1418 экз. кніг, якія паступілі з ЦДГА СССР у г. Ленінградзе, складзена 3667 картак для бібліятэчнага каталога[17].

У 1973 г. навукова-даведачная бібліятэка перададзена ў аддзел выкарыстання і публікацыі дакументальных матэрыялаў, а абавязкі загадчыка бібліятэкай былі ўскладзены на старшага навуковага супрацоўніка Маю Цімафееўну Мінько, якая выконвала гэтыя абавязкі да 1976 г. З 1976 г. па 1978 г. навукова-даведачную бібліятэку ўзначальвала малодшы навуковы супрацоўнік Святлана Міхайлаўна Лорына, з 1978 г. па 1983 г. – старшы навуковы супрацоўнік Альбіна Францаўна Аляксандрава, з 1983 г. па 1985 г. – археограф 1 катэгорыі Таццяна Мікалаеўна Лініч, з 1985 г. па 1988 г. – малодшы навуковы супрацоўнік Вольга Уладзіміраўна Бабкова, з 1988 г. па 1999 г. – вядучы навуковы супрацоўнік, галоўны архівіст Таццяна Восіпаўна Седлярэвіч. У 1999 г. навукова-даведачную бібліятэку прыняла вядучы навуковы супрацоўнік Ірына Мікалаеўна Шпілеўская. У 1996 г. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі пераехаў у новы будынак па вуліцы Крапоткіна, 55, але бібліятэка архіва была перавезена толькі ў кастрычніку 2000 г. Перавозка і расстаноўка бібліятэчнага фонда ў сховішчы былі арганізаваны хутка.

З 2000 г. па 2001 г. бібліятэкай загадвала Ірына Львоўна Вернер, з 2002 г. па цяперашні час – вядучы навуковы супрацоўнік Вольга Хамітаўна Канаваленка.

Асноўны кніжны фонд навукова-даведачнай бібліятэкі архіва складаюць кнігі, брашуры, перыядычныя выданні (газеты, часопісы, бюлетэні). Каштоўную частку бібліятэкі складаюць рэдкія выданні: “Ахтаіх”, “Евангелле”, “Трэбнік”, “Службоўнік”, “Анфалагіён”, “Новы і поўны геаграфічны слоўнік Расійскай дзяржавы”, “Гісторыя Расійскай іерархіі, сабраная Наўгародскай семінарыі рэктарам і багасловам, настаўнікам Антоніева кляштара, архімандрытам Амбросіем”, “Статут Вялікага княства Літоўскага”, “Збор старажытных грамат і актаў гарадоў: Вільні, Коўна, Трок, праваслаўных кляштараў, цэркваў і па розных

[17] НАРБ. Ф. 251. Воп. 3. Спр. 174. Арк. 14.



прадметах”[18].

У складзе бібліятэчнага фонда маюцца пастановы, зборы законаў, выдадзеныя да 1917 г.: асобныя выданні законаў царскага перыяду (Пятра I, Кацярыны I, Пятра II, Кацярыны II), “Поўны збор законаў Расійскай імперыі, мясцовых узаканенняў і распараджэнняў Астзейскіх губерняў”, “Збор узаконенняў і распараджэнняў урада”, “Зборнік узаконенняў і распараджэнняў аб сялянскіх і судовых установах”, цыркуляры, указы і рашэнні Сената, “Звод ваенных пастаноў”, “Збор пастаноў Міністэрства народнай асветы”, цыркуляры па Віленскай навучальнай акрузе, “Зборнік цыркуляраў і інструкцый МУС і Міністэрства фінансаў”, “Зборнік узаконенняў і распараджэнняў Міністэрства юстыцыі”, “Зборнік пастаноў Міністэрства шляхоў зносін”, “Зборнік законаў і распараджэнняў па землеўладкаванню”, “Зборнік распараджэнняў і пастаноў па паштова-тэлеграфнаму ведамству” і інш.

Аснову навукова-даведачнага фонда складаюць даведнікі, слоўнікі, энцыклапедыі, адрасныя кнігі, сярод якіх нямала карысных для даследчыка выданняў XIX–XX стст.: спісы населеных месцаў Віленскай, Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і іншых губерняў, слоўнікі назваў населеных месцаў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, спісы землеўладальнікаў Мінскай губерні за канец XIX–пач. XX стст., спісы землеўладальнікаў Гродзенскай губ. за 1890 г., алфавітныя спісы дваранскіх родаў Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, “Слоўнік старажытнай актавай мовы” Н.І. Гарбачэўскага[19], “Слоўнік беларускіх гаворак” І.І. Насовіча[20], “Руска-габрэйскі (ідыш) слоўнік”[21], а

[18] Ахтаих (Восьмігласнік). М., 1666. – 373 с.; Евангелие (служебное). М., 1685. – 375 с.; Требник. М., 1750. – 374 с.; Служебник. Киев, 1775. – 247 с.; Анфалагион. Киев, 1631. – 321 с.; Новый і полный географіческій словарь Россійского государства. М.: Университетская типография у Новикова, 1788–1792; История российской иерархии, собранная Новгородской семинарии ректором и богословом, учителем Антониевого монастыря, архимандритом Амбросием. Т. I–IV. М.: Синодальная типография, 1807–1817; Статут Великого княжества Литовского. Спб.: типография при Сенате, 1811; Собрание древних актов и грамот городов: Вильно, Ковно,Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Вильно: типография А. Марцинкевича, 1843. – 208 с.

[19] Горбачевский Н.И. Словарь древнего актового языка северно-западного края и Царства Польского. Вильно: типография А.И. Зака, 1874. – 397 с.

[20] Носович И.И. Словарь белорусского наречия. Спб.: типография императорской Академии наук, 1870. – 755 с.

[21] Еврейская энциклопедия: Свод знаний о еврействе и его культуре в прошлом и настоящем. СПб: издание Общества научных еврейских изданий и издательства Брокгауз и Ефрон., 1889.

таксама гістарычныя, філасофскія, геаграфічныя, тапанімічныя слоўнікі, тлумачальныя і арфаграфічныя слоўнікі беларускай і рускай моў, замежных слоў, энцыклапедычныя слоўнікі Бракгауза і Ефрона, "Гранат", Вялікая і Малая савецкія энцыклапедыі, "Поўны праваслаўны багаслоўскі энцыклапедычны слоўнік"[22], "Рускі энцыклапедычны слоўнік", "Савецкая гістарычная энцыклапедыя", "Кароткая геаграфічная энцыклапедыя", "Прыдворны каляндар" на розныя гады, "Віленскі каляндар" на канец XIX–пач. XX стст., "Памятныя кніжкі ведамстваў устаноў Імператрыцы Марыі на 1910–1911 гг.", "Адрасная і даведачная кніга на 1917 г.", "Увесь Менск або падарожнік па г. Менску за 1911 г.", "Памятныя кніжкі" Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і іншых губерняў, "Памятныя кніжкі" Віленскай навучальнай акругі.

У складзе бібліятэчнага фонда маецца нямала літаратуры па гісторыі рэлігіі: "Апісанне цэркваў і парафіяў Мінскай дыяцэзіі", "Гісторыка-статыстычнае апісанне" Мінскай і Магілёўскай дыяцэзій, "Гісторыя праваслаўнай царквы", "Гісторыя Мінскай духоўнай семінарыі", статуты духоўных кансісторый, статыстычныя звесткі аб цэрквах і прычтах Мінскай губерні, "Праваслаўныя царкоўныя брацтвы", "Хрысціянскае вучэнне" і інш.

У бібліятэцы прадстаўлены таксама афіцыйныя і ведамасныя выданні цэнтральных і мясцовых устаноў: справаздачы Дзяржаўнага Савета і Сената, агляды дзейнасці Дзяржаўнай Думы, становішча аб выбарах, выбарчыя спісы; справаздачы губернатараў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, даклады і справаздачы Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай гарадскіх і земскіх упраў; агляды па Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях за 1878–1914 гг.; справаздачы дзяржаўнага, дваранскага, сялянскага пазямельнага і гарадскіх банкаў; сметы прыбыткаў і выдаткаў па 34 губернях Расійскай імперыі, павятовых земстваў Мінскай губерні; статуты суполак і таварыстваў, сметы дабрачынных таварыстваў і апякунстваў, фабрычных інспектараў і інш.

Маюцца выданні па гісторыі прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадарцы, адукацыі, культуры, ахове здароўя, па пытаннях дзяржаўнага і крымінальнага права, а таксама статыстычныя звесткі аб стане прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі, насельніцтва па Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і іншых губернях.

Значную частку фонда бібліятэкі складае гістарычная літаратура, у тым ліку зборнікі дакументаў, выдадзеныя да 1917 г.: "Гісторыка-

[22] Полный православный энциклопедический словарь. СПБ.: издательство П.П. Сойкина, 1873–1879.



юрыдычныя матэрыялы"[23], "Акты Віленскай камісіі для разбору старажытных актаў"[24], "Акты, якія адносяцца да Заходняй і Паўднёвай Расіі"[25], "Матэрыялы па гісторыі вайны 1812 г."[26], "Зборнік рускага гістарычнага таварыства"[27] і інш.

У бібліятэцы захоўваецца літаратура па гісторыі, арганізацыі, тэорыі і практыцы архіўнай справы, даведнікі па цэнтральных, рэспубліканскіх і абласных архівах СССР, Рэспублікі Беларусь, вопісы фондаў архіваў. Каштоўную частку складаюць перыядычныя выданні: усесаюзныя і рэспубліканскія гістарычныя і архівазнаўчыя часопісы і газеты, часопісы дарэвалюцыйных міністэрстваў (юстыцыі, унутраных спраў, асветы, фінансаў, прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі, рэлігійнага культу, грамадскіх арганізацый), першыя выданні газет у Беларусі: афіцыйныя газеты "Губернскія ведамасці", якія выдаваліся ў 1838–1917 гг. Віцебскім, Гродзенскім, Мінскім і Магілёўскім губернскімі праўленнямі, перыядычныя выданні праваслаўнай царквы "Епархіяльныя ведамасці" (полацкія, мінскія, магілёўскія), грамадска-палітычныя газеты "Мінскі лісток", "Паўночна-Заходні край", беларуская газета "Наша ніва", грамадска-палітычная і літаратурная газета "Ускраіна" і інш. Бібліятэка працягвае папаўняцца навуковымі перыядычнымі выданнямі – часопісамі "Гістарычны архіў", "Айчынныя архівы", "Спадчына", "Архівы і справаводства", "Беларускі гістарычны часопіс" і інш.

Фонд навукова-даведачнай бібліятэкі заўсёды папаўняецца грамадска-палітычнай, гістарычнай, даведачнай, архівазнаўчай літаратурай. Існуе традыцыя, па якой аўтары апублікаваных работ па дакументальных матэрыялах НГАБ дораць бібліятэцы асобнікі з пасвячэннем (Я.К. Анішчанка, У.Н. Дзянісаў, А.Б. Доўнар, У.Н. Кісялёў, У.А. Лякін, Л.І. Маленка, Т.У. Пішчыкава, Ф.У. Чарняўскі, Д.Л. Яцкевіч). Маецца шэраг выданняў з асабістых бібліятэк. Так, вядомы беларускі гісторык і археограф М.У. Мялешка перадаў архіву 46 кніг. Папаўняецца бібліятэчны фонд і за кошт зборнікаў і даведнікаў, у падрыхтоўцы і выданні якіх прымаў удзел архіў (гл. бібліяграфічны спіс работ

[23] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. 32 т. Витебск: типография губернского правления, 1871-1906.

[24] Акты Виленской археографической комиссии. 49 т. Вильно: типография губернского правления, 1865–1915.

[25] Акты, относящиеся к истории южной и западной России, собранные и изданные археографической комиссиею. 11 т. СПб.: типография Э. Праца, 1863–1892.

[26] Отечественная война 1812 г. Т. 5-21. СПб.: «Бережливость», 1904–1914.

[27] Сборник императорского русского исторического общества. 148 т. СПб.: Типография императорской Академии наук, 1867–1916.

супрацоўнікаў архіва).

Даведачны апарат бібліятэкі прадстаўляе сабой алфавітны і сістэматычны каталогі кніг і брашур. Даведачна-інфармацыйны фонд (ДІФ) бібліятэкі на снежань 2007 г. налічае 1867 адзінак захоўвання. Ён прадстаўляе сабой сукупнасць сістэматызаванага па аднаму прынцыпу збора друкаваных і недрукаваных матэрыялаў па архіўнай справе, дакументазнаўству і даведачна-пошукаваму апарату да яго. ДІФ прызначаны для інфармацыйнага забеспячэння арганізацыйнай, практычнай і навуковай дзейнасці архіва.

Асноўнымі задачамі ДІФ з'яўляюцца: канцэнтрацыя профільнай літаратуры і дакументацыі, неабходных для інфармацыйнага забеспячэння дзейнасці карыстальнікаў, навуковая апрацоўка, сістэматызацыя і ўлік матэрыялаў, стварэнне даведачна-пошукавага апарата ў мэтах эфектыўнага даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання грамадзян.

ДІФ камплектуецца матэрыяламі па профільнай і сумежнай праблематыцы ў адпаведнасці з задачамі інфармацыйнага забеспячэння дзейнасці Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і зваротамі спажыўцоў інфармацыі. Крыніцамі камплектавання ДІФ з'яўляюцца структурныя падраздзяленні архіва, архіўных устаноў Дзяржаўнай архіўнай службы, а таксама ўстановы і арганізацыі, якімі распрацоўваюцца навукова-метадычныя дакументы, даведачна-інфармацыйныя і іншыя матэрыялы ў галіне архіўнай справы і дакументазнаўства.

Структурныя падраздзяленні НГАБ прадстаўляюць у ДІФ навуковыя распрацоўкі, нарматыўныя дакументы і метадычныя дапаможнікі, тэматычныя агляды і пералік дакументаў і фондаў архіўнай установы. Даклады і паведамленні тэарэтычнага, арганізацыйна-метадычнага і інфармацыйнага характару, падрыхтаваныя супрацоўнікамі, артыкулы і іншыя матэрыялы, апублікаваныя ў друку, выдадзеныя архівам зборнікі дакументаў, матэрыялы навуковых канферэнцый праходзяць улік і навуковую апрацоўку.

Для забеспячэння пошуку інфармацыі па матэрыялах ДІФ распрацоўваецца і вядзецца даведачна-пошукавы апарат (ДПА). Ён уключае галоўную даведачную картатэку, дапаможныя картатэкі (газетных і журнальных артыкулаў, перыядычных выданняў, даведачна-інфармацыйныя выданні і ненадрукаваныя інфармацыйныя матэрыялы).

Асноўнымі формамі выкарыстання матэрыялаў ДІФ архіва з'яўляюцца выдача ва ўстаноўленым парадку матэрыялаў карыстальнікам, падбор матэрыялаў па тэматыцы работ, якія праводзяцца ў архіве, а таксама рэгулярнае інфарміраванне супрацоўнікаў архіва аб новых паступленнях.

*В.Х. Канаваленка*



# СУПРАЦОЎНІКІ ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА

**АДАМОВІЧ Святлана Філіпаўна** (н. 01.01.1948, г. Слаўгарад, Алтайскі край, Расія), гісторык, мастацтвазнаўца, архівіст. З сям'і ваеннага авіяінжынера. Скончыла СШ № 42 г. Мінска (1966), гістарычны факультэт Беларускага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1970). Працавала на пасадзе навуковага супрацоўніка сацыялагічнай лабараторыі БДУ імя У.І. Леніна; з 1973 – у Гарадскім савеце Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, у інстытуце «Белпраектрэстаўрацыя» на пасадзе навуковага супрацоўніка, начальніка гістарычнага аддзела. За гэты час выканала шэраг гісторыка-архіўных і бібліяграфічных даследаванняў, якія сталі падставай для распрацоўкі праектаў рэстаўрацыі многіх помнікаў беларускага дойлідства ў Навагрудку, Пінску, Кобрыне, Мінску, Валожыне, Жыровічах, Ішкальдзі, Любчы і інш.

З 1995 па 2000 г. працавала заг. аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання НГАБ. У гэты перыяд удзельнічала ў падрыхтоўцы і выданні навуковых зборнікаў, у навуковых канферэнцыях. Вынікі яе працы былі адлюстраваны ў шэрагу артыкулаў, а таксама знайшлі свой ужытак на практыцы – у рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мае вялікі вопыт працы ў архівах не толькі Беларусі, але і Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы. У цяперашні час працуе ў УП «Праектрэстаўрацыя».

*Тв.:* Костел Св. Михаила в Ивенце // Диалог. 1995. № 1; Пинск. Фотоальбом (посвящается 900-летию города). Мн., 1997 (в соавторстве); Троицкий костел в Ишкольди // Диалог. 1995. № 9; Пінскія камуністы // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 3.- С.57-59; Цуд адраджэння (гісторыя будаўніцтва і рэстаўрацыі Мінскага кафедральнага касцёла) // Наша вера. 1997. № 1(4); Занядбаная святыня: З гісторыі касцёла Зембінскага дамініканскага кляштара // Наша вера. 1999. № 1(7); Страчаная спадчына (бенедыктынскі кляштар у Гарадзішчы пад Пінскам) // Каштоўнасці мінуўшчыны: Праблемы зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны Мінска (Матэрыялы канферэнцыі (Мінск, 12 лістапада 1997 г.)). Мн., 1998; Загадкавая і старажытная (пра гісторыю Ішкальдскага касцёла) // Наша вера. 1997. № 1; Комплекс пинского иезуитского монастыря // Наша вера. 1999. № 3(9) і інш.

*У.М. Дзянісаў*

**АКУЛОВІЧ Галіна Яўгенаўна** (н. 30.08.1957, г. Мінск), гісторык, архівіст. Скончыла гістарычны факультэт БДУ (1981).

З 1974 пачала працаваць у ЦДГА БССР на пасадзе машыністкі. У ліст. 1978 – мал. навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даведачнага апарата, праз год – архівіст II катэгорыі. У 1980 была прызначана ст. архівістам, у ліп. 1990 — ст. навуковым супрацоўнікам аддзела навукова-даведачнага апарата архіва. З мая 1991 — заг. сектарам уліку дакументаў і фондаў аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм ЦДГА БССР. Пасля часовага аб'яднання ЦДГА і былога Партархіва ІГП пры ЦК КПБ — вяд. навуковы супрацоўнік. З пачатку 1993 — заг. аддзела інфармацыйна-

пошукавых сістэм НГАБ у г. Мінску.

Займалася ўдасканальваннем сістэмы ўліку дакументаў і фондаў у архіве, камп'ютэрызацыяй уліку. Узначальвала працу па ўдасканальванню вопісаў фондаў устаноў рэлігійнага культу Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай губ., судовых органаў Мінскай губ., князёў Радзівілаў, сістэматычнага і імяннога каталогаў НГАБ.

Узнагароджаны нагрудным знакам «Ганаровы архівіст Беларусі».

*Н.М. Леўчык*

**АЛІПЧАНКА Наталля Мікалаеўна** (н. 20.05.1967, г. Мінск), архівіст. Скончыла СПТВ–24 імя М. Кедышкі (1986).

У НГАБ з сакавіка 1987. Працавала сакратаром-машыністкай, архівістам 2-й катэгорыі (1988) у аддзеле інфармацыйна-пошукавых сістэм. Са жніўня 2003 – архівістам 2-й катэгорыі аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў.

Аліпчанка Н.М. займаецца выдачай і прыёмам спраў са сховішча ў чытальную залу і супрацоўнікам, праверкай нумарацыі і нумараваннем аркушоў дакументаў, праверкай наяўнасці і стану спраў, адказвае за захаванасць дакументаў комплекса былой Мінскай губерні архіўнага сховішча № 3.

Узнагароджана ганаровымі граматамі архіва.

*Г.М. Кутукова*

**АЛЯКСАНДРАВА Альбіна Францаўна** (н. 02.01.1941, в. Суцін Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), архівіст. Скончыла Жалудоцкую СШ, філалагічны факультэт БДУ (1964).

Працавала настаўніцай. У 1975 перайшла на пасаду малодшага, а затым старшага навуковага супрацоўніка ў гаспадарча-разліковы аддзел Дзяржаўнага архіва Мінскай вобл. З ліп. 1978 — у ЦДГА БССР у г. Мінску. Працавала малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам, галоўным палеографам ў аддзелах інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, навукова-даведачнага апарата. Займалася працай па арганізацыі выкарыстання дакументаў, улікам і камплектаваннем бібліятэкі, перапрацоўкай і ўдасканальваннем вопісаў старажытных актаў, фонда «Радзівілы, князі» і інш.

З 1991 узначальвала аддзел старажытных актаў НГАБ. У 2003 перайшла на пасаду галоўнага палеографа. Шмат увагі ўдзяляла метадыцы распрацоўкі і апісання актавых кніг судовых устаноў XVI-XVIII стст., помнікаў сфрагістыкі, публікацыі і папулярызацыі дакументаў архіва ў сродках масавай інфармацыі і г.д. Удзельнічала ў падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў гісторыка-дакументальнай серыі кніг «Памяць», навуковага выдання серыі «Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII стст.», у працы Навуковай рады архіва і экспертна-метадычнай камісіі. З'яўляецца адным з аўтараў-складальнікаў даведніка «Фонды НГАБ», удзельнічае ў падрыхтоўцы навуковага зборніка дакументаў «Тэстаменты другой паловы XVI ст. па матэрыялах актавых кніг НГАБ». Узнагароджана



знакам "Ганаровы архівіст Беларусі" (2007).

***Тв.:*** Пасёлак, дзе мы жывём (з гістарычнага мінулага Жалудка) // Савецкая вёска. (г.п. Жалудок). 1981. 3 ліст.; З успамінаў рэвалюцыянера (да 100-годдзя І.Е.Любімава) // Ленінскі шлях (Лунінец). 1982. 15 мая і інш.; Брэгер Герман Максімавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 74-75; Яцкевіч Зміцер Лявонцьевіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 238-239.

***Літ.:*** Архівісты Беларусі: Біябібліягр. даведнік. Мн., 2006. С. 52-53.

*А.К. Галубовіч*

**АНТАНОВІЧ Зінаіда Васільеўна** (н. 02.02.1984, г. Пінск Брэсцкай вобл.), гісторык-архівіст. Скончыла СШ № 12 г. Пінска (2001), гістарычны факультэт БДУ (2006). Паступіла ў аспірантуру БелНДІДАС (2007). З 2004 па 2007 г. займала пасаду старшага навуковага супрацоўніка, з ліпеня 2007 – галоўнага архівіста аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

Удзельнічала ў распрацоўцы навукова-даследчых тэм «Крыніцы па гісторыі горадабудаўніцтва і архітэктуры Беларусі» і «Гісторыя дзяржаўных устаноў ВКЛ: Пінскі магістрат і Пінскі каптуровы суд». Аўтар шэрагу артыкулаў, прысвечаных гісторыі рыма-каталіцкай царквы на Беларусі XVIII–пачатку XX стст., а таксама знакамітым дзеячам айчыннай гісторыі і культуры. Удзельнічала ў падрыхтоўцы навуковага зборніка дакументаў «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч». Займаецца падрыхтоўкай да выдання гістарычных крыніц, рэгулярна друкуецца ў зборніку «Архіварыус». Удзельніца шэрагу міжнародных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый.

***Тв.:*** Лёсы каталіцкага духавенства на Беларусі 1917–1939 гг.: асноўныя аспекты даследавання // Беларуска-польскія архіваліі: стан і перспектывы: Матэрыялы Другой беларуска-польскай канферэнцыі архівістаў (Мінск, 10-11 кастрычніка 2001 г.) / Рэд. К.І. Козак. Мн.: НАРБ, 2003. С. 216–220; Пінскі кляштар мар'явітак // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3 / Рэдкал.: А.К. Галубовіч (старш.) і інш. Мн.: НГАБ, 2005.С. 5–8; Лёсы каталіцкіх ксяндзоў Магілеўшчыны (1917–1939 гг.) // Шляхі магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац. / Уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. Магілёў: Магілёўская абласная ўзбуйненая друкарня, 2005; Перыядычны друк рыма-каталіцкай царквы г. Мінска кан. XVIII–пач. XX стст. // Міжнародная навуковая канферэнцыя «Знакамітыя мінчане XIX-XX стст.». (Мінск, 27 кастрычніка 2005 г.) (у сааўтарстве з З.Л. Яцкевічам); Крыніцы па генеалогіі шляхты Пінскага павета ВКЛ XVI-пач. XX стст. // Герольд litherlands. 2006. №17.-С. 7-23; Архіў Полацкага дамініканскага кляштара ў сярэдзіне XIX ст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. / Рэдкал.: Ю.М. Бохан [і інш.]. Мн.: НГАБ, 2007. С. 8–14; Максім Лужанін – паплечнік Кузьмы Чорнага / Пра час «Узвышша»: матэрыялы Узвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2005–2006). Вып. 3 / Уклад. Г.В. Запартыка, Т.В. Кекелева, У.Г. Кулажанка; навук. рэд. М.І. Мушынскі. Мн.: РІВШ, 2007. С. 110–116; Адбітак грамадска-палітычных падзей пачатку XX стагоддзя на даследаванні Змітрака Бядулі «Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных песнях і казках» / Пра час «Узвышша»: Матэрыялы Узвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2005–2006). Вып. 3 / Уклад. Г.В. Запартыка, Т.В. Кекелева, У.Г. Кулажанка; навук. рэд. М.І. Мушынскі. Мн.: РІВШ, 2007.-С. 197–203; Судовыя пратаколы рыма-каталіцкіх кансісторый Беларусі як крыніцы па справаводству канца XVIII–пачатку XX стагоддзя // Архівы і справаводства. 2007. № 6. С. 111–115 (у сааўтарстве з З.Л. Яцкевічам).

*З.Л. Яцкевіч*

**АХРАЛОВІЧ Рыгор Аркадзьевіч** (н. 08.11.1925, г. Магілёў) архівіст, настаўнік гісторыі. Са снежня 1942 – курсант Тамбоўскага Чырвонасцяжнага пяхотнага вучылішча, з лютага 1945 – малодшы лейтэнант, камандзір узвода 2-га Беларускага фронта, савецкіх войскаў у Германіі (у 1969 г. – ст. лейтэнант). У 1948 скончыў 10 класаў школы рабочай моладзі, завочна вучыўся ў МДПІ, у 1954 атрымаў спецыяльнасць настаўніка гісторыі.

З 27.11.1946 працаваў архіварыусам, ст. архіварыусам аддзела агульных фондаў, з 26.01.1950 – начальнікам аддзела сакрэтных фондаў ЦДГА БССР, чатыры месяцы замяшчаў начальніка ЦДГА БССР, з 06.10.1952 – навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік у навукова-даведачнай бібліятэцы. З 13.08.1954 – настаўнік гісторыі Варацэвіцкай СШ Іванаўскага раёна Брэсцкай вобл.; з ліпеня 1966 па 1969 г. – дырэктар Брылеўскай васьмігадовай школы.; ст. лейтэнант запасу.

Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне».

***Крыніцы***: НГАБ. Ф. 251(ба), воп. 1, спр. 2, арк. 36 адв., 37; спр. 5, арк. 12; спр. 7, арк. 6а; спр. 8, арк. 13; спр. 10, арк. 56; спр. 11, арк. 3; спр. 12, арк. 92, 96; спр. 13, арк. 9; спр. 15, арк. 3; спр. 16, арк. 31, спр. 17, арк. 1; ДАГАМВ. Ф. 52, воп. 30, спр. 26, арк. 2, 6.

*З.Л. Яцкевіч*

**БАБІЧ Наталля Аляксандраўна** (н. 07.05.1981), архівіст, гісторык. Скончыла СШ г. Мінска (1998), гістарычны факультэт БДУ (2008). Са жніўня 1998 працуе ў НГАБ. Займала пасады архівіста 2-й катэгорыі аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, з чэрвеня 1999 – архівіст І катэгорыі, у лістападзе 1999–верасні 2001 – вядучы архівіст. У верасні 2006 вярнулася на працу ў архіў, займала пасаду вядучага архівіста аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў; з лістапада 2006 пераведзена на адпаведную пасаду ў аддзеле аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, з лютага 2007 – вядучы навуковы супрацоўнік. Займалася забеспячэннем працы чытальнай залы, выкананнем біяграфічных і генеалагічных запытаў. Удзельнічае ў стварэнні навукова-даведачнага апарата да дакументаў архіва і ўкараненні аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, займаецца ўвядзеннем інфармацыі ў базу дадзеных «Радавод» і інш., стварэннем лічбавых копій дакументаў. Выконвае абавязкі сакратара дырэкцыі.

*Т.С. Міхяёнак*

**БАБІЧ Раіса Фёдараўна** (н. 15.04.1957, в. Брухаўка Дубровенскага р-на, Віцебскай вобл.), бухгалтар. Скончыла Ельнінскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1976), Міжнародныя міжвузаўскія курсы па падрыхтоўцы бухгалтараў вышэйшай кваліфікацыі прадпрыемстваў розных форм уласнасці, атрымаўшы кваліфікацыю “Бухгалтар-эканаміст вышэйшай кваліфікацыі”(1995).

З 1991 па 1996 г. працавала бухгалтарам упраўлення вайсковай часткі 36842, з 01.10.1996 - галоўны бухгалтар НГАБ.



Забяспечвае распрацоўку прагнозных паказчыкаў развіцця архіва, своечасовы ўлік, налічэнне бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў, рыхтуе справаздачы. Добра ведае эканоміку, працоўнае і гаспадарчае заканадаўства. Удзельнічала ў фарміраванні цэнаў на платныя работы і паслугі, якія аказвае архіў, укараніла іх у практыку работы архіва.

Падтрымлівае сувязі з фінансавымі і банкаўскімі ўстановамі. Дапамагае калегам, кансультуе іх па пытаннях арганізацыі работы з пазабюджэтным і валютным рахункамі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2007), граматамі дырэктара архіва.

*А.К. Галубовіч*

**БАБКОВА Вольга Уладзіміраўна** (н. 27.02.1961, г. Мінск), гісторык, архівіст. Скончыла СШ № 80 г. Мінска, гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1983). З 1982 працуе ў ЦДГА (потым у НГАБ), займала пасады архіварыуса, архівіста, малодшага навуковага супрацоўніка аддзелаў інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыйна-пошукавых сістэм. Займалася ўлікам і камплектаваннем бібліятэкі архіва. Некаторы час працавала навуковым супрацоўнікам у Заслаўскім запаведніку. З 1991 працавала ў аддзеле старажытных актаў вядучым навуковым супрацоўнікам, палеографам. З 2003 загадчык аддзела старажытных актаў.

Займалася распрацоўкай актавых кніг XVI–XVII стст. (Менскі гродскі суд, Слонімскія гродскі і земскі суды). Прымала ўдзел у складанні даведніка «Фонды НГАБ». З’яўляецца адным з аўтараў-складальнікаў навуковага зборніка «Тэстаменты другой паловы XVI ст. па матэрыялах актавых кніг НГАБ», які рыхтуецца да выдання ў аддзеле старажытных актаў.

Даследуе гісторыю Менска XVI-XVII стст., гісторыю штодзённасці насельніцтва Беларусі на падставе вывучэння актавых матэрыялаў НГАБ. Аўтар шэрагу публікацый па гісторыі Беларусі XVI-XVII стст., у т.л. гістарычных эсэ, якія былі надрукаваны ў газеце «Наша ніва»: «Стары Менск», «Дзеці», «Чарадзейства», «Грошы», «Старажытныя імёны», «Вяселле», «Дарога», «Шляхецкія скарбы» і інш., а таксама артыкулаў аб вядомых дзеячах культуры Беларусі: В. Цяпінскім, З. Слуцкай, П. Багрыме, М. Мялешку.

Удзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях, у працы экспертна-метадычнай камісіі, Навуковага савета.

***Тв.***: Новыя дадзеныя аб В. Цяпінскім на падставе актавага матэрыялу ЦДГА БССР у Мінску // Наш радавод. Кн. 3. Ч. 1. Гродна, 1991. С. 194-198; Васіль Цяпінскі: Новыя дакументы // Спадчына. 1991. № 3. С. 15-19; Паўлюк Багрым: Фрагменты да біяграфіі // Культура. 1993. 25 студзеня; Вяртанне (публ. дзённіка Міхаіла Мялешкі) // Шляхам гадоў: Гісторыка-літаратурны зборнік. Мн., 1994. С. 131-140; Пра мяне // Крыніца. 1995. № 4. С. 5-6; Тры дакументы пра Зафею Слуцкую // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт.

Вып. 2. Мн., 2004. С. 83-92; Новы факт да біяграфіі Паўлюка Багрыма // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 2. Мн.: НГАБ, 2004. С. 92-93; Лист писаря Великого княжества Литовского Гелияша Пельгримовского Август 1600 г. // Исторический архив. 2004. № 6. С. 199-201; Привилей короля Сигизмунда III Вазы воину Базылею Баку // Исторический архив. 2004. № 6. С. 202-206; Тэстаменты з актавых кніг Менскага гродскага суда XVI–XVII стст. // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. Мн., 2005. С. 104–119; «Добрая вестка» – рецензия на факсимиле „Евангелие от Матвея и Марка", в серии «Biblia Slavica» под ред. Ганса Ротэ (Германия) и Г. Голенченко (Беларусь) // БАШ. 2007. № 8; Карчма // Найясьнейшая Рэч Паспалітая. Мн.: Кнігарня НН, 2007.- С. 40–44; Мир чувств и мир вещей: шляхетские тестаменты второй пол. XVI в. из фондов Национального историчекого архива Беларуси как источник по исторической антропологии // Vesture: avoti un cilveki. Proceedings of the 17th International Scientific Readings of the Faculty of Humanities. History X/ Daugavpils Universitates akademiskais apgads «SAULE». 2008

***Літ.:*** Архівісты Беларусі: Біябібліяграфічны даведнік. Мн., 2006.- С. 60-61.

*А.Ф. Аляксандрава*

**БАРАНОЎСКІ Яўген Іванавіч** (н. 3.09.1938, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), гісторык, архівіст. Кандыдат гістарычных навук (1973). Скончыў Слуцкае педагагічнае вучылішча (1954). З вер. 1956 па ліст. 1958 г. працаваў настаўнікам пачатковых класаў у вёсках Старая Мілееўка і Грыбаны Магілёўскага раёна. З ліст. 1958 па жн. 1961 г. – паветраны стралок-радыст дальняй авіяцыі Савецкай Арміі. З 1961 па 1966 г. – студэнт гістарычнага факультэта БДУ, атрымаў дыплом з запісам: «гісторык, настаўнік гісторыі ў школах з англійскай мовай навучання». З 1966 па 1980 г. – мал. навук. супрацоўнік, вучоны сакратар, ст. навук. супрацоўнік ІГП пры ЦК КПБ. У 1973 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі ў 1921–1925 гг.». З 1980 па 1990 г. – інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў, ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ. З 1990 – дырэктар Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ, дырэктар НАРБ, вядучы навук. супрацоўнік, вучоны сакратар НАРБ. Старшыня праўлення Беларускага таварыства архівістаў (з 1999), член Рэспубліканскай камісіі па справах былых партызан і падпольшчыкаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (з 1990).

Вывучае праблемы археаграфіі, гісторыі і арганізацыі архіўнай справы, нацыянальнай палітыкі, гісторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. У апошняй асноўная увага аддадзена Мінскаму антыфашысцкаму падполлю. Пад яго кіраўніцтвам выдадзена кніга «Мінскае антыфашысцкае падполле» (1995). Як член спецыяльнай камісіі ЦК КПБ прымаў удзел у рэабілітацыі сакратара Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б І.К. Кавалёва. Аб навуковых інтарэсах сведчаць артыкулы ў ЭГБ – «Часовы рабоча-сялянскі савецкі урад Беларусі» (разам з В.Дз. Селяменевым), «Фракцыі Кампартыі Беларусі», «Мінскае патрыятычнае падполле» (разам з І.М. Ігнаценкам), «Камісіі ЦК КПБ па дадатковаму вывучэнню актуальных пытанняў гісторыі Мінскага падполля», «Нацыянальная палітыка», «Цэнтральны партыйны архіў Кампартыі Беларусі».



З'яўляецца складальнікам зборніка матэрыялаў «круглых сталоў» па актуальных праблемах беларускай гісторыі «На скрыжаванні думак» (1998). Сааўтар (разам з В.Дз. Селяменевым) серыі дакументальных публікацый па гісторыі газеты «Звязда» (Звязда. 1997. 9 студ., 1 – 4, 7 чэрв., 9 жн., 12 жн.). Разам з В.Дз. Селяменевым і З.В. Корж падрыхтаваў да друку партызанскі дзённік аднаго з першых арганізатараў партызанскага руху у Беларусі В.З. Каржа («Моя борьба и труд» // Нёман. 1998. №2). Разам з В.Дз. Селяменевым падрыхтаваў дакументальную хроніку газеты «Чырвоная змена» (Чырвоная змена. 2001. №№ 54, 55–56, 68–69, 72–73, 81–82, 89–90, 100–101, 112–113, 122–123, 132–140, 151, 157–158, 167, 183). Кіраўнік аўтарскага калектыва, адзін з аўтараў серыі дакументальных публікацый па гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля «Чтобы знали и помнили» (Вечерний Минск. 2002. №№ 135, 140, 147, 153, 159, 180, 186, 198, 210, 221, 227, 254, 266, 27; 2003. № 9). Навуковы рэдактар, аўтар прадмовы да кнігі М.В. Доўнар-Запольскага «Гісторыя Беларусі» (1994), адзін з навуковых рэдактараў другога выдання гэтай кнігі на рускай мове – «История Белоруссии» (2003). Член рэдакцыйнай калегіі і адзін з аўтараў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» па г. Слуцку і Слуцкаму раёну (2000), аўтар атрыкула «Чалавек-легенда» пра І.К. Кавалёва у кнізе «Памяць» Чачэрскага р-на (2001), аўтар (разам з В.Дз.Селяменевым) артыкула аб прэзідэнце АН БССР А.Р. Жэбраку «Талент, памножаны на вернасць выбару» у кнізе «Памяць» Зэльвенскага раёна (2004). Праводзіў работу па прапагандзе гістарычных ведаў у форме выдання брашур – «Памятные места Великой Октябрьской социалистической революции в Белоруссии» (1976, 2-е выд. 1978), «Белорусская ССР – одна из учредительниц Союза ССР» (1978), «Образование СССР – торжество ленинской национальной политики» (1982).

***Тв.:*** За дружбу народаў. Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі у 1921–1925 гг. Мн., 1972; Многонациональное советское государство. М., 1976 (у сааўтарстве); Великая сила интернационального единства. Киев, 1976 (у сааўтарстве); Осуществление принципов интернационализма в условиях развитого социализма. Из опыта деятельности Компартии Белоруссии. Мн., 1979 (кіраўнік аўтарскага калектыву, адзін з аўтараў); Критика фальсификаций национальных отношений в СССР. М., 1984 (у сааўтарстве); Знаки отличия твоего, комсомол. М., 1985 (сумесна з А.М. Міхальчанкам); І.К. Кавалёў – сакратар Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б // Звязда. 1990. 9 мая (у сааўтарстве); Документы Национального архива Республики Беларусь о подпольной борьбе в годы Великой Отечественной войны как исторический источник // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання: Матэрыялы да Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У.І. Пічэты. Мн., 1998; Заходнебеларускі рэгіён: асаблівасці эканамічнага і духоўнага развіцця ў 1960-1980-я гады //Назаўсёды разам. Да 60-годдзя уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999 (сумесна з В.Дз. Селяменевым); Характеристика документов архивного фонда бывшего Института истории партии при ЦК КПБ и их использование в контексте важнейших событий истории Белоруссии XX столетия // The Sciences Archives in the European Integration Materials of

the International Conference. Warsaw. Poland, 2-3 XII 1999. Warszawa, 2000; Некоторые вопросы реконструкции истории партизанского и подпольного движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфармацыйны зборнік. Мн., 2000; Роль академика И.М. Игнатенко в разработке проблемы истории партизанского и подпольного движения в Белоруссии // Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка (да 80-годдзя з дня нараджэння). Мн., 2000; Отражение истории обороны Могилёва в июле 1941 г. в документах Национального архива Республики Беларусь, отечественной и немецкой литературе // Мінулае і сучасная гісторыя Магілёва. Зборнік навуковых прац удзельнікаў Другой Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць». Магілёў, 2001; Особенности зарождения в Белоруссии в 1941 г. антифашистского подпольного движения; Беларусь, 22 июня 1941 года // Говорят архивы…; Материалы к заседанию «круглого стола», посвященного 60-летию начала Великой Отечественной войны (июнь 2001). Мн., 2001; Черты и лица Минского антифашистского подполья периода Великой Отечественной войны // БАШ. Вып. 2. Мн., 2001; «Легализация» документов Минского антифашистского подполья // АіС. 2001. № 6; Оборонная и военно-мобилизационная деятельность правительства БССР накануне Великой Отечественной войны; трагічнае лета: напамін гісторыі // Матэрыялы Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі (Мінск, 22 чэрвеня 2001 г.). У 2 ч. Ч. І. Мн., 2001; Архіўны след крыжа Еўфрасінні Полацкай // Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай: Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. (Наваполацк, 30-31 мая 2002 г.). Мн., 2002; Участие украинцев в партизанском и подпольном движении в Беларуси в годы Великой Отечественной войны // Беларусь-Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Міжнародная навуковая канферэнцыя (Мінск, 18-19 сакавіка 2003 г.); Особенности становления антифашистского подполья в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (на материалах Минской и Могилёвской городских подпольных организаций // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: Зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэцяй Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва»: мінулае і сучаснасць (22-23 мая 2003 г.). Ч. 2. Магілёў, 2003; Актуальные вопросы истории Минского антифашистского подполья и их освещение в научной литературе // Современные стратегии развития мегаполисов и крупных городов: Материалы Международной научно-практической конференции. Мн., 2003; История Минского антифашистского подполья (1941-1944) по материалам немецкого трофейного архива и архивных фондов ФРГ // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 16 мая 2003 г.). Мн., 2003.

***Літ.*** ЭГБ. Т. 1. Мн., 1993. С. 302-303; Памяць. Гіст.: дакум. хроніка Слуцкага р-на і г. Слуцка. У 2 кн. Кн. 2. Мн., 2000. С. 493; Скалабан В.У. Бараноўскі Яўген Іванавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 66-68.

*В.У. Скалабан*

**БАРСУКОВА Галіна Васільеўна** (н. 28.03.1952 г., в. Сульжыцы Валожынскага р-на), архівіст. Скончыла Ракаўскую сярэднюю школу (1969), Мінскае прафесіянальнае гандлёвае вучылішча (1970).

У НГАБ са студзеня 1978. Працавала архівістам у аддзеле ўліку і навукова-даведачнага апарата. З лютага 1982 — у аддзеле забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў захавальнікам, архівістам 1-й катэгорыі (1995 г.), загадчыцай архівасховішчам (1997 г.), архівістам 2-й катэгорыі.



З лістапада 2003 г. па сённяшні час Барсукова Г.В. займаецца выдачай і прыёмам спраў са сховішча ў чытальны зал і супрацоўнікам архіва, праверкай нумарацыі і нумарацыяй лістоў у дакументах, праверкай наяўнасці і стану спраў, адказвае за захаванасць дакументаў комплекса былых Віцебскай і Магілёўскай губерняў у архівасховішчы № 1.

Узнагароджана Ганаровай граматай Галоўархіва БССР (1988 г.), знакам "Ударнік 12-й пяцігодкі" (1990 г.), ганаровымі граматамі архіва.

*Г.М. Кутукова*

**БАРСУКОВА Наталля Аляксандраўна** (н. 10.05.1965, в. Лысавічы Мінскага р-на), гісторык, архівіст. Скончыла гістарычны факультэт БДУ ім. Леніна (1989). У 1989–1990 працавала настаўніцай гісторыі ў Лядзінскай СШ. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве з верасня 1990: на пасадах палеографа, старшага палеографа, старшага навуковага супрацоўніка, вядучага навуковага супрацоўніка, галоўнага архівіста ў аддзеле старажытных актаў. Займаецца распрацоўкай актавых кніг Брэсцкага, Гродзенскага, Слонімскага земскіх судоў XVI–XVII стст. Рыхтавала тэматычныя пералікі па гісторыі населеных пунктаў Валыні, г. Мазыра з 1576 па 1804 г., Дубровенскага манастыра ў Аршанскім павеце і інш. Выконвае генеалагічныя запыты, у т.л. шляхецкіх родаў Карафа-Корбутаў і Сацкевіч-Сцецкевічаў. Цікавіцца гісторыяй Лядзінскага манастыра, кіруе архіўнай практыкай студэнтаў, уваходзіць у склад Экспертна-метадычнай камісіі.

***Тв.*** Тэстамент капітана каралеўскіх драбантаў Юрыя Караля Шэлпаха фон Штэтэнберга // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001. С. 71–72.

*В.У. Бабкова*

**БЛАШКОВА Марыя Іванаўна** (н. 22.07.1955 у мяст. Васілішкі Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.), гісторык, бібліятэкар, архівіст. З сям'і рабочых. Скончыла Васілішкаўскую СШ (1972), гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1977). З 1978 працавала ў бібліятэцы № 4 імя Гогаля г. Мінска на пасадзе бібліятэкара І катэгорыі, у 1988-2004 г. – загадчыкам абанемента. З мая 2006 працуе ў НГАБ загадчыкам чытальнай залы на пасадзе галоўнага архівіста. Працуючы з даследчыкамі, садзейнічае ўсебаковаму выкарыстанню дакументаў архіва, праводзіць вялікую навукова-інфармацыйную работу, выконвае тэматычныя і генеалагічныя запыты.

*В.А. Ходзіна*

**БОБЕР Ірына Міронаўна** (н. 19.06.1966, г. Мінск)., гісторык, архівіст. Скончыла СШ № 24 г. Мінска, гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1988). У 1986–1987 працавала ў Музеі гісторыі Беларускай ваеннай акругі, у 1987–1990 – экскурсаводам у Музеі Вялікай Айчыннай вайны, з 1991 па 1992 – навуковым супрацоўнікам Музея народнай архітэктуры і побыту. З красавіка 1992 – у НАРБ (затым – НГАБ) на

пасадах вядучага палеографа ў сектары сфрагістыкі, старшым навуковым супрацоўнікам, галоўным архівістам аддзела старажытных актаў.

Распрацоўвае актавыя кнігі Слонімскіх земскага і гродскага судоў, Брэсцкіх земскага і гродскага судоў, Гродзенскага, Віцебскага земскіх судоў. Займалася апісаннем пячатак на актавых дакументах Віцебскага і Слонімскага судоў, пергаментных грамат XV–XVI стст. Цікавіцца гісторыяй функцыяніравання копных судоў на Беларусі ў XVI–XVII стст. З'яўляецца адным з аўтараў-складальнікаў навуковага зборніка «Тэстаменты другой паловы XVI ст. па матэрыялах актавых кніг НГАБ», які рыхтуецца да выдання ў аддзеле старажытных актаў. Кіруе архіўнай практыкай студэнтаў.

***Тв.*** Ліст падкаморага гарадзенскага Грыгорыя Масальскага насельніцтву Гарадзенскага пав. аб правілах склікання коп і прызначэнні месцаў капавішчаў // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001. С. 72–76.

*В.У. Бабкова*

**БРАВЕР Яўгенія Леанідаўна** (н. 14.07.1932), гісторык, архівіст. З верасня 1955 працавала ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобл. на пасадзе навуковага супрацоўніка. З 1963 –у ЦДГА БССР у г. Мінску, дзе была прызначана начальнікам аддзела старажытных актаў. У 1965 стала старшым навуковым супрацоўнікам аддзела выкарыстання і публікацыі, пасля 1975 – начальнікам гэтага аддзела, якім кіравала 15 гадоў. Пасля выхаду на пенсію з 1989 па 1992 працягвала працаваць у аддзеле выкарыстання дакументаў у ЦДАКР БССР.

Прымала ўдзел у складанні і падрыхтоўцы да выдання Даведніка па ЦДГА БССР у г. Мінску, зборнікаў «Подъем революционного движения в Белоруссии и Литве 1861–1862 гг.», «Восстание 1863-1864 гг. в Белоруссии и Литве», артыкулаў, падборак і пералікаў дакументаў, у стварэнні навукова-даведачнага апарату да фондаў. Аўтар шэрагу навуковых і навукова-папулярных публікацый у газетах і часопісах: «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», «Беларусь», «Полымя», «Маладосць» і інш.

Ёю падрыхтаваны юбілейныя радыёперадачы пра А.С. Пушкіна, А.Я. Багдановіча, В.В. Верасаева, Н.К. Крупскую, М.Ю. Лермантава, М. Горкага, І.В. Бабушкіна, У.У. Маякоўскага, Я. Лучыну, А.Ф. Мяснікова, А.І. Ульянава, А.П. Чэхава, М.К. Агінскага, М.Ц. Лынькова, С. Каваліка і інш.; тэлеперадачы «Як старэе папера», «100 гадоў з дня нараджэння Н.К. Крупскай», «Дакументы, звязаныя з імем Манюшкі», пра аўтара песні «Замучен тяжёлой неволей…», пра выяўленне матэрыялаў аб адной са старэйшых аптэк г. Мінска і інш.

З 1992 жыве ў ЗША ў г. Балціморы.

***Тв.:*** Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг. М., 1965. 588 с. (саўдзел); Дзекабрысты на Беларусі // Маладосць. 1966. № 10. С. 146; «Не я пою – народ…» (разам з К.П. Міхайлавай) // Нёман. 1966. № 4. С. 186; Продкі і сваякі Манюшкі // Маладосць. 1967. № 9; Сяргей Кавалік // Полымя. 1969. № 11. С. 248–250; Из истории учреждения аптеки в г. Слуцке // Здравоохранение Белоруссии (разам з Т.Е. Лявонцьевай). 1970. № 5. С. 77-78; Архівы расказваюць (Новыя матэрыялы да біяграфіі Янкі Лучыны) // ПГКБ. 1971. №№ 7. С. 225-227; Центральный государственный исторический архив БССР в Минске: Путеводитель. Мн., 1974. 336 с. (саўдзел); Да біяграфіі народнага пісьменніка // ПГКБ. 1977. № 4. С. 30-31; Новыя дакументы пра С.К. Мяржынскага // Беларусь. 1977. №. 1. С. 29; Рукою Багдана Хмяльніцкага // ПГКБ. 1977. №. 1. С.39-41; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв.: Владение Сморгонь. Мн., 1977. 256 с. (саўдзел); Пра Л.М. Талстога (разам з Б.З.Прыгожынай) // ПГКБ. 1978. № 3. С. 26-28; Барань // ПГКБ. 1979. № 4. С. 21-22; Старажытныя сведкі пісьменнасці (разам з Т.А.Вараб'ёвай) // ПГКБ. 1979. № 3. С. 39; Публикация документов по истории социально-политической борьбы в городах Белоруссии XVI–XVII вв. // Вопросы археографии в БССР. Мн., 1980; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв.: Владение Тимковичи. Мн., 1982. 216 с. (саўдзел); Новае з біяграфіі Ядвігіна Ш. // ПГКБ. 1982. № 2. С. 23–24; Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв. Владение Тимковичи. Сб. документов // СА. 1984. № 5. С. 76–77; Сазонаў Аляксандр Міхайлавіч (разам з Э.Л.Казлоўскай і М.Ф.Шумейкам) // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2006. С.34-35.

***Літ.:*** Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 72-74.

*А.Ф. Аляксандрава*



**БРЭГЕР Герман Максімавіч** (н. 31.10.1962, г. Мінск), архівіст. Скончыў БПІ па спецыяльнасці прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва (1988). Працаваў у будаўнічых і праектна-канструктарскіх установах г. Мінска. У 1994–1995 супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, з 1997 – у аддзеле старажытных актаў НГАБ на пасадах вядучага палеографа, галоўнага архівіста. Займаўся распрацоўкай актавай кнігі «Ашмянскі гродскі суд. 1661–1663 гг.». Склаў вопіс на мікрафішы дакументаў «Калекцыя мікрафільмаў інвентароў архіва Скарбовай камісіі ВКЛ і архіва Гродзенскай казённай палаты» (КМФ-19) з Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільні, а таксама ўнутраны вопіс да актавай кнігі Віленскага ваяводскага суда за 1553–1557 гг. Кніга запісаў № 34 Літоўскай метрыкі. Распрацоўвае навуковыя тэмы «Шляхта Ашмянскага павета XV–XVII стст.», «Гісторыя дзяржаўных устаноў Вялікага княства Літоўскага XVI–XVIII стст.», актавыя кнігі Літоўскай Метрыкі, земскіх і гродскіх судоў Вялікага княства Літоўскага. Займаецца гістарычным краязнаўствам і археаграфіяй. Удзельнічаў у археалагічных экспедыцыях, рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях. Аўтар шматлікіх публікацый.

***Тв.:*** Хацюхова. Гісторыя невялікага паселішча. Мн., 2001; Праблемы пошуку дакументаў па гісторыі населеных месцаў і генеалогіі павятовай шляхты былога Віленскага ваяводства ВКЛ да сярэдзіны XVIII ст. у архівах і бібліятэках Вільні // Замежная архіўная беларусіка / Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. 25-26 красавіка 1996 г. Мн., 1998; Матэрыялы Мінскай кадэнцыі Галоўнага Трыбунала Вялікага княства Літоўскага ў Вільнюскім архіве (супастаўленне двух вопісаў) // Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах (Вяртанне. Вып. 6). Мн., 1999.; Архіў Ашмянскага земскага суда 2-й пал. XVIII ст. (Мядзельская кадэнцыя) // Архівы на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2001.; Уласнасць ашмянскай шляхты ў Браслаўскім павеце (паводле актавых кніг Браслаўскага земскага суда 1603-1632 гг.) // Браслаўскія чытанні. Вып. 5. Браслаў, 2002; Маёнтак

Паставы ў сярэдзіне XVI–1-й палове XVII ст. // Памяць. Гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага р-на. Мн., 2001; Кальвінскі збор у Вароне // Беларусь-Расія-Японія / Матэрыялы Першых Астравецкіх краязнаўчых чытанняў, прысвечаных памяці Іосіфа Гашкевіча (Беларусіка. Вып. 8). Мн., 1997, Разрабаванне маёнтка Ілля ў 1831 г. // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001. С. 76-80; З гісторыі маёнтка Дамашкавічы // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 2. Мн., 2004. С. 8-29; Сумны лёс Бешанковіцкага архіва // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. Мн., 2005. С. 143-147; Архіў маёнтка Глыбокае Зяновічаў і Радзівілаў у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 4. Мн., 2006. С. 3-14 і інш.

***Літ.:*** Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 74-75.

*А.Ф. Аляксандрава*

**БУРАКОЎСКАЯ Ніна Іванаўна** (н. 24.09.1936, с. Мядведзі Краснагорскага р-на Бранскай вобл.), гісторык, архівіст, этнограф. Скончыла МДГАІ (1958).

Працавала навуковым супрацоўнікам ЦДГА БССР у Магілёве (1958 – 1961), старшым навуковым супрацоўнікам, заг. аддзела ведамасных архіваў Дзяржархіва Мінскай вобл. (1961 – 1970), заг. навукова-тэхнічнага архіва ЦНДІТУ у 1970 – 1973 г., бібліятэкарам БПІ (1973 – 1974). У 1975 перайшла на працу у Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора АН БССР, дзе займала пасады ст. лабаранта, мал., ст. навуковага супрацоўніка. Абараніла кандыдацкую дысертацыю «Промыслы і рамёслы беларусаў у перыяд разлажэння феадалізма і зацвярджэння капіталізма (канец XVIII–XIX стст.)» (1982). Даследавала матэрыяльную і духоўную культуру, святы і абрады беларусаў. З 1992 працуе метадыстам у Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці. З’яўляецца аўтарам шэрагу навуковых прац па этнаграфіі і краязнаўству. Сааўтар калектыўных манаграфій і зборнікаў, у т.л.: «Этнаграфічны зборнік» (1975), «Памятники народной архитектуры и быта Белоруссии» (1979), «Помнікі этнаграфіі» (1981), «Народная культура і быт беларусаў» (1982), «Промыслы і рамёствы Беларусі» (1984), «Быт і культура беларусаў» (1984), «Беларусы. Прамысловыя і рамёсныя заняткі (1995), «Белорусы» (1998)» і інш.

***Тв.:*** Вотчинные инструкции середины XVIII в. как источник по истории крепостного хозяйства // Труды Московского государственного историко-архивного института. М., 1961. Т. 16; Упорядочение архивов учреждений районного звена // СА. 1968. № 5; К вопросу о формах и методах контроля за постановкой документальной части делопроизводства и упорядочением архивов учреждений районного и сельского звена // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР. Мн., 1971 і інш.

***Літ.:*** Буракоўская Ніна Іванаўна // Этнаграфія Беларусі. Мн., 1989. С. 93.

*М.Ф. Шумейка*

**ВАРАБ’ЁВА Тамара Анатольеўна** (н. 17.12.1932, ст. Аджы-Кабул Зубаўскага р-на Азербайджанскай ССР – 26.01.1999, г. Мінск), гісторык, архівіст, археограф. З сям’і чыгуначніка. Скончыла Памашнанскую чыгуначную СШ № 19 Кіравеградскай вобл., Украіна (1950), МДГАІ (1955). Са жн. 1955 працавала навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела выкарыстання і публікацыі дакументаў Дзяржархіва Мінскай вобл. У крас. 1965 стала загадчыкам аналагічнага аддзела ЦДГА БССР у г. Мінску, а ў крас. 1975 – загадчыкам навукова-выдавецкага аддзела ГАУ пры Савеце Міністраў БССР. У ліп. 1981 узначаліла аддзел арганізацыйна-метадычны і навукова-даведачнага апарату ГАУ пры Савеце Міністраў БССР. З 1988 на пенсіі.



Прымала непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў «Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.» (1964), «Восстание в Литве и Белоруссии в 1863–1864 гг.» (1965), «Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину» (1980), «Революционное движение в Белоруссии в 1907–1917 гг.» (1955), «Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР 1917–1927 гг.» (1980), «Революционный авангард трудящейся молодежи Западной Белоруссии» (1978), «Народное образование в БССР 1917-1928 гг.» (1979), «Мастацтва Савецкай Беларусі 1917-1941 гг.» (1976), «Восстановление народного хозяйства в БССР 1921–1925 гг.» (1981), «Библиотечное дело в БССР 1917–1941 гг.» (1978), «Развитие социалистического соревнования в БССР 1917–1941 гг.» (1980) і інш.

З’яўлялася адным з рэдактараў і складальнікаў даведнікаў па Дзяржархіву Мінскай вобл. і ЦДГА БССР у г. Мінску, актыўна ўдзельнічала ў рабоце Навуковага савета і Метадычнай камісіі Галоўархіва рэспублікі, арганізоўвала і прымала ўдзел у навукова-даследчай рабоце архіўных устаноў Беларусі. Дзякуючы яе пошукам у архівах у навуковы ўжытак была ўведзена значная колькасць раней невядомых дакументаў па гісторыі Мінска, эканамічнага становішча беларускіх сялян, рабочых і рамеснікаў і г. д. На падставе выяўленых дакументаў падрыхтавала і апублікавала ў перыядычным друку сотні артыкулаў, правяла дзесяткі тэле- і радыёперадач.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «Ветэран працы», знакам «Выдатнік архіўнай справы».

***Тв.:*** Археаграфія // БСЭ. Мн., 1969. Т. 1. С. 467; Археаграфія // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва. Мн., 1984. Т. 1. С. 176–177; Листовки и прокламации социал-демократических организаций как источник по истории революции 1905–1907 гг. в Белоруссии // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР: Материалы научной конференции архивистов и историков, посвященной 50-летию архивного строительства в СССР. Мн., 1971. С. 342–357; Методы и принципы публикации документов в сборнике «Белоруссия в эпоху феодализма» // Вопросы археографии в БССР: Материалы Научной конференции архивных учреждений республики. Мн., 1980. С. 119–125; Распространение трудов В.И. Ленина в дореволюционной Белоруссии (по документам ЦГИА БССР в г. Минске) // С именем В.И. Ленина. Мн., 1972. С. 28–33; Документальное издание о комсомоле Западной Белоруссии [рэц. на зб. дак. «Революционный авангард трудящейся молодежи Западной Белоруссии (1921–1939)] // Советские архивы. 1978. № 6. С. 90–91 і інш.

***Літ.:*** Т.А. Вараб’ёва (Шчукіна) [некралог] // БАШ. Вып. 1. Мн., БелНДІДАС, 2000. С. 257–258; Вараб’ёва К.У. Вараб’ёва Тамара Анатольеўна // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2005. С. 78-79.

*К.У. Вараб’ёва*

**ВАШКЕВІЧ Пётр Емельянавіч** (н. 1900, в. Гатава Мінскага павета – верасень 1938), архівіст. У 1916-1918 працаваў у гасцініцах г. Мінска, на будаванні дамоў на вёсках. У пачатку 1919 уступіў у партызанскі атрад, якім камандаваў В. Шаранговіч. За ўдзел у партызанскім руху ў 1920 арыштаваны польскімі ўладамі і асуджаны на чатыры гады зняволення. Пасля абмену ў 1921-1922 служыў у Чырвонай Арміі. У 1923-1926 працаваў у сельскай кааперацыі. У 1926 прыняты на працу ў Цэнтрархіў БССР. Праз год уступіў у УКП(б). З кастр. 1926 па крас. 1929 – загадчык Аршанскага акруговага аддзялення Цэнтрархіва. Са снежня 1928 па красавік 1929 вучыўся на чатырохмесячных архіўных курсах пры ЦАУ РСФСР. У крас. 1929 прызначаны загадчыкам Магілёўскага гістарычнага архіва і сакрэтнага архіва ЦАУ БССР у Магілёве. З вер. 1929 – загадчык Віцебскага гістарычнага архіва. У сак. 1931 узначаліў Мінскі гістарычны архіў, а ў маі 1936 – дырэктарам ЦДАКР БССР. У ліст. 1937 звольнены, у лют. 1938 арыштаваны і праз сем месяцаў расстраляны. У 1960 рэабілітаваны.

*В.Дз. Селяменеў*

**ВЕРНЕР Ірына Львоўна** (н. 10.06.1949, г. Палтава, Украіна), гісторык, архівіст. Скончыла СШ № 27 г. Мінска (1966), гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1974). Працавала тэхнікам, інжынерам навукова-тэхнічнай інфармацыі Мінскага завода «Ударнік», з 1987 – загадчыкам навукова-тэхнічнай бібліятэкі Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута. З 1993 працуе ў НГАБ, займала пасады вядучага архівіста, старшага навуковага супрацоўніка, галоўнага архівіста, вядучага навуковага супрацоўніка. Займаецца выкананнем запытаў біяграфічнага, генеалагічнага і тэматычнага характару. Працавала над навуковымі тэмамі «Генеалогія і геральдыка беларускай шляхты» і «Замежныя падданыя на Беларусі», у выніку чаго падрыхтавала шэраг артыкулаў для «Гербоўніка беларускай шляхты» (Т. 1-2), а таксама самастойна падрыхтавала да выдання зборнік дакументаў з фондаў НГАБ «Замежныя падданыя на Беларусі (кан. XVIII–пач. XX стст.)». Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі Беларусі і генеалогіі ў зборніку «Архіварыус».

***Тв.***: Источники исследований по родословию и истории семьи (конец XVIII–начало XX вв.) // Матэрыялы канферэнцыі «Праблемы зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны Мінска» (Мінск, 12 лістапада 1998 г.).- С. 73–78; Добрый и чистый талант // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн.: НГАБ, 2001. - С. 27–28; Неизвестные факты биографии И.А. Гошкевича // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 2. Мн.: БелНДІДАС, 2004. С. 29–32; Об открытии Витебского отделения Московского археологического института // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. Мн.: НГАБ, 2005. С. 22–24; На губернаторском посту (о деятельности Павла Яковлевича Ростовцева по управлению Витебской губернией в 1869–1880 гг.) // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн.: НГАБ, 2007. С. 175–187.

*У.М. Дзянісаў*



**ГАЛУБОВІЧ Ала Купрыянаўна** (н. 06.04.1945, г. Тбілісі, Грузія), гісторык, архівіст. З сям'і вайскоўца. Скончыла СШ № 11 у г. Віцебску (1962), гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1970).

З ліп. 1970 працавала навуковым супрацоўнікам у Віцебскім краязнаўчым музеі, са жн. 1975 – старшым захавальнікам фондаў, навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў, навукова-даведачнага апарату ЦДГА БССР у г. Мінску. З крас. 1982 па снеж. 1984 – інпектар навукова-выдавецкага аддзела ГАУ пры Савеце Міністраў БССР. Са студз. 1985 па снеж. 1992 – навуковы супрацоўнік (загадчык чытальнай залы), затым загадчык аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў ЦДГА БССР.

Са студ. 1993 – намеснік генеральнага дырэктара НАРБ (комплекс дакументаў XIV – пач. XX стст.); са жн. 1995 – дырэктар НГАБ. Член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Археаграфічнай камісіі Дэпартамента па архівах і справаводству, тапанімічнай камісіі пры Мінгарвыканкаме. Узначальвае Вучоны савет НГАБ, з'яўляецца членам Вучонага савета БелНДІДАС, членам Еўра-Азіяцкага рэгіянальнага аддзялення (ЕВРАЗИКА) Міжнароднага Савета Архіваў.

Прымала ўдзел у падрыхтоўцы і выданні навуковых даведнікаў, зборнікаў, манаграфій, апублікаваных архівам па праблемах грамадска-палітычнага жыцця Беларусі: «Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Конец XIV в.–1648 г.», т. 1 (Мн., 1988); Касьцёл св. Сымона і св. Алены // Касьцёлы Менска (1996); «Беларусь у актавых кнігах XVI-XVIII стст. Магілёўскі магістрат 1580-1581, 1588». Вып. 1 (2000), вып. 2 (2006); «Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44 (1559-1566)» (2001); «Архіварыус». Вып. 1-6. (2001-2008); «Гербоўнік беларускай шляхты» т. 1 (2002), т. 2 (2006) і інш. Удзельнічала ў падрыхтоўцы матэрыялаў да гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Займаецца гісторыяй архіва князёў Радзівілаў, праблемамі засваення і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі.

У апошні час плённа працуе ў галіне крыніцазнаўства, іншых спецыяльных гістарычных дысцыплін. З'яўляецца аўтарам больш чым 100 артыкулаў і радыёперадач па гісторыі Беларусі, брашуры, прысвечанай 60-годдзю архіва «Национальный исторический архив Беларуси» (Мн., 1998), адным з аўтараў цыкла тэлеперадач «Дрэва жыцця», вылучанага на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2000).

Удзельнік шэрагу навуковых канферэнцый, у тым ліку міжнародных – «Архіў Радзівілаў у зборах публічных» (Небарова, Польшча, 1994), 21-й Міжнароднай канферэнцыі па генеалогіі яўрэяў (Лондан, Вялікабрытанія, 2001 г.) і інш.

Ажыццяўляе супрацоўніцтва і творчыя кантакты з калегамі з Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы, Германіі, у т.л. па пытаннях выяўлення і рэстытуцыі архіўных дакументаў па гісторыі Беларусі. Прымала ўдзел у

пасяджэнні Кансультацыйнага Савета кіраўнікоў дзяржаўных архіўных служб дзяржаў-удзельніц СНД, 4-й (Мінск, 2003), 6-й (г. Львоў, 2005) і 7-й (г. Ерэван, 2006) агульных канферэнцыях Еўра-Азіяцкага рэгіянальнага аддзялення (ЕВРАЗИКА) Міжнароднага Савета Архіваў.

Узнагароджана ганаровай граматай Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі ГАУ пры Савеце Міністраў СССР, БССР, Дзяржкамархіва, Белсаўпрофа, медалём «Ветэран працы», знакам «Ганаровы архівіст Беларусі» (2004), у 2007 аб’яўлена падзяка міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь за актыўную працу па падрыхтоўцы і правядзенні Міжнароднага Савета па праекту віртуальных рэканструкцый дакументальнай спадчыны і бібліятэкі Радзівілаў.

***Тв.:*** Источники по генеалогии Беларуси в НАРБ // Международная конференция «Генеалогия: проблемы, задачи, перспективы» (Санкт-Петербург, сентябрь 1992). СПб., 1992; Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь: колькасны і якасны аналіз асобных фондаў, калекцый, картатэк (перыяд XIV ст.–1917 г.) // Тэзісы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Архівазнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія Беларусі: стан і перспектывы» (Мінск, 1-2 снежня 1993). Ч. II. Мн., 1993; Род Пржевальских // Витебский рабочий. 1993; Вяроўкін Міхаіл Лаўрэнцьевіч // ЭГБ. Т. 2. Мн., 1994; Братский листок // ЭГБ. Т. 2. Мн., 1994; Дакументы і матэрыялы роду Радзівілаў у НАРБ // Міжнародная навуковая канферэнцыя «Архіў Радзівілаў у сборах публічных» (Неборава, Польшча, верасень 1994 г.); Национальный архив Республики Беларусь // Вечерний Минск. 1995; Национальный исторический архив Беларуси. Мн., 1998; Достояние республики // Труд в Беларуси. Региональный выпуск. 1998 г.; Историческую память восстанавливает архив (Интервью) // Беларускі час. 1998, 22 мая; Кіламетры «праўдзівых» крыніц // Літаратура і мастацтва. 1998, 5 чэрвеня; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі // ЭГБ Т. 5. Мн., 1999; Обзор документальных материалов фонда «Радзивиллы, князья» // БАШ. Вып. 1. Мн., 2000; Вы случайно не граф? (Интервью) // Частная собственность. 2000, 6 апреля; Вехи пройденного пути // Архіварыус. Вып. 1. Мн., 2001; Источники по генеалогии Беларуси // Архіварыус. Вып. 1. Мн., 2001; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі // Памяць. Гіст.-дакум. хроніка г. Мінска. Кн 1. Мн., 2001; Национальный исторический архив Беларуси: история и перспективы // Архівы Беларусі на рубяжы XX-XXI стст.: гісторыя, стан, перспектывы развіцця: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (Мінск, 8-9 лютага 2000). Мн., 2001; Порядок исполнения запросов Национальным историческим архивом Беларуси в Минске // АіС. 2001. № 5; Віцебская губерня ў дакументах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 4; К 200-летию образования Витебской губернии // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX-XX вв.). Минск-Витебск, 2002; Основное содержание виртуального архива князей Радзивиллов // Вяртанне. Вып. 7 («Нясвіжскія зборы Радзівілаў»). Мн.: Беларускі фонд культуры, 2002; Грамота с вислой печатью // Советская Белоруссия. 2003, 15 февраля; Компьютерный замок Радзивиллов // Советская Белоруссия. 2003, 5 июня; Национальному историческому архиву Беларуси – 65 лет // Архівы і справаводства. № 3. 2003; А может, все-таки 600? // Советская Белоруссия. 2003, 5 июля; Рукописные документы Национального исторического архива Беларуси // Архіварыус. Вып. 2. Мн., 2004; «Благодарю Бога, что наконец с моим добрым мужем разделяю его участь, его заточение» – письмо М.К. Юшневской брату 1832 г. // Исторический архив: Научно-публикаторский журнал. 2004. № 6; Архив Радзивиллов-Витгенштейнов в Бундесархиве // Архівы і справаводства. 2005. № 6; Дакументы з замежных архіваў у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі // БАШ. Вып. 6. Мн., 2005, Портреты во весь рост – 76 наименований // Советская Белоруссия - Беларусь сегодня, 2006; Архіўны вопіс «Інвентары партрэтаў, карцін і мармуровых скульптур» Нясвіжскага замка князёў Радзівілаў у бундэсархіве г. Кобленца (Германія) // БАШ. Вып. 7. Мн., 2006; История судебных органов Беларуси в архивных документах XV - нач. XX в. // Юстиция Беларуси. 2007. № 3; О реализации отраслевой «Программы по сохранению архивного документального наследия – составной части информационного ресурса общества» в Национальном историческом архиве Беларуси // Программа ЮНЕСКО «Память мира»: деятельность библиотек, архивов, музеев по сохранению документального наследия: Материалы Международной конференции (Национальная библиотека Беларуси, 30 ноября–1 декабря 2006 г.). Мн.: «Красико-Принт», 2007; Раритеты белорусских архивов // Архівы і справаводства. 2007. № 4 і інш.



*Л.М. Лісава*

**ГЕСЬ Аляксандра Мікалаеўна** (н. 01.02.1940, в. Гусакі Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), гісторык, архівіст. З сям’і сялян. Скончыла Пінскае педвучылішча, гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1967). Працавала настаўнікам, потым дырэктарам Мядзведзіцкай СШ Ляхавіцкага раёна (1970-1975); з 1975 – навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, з 1991 – у БелНДІДАС, з 1995 – навуковы супрацоўнік аддзела публікацый НАРБ, з верасня 2006 – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

Займаецца археаграфічнай дзейнасцю. З’яўляецца адным са складальнікаў зборнікаў дакументаў і матэрыялаў «Хроника важнейших событий истории КПБ» (ч. 3, 1980), «Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК» (т. 1–3, 1983–1985), «По воле народа: Из истории организации БССР и создания КПБ» (1988), «К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия» (1988), «Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии» (ч. 1, 1990), «Архіўная справа на Беларусі ў дакументах і матэрыялах (1921-1995)» (1996), «Антон Луцкевіч: матэрыялы следчай справы НКУС Беларусі» (1997), «Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі» (2001), «Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах» (выд. 1 – 2001; выд. 2 – 2006); «Поўны збор твораў Янкі Купалы» (раздзел «Службовыя і асабістыя дакументы»). Т. 9, ч. 1 (2003) і інш.

Удзельнічала ў шэрагу міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый па праблемах архівазнаўства і археаграфіі, працавала з архівамі Міхася Мялешкі, Беларускага Рабочага клуба, вынікам чаго стала публікацыя падборак дакументаў беларускіх дзеячаў культуры першай паловы XX ст.; рэдагавала навуковыя зборнікі: «Фонды Национального исторического архива Беларуси: Справочник» (Мн., 2006), «Архіварыус» (Вып. 5. Мн., 2007), «Гербоўнік беларускай шляхты». Т. 2 (Мн., 2007), «Архіварыус» (Вып. 6. Мн., 2008); прымала ўдзел у падрыхтоўцы выставы і каталога, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. Каспяровіча – «Усім вам вядомы М. Каспяровіч».

***Тв.:*** Праблемы беларусізацыі (20-30-я гг.) у дакументах НАРБ // Тэзісы навукова-

тэарэтычнай канферэнцыі «Архівазнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія Беларусі: стан і перспектывы» (Мінск, 1-2 снежня 1993). Ч. ІІ. Мн., 1993. С. 36-41; Апостол национального возрождения (Публикация показаний А. Луцкевича) // Нёман. 1995. № 1. С. 127-166 (сумесна з У.М. Міхнюком і М.М. Клімовічам); Мамонька Язэп Аляксеевіч // Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 461-462 (сумесна з У.М. Міхнюком і М.М. Клімовічам); Як адстойвалі ўсходнія землі (Публікацыя дакладной запіскі У. Ігнатоўскага ў Цэнтральнае Бюро КПБ і працы М. Мялешкі // Спадчына. 1995. № 6. С. 37-54; М. Краўцоў аб рабоце Першага Беларускага з’езда: Разгон. 20 гадоў назад (успаміны) // Спадчына. 1996. № 1. С. 181-194; «Калі песня жыве беларуса, будзе жыць беларускі народ!»: Жыццёвы і творчы шлях У. Тэраўскага // Мастацтва. 1996. № 12 (сумесна з У.В. Ляхоўскім); Учора і сёння: Ці мае беларускі народ сваю мову і сваю культуру // Скарыніч. Вып. 3. Мн., 1997; Са студэнцкай біяграфіі Мікалая Улашчыка // М.М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага): Матэрыялы навуковай канферэнцыі (Мінск, 14-15 лютага 1996). Мн., 1997. С. 81-88; «Іменем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі…» (пра рэпрэсіі супраць немцаў у Беларусі ў 30-я гг.) // Форум. 1997–1998. № 6–7; «Выслаць за межы Беларусі…» // Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX ст.: Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Мн., 1998; Яшчэ адзін след беларускага загранічнага архіва ў Празе // Замежная архіўная беларусіка: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 25-26 красавіка 1996). Мн., 1998. С. 27-35 (сумесна з У. В.Ляхоўскім); Краўцоў Макар. Рада Беларускае Народнае Рэспублікі // Спадчына. 1998. № 1. С. 75-126; Дакументы Нацыянальнага архіва пра дзейнасць У.І. Пічэты // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання (Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-й гадавіне з дня нараджэння У.І. Пічэты). Мн., 1998. С. 111-112; Эпісталярыя пісьменнікаў-узвышанцаў // Скарыніч. Вып. 4. Мн., 1999. С. 105-111; «Усякі іншы шлях лічу памылковым і шкодным»: Беларусізацыя сельгасакадэміі, год 1925-ы. // Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы. Мн., 2000. С. 258-290; Яна працавала з Янкам Купалам (Н. Панамарова (Хмарка)): уступны артыкул і публікацыя апавядання «Пралеска» // Бярозка. 2000. № 3. С. 8-11; Беларускі нацыянальна-вызвольны рух на Случчыне падчас польскай акупацыі // Спадчына. 2000. № 3.(сумесна з У.М. Міхнюком і У. В.Ляхоўскім); «На кніжцы трымаецца культура…» (Публікацыя лістоў Ц. Гартнага да М. Мароза) // Полымя. 2000. № 10. С. 115-137; Без права на ўласнасць (Публікацыя зваротаў грамадзян да А.Р. Чарвякова з фондаў Нацыянальнага архіва) // Спадчына. 2000. № 5-6. С. 59-75; Калінінская акруга: хроніка беларускага культурнага жыцця 1920-х гг. // Спадчына. 2001. № 3. С. 3-49; «Нельга кіравацца адным этнаграфічным матэрыялам…» // Arche. 2001. № 5; Хмарка // Матэрыялы канферэнцыі да 130-годдзя маці Максіма Багдановіча, Марыі Апанасаўны Багдановіч. Мн., 2001; Ці знаем, што трэба рабіць? (Пра песню «Ад веку мы спалі») // Мастацтва. 2002. № 2. С. 31-35; «Быў час, была эпоха»: перлы з архіўных збораў і ўспамінаў пра савецкую рэчаіснасць // Спадчына. 2003. № 2-3. С. 116-120; 2006. № 1. С. 95-101; Купаліяна ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь // Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс: Матэрыялы навуковай канферэнцыі. Мн., 2003. С. 40-45; Максім Гарэцкі і савецка-літоўскія дачыненні (1920 г.). Ліст Максіма Гарэцкага да М.С. Міцкевіча-Капсукаса // Гарэцкія чытанні: Матэрыялы навуковай канферэнцыі. Мн., 2004. С. 70-76; З жыцця і дзейнасці В. Гадлеўскага // Спадчына. 2006. № 1. С. 36-47 (сумесна з У.В. Ляхоўскім); Міхась Мялешка вяртаецца на Беларусь // Архіварыус. Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн., НГАБ, 2007. С. 46-51; Як трапілі ў архіў дакументы Палуты Бадуновай // Архіварыус. Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн., НГАБ, 2005. С. 14-20 (сумесна з Н.Я. Калеснік) і інш.; аўтар артыкулаў у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» («Мамонька Язэп Аляксеевіч», «Мінскае навуковае педагагічнае таварыства» (сумесна з У.В. Ляхоўскім), «Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасці» (сумесна з У.В. Ляхоўскім), «Першы з’езд педагогаў беларускіх школ Заходняй Беларусі», «Першы Усебеларускі краязнаўчы з’езд», «Першая Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя», «Платун Антон Мартынавіч», «Рак Рыгор Пракопавіч», «Сядура (Глыбінны) Уладзімір Ільіч» (сумесна з У. Кушніравым), «Трэці Усебеларускі з’езд Саветаў» (сумесна з С.П. Самуэль), «Тэраўскі Уладзімір Васільевіч» (сумесна з У.В. Ляхоўскім) і інш., «Беларускай энцыклапедыі» («Краўцоў Макар», «Мамонька Язэп Аляксеевіч» і інш.), гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» Слуцкага і Нясвіжскага раёнаў, шматлікіх артыкулаў у газетах «Наша Ніва», «ЛіМ», «Народная воля», «Настаўніцкая газета», «Наша слова» і інш.

***Літ.***: Архівісты Беларусі: Біябібліягр давед. Мн., 2006. С. 89; ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. Мн., 2003. С. 366.

*М.Ф. Шумейка*



**ГРУША Аляксандр Іванавіч** (н. 15.01.1973, г. Гродна), гісторык, архівіст. Кандыдат гістарычных навук (2001). Скончыў БДПУ імя М. Танка (1996). Працаваў вядучым палеографам у аддзеле старажытных актаў НГАБ з верасня 1996 па кастрычнік 2001, займаўся распрацоўкай актавых кніг XVI ст., падрыхтаваў да друку і выдаў кн. «Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44. Кніга запісаў 44 (1559-1566)» (2001), распрацоўваў навуковую тэму «Землеўладанне пісараў канцылярыі ВКЛ па матэрыялах Літоўскай Метрыкі і ф. 694 («Радзівілы, князі») за другую пал. XV – першую пал. XVI ст.». У цяперашні час працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

***Тв.:*** Дакумент Метрыкі ВКЛ па гісторыі справаводства канцылярыі ВКЛ першай паловы XVI ст. (публікацыя) // БАШ. Вып. 1. Мн., 2000; Інфармацыйныя элементы фармуляра дакумента канцылярыі Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV–першай паловы XVI ст. // БАШ. Вып. 2. Мн., 2001; Метрыка Вялікага княства Літоўскага: праблемы выдання ў Беларусі // Кантакты і дыялогі. 2001. № 9-10; Службовы склад і структура канцылярыі ВКЛ 40-х гг. XV–першай паловы XVI ст. // Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага княства Літоўскага. Т. 1. Мн., 2001.; Функцыі канцылярыі Вялікага княства Літоўскага: (40-я гг. XV–першая палова XVI ст.) // Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2001. № 3; Невядомая грамата Фёдара Карыятавіча за 1391 г. // Беларускі гістарычны агляд. 2001. Сш. 1-2; і інш.

*В.У. Бабкова*

**ГУСАРЭВІЧ Валянціна Андрэеўна** (н. 25.08.1925, г. Магілёў – 10.04.1998). З сям’і служачых. Бацька, Андрэй Іванавіч, да рэвалюцыі і пасля яе працаваў ветэрынарным урачом у Магілёўскай гарадской ветлячэбніцы, быў забіты немцамі; маці Глікерыя Пятроўна – хатняя гаспадыня. Скончыла СШ № 17 г. Магілёва ў 1940 г. і паступіла на гістарычны факультэт МДПІ. Падчас акупацыі працавала чорнарабочай на шашэйных дарогах, санітаркай у дзіцячым доме. У 1945–1946 гг. – сакратар 1-га участка штаба МПВО. У 1947 г. скончыла МДПІ і атрымала спецыяльнасць настаўніка гісторыі. У 1948 г. скончыла 2-х месячныя курсы пры АУ МУС БССР у г. Гродна, у 1951 г. – вячэрні факультэт марксізму-ленінізму, рыхтавалася да здачы кандыдацкага мінімума.

З 1.08.1947 г. – навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік; з 31.01.1948 – начальнік чытальнай залы; з 01.06.1951 – начальнік аддзела агульных фондаў ЦДГА БССР; 09.12.1963 - 01.01.1967 – старшы навуковы супрацоўнік агульных фондаў Магілёўскага дзяржаўнага абласнога архіва; са снежня 1967 па красавік 1969 – старшы бібліятэкар Магілёўскай абласной бібліятэкі; 24.04.1969 - 01.01.1980 – старшы інспектар Архіўнага аддзела Магілёўскага аблвыканкама.

Паводле службовых характарыстык падчас працы ў гістарычным архіве пастаянна працавала над стварэннем наукова-даведачнага апарата, правядзеннем экспертызы каштоўнасці дакументаў, забеспячэннем іх захаванасці. Распрацавала і правяла шэраг лекцый і дакладаў па тэорыі і практыцы архіўнай справы на тэхмінімуме (1950). Выяўляла і рыхтавала дакументы да зборніка «Дакументы і матэрыялы па гісторыі БССР», т. 1 (1772-1861), т. 2 (1861-1900) і «Школа Магілёўскай губерні», а таксама даведніка па ЦДГА БССР, з’яўлялася сакратаром Вучонага Савета. Актыўна ўдзельнічала ў грамадска-палітычным жыцці, з’яўлялася намеснікам старшыні акруговай камісіі па выбарах у мясцовыя саветы (1950), старшынёй мясцкома (1952) і рэдактарам насценнай газеты архіва (1950).

Узнагароджана Ганаровай граматай у сувязі з 40-годдзем архіўнай справы (03.07.1958), Ганаровай граматай у сувязі са 100-годдзем У.І. Леніна (16.04.1970), Ганаровай граматай за дасягненне высокіх паказчыкаў (28.12.1976).

***Тв.***: Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР: Путеводитель / под ред. Е.П. Лукьянова, В.Н. Жигалова, В.П. Похвалова. Могилёв: Могилёвская областная типография, 1959; Гусарэвіч В.А. З гісторыі ўстанаўлення Савецкай ўлады ў Клімавіцкім павеце // Молот. 1957. 30 окт.

***Крыніцы:*** НГАБ. Ф. 251(ба), воп. 1, спр. 3, арк. 48; спр. 4, арк. 11-11 адв.; спр. 5, арк. 10; спр. 7, арк. 5; спр. 9, арк. 8; спр. 10, арк. 59; спр. 11, арк. 4; спр. 15, арк. 4; спр. 17, арк. 1, 55; спр. 18, арк. 23; спр. 19, арк. 1, ДАМВ. Ф. 817, воп. 6, спр. 17, арк. 59-92.

*З.Л. Яцкевіч*

**ГУШЧА (МАІСЕЕНКА) Валянціна Рыгораўна** (н. 07.1932, в. Дмітрыеўка Клічаўскага р-на). Сышла з 2 курса Магілёўскага культпрасветвучылішча ў 1951, 29.07.1951-25.01.1953 – архіўна-тэхнічны супрацоўнік партархіва ЦК КПБ (г. Магілёў); 15.03.1954-01.02.1955 – архіварыус Магілёўскага аблвыканкама, у 1958-1959 – сакратар-машыністка ЦДГА БССР, 01.04.1954-19.04.1960 – архіварыус ЦДГА БССР.

***Крыніцы***: НАРБ. Ф. 251, воп. 2, спр. 48.

*З.Л. Яцкевіч*

**ДЗЯНІСАЎ Уладзімір Мікалаевіч** (н. 21.04.1955 у Мінску), гісторык, архівіст. Скончыў СШ № 53 г. Мінска (1972), Мінскі інстытут культуры (1980), аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1987). Працаваў у Рэспубліканскім навукова-метадычным цэнтры Міністэрства культуры БССР (1980-1983), Беларускім рэстаўрацыйна-праектным інстытуце (1983-1995). З 1995 – у НГАБ. Даследуе крыніцы па гісторыі горадабудаўніцтва і архітэктуры Беларусі, культурнага і мастацкага жыцця Мінска XVI–XX стст. Адзін з аўтараў-складальнікаў даведніка «Дакументы па архітэктуры і картаграфіі Беларусі ў архівах Санкт-Пецярбурга і Вільні» (1994). Выявіў у архівах Масквы, С.-Пецярбурга, Вільні, Варшавы, Кракава і апублікаваў шэраг дакументаў па гісторыі архітэктуры Беларусі. З’яўляецца аўтарам комплексных гісторыка-архіўных даследаванняў да праектаў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры Мінска, Брэста, Оршы і інш. Правёў даследаванне па гісторыі тэатральных будынкаў у Мінску XVIII-XIX стст., мінскай сядзібы В. Дуніна-Марцінкевіча, атрыбутаваў і апублікаваў фрагменты рукапісу кнігі М. Гаўсмана па гісторыі Мінска, якая захоўваецца ў Пушкінскім доме (Санкт-Пецярбург). З’яўляецца аўтарам вялікай колькасці публікацый у айчынных і замежных выданнях, у т.л. энцыклапедычнага характару.



Намеснік старшыні Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага таварыства аховы помнікаў, член прэзідыума Беларускага нацыянальнага камітэта Міжнароднага Савета па помніках і гістарычных мясцінах (IKOMOS).

10 ліпеня 2006 г. узнагароджаны нагрудным знакам «Ганаровы архівіст Беларусі».

***Тв.:*** Площадь Свободы в Минске. Мн., 1985; Касцёл св. Сымона і св. Алены. Мн., 1997; Тут была пастаўлена «Сялянка» // Мастацтва Беларусі. 1983. № 3; К истории одной неопубликованной книги // Книга в Белоруссии. Мн., 1988; Дзе знаходзіўся дом В. Дуніна-Марцінкевіча // Шляхам гадоў. Вып. 1. Мн., 1990, Матэрыялы ў фондах Нацыянальнага музея ў Варшаве // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Мн., 1984; Kościól i klasztor benedyktynek w Mińsku // Przegląd wschodni. 2001. T. 7. Z. 3(27); Belarus // Heritage at Risk. Műnchen, 2001-2002, і інш.

Літ.: Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 99-100; Энцыклапедыя Вялікага княства Літоўскага. Т. 1. Мн., 2005. С. 588.

*С.А. Рыбчонак*

**ЕЛІСЕЕВА Таццяна Валер’еўна** (н. 21.09.1966, г. Чэрвень Мінскай вобл.), архівіст. Скончыла СШ № 28 г. Мінска (1983), Мінскае сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча МТ БССР (1984).

У НГАБ з мая 1990 Працавала захавальнікам фондаў, старшым захавальнікам фондаў, архівістам 1-ай катэгорыі (1993 г.), архівістам 2-ой катэгорыі з лістапада 2003 па сённяшні час. Займаецца выдачай і прыёмам спраў са сховішча ў чытальны зал і супрацоўнікам архіва, праверкай нумарацыі і нумарацыяй лістоў у дакументах, праверкай наяўнасці і стану спраў, адказвае за захаванасць дакументаў комплекса былых Віцебскай і Магілёўскай губерняў у архівасховішчы № 4.

Узнагароджана Ганаровай граматай Белкамархіва (2001 г.), ганаровымі граматамі архіва.

*Г.М. Кутукова*

**ЖАЎНЯРКЕВІЧ Рыгор Сцяпанавіч** (н. 01.01.1970, г. Вілейка Мінскай вобл.) гісторык, архівіст. Пасля заканчэння гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1992) працаваў настаўнікам гісторыі СШ г.п. Ждановічы. З кастрычніка 1993 старшы навуковы супрацоўнік, затым – галоўны архівіст аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў НАРБ, з мая 1995 працуе ў НГАБ. З кастрычніка 1999 – спецыяліст II катэгорыі, затым – I катэгорыі аддзела геральдыкі і генеалогіі Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь; з лютага 2002 – вядучы спецыяліст, галоўны спецыяліст (з лістапада 2002), кансультант (з 1 лютага 2006) аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Падчас працы ў НГАБ займаўся апрацоўкай архіўнага фонду «Радзівілы, князі», пытаннямі шляхецкай і сялянскай генеалогіі, сфрагістыкі, радаводамі творчай беларускай інтэлегенцыі, праблемамі гісторыі рыма-каталіцкай канфесіі на тэрыторыі Беларусі. Даследуе праблемы сфрагістыкі рэлігійных устаноў Беларусі. У 2000-2005 з'яўляўся суіскальнікам аспірантуры БелНДІДАС. Працуе над кандыдацкай дысертацыяй «Сфрагістыка рэлігійных устаноў як крыніца па гісторыі канфесій Беларусі».

У 2004 і 2005 павышаў кваліфікацыю ў Інстытуце вышэйшых кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У рамках службовых абавязкаў займаецца пытаннямі культурна-асветніцкай дзейнасці дзяржаўных архіваў, ажыццяўляе метадычнае кіраўніцтва працы ўстаноў дзяржаўнай архіўнай службы з сакрэтнымі і абмежаванага допуска дакументамі, курыруе дзейнасць архіўных устаноў па рабоце са зваротамі грамадзян, кантралюе працу чытальных залаў архіваў, прымае ўдзел у распрацоўцы праектаў шэрагу нарматыўна-прававых актаў, метадычных дакументаў, звязаных з дзейнасцю архіўнай галіны нашай краіны, а таксама метадычных дакументаў.

***Тв.:*** Кляштар айцоў Дамініканаў у Стоўбцах // Наша вера. 1999. № 2(8); Sfragistyka parafii rzymskokatolickiej w zbiorach Narodowego Archiwum Historycznego Białorusi (XVIII w. – 1917r.) // Białostocczyzna. 2000. № 2; Православие и греко-католичество Беларуси в XVII – начале XX веков: сфрагистический аспект // Беларуска-грэчаскія ўзаемасувязі: ад старажытнасці да сучаснасці. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 26 кастрычніка 2000). Мн.: «Дэполіс», 2000; Нямецкія ўплывы ў пячатках рэлігійных устаноў Беларусі (XIX–XX стст.) // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навуковай канферэнцыі (Мінск, 6-7 снежня 2001). Мн.: «Дэполіс», 2001; Пячаткі, штэмпелі і штампы як крыніца для гісторыі праваслаўя Беларусі (XIX–пач. XX ст.) // Хрысціянства і беларуская культура: Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 1 сэсія – 21-25 мая, 2 сесія – 4-7 снежня 2000 г.). Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2001; Создание и использование баз данных архивных источников по сфрагистике религиозных учреждений при помощи системы управления базами данных Microsoft Access // Archives in the New Age. The Strategic Problems of the Automatization of Archives. Papers of the International Conference (Warsaw, September 28-29 2001). Warszawa, 2002; Печати униатских церквей Беларуси XVI–XIX вв. как источник по истории греко-католической конфессии // Архіўная спадчына Віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: Матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова (Віцебск, 6-7 чэрвеня 2001 г.). Мінск-Віцебск, 2002; Сфрагистика православных учреждений Беларуси и сигилическое законодательство Российской империи (конец XVIII в. – 1839) // Традиции и обычаи народов России и Беларуси: Международная конференция (Минск, 23-25 мая 2001). Т. 1. Мн., 2001; Сфрагістыка рэлігійных устаноў Беларусі часоў нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. як крыніца вывучэння гісторыі канфесій // Беларускі археграфічны штогоднік. Вып. 4. Мн.: 2003; Радавод Хаіма Суціна // Архіварыус. Вып. 1. Мн.: 2001; Дакументы аб выдачы замежных пашпартоў Якубу Антонавічу Наркевічу-Ёдку і ягонай дачцэ Алене // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн.: 2001; Сфрагістыка рэлігійных устаноў як крыніца па гісторыі канфесій Беларусі // Беларускі археграфічны штогоднік. Вып. 5. Мн.: 2004; Сфрагістыка рыма-каталіцкіх парафій былога Ігуменскага павета (XVIII – пачатак XX ст.) // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 2. Мн.: 2004; Сфрагістыка рыма-каталіцкіх парафій былога Барысаўскага павета (XVIII – пачатак XX ст.) // Архіварыус. Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. Мн.: 2005; Станаўленне сфрагістыкі ісламскіх устаноў Беларусі (XIX ст.) // Беларускі археграфічны штогоднік. Вып. 6. Мн., 2005.

*М.М. Елінская*



**ЗІМІНА (ТРАЦЦЯКОВА) Раіса Ільінічна** (н. 15.01.1926, в. Мурхоўская Архангельскай вобл.); з сялян. Настаўнік, архівіст. Скончыла педкурсы ў 1945 г., і Бабруйскі сельгастэхнікум у 1965 працавала настаўніцай пачатковых класаў у Архангельскай вобл. і г. Бабруйску, 11.12.1951 - 15.12.1952 – інспектар архіўнага аддзела г. Бабруйска; 28.10.1954 - 13.08.1958 – навуковы супрацоўнік аддзела агульных фондаў ЦДГА БССР, 13.08.1958 -15.06.1959 – ст.архіварыус ЦДГА БССР, 15.06.1959 – май 1962 – майстар-рэстаўратар ЦГДА БССР. З 28.05.1962 – інжынер-эканаміст Бабруйскага малочнага камбіната.

Паводле службовай характарыстыкі працавала па забеспячэнні захаванасці дакументаў, удзельнічала ў падрыхтоўцы да друку даведніка па ЦДГА БССР, выконвала тэматычныя запыты і даведачную працу, з'яўлялася членам паверачна-экспертнай камісіі Архіўнага аддзела УУС, праводзіла экспертызу па адборы дакументаў ва ўстановах г. Магілёва. Атрымала падзяку ў гонар 40-й гадавіны савецкага архіўнага будаўніцтва.

***Тв.***: Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР: Путеводитель / под ред. Е.П. Лукьянова, В.Н. Жигалова, В.П. Похвалова. Могилев: Могилевская областная типография, 1959.

***Крыніцы***: НГАБ. Ф. 251(ба), воп. 2, спр. 44; ДАГАМВ. Ф. 2951, воп. 31, спр. 137, арк. 2, 7.

*З.Л. Яцкевіч*

**КАЗЛОЎ Уладзімір Леанідавіч** (н. 30.04.1977, г. Мінск), гісторык, архівіст. Скончыў СШ № 41 г. Мінска (1996), гістарычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры» (2002). З лютага 2001 працуе ў НГАБ на пасадзе галоўнага архівіста аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі. Займаецца выкананнем запытаў біяграфічнага, генеалагічнага

тэматычнага характару, падрыхтоўкай дакументаў архіва да друку, з'яўляецца адказным за архіўную базу дадзеных біяграфічных запытаў. Аўтар некалькіх артыкулаў у перыядычных выданнях і навуковым зборніку «Архіварыус».

***Тв.***: Из истории Стародорожского лесопильного завода (1894-1917 гг.) // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. Мн.: НГАБ, 2005. С. 36-44; События 1915-1917 гг. сквозь призму документов Чериковского уездного полицейского управления // Архіварыус.: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 4. Мн.: НГАБ, 2006. С. 86-92; Малоизвестные документы из жизни Наполеона Орды // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн.: НГАБ, 2007. С. 53-59 і інш.

*І.Л. Вернер*

**КАЗЛОЎСКАЯ Электрына Леанідаўна** (н. 01.04.1933, станцыя Атар Краснагорскага р-на Алма-Ацінскай вобл., Казахстан), гісторык, архівіст. З сям'і настаўнікаў. У 1937 разам з бацькамі пераехала ў г. Наманган (Узбекістан), дзе скончыла СШ з залатым медалём. У 1951 паступіла ў МДГАІ, які з адзнакай скончыла ў 1956.

З 1956 па 1982 працавала старшым інспектарам, старшым навуковым супрацоўнікам, старшым метадыстам у арганізацыйна-метадычным аддзеле, аддзеле выкарыстання дакументальных матэрыялаў і навукова-выдавецкім аддзеле АУ МУС БССР, Галоўархіва пры СМ БССР. З сакавіка 1982 па 1988 — нам. дырэктара ЦДГА БССР у г. Мінску. Падрыхтавала шэраг метадычных і даведачных матэрыялаў (галоўным чынам па дакументах ЦДГА БССР) — памятку па археаграфічнай падрыхтоўцы да выдання дакументаў даведніка «Кооперативно-колхозное строительство в БССР (1917-1927)» (1976), пералік спраў архіва па гісторыі Беларусі дарэвалюцыйнага часу (1802-1917) (1986); метадычныя рэкамендацыі па ўкараненні і выкарыстанні рэйтэркартатэкі ўнутраных нарматываў, навукова-даведачных распрацовак і перадавога вопыту (1987) і інш. Прымала ўдзел у падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў «Народное образование в БССР» (т. 1-2, 1979-1980), «Мастацтва Савецкай Беларусі» (Т. 1-2, 1976, 1986), «Борьба за Советскую власть в Белоруссии» (1988), «Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Конец XIV в.-1648 г.» (Т. 1, 1988) і інш., шэрагу навуковых і навукова-практычных канферэнцый і семінараў па архіўнай справе.

***Тв.:*** Поиск документов по истории Белоруссии // Советские архивы. 1984. № 2 і інш.

*А.К. Галубовіч*

**КАНАВАЛЕНКА Вольга Хамітаўна** (н. 08.02.1952 у Мінску), філолаг, архівіст. З сям'і вайскоўца. Скончыла філфак БДУ імя У.І. Леніна (1974). Працавала настаўніцай. З 1999 працуе ў НГАБ, займала пасады старшага захавальніка фондаў, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела захаванасці дакументаў і фондаў, галоўнага архівіста, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў. У цяперашні час з'яўляецца загадчыкам навукова-даведачнай бібліятэкі НГАБ.

*В.А. Ходзіна*



**КАПЦА Юрый Аляксандравіч** (н. 30.06.1936, с. Спаскае Медвенскага р-на Курскай вобл.), гісторык, архівіст. З пачаткам Вялікай Айчынай вайны эвакуіраваны у Свярдлоўскую вобл. У 1943 пайшоў у школу ў г. Стары Оскол, але ў тым жа годзе разам з бацькамі вярнуўся ў Курскую вобл. у г. Фатеж. Пасля заканчэння СШ паступіў у МГАІ. На 2 курсе пакінуў інстытут і ў 1955 – 1958 служыў ў Савецкай Арміі. Пасля звальнення ў запас узнавіў вучобу ў інстытуце. На 3 курсе падаў заяву аб пераводзе на завочную форму навучання і накіраванні ў Мінск па месцу працы жонкі (Капіцы А.В.). Завочна скончыў факультэт архіўнай справы МГАІ (1963).

У 1960 пачаў працаваць старшым навуковым супрацоўнікам у Лабараторыі па рэстаўрацыі і мікрафільмаванню дакументальных матэрыялаў АУ пры Савеце Міністраў БССР. У лютым 1961 прызначаны часова выконваючым абавязкі намесніка, а потым намеснікам начальніка (з 1965 дырэктара) ЦДАКФФД БССР. На працягу 1969 быў дырэктарам ЦДГА БССР у г. Мінске, а ў снежні 1969 зацверджаны Мінскім абкамам КПБ заг. абласнога партархіва. На гэтай пасадзе працаваў да ліквідацыі архіва у снежні 1990. У 1990 – 1992 быў заг. сектара па працы з мясцовымі партыйнымі архівамі, нам. дырэктара Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ, дырэктарам ЦДГА ў г. Мінске, дырэктарам Цэнтра гістарычных дакументаў НАРБ. З снежня 1992 па чэрвень 1999 працаваў нач. аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў, інфаматызацыі і архіўных тэхналогій Белкамархіва. З 1999 – вядучы навуковы супрацоунік аддзела архівазнаўства БелНДІДАС. У 2004 перайшоў на выкладчыцкую працу на гісторыка-архіўнае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ дзе чытае базавы курс «Архівазнаўства», распрацаваў і вядзе там жа спецыяльны курс «Архівы палітычных партый і рухаў Беларусі».

Прымаў удзел у шэрагу навуковых канферэнцый і нарад па пытаннях архівазнаўства; узначальваў у распрацоўцы «Асноўных правіл работы дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь», удзельнічаў у падрыхтоўцы іншых нарматыўна-метадычных дакументаў ў галіне архіўнай справы. З'яўляецца аўтарам шэрагу артыкулаў, інфармацый, радыёперадач гісторычнай і архівазнаўчай тэматыкі. Прымаў удзел у складанні сборніка дакументаў «М.И.Калинин в Белоруссии» (1973), падрыхтоўцы зборніка артыкулаў «Подвиги их бессмертны» (1978) і інш.

Узнагароджаны медалямі «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения В.И. Ленина» (1970), «Ветеран труда», дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, нагрудным знакам «Выдатнік архіўнай справы СССР» (1988).

***Тв.:*** Принципы и критерии отбора на государственное хранение кинодокументов // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР. Материалы научной конференции архивистов и историков, посвящённой 50-летию архивного строительства в СССР. Мн., 1971 С. 69–80; Бойцы колодищанского подполья (разам з Л.В. Аржаевай) // Подвиги их бессмертны. О подпольной борьбе советских людей в захваченных фашистскими оккупантами городах и селах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944). Мн., 1978. С. 127–140 і інш.

***Літ.:*** Жумар С.У. Капіца Юрый Аляксандравіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 120-121.

*С.У. Жумар*

**КОЦІК Тамара Мікалаеўна** (н. 04.03.1959, г. Бабруйск), географ, архівіст. У 1976 г. скончыла СШ № 5 г. Бабруйска, у 1981 – геаграфічны факультэт (краязнаўства) Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І. Леніна.

У 1981-1986 працавала метадыстам-экскурсаводам Бабруйскага бюро падарожжаў. З 1986 – архівіст 2 катэгорыі аддзела ІПС ЦДГА БССР у г. Мінску (цяпер НГАБ), з чэрвеня 1989 – ст. захавальнік фондаў, з ліпеня 1990 – вядучы архівіст, са студзеня 1992 – заг. архівасховішча аддзела захаванасці дакументаў і фондаў, са студзеня 1993 – вядучы архівіст, са студзеня 2000 – ст. навуковы супрацоўнік, з сакавіка 2004 – вядучы навуковы супрацоўнік, са студзеня 2006 – галоўны архівіст аддзела ІПС.

Прымала ўдзел ва ўдасканаленні фондаў крымінальнага і цывільнага судоў, у складанні вопісаў фондаў судовых устаноў вышэйшай інстанцыі Мінскай губерні, фондаў «Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя», «Віцебскае губернскае праўленне». Кіравала працай па ўдасканаленню і перапрацоўцы фондаў цэркваў Віцебскай і Магілёўскай губерній. Займалася каталагізацыяй спраў, удасканаленнем каталога, фандзіраваннем дакументаў, метадычнай працай. Прымае ўдзел у складанні даведніка па гісторыі дзяржаўных устаноў Віцебскай і Магілёўскай губерній.

Мае шмат падзяк, узнагароджана ганаровымі граматамі архіва.

*Г.Я. Акуловіч*

**КРУК Уладзімір Пятровіч** (н. 14.08.1947 у в. Караліна Мінскага р-на). З сялянскай сям'і. Скончыў Крупіцкую СШ і паступіў на гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1965). Пасля яго заканчэння з 1970 па 1972 знаходзіўся на вайсковай службе ва Узброеных Сілах СССР. Пасля звальнення ў запас, з кастрычніка 1972 па 1993 працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР (затым – НАН Беларусі). Вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР. Абараніў кандыдацкую дысертацыю «Сялянскі рух у Беларусі ў 80–90-я гады XIX стагоддзя» (1985, навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт АН БССР К.І. Шабуня).

15 лютага 1993 перайшоў на працу ў архіўную галіну. Займаў пасады загадчыка аддзела інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў (XIV–пачатак XX ст.) НАРБ, намесніка дырэктара НГАБ. З 1 лістапада 1995 працуе загадчыкам аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента (раней – Камітэта) па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, член яго калегіі. З'яўляецца членам Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, членам беларускай часткі Беларуска-Польскай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны, членам бюро Археаграфічнай камісіі Дэпартамента па архівах і справаводству, намеснікам старшыні навукова-кваліфікацыйнай камісіі па вызначэнні (або пацвярджэнні) статуса



месцаў прымусовага ўтрымання грамадзян на часова акупіраванай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Навуковыя даследаванні звязаны з вывучэннем сялянскага руху, развіццём капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі, становішчам ідэалогіі сялянства ў другой палове XIX–пачатку XX ст., месцаў прымусовага ўтрымання ваеннапалонных чырвонаармейцаў і грамадзянскага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг., выкарыстаннем архіўных дакументаў і арганізацыяй доступу да архіўнай інфармацыі. Аўтар больш 50 навуковых прац.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2006), знакам «Ганаровы архівіст Беларусі» (2007).

***Тв.:*** Сялянскі рух на Беларусі 1864–1900 гг. Мн., 1993; Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. Т. 2. Мн., 2002 (у сааўтарстве); Ці ведаеце Вы гісторыю сваёй краіны? Выд. 2. Мн., 1995 (у сааўтарстве); Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да пачатку XXI ст. у пытаннях і адказах. Мн., 2003 (у сааўтарстве); Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированой территории Беларуси 1941–1944. Мн., 2001 (у сааўтарстве; на рускай і нямецкай мовах); Лагеря советских военнопленных в Беларуси. 1941–1944: Справочник. Мн., 2004 (у сааўтарстве; на рускай і нямецкай мовах); Правила работы государственных архивов Республики Беларусь. Мн, 2006 (у сааўтарстве); Об идеологических воззрениях белорусских крестьян во второй половине XIX века // Сельская гаспадарка і сялянства Беларусі: Зборнік. Мн., 1991; Законодательство Республики Беларусь и практика архивных учреждений в области доступа и использования архивной информации // Accessibility of Archival Materials in Compliance with the Law and General Practices of the States of Central and East European Countries. Warschawa, 2000; Да 80-годдзя Дзяржаўнай архіўнай службы Рэспублікі Беларусь // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 3. Мн., 2002 (у сааўтарстве); Публикаторская деятельность государственных архивов Республики Беларусь в конце XIX – начале XX в.: состояние и перспективы // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. Мн., 2007 (у сааўтарстве).

***Літ.:*** Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. Мн., 1997. С. 264; Памяць: гіст.-дакум. хроніка Мінскага р-на. Мн., 1998. С. 512; Архівісты Беларусі: біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 139-140; Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. Мн. 2007. С. 271–274; Корзенко Г.В. Историки Беларуси в начале XXI столетия. Мн., 2007. С. 204-205.

*Р.У. Жаўняркевіч*

**КУТУЗАЎ Аляксей Ціханавіч** (н. 15.03.1923, в. Дамашэўка Мяшчэўскага р-на Калужскай вобл. – 30.07.1998). З сялян. Партызан, супрацоўнік МУС і МДБ, архівіст. Пасля заканчэння сямігодкі і Сухініцкага фабрычна-завадскога вучылішча, у 1939-1941 працаваў слесарам, матарыстам экскаватара. У 1942-1944 – намеснік камісара 1-й Баранавіцкай Чырвонапартызанскай брыгады, у 1944 – старшы аперупаўнаважаны аддзела УМ УНКУС Баранавіцкай вобл., у 1945 скончыў Мінскую школу НКУС і працаваў следчым, ст. следчым, нам. начальніка аддзялення УББ НКУС і МДБ БССР, у 1952-1956 – начальнік следаддзела ў Бабруйску, УМ МУС Марыйскай АССР, УМ УМВД Магілёўскай вобл. 26.04.1954 прысвоена званне капітана, у 1956-1960 – начальнік аддзела сакрэтных фондаў ЦДГА БССР. У 1970-1980 –

загадчык архіўнага аддзела Магілёўскага аблвыканкама.

Паводле службовых характарыстык актыўна ўключыўся ў працу па выкарыстанню дакументальных матэрыялаў у навуковых мэтах. За некалькі гадоў напісаў больш 60 артыкулаў, якія надрукаваны са станоўчымі водгукамі. Своечасова выконваў аператыўныя запыты ўстаноў.

Узнагароджаны Ордэнам Чырвонай Зоркі (1949), медалямі «Партызану Айчыннай вайны 1-й ступені», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне», «За баявыя заслугі»(1948), «30 гадоў Савецкай арміі», а таксама Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

***Тв.***: 40 год савецкай пажарнай аховы // Шлях сацыялізма. 1958 . 16 крас.; Аб чым гаворыць архіў // Шлях сацыялізма. 1958. 12 кастр.; Аб рэвалюцыйным мінулым гор. Горак // Ленінскі шлях. 1957, 1 лістап.; Вачыма суайчынніка // Шлях сацыялізма. 1959. 28 сакав.; Гісторыя аднаго фотаздымка // Витебский рабочий. 1959. 21 авг.; Гэта было летам 1905 года (З гераічнага мінулага Смаргоні) // Перамога. 1959, 14 ліп.; Дакументы расказваюць // Магілёўская праўда. 1960. 4 сакав.; З мінулага Мсціслаўшыны // Калгасная газета. 1960. 20 лют.; Ленінскія творы на Віцебшчыне // Витебский рабочий. 1960. 18 март.; Пад гнётам царызма // Чырвоны хлебароб. 1959. 2 ліп.; Пажарная ахова ў дарэвалюцыйным Гарадку // Прамень камунізма. 1958. 17 красав.; Першамайская лістоўка // Знамя камунізма. 1959, 1 мая; Рэдкія дакументы аб М.П. Лепяшынскім // Магілёўская праўда. 1959, 20 чэрв.; Святошы-забойцы // Ленінскі шлях. 1960, 16 ліп; Слуцкі павятовы рэўком // За Сацыялістычную радзіму. 1958, 3 вер.; Старонка з гераічнага мінулага // Молот. 1959, 19 июня.; Так было раней (з гісторыі вёскі Казіміраўкі) // Сацыялістычная праца. № 112. 1960 г.; Так было раней (старонкі з мінулага нашага раёна) // Искра. 1959, 17 сент.; Так выбіралі ў царскую Думу (у дапамогу агітатару) // Сацыялістычная перамога. 1959, 24 лют.; Твар святога айца // Шлях сацыялізма. 1960, 30 ліп.; Унікальныя дакументы // Магілёўская праўда. 1959, 21 жн.; Ці ведаеце Вы? (старонка з архіва) // Ленінскі шлях. 1959, 12 ліп.; Які быў суд у Горацкім павеце да рэвалюцыі // Ленінскі шлях. 1957, 4 снежн.; З гушчыні народнай // Витебский рабочий. № 201. 1960 г.( у сааўтарстве ); У нашым Быхаве // Сцяг працы. №№ 87-88, 101-102. 1960 г.(у сааўтарстве); Які быў Магілёўскі павет 120 гадоў таму // Сацыялістычная праца. № 87. 1960 г. ( у сааўтарстве ); 40 лет пожарной охране (пожарная охрана на Быховщине) // Сцяг працы. 18 красавіка 1958 г.; 40 лет пожарной охране // Камунар. 1958, 18 крас.; 40 лет советской пожарной охране (о Сенно) // Шлях да камунізму. 1958, 11 крас.; 40 лет советской пожарной охране (о Полоцке) // Сцяг камунізма. 1958, 16 крас.; 40 лет тому назад // Советский студент. 4 августа 1958 г.; 50 лет тому назад (о революционном выступлении горецких студентов) // Ленінскі шлях. 1 мая 1958 г.; «Агитатор, расскажи об этом» (о царском суде в Климовичском уезде) // Молот. 4 декабря 1957 г.; В поддержку власти Советов // Калгасная звязда. 1959, 29 чэрв.; Два суда // Витебский рабочий. 1957, 10 дек.; Декабристы в Могилевщине // Магілёўская праўда. № 25. 1960 г.; Деревня Буйничи когда-то // Сацыялістычная праца. № 81. 1960 г.; Дореволюционный суд в Сенно // Шлях да камунізму. 1957, 6 снеж.; За власть Советов (К 40-летию БССР) // Молот. 1 авг. 1958 г.; За власть Советов // Ленінскі шлях. 1959, 28 чэрв.; Знаете ли Вы (о выпавшем в 1912 г. граде) // Сацыялістычная перамога. 23 мая 1958 г.; Знаете ли Вы (о выставке 1889 г.) // Советский студент. 13 апреля 1958 г.; Знаете ли Вы (Цифры и факты по истории города и района) // Перамога. 1960 г.; Знаете ли Вы… (историческая справка пожарного дела в России) // Калгасная газета. 8 чэрвеня 1958 г.; Из героического прошлого Ошмян // Знамя Свободы. 1 августа 1959 г.; Из истории Круглянского района // Ленінскі шлях. 29 чэрвеня 1958 г.; Из истории седых веков (очерк о гор. Двинске) // Падомью Даугава. №№ 7-11 и др. 1960 г.; Из прошлого Уллы // Заря. № 10-11. 1960 г.; Исторический очерк о Головчине // Перамога. 1960 г. Исторический очерк о Рясно // Искра. 1960 г.; История Княжиц // Сацыялістычная праца. 1960 г.; История одной улицы // Знамя юности. 11 июля 1958 г.; Казаки в Могилевщине // Магілёўская праўда. № 102. 1960 г.; Какой была пожарная охрана в дореволюционном Минске // Калгасная праўда. 16 красавіка 1958 г.; Картины безвозвратного прошлого // Искра. 20 августа. 1959 г.; Кто выбирался в суды до революции // Коммунар. 11 декабря 1957 г.; Кто учился в земледельческом институте // Советский студент. 6 июня 1958 г.; Лицо святого отца // Шлях да камунізма. № 60. 1960 г.; Ничто не могло сдержать // Магілёўская праўда. № 33. 1960 г.; О чем говорит архив // Красное знамя. 16 апреля 1958 г.; От братского сердца // Калгасная праўда. 3 октября 1958 г.; Письма трудящихся Могилевщины В.И. Ленину. Подборка // Магілёўская праўда. № 24. 1960 г.; Подборка документов к 90-летию со дня рождения В.И.Ленина // Витебский рабочий. № 37. 1960 г.; Поучительный пример прошлого // Советский студент. 15 июня. 1958 г.; Приветствия великому вождю // Витебский рабочий. № 23. 1960 г.; Раньше и теперь // Советский студент. 5 декабря 1957 г.; Редкий экземпляр книги В.И. Ленина // Витебский рабочий. 25 июля 1958 г.; Святоши-убийцы из деревни Сысоево // За камунізм. № 44. 1960 г.; Собачка урядника // Советская Даугава. 16 июля 1958 г.; Советский суд – суд народа // Колхозная правда. 13 декабря 1957 г.; Странички из прошлого // Шлях да камунізму. 27 ліпеня 1958 г.; Странички из прошлого: К 40-летию БССР // За сацыялістычную радзіму. 15 жніўня 1958 г.; Странички истории (к 40-летию БССР) // Советская деревня. 29 июня 1958 г.; Странички истории // Горецкий студент. 7 ноября 1957 г.; Странички прошлого нашего района // Кіравец. 29 чэрвеня 1958 г.; Суды дореволюционной Могилевщины // Магілёўская праўда. 13 снежня 1957 г.; Так было раньше (из истории гор. Хотимска) // Калгасная звязда. 1960 г.; Так было раньше (из прошлого Белыничского района) // Перамога. 1960 г.; Так было раньше (историческая справка) // Ленінскі прызыў. 16 красавіка 1958 г.; Такой была пожарная охрана в Двинске // Красное знамя. 18 апреля 1958 г.; Уезд 120 лет назад // Сацыялістычная праца. 1960 г.; Это было 40 лет назад (из истории Дисненского района) // Новая жизнь. 10 августа 1958 г.; Это было 40 лет назад // Зара. 26 ліпеня 1958 г.; Это было 40 лет назад // Калгасная трыбуна. 8 жніўня 1958 г.; Это было 40 лет тому назад // Зара. 6 ліпеня 1958 г.; Это было в деревне Гили // Сцяг сацыялізма. № 64. 1960 г.; В дни революции 1905 г. // Советский судент. 18 мая 1958 г. (в соавт. с Левским А.А.); Михаил Васильевич Рытов // Советский студент. 22 апреля 1958 г. (в соавт. с Левским А.А.).

***Крыніцы*:** НАРБ, ф. 251, воп. 2, спр. 46.; ДАМВ. Ф. 817, воп. 6, спр. 17, арк. 76-81.

*З.Л. Яцкевіч*



**ЛАТУШКІН Андрэй Мікалаевіч** (н. 08.08.1979, в. Піямонт Талачынскага р-на Віцебскай вобл.). Гісторык, архівіст. Скончыў Забалацкую СШ (1996), гістарычны факультэт БДУ (аддзяленне гісторыка-архівазнаўства) (2001), аспірантуру БДУ (2005). Кандыдат гістарычных навук (2008). Тэма кандыдацкай дысертацыі – «Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII–першай палове XX ст.».

У НГАБ з восені 2000, са снежня 2001 па чэрвень 2004 – у аддзеле старажытных актаў на пасадзе вядучага палеографа. Займаўся стварэннем падакументальнага вопісу да спраў вопіса 1 ф. 694 («Радзівілы, князі»), сфрагістычнага каталога.

***Тв.*** Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у перыяд дзейнасці Вышэйшай радзівілаўскай камісіі (1814-1838 гг.): гісторыя і арганізацыя архіўнай справы, стан дакументаў // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. 2004. № 2. С. 3-9; Да гісторыі Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у 1790–1818 гг. // БАШ. Вып. 6. Мн.: БелНДІДАС, 2005. С. 46–60, і інш.

*В.У. Бабкова*

**ЛАШКЕВІЧ Аляксандр Аляксандравіч** (н. 09.06.1953, г. Барысаў Мінскай вобл.), гісторык, архівіст. Скончыў СШ № 9 г. Гомеля, гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1975). Працаваў у Інстытуце гісторыі АН БССР (1975–1992). Кандыдат гістарычных навук (1990). У 1978–81 стажор-даследчык Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН ССР у Маскве. Абараніў дысертацыю па тэме «Вышэйшая школа Балгарыі ў 1944–канцы 1950-х гг.».

З 1993 у аддзеле старажытных актаў НАРБ (затым – НГАБ), займае пасаду вядучага навуковага супрацоўніка. Займаецца распрацоўкай актавых кніг Магілёўскага магістрата 1580–1603 гг. Падрыхтаваў два выпускі выдання ўнутраных вопісаў (кн. 3–6) у серыі «Беларусь у актавых кнігах» (Мн., 1999, 2006). Рыхтаваў тэматычныя пералікі па матэрыялах архіва: «Лясная і паляўнічая справа ў Радзівілаўскіх уладаннях на Валыні XVII–XIX стст.», «Апісанне Маладзечанскага замка XVIII ст.», «Звесткі па радаводу Ф. Дзяржынскага» і інш. Удакладняў загалоўкі да мікрафільма «Літоўская метрыка» (КМФ-18) з уключэннем у вопіс 77 спраў Метрыкі, якія не ўвайшлі ў «Описание…» С.Л. Пташыцкага. Займаецца апісаннем пергаментных грамат. Аўтар шэрагу артыкулаў па гісторыі ўрадавай палітыкі па падаўленню паўстання 1863-1864 гг.

***Тв.*** Лашкевіч А.А. Беларускі нацыянальны рух у Польшчы // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1994. № 1. С. 60–66; Незнаёмае – побач // Байрам. Татары на зямлі Беларусі: Квартальнік Беларускага згуртавання татараў-мусульман «Аль-Кітаб». 1994. № 3. С. 52-54; Нашчадак гуна Заарда // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 4. С. 45; Мусульманскія абшчыны на Беларусі ў XIX ст. (па дакументах НАРБ) // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі. Ч. 1. Мн., 1996. С. 140–143; Раскол // Байрам. 1996. № 3. С. 26–28. (у сааўтарстве з І. Канапацкім); Якубоўскія гербу «Тапор» // Байрам. 1999. № 1. С. 16–18; Згадкі аб Стахору Мітковічу ў актавых кнігах Магілёва // Архіварыус. Вып. 1. Мн. 2001. С. 93–96; Трагічны лёс імама Алі Варановіча (да 100-годдзя з дня нараджэння) // Наша слова. 13.03.2002 (у сааўтарстве з І. Канапацкім); Вайскова-цывільная адміністрацыя Мінскай губерні ў час паўстання 1863–1864 гг. (па матэрыялах НГАБ) // БАШ. Вып. 4. Мн.: БелНДІДАС, 2003. С. 156–163; Лашкевич А.А. Свидетельство арендатора пограничных таможен. Из актовых книг Могилевского магистрата. Сентябрь 1588 г. // Исторический архив. № 6. 2004. С. 195-198; Аб дзейнасці следчых камісій па справах аб паўстанні 1863–1864 гг. у Мінскай губ. (Паводле архіўных крыніц НГАБ) // Архіварыус. Вып. 2. Мн., 2004. С. 54–59; Барацьба мясцовых уладаў з паўстанцкім рухам 1863–1864 гг. у Мінскай губ. (па матэрыялах фондаў «Вайскова-павятовыя начальнікі 60-х гг. XIX ст.) // Архіварыус. Вып. 2. Мн., 2004. С. 59–71; Дакументы аб дзейнасці расійскіх уладаў па стварэнню адміністрацыйна-паліцэйскага кантролю ў час паўстання 1863–1864 гг. (па матэрыялах Віцебскай губ.) // Архіварыус. Вып. 3. Мн. 2005. С. 137–142; Супрацьпаўстанцкая дзейнасць вайскова-цывільных уладаў Віцебскай губ. у 1863–1864 гг. // Архіварыус. Вып. 4. Мн. 2006. С. 57–60; Мінскае губернскае жандарскае ўпраўленне у канцы XIX–пачатку XX ст. // Архіварыус. Вып. 5. Мн., 2007. С. 115-121.

*В.У. Бабкова*



**ЛЕШЧАНКА Мікалай Кузьміч** (н. 27.09.1923, в. Маканавічы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. – 29.12.1980, г. Мінск), адміністратыўны работнік. З сялянскай сям'і. У 1939 скончыў Хойніцкую СШ, педагагічныя курсы і стаў працаваць дырэктарам сямігадовай школы. У 1941 мабілізаваны ў Чырвоную Армію, удзельнічаў у бітве пад Масквой. Пасля цяжкага ранення ў лютым 1942 быў на лячэнні ў Новасібірскім шпіталі. У 1944 прызначаны сакратаром Петрыкаўскага РК ЛКСМБ. З 1946 па 1948 вучыўся ў Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КП(б)Б. Працаваў на партыйных і адміністратыўных пасадах. З 1972 па 1978 быў дырэктарам ЦДГА БССР у г. Мінску. Праводзіў значную арганізацыйную работу па забеспячэнні захаванасці дакументаў архіва і іх выкарыстанні. Садзейнічаў выданню даведніка «Центральный государственный исторический архив БССР в г. Минске» (1974) і зборніка дакументаў «Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв. Владение Сморгонь» (1977).

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За адвагу».

***Літ.:*** Галубовіч А.К. Лешчанка Мікалай Кузьміч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 145.

*А.К. Галубовіч*

**ЛЕЎЧЫК Наталля Мікалаеўна** (н. 03.10.1946, г. Цяньцзінь, Кітай), гісторык, архівіст. У 1972 г. скончыла МДГАІ. З мая 1972 – малодшы навуковы супрацоўнік, са студзеня 1978 – старшы навуковы супрацоўнік ЦДГА БССР у г. Мінску; у 1982–1991 – загадчык аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм, з 1992 – галоўны архівіст, вядучы навуковы супрацоўнік АІПС; з 2007 – на пенсіі.

Займалася пытаннямі стварэння і ўдасканалення навукова-даведачнага апарата архіва. Прымала ўдзел ва ўдасканаленні фондаў намесніцкіх і губернскіх упраў, Мінскай казённай палаты, губернскай чарцёжнай і інш. Узначальвала работу па перапрацоўцы і ўдасканаленню фондаў судовых устаноў перыядаў Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі (вышэйшай інстанцыі Мінскай губерні), фондаў князёў Радзівілаў, праваслаўных кансісторый, духоўных упраў, благачынняў, цэркваў, манастыроў. Каардынавала працу па каталагізацыі многіх фондаў архіва, інфармацыйнаму напаўненню сістэматычнага каталога і каталога імёнаў. Удзельніца распрацовак шэрагу навукова-метадычных дапаможнікаў па навукова-даведачнам апараце архіва. Адна са складальніц даведніка «Фонды Нацыянальныга гістарычнага архіва Беларусі», аўтар яго шматлікіх артыкулаў па гісторыі дзяржаўных устаноў Віцебскай і Магілёўскай губерній. Веды архівіста і вялікі практычны вопыт перадавала маладым супрацоўнікам, падрыхтавала шэраг спецыялістаў аддзела ІПС.

Узнагароджана медалём «Ветэран працы», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровымі граматамі архіва, Белкамархіва.

***Тв.***: Усовершенствование описей в ЦГИА БССР в г. Минске // Советские архивы.

1987. № 4; Усовершенствование и переработка описей церковных фондов в НИАБ // Архіварыус. Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001; Обновленческая церковь в Беларуси (по документам фонда Белорусский православный священный синод. 1922–1935 гг.) // Архівы і справаводства. 2002. № 4. С. 97–106 (перадрук у: БАШ. Вып. 3. Мн., 2002. С. 113–122) і інш.

***Літ.***: Архівісты Беларусі: Біябібліягр давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 143-144.

*Г.Я. Акуловіч*

**ЛІСАВА Ларыса Міхайлаўна** (н. 28.08.1956, г. Баранавічы Брэсцкай вобл.), гісторык, архівіст. З сям'і служачых. Скончыла Баранавіцкую СШ № 5 (1973), гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1979). Са студ. 1981 працавала ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобл. на пасадах старшага архівіста, загадчыка гаспадарча-разліковага аддзела, малодшага навуковага супрацоўніка аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў, старшага навуковага супрацоўніка, загадчыка сектарам (з сак. 1994 – аддзелам) камплектавання ведамасных архіваў і справаводства. З вер. 1996 – намеснік дырэктара НГАБ. Старшыня праўлення Беларускага таварыства архівістаў (са снежня 2007), намеснік старшыні Вучонага савета архіва.

З'яўляецца аўтарам больш чым 30 прац па пытаннях архівазнаўства, дакументазнаўства, крыніцазнаўства, аўтарам артыкулаў у перыядычным друку і вядучай радыёперадач па гісторыі Міншчыны, тэлестаронкі «Календарь революции» на рэспубліканскім тэлебачанні (1987). Даследуе праблематыку дакументацыйнага забеспячэння знешнеэканамічнай дзейнасці ўстаноў і арганізацый, займаецца вывучэннем крыніц па гісторыі войн (1812, 1914 гг.).

Удзельніца шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцый, у тым ліку Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Французская рэвалюцыя і лёсы свету» (Мінск, 1999), прысвечанай гадавіне Французскай рэвалюцыі (1789-1999 гг.), Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Дакументальная спадчына дзвюх рэвалюцый 1917 г. у Расіі: яе захаванне і выкарыстанне пры аналізе гістарычных падзей XX стагоддзя» (Масква, 2007) і інш. Распрацоўвае методыку і арганізацыю работы з гістарычнымі дакументамі («Положение о документальных памятниках НИАБ», «Положение о порядке доступа к документам, содержащим сведения генеалогического и биографического характера и выдаче архивных справок, копий и выписок из документов, содержащих информацию, составляющую личную или семейную тайну», «Положение об организации и порядке проведения платных работ и оказания платных услуг юридическим и физическим лицам» і інш.). Удзельнічала ў падрыхтоўцы «Основных правил работы архивов центральных и местных органов государственной власти и управления, учреждений, организаций и предприятий Республики Беларусь» (1997), «Правил работы государственных архивов Республики Беларусь» (2006), распрацоўцы ўлікова-даведачнай аўтаматызаванай базы дадзеных ААТ-»Учет» і іншых дакументаў, якія рэгламентуюць працу дзяржаўных і ведамасных архіваў. Аўтар нарматыўных дакументаў, якія вызначаюць працу НГАБ. Шмат



увагі надае пытанням падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў.

Займалася вызначэннем асноўных напрамкаў камплектавання дзяржаўных архіваў, вывучэннем гісторыі дзяржаўных устаноў г. Мінска і Мінскай вобл., даследаваннем працэса змянення іх форм уласнасці ў 90-х гг. XX ст.

Узнагароджана Ганаровымі граматамі ДАУ пры СМ БССР, Дзяржкамархіва, архіўнага аддзела Мінскага аблвыканкама, знакам «Ганаровы архівіст Беларусі» (2006).

***Тв.:*** Из истории Государственного архива Минской области в период Великой Отечественной войны // Замежная архіўная беларусіка. Мн., 1998. С. 238-242; Источники по истории Отечественной войны 1812 г. (опыт изучения и систематизации) // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання / Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У.І. Пічэты (Мінск, 23-24 красавіка 1998 г.). Мн., 1998; Документы Витебской губернской комиссии по военнопленным 1812-1815 гг. как исторический источник // Французская рэвалюцыя і лёсы свету / Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай гадавіне французскай рэвалюцыі (1789-1999 гг.) (Мінск, 21-22 красавіка 1999 г.). Мн., 1999; Национальный исторический архив Беларуси: история и перспективы // Архівы Беларусі на рубяжы XX-XXI стст.: гісторыя, стан, перспектывы развіцця / Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (Мінск, 8-9 лютага 2000 г.). Мн., 2001; Документальное обеспечение высших органов государственного управления внешнеэкономической деятельностью // Документация в информационном обществе: роль и значение документа в управленческом процессе: Материалы Международной научно-практической конференции (Минск, 7-8 декабря 2000 г.). Мн., 2001; Становішча цэркваў пасля вайны 1812 г. // Памяць. Гіст.-дакум. хроніка г. Мінска. Кн. 1. Мн.: БЕЛТА, 2001; «В списках не значится…» // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001; Переезд НИАБ в новое здание: год за годом (1996-1998) // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн., 2001; Современные методы обучения студентов вузов практике научной работы с историческими документами в Национальном историческом архиве Беларуси // Архіўная спадчына віцебшчыны як крыніца вывучэння гісторыі краю: Матэрыялы архіўных чытанняў, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П. Сапунова (Віцебск, 6-7 чэрвеня 2001 г.). Мінск-Віцебск, 2002; Віцебская губерня ў дакументах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 4; К 200-летию образования Витебской губернии // Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX–XX вв.). Минск-Витебск, 2002; Лыко для Наполеона // Советская Белоруссия. 26 октября 2002 г.; Обзор первоисточников по войне 1812 г. на территории Беларуси, хранящихся в НИАБ // БАШ. Вып. 4. Мн., 2003; Работа Национального исторического архива Беларуси по исполнению запросов биографического характера // Юстыцыя Беларусі. 2004. № 9; Дакументы з замежных архіваў у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі // БАШ. Вып. 6. Мн., 2005; Источники по Первой мировой войне в фондах Национального исторического архива Беларуси: опыт изучения и систематизации // Последняя война Российской империи. Россия, мир накануне в ходе и после Первой мировой войны по документам российских и зарубежных архивов: Материалы Международной научной конференции (Москва, 7-8 сентября 2004 г.). М.: Наука, 2006; Источники по первой мировой войне в фондах НИАБ // III архіўныя чытанні «Падзеі першай сусветнай вайны на тэрыторы Беларусі ў дакументах беларускіх архіваў». Мн.: БДАМЛІМ і інш.

*А.К. Галубовіч*

**ЛІСЕЙЧЫКАЎ Дзяніс Васільевіч** (н. 04.09.1979, в. Дзяніскавічы Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл.). Гісторык, архівіст. Скончыў СШ № 7 г. Баранавічы (1996), гістарычны факультэт БДУ (2001), магістратуру БДУ са ступенню магістра гуманітарных навук (2002), аспірантуру пры Інстытуце гісторыі НАНБ (2006). З 2002 г. працуе у НГАБ, у 2005-2006 гг. – у аддзеле публікацыі дакументаў, з 2007 г. – у аддзеле ІПС на пасадзе старшага, пасля – вядучага навуковага супрацоўніка, галоўнага архівіста.

Займаецца ўдасканаленнем НДА да фондаў рэлігійных устаноў, гісторыяй уніяцкай царквы XVII-XIX стст. Распрацоўвае навуковыя тэмы «Гісторыя дзяржустаноў ВКЛ», «Дзяржаўныя ўстановы Віцебскай губерні». Прымаў удзел у стварэнні «Гербоўніка беларускай шляхты», у складанні кнігі «Памяць» па Баранавіцкаму р-ну. Аўтар звыш 20 артыкулаў у навуковых зборніках Беларусі, Украіны і Польшчы. Займаецца гістарычным краязнаўствам. Удзельнічае ў шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях.

***Тв.***: Плябанская гаспадарка уніяцкага святара ў Беларусі ў XVIII ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. № 5. Ч. 2 / Рэд. кал.: П.Г. Нікіценка (гал. рэд.) і інш. Мн.: Беларуская навука, 2005. -С. 44–46; Беларускамоўныя дакументы ў справаводстве уніяцкай царквы першай трэці XIX ст. // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3 / Рэдкал.: А.К. Галубовіч (старш.) і інш. Мн.: НГАБ, 2005. С. 66–73; Візіты і інвентары уніяцкіх храмаў Беларусі як крыніца па гісторыі штодзённасці (паводле матэрыялаў НГАБ) // БАШ. Вып. 6 / Рэд. калегія: У.К. Коршук (гал. рэд.) і інш. Мн.: БелНДІДАС, 2005. С. 94–101; Бенефіцыяльныя сваяцкія кланы // Історія релігій в Украпні. Науковий щорічник. Львів: Логос, 2006. С. 365-373; Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 2. Мн.: НГАБ, 2007 (у сааўтарстве); Униатские учреждения // Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793-1917) / Сост. Т.Е. Леонтьева. Мн.: БелНИИДАД, 2006. С. 366-367; Культ цудатворных абразоў і змаганне з рэшткамі народных вераванняў ва уніяцкіх парафіях Беларусі XVIII–пач. XIX ст. // Історія релігій в Украпні. Науковий щорічник. Львів: Логос, 2007. С. 565-572; Пратаколы генеральнай візітацыі уніяцкіх цэркваў Кіеўска-Віленскай епархіі 1680-1682 гг. у фондах НГАБ // Rocznik Instytuty Europy Środkowo-Wschodniej. Red. J. Kłoczowski, A. Gil. Rok (5) Lublin, 2007. S. 123-138; Фарміраванне кнігазбораў пры уніяцкіх цэрквах Беларусі ў XVIII ст. // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст. Вып 4 (9) / под ред. В.Ф. Беркова. Мн.: РИВШ, 2007.- С. 81-85; Фрагмент асабістага архіва прафесара Полацкай духоўнай семінарыі Адама Тамковіда // БАШ. Вып. 7 / Рэд. калегія: У.К. Коршук (гал. рэд.) і інш. Мн.: БелНДІДАС, 2007. С. 140–150.

*Г.Я. Акуловіч*

**ЛЯВОНЦЬЕВА Тамара Еўдакімаўна** (н. 16.01.1924, г. Южа Іванаўскай вобл. Расія), гісторык, архівіст. З сям'і служачага. Скончыла Южскую СШ № 2 (1942), МДГАІ (1947). З вер. 1947 працавала загадчыкам аддзела, начальнікам Дзяржархіва Прыморскага краю (г. Уладзівасток), са студз. 1950 – старшым навуковым супрацоўнікам арганізацыйна-метадычнага аддзела АУ МУС БССР, з вер. 1953 – намеснікам начальніка ЦДАКР БССР, са студз. 1954 – старшым навуковым супрацоўнікам ЦДА Удмурцкай АССР, са жн. 1956 – намеснікам начальніка, начальнікам аддзела дарэвалюцыйных фондаў Дзяржархіва Мінскай вобл., са студз. 1964 – начальнікам аддзела фондаў (загадчыкам аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў) ЦДГА БССР у г. Мінску. З 1986 на пенсіі. З 1997 па 2003 па кантракце працавала вядучым, галоўным архівістам аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм і аўтаматызаваных архіўных тэхналогій НГАБ.



Удзельнічала ў падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў «Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.» (1964), «Восстание в Литве и Белоруссии в 1863–1864 гг.» (1965), даведнікаў па Дзяржархіве Мінскай вобл. і ЦДГА БССР у г. Мінску. З'яўляецца складальнікам шэрагу дапаможнікаў і рабочых інструкцый па стварэнні і ўдасканаленні навукова-даведачнага апарату да дакументаў фонду, праверцы наяўнасці і стану дакументаў, адборы і ўліку асабліва каштоўных спраў, выяўленні, уліку і падрыхтоўцы да рэстаўрацыі пашкоджаных спраў. З'яўлялася аўтарам публікацый у архівазнаўчай перыёдыцы. Яна была членам Метадычнай камісіі ГАУ БССР, прымала ўдзел у шматлікіх навукова-тэарэтычных канферэнцыях ГАУ СССР і ГАУ БССР, была дэлегатам Міжнароднага з'езда архівістаў у г. Маскве (1972).

***Тв.:*** Из опыта работы по составлению указателей к описям в Госархиве Минской обл. // Информационный бюллетень АУ МВД БССР. 1956. № 2; Рабочая инструкция по подготовке путеводителя по Госархиву Минской обл. // Там жа. 1957. № 3–4 (у сааўтарстве); Использование документальных материалов Госархива Минской обл. // Там жа. 1958. № 6; Несвижский архив князей Радзивиллов (обзор фонда) // Научно-информационный бюллетень АУ при СМ БССР. 1960. № 2(9); Документальные материалы фонда Радзивиллов как исторический источник // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР. Мн., 1971; Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793-1917). Мн.: БелНИИДАД, 2006 (составитель) і інш.

***Архівы***: НГАБ. Справочник по истории государственных и общественных учреждений Минской, Витебской и Могилевской губерний за дореволюционный период 1793–1917 гг. (рукапіс).

*Г.А. Станкевіч*

**МІРОНАЎ Уладзіслаў Паўлавіч** (н.18.06.1927, в. Алдаркіна Бузулукскага р-на Самарскай вобл., Расія), гісторык, архівіст. Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. З 1933 жыў у станіцы Краснаармейскай Краснадарскага краю. З 1936 па 1942 вучыўся ў СШ. Летам 1942 добраахвотнікам пайшоў на фронт, а ў вер. 1942 быў цяжка паранены ў баях за Новарасійск. У 1943 вярнуўся ў станіцу Краснаармейскую Краснадарскага краю, дзе ў 1949 скончыў СШ. З 1950 па 1955 вучыўся ў МДГАІ.

У 1955 накіраваны на пасаду ст. навук. супрацоўніка Дзяржархіва Ровенскай вобл. У 1960–1961 – начальнік Філіяла Краснадарскага краявога дзяржархіва ў г. Новарасійску. Пасля пераводу ў Беларусь у 1961 працаваў ст. навук. супрацоўнікам, ст. інжынерам арганізацыйна-метадычнага аддзела АУ пры Савеце Міністраў БССР, начальнікам Лабараторыі па рэстаўрацыі і мікрафотакапіраванні дакументальных матэрыялаў. З сак. 1968 па студз. 1980 – нам. дырэктара ЦДГА БССР у г. Мінску. Асаблівую ўвагу надаваў

метадычнай працы і падрыхтоўцы кадраў архівістаў.

Узнагароджаны медалямі «За перамогу над Германіяй ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

*Літ.:* Жумар С.У. Міронаў Уладзімір Паўлавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 157-158.

*С.У. Жумар*

**МІХАЙЛАВА Кацярына Пятроўна** (н. 10.08.1925, с. Барысава Бабаеўскага р-на Валагодскай вобл., Расія ), гісторык, архівіст. З сям'і служачага. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1943 працавала піянерважатай у Барысаўскім дзіцячым доме. Скончыла гістарычны факультэт Ленінградскага педінстытута (1949). Была накіравана ў Архіўны аддзел МУС Ленінградскай вобл., дзе працавала інспектарам. З 1950 па 1951 выкладала гісторыю ў Стараладажскай сярэдняй школе; з 1951 па 1955 – у Чырвонабярэжскім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. З 1955 па 1957 працавала настаўніцай гісторыі ў Свяцілавіцкай сярэдняй школе Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.

З 1 вер. 1957 – навук. супрацоўнік Архіўнага ўпраўлення МУС БССР, з 8 лют. 1958 па 31 снеж. 1963 – навук. супрацоўнік ДА Мінскай вобл., з 1 студ. 1964 па 12 крас. 1968 – навук. супрацоўнік ЦДГА БССР у г. Мінску, з 12 крас. 1968 – інспектар аддзела навуковага выкарыстання і інфармацыі, ст. інжынер арганізацыйна-метадычнага аддзела Галоўархіва пры Савеце Міністраў БССР. 1 кастр. 1976 прызначана намеснікам дырэктара ЦДАКФФД БССР. З 1 ліст. 1983 на пенсіі.

*Літ.:* Паляшук А.К. Міхайлава Кацярына Пятроўна // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 158.

*А.К. Паляшчук*

**МІХЯЁНАК Таццяна Сяргееўна** (н. 02.08.1972, Мінск), інжынер-матэматык, мэнэджэр па інфармацыйных тэхналогіях. Скончыла СШ № 37 г. Мінска (1989), факультэт робатаў і робататэхнічных сістэм Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі па спецыяльнасці «Прыкладная матэматыка» (1994), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце РБ па спецыяльнасці «Інфармацыйныя тэхналогіі ў дзяржаўным кіраванні» (2005). З сак. 1998 г. працуе ў НГАБ на пасадзе загадчыка аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій.

Займаецца ўвядзеннем інфармацыйных тэхналогій ва ўжытак у працы архіва, у т.л. арганізацыяй запаўнення і выкарыстання БД, забеспячэннем функцыянавання архіўнага Web-сайта, арганізацыяй стварэння фонда выкарыстання ў лічбавым фармаце. Таксама займаецца метадычным забеспячэннем работы, з'яўляецца аўтарам «Інструкцыі па арганізацыі работы з БД абмежаванага доступу», «Метадычнай рэкамендацыі па стварэнні АНДА у НГАБ», «Інструкцыі па інфармацыйнай бяспецы архіва». Аўтар шэрагу навуковых артыкулаў, а таксама ўдзельнік



рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый, выступае з дакладамі па тэматыцы працы аддзела. Распрацавала і выкладае ў БДУ спецкурс «Архіўная інфарматыка» студэнтам спецыяльнасці «Гісторыка-архівазнаўства».

***Тв.***: Зачем архивам Интернет? // АіС. 2001. № 5.-С. 90-93; Информационные технологии в Национальном историческом архиве Беларуси: состояние, проблемы, перспективы развития // Архівы Беларусі на рубяжы XX-XXI стст.: гісторыя, стан, перспектывы развіцця (Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 8-9 лют. 2000 г.)). Мн.:БелНДІДАС, 2001. С. 146-152; Применение технологий смыслового поиска в архивном деле // АіС. 2001. № 1. С. 102-106; Отдел автоматизированных архивных технологий – реалии и перспективы // Архіварыус. Вып. 1. Мн.: НГАБ, 2001. С. 146-148; Павичи – род крестьянский // АіС. 2001. № 2. С. 103-107; Родословная по-крестьянски // АіС. 2001. № 1. С. 102-106; О достоверности информации, выдаваемой из БД, составленных на основании исторических источников генеалогического характера // Информационный бюллетень ассоциации «История и компьютер». № 30. Мн., 2002; Архивы в информационном обществе // Архіварыус:Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. Мн.: НГАБ, 2005. С. 157-161; Архивы в информационном обществе и перспективные направления развития в отрасли // АіС. 2005. № 1. С. 79-84; Формула профессионализма архивиста // АіС. 2005. № 3. С. 88-92; Автоматизированный научно-справочный аппарат к документам НИАБ: проблемы использования и пути улучшения // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 4. Мн.: НГАБ, 2006. С. 189-193; Использование технологий баз данных в обеспечении доступа к документам и фондам НИАБ // История и компьютер: Информационный бюллетень. № 34. Москва-Тамбов, 2006; Влияние копировально-множительной техники на сохранность архивных документов // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: Матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіў. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь (Мінск, 12 красавіка 2007г.)). Мн.: БелНДІДАС, 2007. С. 68-73, і інш.

*З.Л. Яцкевіч*

**НОВІКАВА Ірына Леанідаўна** (н. 25.08.1951, г. Мінск), гісторык, архівіст. З сям'і служачых. У 1968 скончыла СШ № 15 г. Мінска, у 1975 – Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У.І.Леніна. У 1969–1980 і з верасня 1982 па красавік 1985 – старшая піянерважатая, арганізатар пазашкольнай і пазакласнай работы, выкладчык гісторыі ў СШ №№ 29 і 15 г. Мінска.

З 1981 па жнівень 1982 і з 1985 па 08.10.2007 – супрацоўнік ЦДГА БССР у г. Мінску (цяпер НГАБ) – архівіст 2 катэгорыі, мал. навук. супрацоўнік аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм, ст. захавальнік фондаў, заг. архівасховішча аддзела забеспячэння захаванасці фондаў, заг. чытальнай залы аддзела інфармацыі, публікацыі і выкарыстання дакументаў, галоўны архівіст, вядучы навук. супрацоўнік аддзела ІПС; з 2007 г. – на пенсіі.

Працуючы з даследчыкамі, садзейнічала ўсебаковаму выкарыстанню дакументаў архіва, праводзіла вялікую навукова-інфармацыйную работу, выконвала тэматычныя і генеалагічныя запыты, складала тэматычныя пералікі дакументаў, займалася ўдасканаленнем вопісаў фондаў дарожных і будаўнічых камісій Мінскай губерні, Віцебскага губернскага праўлення, складаннем аўтаматызаваных паказальнікаў, каталагізацыяй

дакументаў. Дзякуючы яе даследаванням, у навуковы ўжытак уключаны невядомыя раней дакументы па гісторыі Беларусі XVIII–XX стст., архіўнай справы XIX–пач. XX ст., біяграфіях архівістаў.

Узнагароджана Ганаровымі граматамі Галоўархіва БССР, Дзяржкамархіва, медалём Францыска Скарыны (2006).

***Тв.***: Народная адукацыя Ігуменскага павета да 1917 г. // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка. Чэрвеньскі раён. Мн., 2000.- С. 72-77; Да біябібліяграфічнага даведніка «Архівісты Беларусі» // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 3. / Рэдкал.: А.К. Галубовіч (старш.) і інш. Мн.: НГАБ, 2005. С. 162-165; Бітнэр Вільгельм Карлавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 8; Бржэскі Браніслаў Генрыхавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 10-11; Кудраў Сяргей Сяргеевіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 26-27; Палубінскі Уладзімір Міхайлавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 31-32; Сычоў Антон Якаўлевіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 42; Сяўрук Васіль Міхайлавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 42-43; Да біябібліяграфічнага даведніка «Архівісты Беларусі» // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 4. / Рэдкал.: А.К. Галубовіч (старш.) і інш. Мн.: НГАБ, 2006. С. 194-198.

*Г.Я. Акуловіч*

**ПАНАСЮК Ірына Рыгораўна** (н. 01.09.1972), архівіст, гісторык. Скончыла СШ г. Мінска (1989), гістарычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры» (2006). У 1997-2006 працавала ў НГАБ. З лістапада 1997 займала пасаду тэхніка I катэгорыі, з сакавіка 1998 – архівіста I катэгорыі, са жніўня 2000 – вядучага архівіста, з лістапада 2003 – старшага навуковага супрацоўніка, з ліпеня 2004 па лістапад 2006 з'яўлялася галоўным архівістам аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій. Удзельнічала ў комплексе прац па стварэнні навукова-даведачнага апарата да дакументаў архіва і ўкараненню аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, займалася ўвядзеннем звестак у базу дадзеных «Радавод» і інш., арганізацыяй капіравання дакументаў.

*Т.С. Міхяёнак*

**ПАЎЛОВІЧ Святлана Іванаўна** (н. 23.08.1946, г. Новашахцінск Растоўскай вобл., Расія), гісторык, архівіст. З сям'і рабочых. Скончыла факультэт архіўнай справы МДГАІ (1969). Была накіравана ў Дзяржархіў Мінскай вобл. на пасаду старшага навуковага супрацоўніка. З 20 кастр. 1975 была загадчыкам аддзела фондаў, уліку і навукова-даведачнага апарата архіва, з 1 ліст. 1979 – аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў. 13 мая 1981 пераведзена ў ГАУ пры Савеце Міністраў БССР; працавала у якасці старшага метадыста аддзела арганізацыйна-метадычнага і навукова-даведачнага апарата. У 1986-1988 займала пасаду начальніка аддзела забеспячэння захаванасці, дзяржаўнага ўліку і навукова-даведачнага апарата дакументаў Дзяржаўнага архіўнага фонда СССР ГАУ БССР. З 15 ліст. 1988 намеснік дырэктара ЦДГА



БССР у Мінске. З утварэннем ў 1992 БелНДЦДАС (з 1995 БелНДІДАС) працавала старшым навуковым супрацоўнікам аддзела архівазнаўства інстытута. Адначасова выкладала курс «Справаводства» у ВНУ Мінска. З вер. 2004 – выкладчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

Адна са складальнікаў бібліяграфічнага паказальніка «Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Са старажытнасці да 1945 г.» (Ч. 1-3, 1995-2001), «Основных правил работы архивов центральных и местных органов государственной власти и управления, учреждений, организаций и предприятий Республики Беларусь» (1997), даведнікаў «Административно-территориальное устройство БССР» (Т. 2, 1987), «Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XV-XIX стст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў ў Расіі» (Ч. 1-2, 1999-2001), «Высшие органы государственной власти и центрального управления БССР (1965-1991)» (2000), «Государственные архивы Республики Беларусь. 1944-1997» (2000), «Документы по истории Православной Церкви на Беларуси XVIII-XX вв. в фондах государственных архивов Республики Беларусь: Межархивный справочник» (2003), «Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI-XX стст. у фондах Літвы і Расіі. Даведнік» (Ч. 3, 2004), Дакументы па гісторыі Беларусі ў фондзе «Радзівілы, князі» Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (Вяртанне. Вып. 7) (2002) і інш.

***Тв.:*** Бібліяграфічны паказальнік газет, што зберагаюцца ў дзяржаўных архівах БССР (1917 – 1941). – Мн., 1990; Тэстамент як гістарычная крыніца // Наш радавод. Кн. 3. Ч.1. Гродна, 1991. С.190–194; Цэнтральны дзяржаўны архіў Беларусі як крыніца па канфесійнай гісторыі // Тамсама. Кн.4. Ч.1 – 3. Гродна, 1992. С.172-178; Перечень документов для организации розыска архивных, музейных, библиотечных фондов Белоруссии XVIII–XX вв. // Вяртанне. Мн., 1992. -С.150-151 (складальнік); У бернардзінскіх мурах // БМ. – 1995. – №1; Прывілей Мікалая Радзівіла // Тамсама. №5; Сямья менскага войта ў люстэрку дакументаў // Спадчына. 1995. №2; Судовы працэс Антонія Тызэнгаўза // Тамсама. – №3; Царкоўная старажытнасць // Тамсама. №4; Агляд фондаў па гісторыі Полацкай епархіі (па архівах Масквы і Санкт-Пецербурга) // Гісторыя і археалогія Полацка і полацкай зямлі : Матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі. 21 – 26 красавіка 1997. Полацк, 1998; З гісторыі Адукацыйнай камісіі // Замежная архіўная Беларусіка / Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Мінск, 25-26 красавіка 1996. Мн., 1998 і інш.

***Літ.:*** Жумар С.У. Паўловіч Святлана Іванаўна // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 172-173.

*С.У. Жумар*

**ПАХВАЛАЎ Уладзімір Пятровіч** (н. 12.07.1928, г. Пенза). З сям'і рабочых. Супрацоўнік МДБ, архівіст, настаўнік гісторыі. У 1943-1945 – вучань Пензенскага мехтэхнікума, у 1946-1947 – студэнт Пензенскага фізкультурна-тэхнічнага інстытута, затым Ленінградскага фізкультурнага інстытута; у 1947-1952 – студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта Пензенскага педінстытута. Атрымаў спецыяльнасць настаўніка гісторыі СШ. У 1952-1954 – курсант Магілёўскай школы КДБ СССР, з 27.07.1954

– лейтэнант. З 30.10.1954 – начальнік аддзела сакрэтных фондаў (старшы навуковы супрацоўнік). З 26.09.1956 па 18.04.1960 – нам. начальніка ЦДГА БССР. З 24.12.1963 – загадчык архіўнага аддзела Магілёўскага аблвыканкама.

Здзяйсняў кіраўніцтва навукова-даследчай і метадычнай працай архіва, праводзіў перадачу сакрэтных фондаў у агульныя і пашырэнне выкарыстання дакументаў. Прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да друку зборнікаў дакументаў аб школе ў Магілёўскай губерні, паўстанні 1863-1864 гг. на Беларусі, шляхаводніка па ЦДГА БССР, фотавыставы прысвечанай 40-годдзю Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі ў Магілёўскай губ. Удзельнічаў ва ўдасканаленні навукова-даведачнага апарата ЦДГА БССР, папулярызацыі складу і зместу архіўных дакументаў ЦДГА БССР праз друк. Аўтар 5 артыкулаў. У 1958-1959 гг. – прапагандыст партарганізацыі УУС, кіраваў тэарытычным семінарам УУС Магілёўскага аблвыканкама па вывучэнні асноў марксізма-ленінізма і гісторыі КПСС.

Атрымаў Ганаровую грамату і падзяку ў сувязі 40-годдзем архіўнай справы.

***Тв.***: Орша: Историко-экономический очерк / сост. Шпаков М.Ф., Похвалов В. П., Смольянов Ю.П., Савицкий Э.М. Мн.: Госиздат БССР, 1962. 124 с.; Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР: Путеводитель / под ред. Е.П. Лукьянова, В.Н. Жигалова, В.П. Похвалова. Могилев: Могилевская областная типография, 1959; Похвалов В. Использование архивных документов ЦГИА БССР в научных и народнохозяйственных целях // Информационный бюллетень Архивного управления Министерства внутренних дел БССР. 1958. № 6. С. 82-85; У гістарычным архіве БССР // Магілёўская праўда. 18 мая 1958 г.; З мінулага Палыкавіч // Сацыялістычная праца. 6 жніўня 1960 г.; У нашым Быхове // Сцяг працы. 13 кастрычніка 1960 г.; Сяляне Лепельшчыны пра дэкрэт аб зямлі // Калгасная праўда. 7 лістапада 1961 г.; Першыя гістарычныя звесткі аб Оршы // Ленінскі прызыў. 17 лістапада 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Рускія на Кубе // Магілёўская праўда. 11 сентября 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Цікавая архіўная знаходка // Витебский рабочий. 30 октября 1960 г. (сумесна з А. Людынам); З мінулага Бялыніч // Перамога. 23 марта 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Мсціслаўшчына ў першай палавіне XIX стагоддзя // Калгасная газета. 27 сакавіка 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Мсціслаў у перыяд пасля ўз'яднання з рускай дзяржавай // Калгасная газета. 1 красавіка 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Лепель 55 год таму назад // Калгасная праўда. 18 мая 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Рэдкі здымак // Магілёўская праўда. 11 июня 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Змагар за свабоду // Магілёўская праўда. 26 чэрвеня 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Кібальчыч (славуты дзеяч народніцкага руху) // Магілёўская праўда. 27 сентября 1961 г. (сумесна з А. Людынам); Цікавыя дакументы // Магілёўская праўда. 4 сентября 1960 г. (сумесна з Э. Савіцкім); М.І.Калінін у Палыкаўскіх сялян // Соха и Молот. 17 июня 1959 г.; З гісторыі вёскі Вендарож // Сацыялістычная праца. 1960 г.; З гісторыі роднага краю (Магілёў у 1812 г.) // Магілёўская праўда. 1960 г.; Это было в Вейно // Сацыялістычная праца. 1960 г.; Гэта было ў вёсцы Панізоў // Сацыялістычная праца. 6 жніўня 1960 г.; Барацьба сялян за зямлю // Сацыялістычная праца. 3 лістапада 1967 г.; Новыя дакументы аб Ф.Э. Дзяржынскім // За Радзіму. 24 ліпеня 1955 г.; Гістарычныя дакументы аб Н.Э. Баумане // За Радзіму. 11 лістапада 1955 г.; Царква ненавідзела Л.М. Талстога // Магілёўская праўда. 20 ноября 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Будзе жыць вечна // Витебский рабочий. 20 ноября 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Их добра памятае Куба // Звязда. 3 снежня 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Першыя гістарычныя звесткі аб Оршы // Ленінскі прызыў. 17 лістапада 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Орша у перыяд польска-літоўскага панавання // Ленінскі прызыў. 17 лістапада 1960 г. (сумесна з А. Людынам); З мінулага Аршаншчыны // Ленінскі прызыў. 17 лістапада 1960 г. (сумесна з А. Людынам); Фотовыставка архивных документов // Магілёўская праўда. 20 ноября 1957 г. (сумесна з М.Ф. Шпакавым).

***Крыніцы***: НГАБ. Ф. 251(ба), воп. 2, спр. 52; ф. 251, воп. 1, спр. 16, арк. 37; спр. 17, арк. 55; спр. 19, арк. 1; ДАГАМВ. Ф. 42, воп. 20, спр. 490, арк. 2, 6; НАРБ Ф. 251, воп. 3, спр. 105, арк. 6; ДАМВ. Ф. 817, воп. 6, спр. 21, арк. 98; спр. 17, арк. 73-74.

*З.Л. Яцкевіч*



**ПРЫГОЖЫНА Бася Залманаўна** (н. 05.01.1922, г. п. Копысь Віцебскай вобл. – 23.02.1987), гісторык, архівіст. Удзельніца партызанскага руху ў Беларусі. Пасля вайны скончыла Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. З 1945 працавала загадчыкам аддзела дарэвалюцыйных фондаў, старшым навуковым супрацоўнікам Дзяржархіва Мінскай вобл., са студз. 1964 – старшым навуковым супрацоўнікам, галоўным захавальнікам фондаў ЦДГА БССР у г. Мінску.

У пасляваенныя гады арганізоўвала і прымала непасрэдны ўдзел у пошуку і вяртанні дакументаў, іх навукова-тэхнічнай апрацоўцы, стварэнні страчанага ў гады вайны навукова-даведачнага апарата да фондаў, удасканаленні старых здатачных вопісаў, арганізацыі рэстаўрацыі пашкоджаных спраў, выяўленні асоба каштоўных дакументаў.

Падрыхтавала шэраг метадычных дапаможнікаў (рабочых інструкцый, памятак, метадычных указанняў па навукова-тэхнічнай апрацоўцы дакументаў, удасканаленні навукова-даведачнага апарату, экспертызе каштоўнасці дакументаў).

Прымала ўдзел у падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў «Белоруссия в эпоху феодализма» (Т. 1–4. 1959–1979); «Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861–1862 гг.)» (1959), даведнікаў па Дзяржархіве Мінскай вобл. і ЦДГА БССР у г. Мінску.

***Тв.***: Пра Л.М. Талстога // ПГіКБ. 1978. № 3. С. 26-28 (сумесна з Я.Л. Бравер).

*Г.А. Станкевіч*

**РАМАНКЕВІЧ Аксана Фёдараўна** (н. 10.12.1976, г. Лунінец Брэсцкай вобл.), гісторык, архвіст. Скончыла СШ № 4 г. Лунінца, Ліцэй пры БДУ (гісторыка-філалагічны клас, 1994), гістарычны факультэт БДУ (1999). Працавала настаўніцай у СШ № 91 г. Мінска. З 2004 па лістапад 2007 у НГАБ на пасадзе архівіста I кат. у аддзеле публікацыі, вядучага палеографа ў аддзеле старажытных актаў. Займалася распрацоўкай актавых кніг Пінскіх земскага і гродскага судоў 1660 г. Займалася апісаннем і выяўленнем пячатак з фонда «Радзівілы, князі». Складала каментарыі да пергаментных грамат XV–XVII стст. Удзельнічала ў Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю М. Улашчыка.

***Тв.*** Адзін са старажытных рэестраў беларускіх архіваў (Пінскі гродскі суд. 1522–1631 гг.) // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 4. Мн. 2006. С. 14–24; Ва ўзвязденні царквы – уклад святога // Лунінецкія навіны. 2007.

*В.У. Бабкова*

**РОШЧЫН Іван Васільевіч** (11.11.1908, в. Віхляеўка Барысаглебскага р-на Варонежскай вобл. – 20.07.1972, в. Верхні Кардаіл Нова-Нікалаеўскага р-на Валгаградскай вобл.), вайсковец, архівіст. Скончыў рабфак, Вышэйшы ваенна-педагагічны інстытут Савецкай Арміі, г. Масква (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, са жніўня 1941 па май 1945, спачатку на Паўночна-Заходнім, потым на 2-м Беларускім франтах. Да 1956 г. у Савецкай арміі, падпалкоўнік; з пачатку 50-х служыў ў Паўночнай групе Савецкіх войскаў (г. Легніца, Польшча), садзейнічаў передачы ў Беларусь выратаваных кніжных фондаў. З 1957 працаваў начальнікам Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, з 1964 па 1968 – дырэктарам Цэнтральнага Дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР у г. Мінску. З 1968 па 1971 – першы дырэктар мемарыяльнага комплекса «Хатынь» – філіяла Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Даследваў архіўныя дакументы па гісторыі медыцыны, адукацыі і літаратуры дарэвалюцыйнай Беларусі, з якімі выступаў на навуковых канферэнцыях і ў перыядычным друку. Апублікаваў рапарт А.Я. Багдановіча з дзвюма запісанымі ім песнямі.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, двума ордэнамі Чырвонай зоркі, ордэнам Чырвонага сцяга, медалямі СССР “За баявыя заслугі”, “За вызваленне Варшавы”, “За ўзяцце Кёнігсберга”, “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.”, “ХХ гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне”, “ХХХ гадоў Савецкай Арміі і Флоту і інш.”, двума польскімі медалямі – “Перамогі і волі”, “За Одэр, Нэйсэ, Балтыку” і чэхаславацкім “Дукельскім памятным медалём”.

***Тв.:*** Обзор документальных и печатных материалов по вопросам здравоохранения Белоруссии, хранящихся в Государственном архиве Минской области // Вопросы истории медицины и здравоохранения БССР / Тезисы докладов научной конференции. Мн., 1960. С. 17-20; Ценный источник по истории аграрных отношений Белоруссии (разам з П.Г. Казлоўскім) // Научно-информационный бюллетень АУ при Совете Министров БССР. 1962. № 12 (макет); Общественная деятельность работников медицины дореволюционной Белоруссии // Вопросы истории медицины и здравоохранения БССР / Материалы II научной конференции. Мн., 1965. С. 153-155; «По мере сил и возможностей…» // Неман. 1966. № 3. С. 189-191; Званы на плошчы: Да 60-годдзя першай рэвалюцыі ў Расіі // Мінская праўда. 1965, 31 кастр.

***Літ.:*** Люшкевич А. Белорускийслед «русского Парижа» // Для служебного пользования. 2003. № 1; Рошчына Т.І. Рошчын Іван Васільевіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 186-187.

*Т.І. Рошчына*

**РЫБЧОНАК Сяргей Аляксандравіч** (07.09.1966, Мінск), гісторык, архівіст. Скончыў СШ № 4 г. Мінска (1982), гістарычны факультэт БДУ (1990). У архіўнай галіне працуе з вер. 1990. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у ЦДГА БССР у г. Мінске на пасадзе археографа 1 катэгорыі ў аддзеле інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў. З вер. 1991 – навуковы супрацоўнік, са студ. 1993 – вядучы навуковы супрацоўнік, з сак. 2000 – загадчык аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў НГАБ у г. Мінску.



Распрацоўвае шырокае кола пытанняў па генеалогіі і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду. З 1993 – кіраўнік планавай тэмы «Генеалогія і геральдыка беларускай шляхты», складальнік і адзін з аўтараў «Малога гербоўніка Наваградзкай шляхты» (Мн., 1997) і «Гербоўніка беларускай шляхты» (т. 1-2) (Мн., 2002, 2007), аўтар метадычнага дапаможніка «Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI–пач. XX ст.» (2003), удзельнік шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый, аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі і генеалогіі Беларусі, апублікаваных у айчынных і замежных выданнях.

***Тв.:*** Менскія варштаты ў 1-й чвэрці XIX ст. (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) // Годнасць. 1994. № 1. С. 3-14; Разрабаванне Нясвіжскага замка ў 1812 г. // Архіварыус. Вып. 2. Мн.: НГАБ, 2004. С. 114-123; Інтэр’еры Нясвіжскага замку // Спадчына. 1996. № 6. С. 261-280 (сумесна з У. Свяжынскім); Радавод Верашчакаў гербу «Касцеша» // Спадчына. 1998. № 4. С. 54-73 (сумесна з У. Свяжынскім); Абуховічы гербу «Ключ раздвоены» // Спадчына. 1998. № 6. С. 210-225 (сумесна з У. Свяжынскім); Радавод Карафа-Корбутаў гербу «Корчак» // Спадчына. 1999. № 5-6. С. 165-176 (сумесна з У. Свяжынскім); Радавод Корсакаў гербу «Корсак» // Спадчына. 2000. № 2. С. 200-216 (сумесна з У. Свяжынскім); Кміты гербу «Харугвы» // Спадчына. 2000. № 5-6. С. 137-151 (сумесна з У. Свяжынскім); Радавод Ходзькаў гербу «Касцеша» // Спадчына. 2001. № 3. С. 188-200 (сумесна з У. Свяжынскім); Основные генеалогические источники: статистика и оценка возможности проведения исследований // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX-XXI стст. у Беларусі: Да 100-годдзя з дня нараджэння М.М. Улашчыка (Зборнік навуковых артыкулаў) / Рэдкалегія: С.М. Ходзін (адк. рэд.) і інш. Мн., 2007. С. 240-247; Праблема верагоднасці выводаў шляхецтва ў першай палове XIX ст. (па матэрыялах Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу) // Праблемы гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі ў Беларусі: Матэрыялы «круглага стала», прысвечанага 60-годдзю з дня нараджэння праф. У.М. Міхнюка (Мінск, 28 верасня 2007 г. / склад. В.С. Пазнякоў, П.П. Журкевіч; навук. рэд. У.І. Адамушка, А.Я. Рыбакоў. Мн.: БелНДІДАС, 2008. С. 95-109; Комплекс рэвізскіх сказак у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі // БАШ. Вып. 8: БелНДІДАС. Мн., 2007. С. 47-54; Анализ сохранности комплекса метрических книг в Национальном историческом архиве Беларуси // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі (Матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіў. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь) (Мінск, 12 красавіка 2007 г.)). Мн.: БелНДІДАС, 2007. С. 138-145; Рыбчонок С.А. Комплексы основных генеалогических источников в Национальном историческом архиве Беларуси // Архівы і С. 2007. № 5. С. 88-95; Радаводная справа шляхецкага роду Міцкевічаў // БАШ. Вып. 7. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 109-120, і інш.

*З.Л. Яцкевіч*

**САВІЦКІ Эдуард Міхайлавіч** (н. 04.03.1935, м. Буда-Кашалёва Гомельскай вобл.), гісторык, архівіст. Доктар гістарычных навук (1992), прафесар (1997). З сям’і рабочых. Скончыў МДГАІ (1959).

Са жніўня 1959 працаваў навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам–археографам навукова-публікатарскай групы; са студз. 1964 – намеснікам дырэктара па навуковай працы ЦДГА БССР у Мінску. У 1968 абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Рэвалюцыйны рух на

Беларусі ў гады першай сусветнай вайны і другой рускай рэвалюцыі (ліпень 1914 г. – сакавік 1917 г.)», пазней працаваў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі гісторыі Беларусі выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя», з 1973 – навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, з 1977 – Інстытута гісторыі АН БССР, з 1982 – дацэнтам кафедры навуковага камунізму Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава, з 1987 – дацэнтам кафедры гісторыі КПСС Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Быў членам навукова-метадычнага савета Рэспубліканскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

У красавіку 1990 прызначаны намеснікам начальніка ГАУ пры СМ БССР (да 1991), намеснікам старшыні Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Абараніў доктарскую дысертацыю па рабочым руху на Беларусі ў 1907-1917 (1992). Са студзеня 1997 – намеснік дырэктара па навуковай працы БелНДІДАС, са жніўня 2001 – саветнік-кансультант па навуковай працы гэтага ж інстытута (да мая 2002). З 1997 быў старшынёй Спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх дысертацый пры БелНДІДАС. З'яўляецца членам Спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый пры БДУ. Адначасова выкладаў у Інстытуце кіравання і прадпрымальніцтва, а таксама ў Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва, у які перайшоў у 2002 на пасаду прафесара. З 2006 працуе галоўным навуковым супрацоўнікам аддзела архівазнаўства БелНДІДАС.

Падчас працы ў архіве свае веды і энергію накіроўваўна паляпшэнне навуковага выкарыстання і публікацый дзейнасці.

Асноўныя напрамкі навуковай дзейнасці – даследаванне палітычнай гісторыі Беларусі дасавецкага і савецкага перыядаў, рабочы рух у пачатку XX ст., гісторыя Бунда, падрыхтаваў зборнік дакументаў «Бунд в 1897–1921 гг.: Документы и материалы». (1997). З'яўляецца адным са складальнікаў і рэдактараў зборнікаў дакументаў «Революционное движение в Белоруссии в 1907–1917 гг.» (1987), «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (1984 –1987), даведніка «Документы по истории и культуре евреев в архивах Беларуси» (2003). Узначальваў камісію па выпрацоўцы «Закона аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь» (прыняты 6 кастрычніка 1999 г.). З'яўляўся каардынатарам працы пры падрыхтоўцы «Асноўных правіл працы дзяржархіваў Рэспублікі Беларусь».

Удзельнічаў у распрацоўцы шэрагу навукова-метадычных дакументаў, у т.л. «Положения о страховании документов НАФ Республики Беларусь: Методические рекомендации», «Положения о денежной оценке документов НАФ Республики Беларусь» і інш. Аўтар больш за 150 навуковых прац, у т.л. 2 манаграфій.

Узнагароджаны знакам «Выдатнік архіўнай справы» (1992).

***Тв.:*** Орша: Историко-экономический очерк. Мн.: Госиздат БССР, 1962. 124 с. (саўдзел у складанні); Революционное движение в Белоруссии в годы Первой мировой войны // Материалы IX конференции молодых ученых Белоруссии. Вып. 2. Мн., 1965. С. 110–115; Помещичье землевладение и землепользование в Белоруссии в начале XX в. (1905–1917 гг.) // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. Кишинев, 1966; Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии // Вопросы истории и археологии. Мн., 1966. С. 250–257; История одной листовки // Нёман. 1967. № 10; Революционное движение в Белоруссии в годы первой мировой войны и второй русской революции (июль 1914-март 1917 г.): Автореферат на соискание ученой степени кандидат исторических наук… Мн., 1968; Новое о М.И. Глинке // Нёман. 1967. № 9. С. 175-176; Революционное движение в Белоруссии (август 1914 г. – февраль 1917 г.) Мн., 1981; Революционное движение в Белоруссии, июнь 1907–февраль 1917 г.: документы и материалы / Гл. арх. упр. при СМ БССР, Институт истории АН БССР. Мн.: «Наука и техника», 1987. 285 с. (саўдзел у складанні); Рабочее движение в Беларуси (июнь 1907 г. – февраль 1917 г.). Мн., 1995. Роль историка-архивиста в разработке отечественной истории на современном этапе // Международная научная конференция «Историки и архивисты: сотрудничество в сохранении и познании прошлого в интересах настоящего и будущего». Москва, 27–28 ноября 1997 г.: Доклады и тезисы научных сообщений. М., 1997. С. 134 – 135; Бунд в Беларуси. 1897-1921: Документы и материалы. Мн.: БелНДИДАД, 1997 (складальнік); Документы по по истории и культуре евреев в архивах Беларуси: путеводитель. М., 2003 (складальнік).

***Літ.:*** ЭГБ. Т. 6. Ч. 1. Мн., 2001. С. 200–201; Архівісты Беларусі: біябібліягр. давед. Мн., 2006.

*К.У. Вараб'ёва, З.Л.Яцкевіч*



**СЕДЛЯРЭВІЧ Таццяна Іосіфаўна** (н. 11.09.1965, г. Пружаны Брэсцкай вобл.), гісторык, архівіст. З сям'і вайскоўца. Разам з бацькамі жыла ў Маскве, Майкопе. У 1983 скончыла СШ у г. Зернаградзе (Расія) і паступіла ў МДГАІ. Пасля заканчэння інстытута (1988) працавала ў ЦДГА БССР (цяпер НГАБ у г. Мінску) на пасадах захавальніка фондаў, навук. супрацоўніка, галоўнага архівіста, вяд. навук. супрацоўніка ў аддзеле інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў. Займалася выкананнем генеалагічных, тэматычных і біяграфічных запытаў, загадвала бібліятэкай архіва, даследавала жаночую адукацыю на Беларусі. У лістападзе 1999 пераведзена на пасаду вядучага спецыяліста аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і архіўных тэхналогій Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь. У 2000-2001 вучылася на курсах МСА ў Будапешце. З сакавіка 2002 працуе галоўным спецыялістам, кансультантам (са снежня 2006) аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў, інфарматызацыі і архіўных тэхналогій Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Займаецца пытаннямі стварэння і ўдасканалення навукова-даведачнага апарату да дакументаў НАФ Рэспублікі Беларусь, галіновага даведачна-інфармацыйнага фонду. З'яўляецца складальнікам зборніка «Архивные документы Республики Беларусь – сокровищница социальной памяти государства» (2005), аўтарам шэрагу публікацый аб складзе дакументаў НАФ Рэспублікі Беларусь і навукова-даведачным апараце да іх, аб архівах і архіўнай справе ў замежных архівах.

***Тв.:*** Документальные источники по истории женского образования в Белоруссии во второй половине XIX – начале XX в. в фондах Национального исторического архива Беларуси // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання: Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Мінск, 23–24 красавіка

1998 г. Мн., 1998; Справочно-информационный фонд Республиканской службы научно-технической информации // АіС. 2000. № 6; Современное состояние и перспективы развития научно-справочного аппарата к документам бывших партийных архивов // Там жа. 2001. № 4; Из истории Минской женской гимназии Министерства народного просвящения (по материалам НИАБ) // Архіварыус. Вып. 2. С. 44-46; О работе справочно-информационных фондов архивных учреждений Республики Беларусь // АіС. 2002. № 1; Национальный архив Великобритании // Там жа. № 3; Система архивных учреждений Швейцарии // Там жа; Государственный архив Российской Федерации // Там жа. № 4; Бизнес-архивы в США // Там жа; Государственная архивная служба Франции // Там жа. № 5; Центральный государственный архив общественных объединений Украины // Там жа. № 6; Алма-Атинский областной государственный архив и его филиалы // Там жа. 2003. № 1; Роль системы научно-справочного аппарата государственных архивов Республики Беларусь в обеспечении доступа к информационным ресурсам архивов // Материалы 8-й международной конференции архивистов стран Центральной и Восточной Европы «Архивы в информационном обществе». Варшава, 2002; Российский государственный архив военно-морского флота // АіС. 2003. № 2; Архивы Венгрии // Там жа; Центральный государственный архив историко-политических документов Санкт-Петербурга // Там жа. № 3; Крупнейшие хранилища фонодокументов Западной Европы и Северной Америки // Там жа; Российский государственный архив древних актов // Там жа. № 4; Российский государственный архив кинофотофонодокументов // Там жа. № 5; Государственный архив документов персонала Латвийской Республики // Там жа; Архивное дело в Республике Молдова // Там жа. № 6; Государственный архив в Белостоке // Там жа; Архивное дело в Грузии // Там жа. 2004. № 1; Государсьвенный архив в Щетине // Там жа; Архивы Словении // Там жа; Центральный государственный исторический архив Украины в Киеве // Там жа. № 2; Государственные архивы Латвии // Там жа; Центральный архив Министерства обороны Российской Федерации // Там жа. № 3; Архивы в Корейской Народной Демократической Республике // Там жа; Центральный государственный кинофотофоноархив Украины им. Г. С. Пшеничного // Там жа. № 5; Российский государственный военный архив // Там жа; С именем женщины-ученой связано // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. и арт. Вып. 2. Мн., 2004. С. 74-77; Архивы Австрийской Республики // Там жа. 2005. № 1; Российский государственный архив фонодокументов // Там жа; Центральный военно-морской архив Министерства обороны Российской Федерации // Там жа. № 2; Российский государственный архив научно-технической документации // Там жа. № 3; Архивы Украины // Там жа; Литовский Центральный государственный архив // Там жа. № 4; Российскій государственный исторический архив // Там жа. № 5; Государственный архив в Кракове // Там жа; Центральный архив города Москвы // Там жа. № 6; Главный архив древних актов в Варшаве // Там жа; Национальный архив Республики Молдова // Там жа. 2006. № 1; Центральный государственный архив во Львове // Там жа; Центральный государственный архив Санкт-Петербурга // Там жа. № 2; Архивное дело в Азербайджанской Республике // Там жа; Национальный архив Румынии // Там жа. № 3; Центральный государственный архив Санкт-Петербурга // Там жа; Архивное дело в Республике Казахстан // Там жа. № 4; Государственный архив Томской области // Там жа; Архив Президента Российской Федерации // Там жа. № 5; Центральный государственный архив кинофотодокументов и звукозаписей Республики Казахстан // Там жа; Архив новых актов в Варшаве // Там жа. № 6; Центр хранения архивных фондов Алтайского края // Там жа; Национальный архив Австралии // Там жа. 2007. № 1; Архивное дело в Республике Таджикистан // Там жа; Российский государственный архив новейшей истории // Там жа. № 2; Архивное дело в Туркменистане // Там жа; Российский государственный архив социально-политической истории // Там жа. № 3; Центральный военный архив Польши // Там жа. Архивное дело в Республике Узбекистан // Там жа. № 4; Российский государственный архив Дальнего Востока // Там жа; Государственный архив Тульской области // Там жа. № 5; Государственный архив Тверской области // Там жа. № 6; Государственный архив Черновицкой области // Там жа; Центральный государственный архив высших органов власти и управления Украины // Там жа. 2008. № 2 Научно-справочный аппарат государственных архивов Республики Беларусь: Справочник. Мн.: БелНИИДАД, 2007 (составитель) і інш.



***Літ.:*** Архівісты Беларусі: біябібліягр. давед. Мн., 2006. С. 197-198.

*З.Л.Яцкевіч*

**СЕЛЯМЕНЕЎ Вячаслаў Дзмітрыевіч** (н. 06.09.1946, г. Мінск), гісторык, архівіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі (2002). Скончыў гістарычны факультэт БДУ імя У.І. Леніна (1971).

З 1968 — архіварыус, ст. захавальнік фондаў, мал. навук. супрацоўнік ЦДАКР БССР, з 1977 — інспектар Галоўархіва пры СМ БССР. У 1979 абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Аграрнае перанасяленне ў БССР і яго ліквідацыя ў гады першай пяцігодкі». З 1980 — нам. дырэктара ЦДГА БССР у г. Мінску. З сак. 1982 — дырэктар ЦДАКР БССР (у 1993 перайменаваны ў БДА), з чэрв. 1995 — дырэктар НАРБ. Абараніў кандыдатскую дысертацыю па тэме "Аграрное перенаселение в БССР и его ликвидация в годы первой пятилетки" ў 1979. Аўтар прац па архівазнаўстве, гісторыі Беларусі XX ст. Адзін са складальнікаў і членаў рэдкалегій даведнікаў і дакументальных выданняў «Хроника Чернобыльской трагедии. 1986—1996» (1996), «Административно-территориальное устройство БССР» (Т. 1. 1985), «Фонды бывших архивов Коммунистической партии Белоруссии» (Ч. 1—2, 1997—1998), «Белорусские остарбайтеры» (Т. 1—3, 1996 — 1998), «Озаричи — лагерь смерти» (1997), «Нацистское золото из Беларуси» (1998), «Заложники вермахта» (1999), «Документы по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Республики Беларусь» (1998; 2001, на ням. мове; 2003, на рус. і ням. мовах), «Заходняя Беларусь: Падзеі і людзі. Т. 1—2» (1998—2002, на пол. мове), «Максім Гарэцкі: Публіцыстыка. 1918—1919 гг.» (2000), «Аграрные преобразования в Вилейской области в 1939—1941 гг.» (2001), «Знешняя палітыка Беларусі» (Т. 4. 2001), «Холокост в Беларуси. 1941—1944» (2002), «Лагерь смерти Тростенец» (2003), «Аграрные преобразования в Молодечненской области» (2003), «Лагеря советских военнопленных в Беларуси. 1941—1944» (2003), «История Белоруссии» М. В. Доўнар-Запольскага (2003), «Освобожденная Беларусь» (Кн. 1. 2004; Кн. 2. 2005), Поўнага збору твораў Я. Купалы (Т. 9. Кн.1—2, Мн., 2003), каталога выстаўкі «Ёсць на карце месца… Грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі. 1921—1938» (2002, выстаўка дэманстравалася ў Мінску і Маскве) і інш. Адзін з аўтараў серыі публікацый па гісторыі газет «Звязда», «Чырвоная змена» (1997, 2001), «Советская Белоруссия» (з 2003,). Адзін са складальнікаў зборніка дакументаў «Приказано приступить: Эвакуация заключенных из Беларуси в 1941 году» (2005). Адзін са складальнікаў зборніка дакументаў зборніка дакументаў «Приказано приступить:Эвакувация заключенных из

Беларуси в 1941 году», «ЦГАОР БССР — 60 лет».

Узнагароджаны ордэнам Пашаны (2002), Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1996), знакам «Ганаровы архівіст Беларусі» (2004).

***Тв.:*** Аграрное перенаселение в БССР и его ликвидация в годы первой пятилетки. Автореферат диссертации… канд. ист. наук. Мн., 1979;ЦГАОР БССР — 60 лет. Мн., 1987; Документальные памятники Советской Белоруссии. Мн., 1990 (разам з М. Ф. Шумейкам); Национальный архив Республики Беларусь. Мн., 1997 (2-е выд. 2002); «На нашых паліцах — гісторыя» // БМ. 1997. № 2; Трэцяя і чацвёртая дэпартацыя насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1940 — 1941 гг. // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. 1997. № 3 (разам з Э. Іофе); Так начинался Холокост // Форум. 1997. № 5 (разам з Э. Іофе); Белпромстройбанк: Страницы истории. 1923—1998. Мн., 1998 (у сааўтарстве); Архивоведение Беларуси. Ч. 1—2. Мн., 1998 (у сааўтарстве); Заходнебеларускі рэгіён: асаблівасці эканамічнага і духоўнага развіцця ў 1960—1980-я гады // Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999 (разам з Я. Бараноўскім); Документы Национального архива Республики Беларусь о белорусско-польском соглашении 1944 года об эвакуации населения // Наш радавод. Кн. 8. Гродна—Беласток. 1999; The Liquidation of Yiddish Schools in Belorussia and Jewish Reaction // Jews in Eastern Europe. 2000. № 1(41) (разам з А. Зельцарам); The Jewish Intelligentsia and the Liquidation of Yiddish Schools in Belorussia, 1938 // Jews in Eastern Europe. 2000. № 3(43) (разам з А. Зельцарам); Фонды научных учреждений и ученых в Национальном архиве Республики Беларусь // The Sciences Archives in the European Integration. Warszawa, 2000; Kolyshki — A Shtetl in the Late 1930s // Jews in Eastern Europe. 2001. № 2(45); Как белорусскую столицу переводили в г. Могилев // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва. Магілёў, 2001; Белорусские остарбайтеры: Историко-аналитическое исследование. Мн., 2001 (у сааўтарстве); Национальный архив Республики Беларусь в 1995—2001 гг. // БАШ. Вып. 3. Мн., 2002; Деятельность Национального архива Республики Беларусь по обеспечению общества ретроспективной информацией // Archives in the information society. Warszawa, 2002; Научно-информационная деятельность Национального архива Республики Беларусь // Архівы на шляху XXI стагоддзя: гісторыя, спадчына, сучаснасць. Мн., 2003; Забытые агенты Кремля. Мн., 2003 (разам з В. Шымоліным); Тайна уголовного дела № 1603: Из истории советской военной разведки. Мн., 2004 (разам з В. Шымоліным); Праграмныя дакументы Сацыялістычнай лігі Новага Усходу // БГЧ. 2004. № 7 (разам з У. Ляхоўскім); Только авторитетный командир сможет заставить преодолеть страх и инстинкт самосохранения // Исторический архив. 2004. №6 С. 44-78; Дрезден-Минск, 2004 (у сааўтарстве); История Белоруссии. Мн., 2005 (у сааўтарстве); Освобождённая Беларусь: док. и материалы. В 2 кн. Кн. 2. Мн.: НАРБ, 2005 (у сааўтарстве); Эвакуация заключенных из Беларуси в 1941 году: сб. док. Мн.: НАРБ, 2005 (у сааўтарстве); Беларусь в первые месяцы Великой Отечественной войны: док. и материалы. Мн.: НАРБ, 2006 (у сааўтарстве); Елена Аладова. Музей – ее судьба: воспоминания, документы, исследования Мн.: Мастацкая літаратура, 2006 (у сааўтарстве); Мікалай Мікалевіч Улашчык: біябібліягр. паказ. Мн.: НАРБ, 2006; Охота на гауляйтера. Мн.: НАРБ, 2006. 246 с. (у сааўтарстве); Чернобыль. 26 апреля 1986–декабрь 1991: док. и материалы. Мн.: НАРБ, 2006 (у сааўтарстве).

***Літ.:*** ЭГБ. Мн., 2001. Т. 6. Кн. 1. С. 282; Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Мн., 2004. Архівісты Беларусі: біябібліягр. давед. склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: Бел НДІДАС, 2006. С. 199-200.

*В.У. Скалабан*



**СТАНКЕВІЧ Ганна Анатольеўна** (н. 19.07.1948, г. п. Негарэлае Дзяржынскага р-на, Мінскай вобл.), гісторык, архівіст. З сям'і рабочага. Скончыла Негарэльскую СШ Мінскай вобл. (1966), гістарычны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1975). З чэрв. 1976 працавала ў ЦДГА БССР у г. Мінску старшым захавальнікам фондаў аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў, загадчыкам архівасховішча. У 1986 прызначана загадчыкам аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў. На гэтай пасадзе знаходзілася да выхаду на пенсію ў жн. 2002. У 2005 зноў стала працаваць у архіве на пасадзе галоўнага спецыяліста. Адзін са складальнікаў «Памяткі аб парадку перадачы-прыёму фондаў на захоўванне пасля перапрацоўкі і ўдасканалення вопісаў» (1981), «Памяткі аб праверцы наяўнасці спраў, выданых з архівасховішч у папярэдні год» (1987). Ёю былі падрыхтаваны «Пералік картаграфічных дакументаў, якія змяшчаюцца ў фондах Мінскай губерні» (2001), «Пералік картаграфічных дакументаў, якія змяшчаюцца ў фондах Віцебскай і Магілёўскай губерняў» (2002) і іншыя даведачныя і метадычныя дапаможнікі.

***Тв.***: О физическом состоянии документов Национального исторического архива Беларуси // Архіварыус: Зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Вып. 1. Мн.: НГАБ, 2001. С. 158-161 і інш.

*Г.М. Кутукова*

**СУДЗІЛОЎСКІ Пётр Міхайлавіч** (н. 13.02.1928, в. Судзілы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 14.02.2000), інжынер, арганізатар вытворчасці, адміністратыўны работнік. З сям'і служачых. У 1941 скончыў 7 класаў Малашкавіцкай НСШ. Добраахвотнікам пайшоў на фронт. Пасля вайны ў 1945—1948 вучыўся ў Мінскім політэхнікуме, у 1949—1954 на маркшэйдэрскім факультэце Ленінградскага горнага інстытута. Працаваў у г. Кіраўску Мурманскай вобл. на камбінаце «Апатыт». З 1962 — у Салігорску, дзе прайшоў працоўны шлях ад горнага інжынера да дырэктара і генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» (з 1971). У 54 гады выйшаў на пенсію, але працягваў працоўную дзейнасць — з ліст. 1982 па сак. 1992 займаў пасаду дырэктара ЦДГА БССР у г. Мінску.

У час яго працы архіў атрымаў для выкарыстання мікрафотакопіі дакументаў фонду «Літоўская метрыка» з Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў, здзейсніў укараненне новых умоў гаспадарання, неаднаразова з'яўляўся пераможцам ва Усесаюзным і Рэспубліканскім сацыялістычных спаборніцтвах.

Узнагароджаны Залатой Зоркай Героя Сацыялістычнай Працы і ордэнам Леніна (1974), а таксама ордэнамі «Знак Пашаны», «Дружба народаў», медалямі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «Ветэран працы» і інш., трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

***Літ.:*** Жумар С.У. Судзілоўскі Пётр Міхайлавіч // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мн.: БелНДІДАС, 2006. С. 208.

*С.У. Жумар*

**СЯДЗЕЛЬНІКАВА Вольга Леанідаўна** (н. 03.01.1981), архівіст, гісторык. Скончыла СШ № 36 г. Мінска (1998), Мінскі палітэхнікум па спецыяльнасці «Дакументазнаўства і дакументацыйнае забеспячэнне кіравання» (2000), гістарычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры» (2008). Са жніўня 2000 займала пасаду архівіста I катэгорыі, з лістапада 2003 – вядучы архівіст, з лістапада 2006 г. – галоўны архівіст аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій НГАБ. Удзельнічае ў комплексе прац па стварэнні навукова-даведачнага апарата да дакументаў архіва і ўкараненню аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, займаецца ўвядзеннем інфармацыі ў базу дадзеных «Беларуская шляхта» і інш., падрыхтоўкай да выдання архіўных даведнікаў, стварэннем лічбавых копій дакументаў, выконвае генеалагічныя запыты.

*Т.С. Міхяёнак*

**СЯРГУНІНА (БУЛДАКОВА) Энергія Іванаўна** (н. 08.09.1927, г. Свярдлоўск – 1988 г., г. Мінск), гісторык, архівіст. Скончыла МДГАІ (1951).

З 1951 г. – навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела агульных фондаў ЦДАКР БССР, у 1959–1962 гг. – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, у 1963 г. працавала загадчыкам аддзела навукова-даведачнага апарата ЦДАКР БССР, з 1964 г. – загадчык аддзела выкарыстання, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ўліку, загадчык аддзела ўліку і навукова-даведачнага апарата ЦДГА БССР у г. Мінску.

Кіравала падрыхтоўкай даведніка па ЦДАКР БССР, стварэннем навукова-даведачнага апарата да фондаў вышэйшых органаў дзяржаўнай улады БССР, узначальвала працу па ўдасканаленню фондаў устаноў дзяржаўнай улады і кіравання Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай губерній, стварэнню сістэм каталогаў, уліку дакументаў архіва. Удзельнічала ў падрыхтоўцы зборнікаў дакументаў «Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг.» (1964), «Восстание в Литве и Белоруссии в 1863-1864 гг.» (1965).

Узнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровымі граматамі Галоўархіва БССР.

*Г.Я. Акуловіч*

**ТРАЦЭЎСКАЯ Соф’я Яраслаўна** (н. 07.09.1948, в. Акінчыцы Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), архівіст. Скончыла Стаўбцоўскую СШ № 1 (1966), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага (1973).

У НГАБ – са снежня 1976. Працавала малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела ўліку і навукова-даведачнага апарату. З лістапада 1979 – старшы захавальнік фондаў, загадчык архівасховішча (1985), галоўны архівіст (1993), вядучы навуковы супрацоўнік (1995) аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў. Займаецца падрыхтоўкай спраў да мікрафільміравання і рэстаўрацыі, праверкай наяўнасці і стану, выяўленнем асабліва каштоўных спраў і дакументаў з дэфектамі носьбіта і тэксту.

Неаднаразова ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Дзяржкамархіва і НГАБ, а таксама мае падзякі.

*Г.М. Кутукова*



**ХЛЯБІЧ Святлана Мікалаеўна** (н. 17.03.1975, г. Мінск), архівіст.

Скончыла СШ № 48 г. Мінска (1992), БДУ (2006). У НГАБ – з сакавіка 1997. Працавала архівістам 1-й катэгорыі аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў. З лютага 2002 – галоўны архівіст азначанага аддзела. Займаецца падрыхтоўкай спраў да мікрафільміравання і рэстаўрацыі, праверкай наяўнасці і стану, выяўленнем асабліва каштоўных спраў і дакументаў з дэфектамі носьбіта і тэксту.

Неаднаразова ўзнагароджана граматамі архіва.

*Г.М. Кутукова*

**ХОДЗІНА Валянціна Анатольеўна** (н. 13.03.1973 у Мінску), гісторык, архівіст. Скончыла СШ № 164 г. Мінска (1990), Мінскае педагагічнае вучылішча № 1 (1995), Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка (2000). З 1995 па 2000 працавала выхавацелем дзіцячага сада № 326, у 2000-2001 гг. – выкладчыкам гісторыі СШ № 192. У 2001 г. перайшла ў НГАБ, пачала працаваць на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка, затым – вядучага навуковага супрацоўніка. З 1 студзеня 2008 г. – загадчык аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі.

